ГІСТОРЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ

5



Г. І. Даўгяла, М. С. Корзун, К. А. Рэвяка

ГІСТОРЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ

ВУЧЭБНЫ ДАПАМОЖНІК
ДЛЯ 5 КЛАСА

Дапушчаны
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

МІНСК «НАРОДНАЯ АСВЕТА» 1993

ББК 63.3(0)3я721
Д21
УДК 931 (075.3)

Выдадзена ў аўтарскай рэдакцыі

Г. І. Даўгяла — «Што такое гісторыя», «Жыццё першабытных людзей», «Цывілізацыі Старажытнага Усходу»;

М. С. Корзун — «Старажытная Грэцыя»;

К. А. Рэвяка — «Як працаваць з падручнікам», «Старажытны Рым».

У падрыхтоўцы раздзелаў «Старажытная Індыя» і «Гісторыя старажытнакітайскай цывілізацыі» прымалі ўдзел аспіранты Белдзяржуніверсітэта Перзашкевіч А. В. і Прохараў А. А.

Д $\frac{4306020600-086}{М\ 303(03)-93}$ 40—93

ISBN 5-341-01146-5

© Г. І. Даўгяла, М. С. Корзун, К. А. Рэвяка, 1993

Што такое гісторыя

У наш час пра ўсе важныя падзеі можна даведацца па тэлебачанню, радыё, прачытаць у газетах. Але як дакладна даведацца аб самых галоўных і цікавых падзеях, якія адбыліся, напрыклад, сто, тысячу і нават мільён гадоў таму назад?

На гэтыя пытанні дае адказы навука **гісторыя.** *Гісторыя* — старажытнае грэчаскае слова. У перакладзе на беларускую мову яно азначае *«даследаванне»* і *«расказ пра падзеі»*.

Гісторыяй *называюць навуку, якая вывучае, як жылі ў далёкім мінулым розныя народы, якія падзеі адбываліся ў іх жыцці, як і чаму мянялася жыццё людзей і стала такім, як цяпер.*

У 5-м класе вы будзеце вывучаць *сусветную гісторыю старажытных цывілізацый.* Тэрмін *«цывілізацыя»* паходзіць ад лацінскага слова *«цывіліс» — грамадзянін.*

Цывілізацыя — буйное ўтварэнне чалавечага грамадства на пэўнай тэрыторыі, якое ўзнікла ў выніку рознабаковай дзейнасці людзей. Гэта дзейнасць уключае: жывёлагадоўлю, земляробства, рамяство, рэлігію і ўвогуле ўсю культуру чалавека, а таксама дзяржаву.

Дзяржава — гэта спецыяльнае грамадскае ўтварэнне, якое арганізуе працоўную дзейнасць людзей і мае сваёй мэтай абме-

жаванне жаданняў кожнага чалавека на карысць усяго калектыву. Дзяржава абараняе агульныя інтарэсы ад знешніх ворагаў.

З гісторыі цывілізацый вы даведаецеся, як і калі на Зямлі ўзнікла чалавечае грамадства. Вы даведаецеся аб першых дзяржавах, першых вялікіх гарадах, пачатках навукі, архітэктуры, розных мастацтваў і літаратуры. У старажытны час узнікаюць такія вядомыя сучасныя рэлігіі, як хрысціянства, індуізм і будызм.

Але вы даведаецеся і аб кровапралітных войнах, жорсткіх уладарах-захопніках, гвалтах над простым народам, цяжкім прыгнёце рабоў. Апошнія змагаліся за сваю чалавечую годнасць, часта паўставалі супраць прыгнятальнікаў.

Якім чынам сучасныя гісторыі даведваюцца аб жыцці людзей у самым далёкім мінулым?

Час захаваў вельмі цікавыя вялікія паэтычныя творы, дзе апавядаецца аб старажытных падзеях. Так, у паэмах «Іліяда» і «Адысея» ёсць шмат звестак аб гісторыі старажытных грэкаў. На працягу некалькіх тысячагоддзяў людзі чыталі і перадавалі нашчадкам старажытнаіндыйскія паэмы «Махабхарата» і «Рамаяна».

У Бібліі, якая больш вядома як святарная кніга, захаваліся дакладныя звесткі аб гісторыі і культуры многіх народаў старажытнасці.

Нават найстаражытнейшыя людзі пакінулі пасля сябе сляды сваёй дзейнасці. Час захаваў рэшткі іх касцей і некаторыя зробленыя імі рэчы, а таксама астаткі жыл-

ля і людскія пахаванні. Адкрыты зробленыя старажытнымі людзьмі малюнкі і выразаныя касцяныя фігуркі жывёл і чалавека.

Гісторыкі кажуць: «Пакажыце нам косці старажытнага чалавека, і мы скажам, якім ён быў. Пакажыце нам рэчы старажытнага чалавека, і мы скажам, чым ёй займаўся, што ўмеў рабіць». Па старажытных малюнках можна ўзнавіць працоўную дзейнасць старажытных людзей, іх звычаі. *Рэчы старажытных людзей, нават рэшткі чалавечых шкілетаў, завуць рэчавымі гістарычнымі крыніцамі.*

Але ў наш час знайсці месцы жыхарства старажытных людзей вельмі цяжка. За тысячы гадоў яны былі засыпаны шматметровым пластом пылу і зямлі, параслі лесам і травой. Часта над імі потым будавалі новыя населеныя пункты. Каб знайсці рэчавыя гістарычныя крыніцы, трэба рабіць *раскопкі.* Гэтай працай займаюцца прадстаўнікі навукі, якая завецца *археалогіяй,* што значыць *«навука аб старажытнасці».* Робяць раскопкі і даследуюць рэчавыя крыніцы вучоныя *археолагі.*

Разам са старажытнымі рэчамі археолагі знаходзяць і пісьмовыя тэксты рознага зместу. Самыя старажытныя з іх былі напісаны каля 5 тысяч гадоў таму назад. Лепш за іншыя захаваліся надпісы, зробленыя на камені, гліняных дошчачках і чарапках. У большасці выпадкаў мовы, на якіх былі зроблены гэтыя надпісы, забыліся. Але ў наш час вучоныя авалодалі сакрэтамі іх чытання і пачалі перакладаць на сучасныя мовы. Пісьмовыя тэксты на розных стара-

жытных мовах з'яўляюцца вельмі каштоўнымі *гістарычнымі крыніцамі.* Да нашага часу захаваліся пісьмовыя гістарычныя крыніцы, ці гістарычныя дакументы, разнастайнага зместу. Гэта гаспадарчыя запісы, законы, апісанні гістарычных падзей, навуковыя і літаратурныя творы і інш. Пісьмовыя крыніцы даюць самы падрабязны і каштоўны матэрыял для гісторыкаў старажытнасці.

Да новага часу на вялікіх адлегласцях ад краін Еўропы, на далёкіх астравах і ў цяжкадаступных месцах, працягвалі жыць людзі ва ўмовах старажытнейшага грамадства. Яны не ведалі металаў, карысталіся каменнымі прыладамі працы, займаліся паляваннем і збіраннем пладоў, клубняў, спажыўных каранёў, яек птушак. Большасць такіх народаў была знішчана за апошнія стагоддзі. Але да гэтага часу вучоныя вывучылі іх штодзённае жыццё, звычаі і вераванні. Жыццё гэтых плямён было вельмі падобна на жыццё старажытнейшых людзей, аб якіх даведаліся археолагі.

Навука, якая вывучае жыццё розных народаў, называецца этнаграфіяй, што значыць *«апісанне народаў».*

Больш падрабязна з рознымі гістарычнымі крыніцамі вы пазнаёміцеся пры вывучэнні асобных старажытных краін.

Вывучаючы гісторыю старажытных цывілізацый, вы даведаецеся пра гісторыю і культуру *цывілізацый Усходу* і *антычную цывілізацыю* (ад лацінскага слова *«антыквуус» — старажытны).* Такім чынам, наш дапаможнік складаецца з трох вялікіх частак: 1) гісторыя першабытнага грамад-

ства, 2) гісторыя цывілізацый Старажытнага Усходу, 3) гісторыя антычнай цывілізацыі. Трэцяя частка складаецца з двух аддзелаў: а) гісторыя старажытнай цывілізацыі грэкаў і б) гісторыя старажытнай цывілізацыі рымлян.

? **1.** Назавіце галоўныя крыніцы нашых ведаў пра гісторыю старажытнага свету. **2.** Што значыць па-беларуску словы *археалогія* і *этнаграфія*? **3.** Назавіце асноўныя віды пісьмовых гістарычных крыніц. **4.** Што вы чыталі аб працы археолагаў? Што вы чыталі аб паляўнічых і збіральніках новага часу?

Як працаваць з падручнікам

Памятайце, тое, на што трэба звярнуць асаблівую ўвагу і добра запомніць, выдзелена або **тлустым** шрыфтам, або пісьмовым, які называецца *курсівам*.

Праверце, ці правільна вымаўляеце вы новыя словы, імёны і назвы, звярніце ўвагу на пастаўленыя ў іх націскі, а таксама на слоўнік пасля параграфа. У кожным параграфе змешчаны дадатковыя матэрыялы: крыніцы аб гэтых падзеях, даследаванні вучоных ці проста цікавыя звесткі з апавяданняў вучоных-гісторыкаў. Пасля чытання параграфа падрыхтуйце адказы на пытанні да яго. Дадатковыя матэрыялы ўзбагацяць вашы веды па тэме ўрока, тым больш што гэтыя матэрыялы цікавыя і лёгка запамінаюцца.

Не старайцеся завучваць матэрыял на памяць. Трэба ўмець расказваць яго сваімі словамі. У расказе не забывайце прыводзіць даты, імёны, назвы. Пастарайцеся дапоўніць яго тым, аб чым вы даведаліся з дадатковага матэрыялу і з расказу настаўніка на ўроку.

У школьным падручніку немагчыма напісаць пра ўсе падзеі гісторыі старажытных цывілізацый. Акрамя дапаможніка, ёсць многа іншых кніг па гісторыі. Найбольш цікавыя для вас кнігі названы ў канцы дапаможніка.

Частка першая. Жыццё першабытных людзей

Раздзел I. Першабытныя збіральнікі і паляўнічыя

§ 1. Жыццё найстаражытнейшых людзей

1. Продкі чалавека. Каля 3 мільёнаў гадоў назад ва Усходняй Афрыцы жылі істоты, якія выразна адрозніваліся ад усіх жывёл. Яны перасоўваліся пераважна на задніх канечнасцях і жылі ў адкрытай раўніннай мясцовасці.

Гэты тып продкаў чалавека атрымаў назву *аўстралапітэкі,* што азначае **«паўднёвыя малпы».** Але яны былі больш падобны на старажытнейшых людзей, чым на дасканалых малпаў. Пры росце каля 1,25 м яны мелі аб'ём мозга значна большы, чым у малпаў — каля 550—600 см^3.

Акрамя збірання пладоў, карэнняў, раслін, яны палявалі на дробных жывёл. Археолагі знайшлі невялікія чарапы і косці, расколатыя імі з дапамогай вострых камянёў. Верагодна, пры здабыванні ежы яны карысталіся яшчэ палкамі, рагамі і косткамі жывёл.

Прамая паходка продкаў чалавека вызваліла пярэднія канечнасці для больш складанай дзейнасці. З часам яны пачалі ператварацца ў рукі.

2. Найстаражытнейшыя людзі. Каля 2 міль-

ёнаў гадоў назад ва Усходняй Афрыцы жыла чалавекападобная істота, якая значна адрознівалася ад сваіх папярэднікаў больш развітымі пярэднімі канечнасцямі. Кісць рукі мела бо́льшы вялікі палец, чым у лапы малпы. Будова чэрапа і пабольшаны аб'ём мозга (каля 680 см ^{3}) набліжалі яе да сучаснага чалавека.

Але самае важнае, што ён меў здольнасць пастаянна і мэтанакіравана рабіць **прылады працы** і карыстацца імі. Гэта галоўнае сведчанне ўзнікнення **працы** — *асноўнай прыкметы чалавека*. Найстаражытнейшы чалавек атрымаў назву *«чалавек умелы»*.

На працягу некалькіх мільёнаў гадоў паволі мяняўся знешні выгляд і паляпшаліся здольнасці найстаражытнейшых людзей. Больш упэўненай рабілася прамая паходка, павялічваліся аб'ём мозга і рухомасць кісці рукі. Чалавек станавіўся больш моцным і знешне дасканалым.

Паступова людзі рассяляліся з Афрыкі ў цёплыя краіны на поўдні Еўропы і Азіі. Агульная колькасць іх была невялікай, і асобныя групы людзей былі аддзелены адна ад адной вялікімі прасторамі.

3. Прылады працы і заняткі найстаражытнейшых людзей. Першыя прылады працы ўяўлялі сабой груба абабітыя валуны і дарабленыя да зручнага карыстання доўгія косці буйных жывёл. Адначасова чалавек звярнуў увагу на *галькі* як добры матэрыял для вырабу простых прылад працы. Гэта падоўжанай яйцападобнай формы камяні, гладка адшліфаваныя за доўгі час рачнымі ці марскімі хвалямі. Камяні крыху аббівалі

для атрымання вострых краёў. Яны выкарыстоўваліся для вытворчасці прылад працы з дрэва, косці, рогу.

Гэта простая прылада працы рабілася і выкарыстоўвалася без значных змен сотні тысяч гадоў. Толькі мільён гадоў назад з'явілася больш дасканалая і шырока распаўсюджаная галечная прылада працы — *ручное рубіла*. Яго рабілі вялікімі сколамі з абодвух бакоў галькі для атрымання вострага ляза. З яго дапамогай выкопвалі спажыўныя карэнні, сяклі галіны дрэў, разбіралі тушы жывёл, выскрабалі шкуры. Рубіла выкарыстоўвалі і як ударную прыладу.

Рубілам высякалі з дрэва *дубіны для палявання* і *палкі-капалкі*. З іх дапамогай удасканальвалася збіральніцтва і паляванне на хворых і адбіўшыхся ад статка траваедных жывёл — зубраў, аленяў, дзікоў і іншых. Найстаражытнейшыя людзі існавалі пераважна *збіральніцтвам*. *Паляванне* мела выпадковы характар і адыгрывала дапаможную ролю пры здабыцці ўсяго неабходнага для жыцця.

4. Першабытны чалавечы статак. Як і вышэйшыя жывёлы, першыя людзі жылі *статкамі*. Іх існаванне было цяжкім і небяспечным. Збіральніцтва давала не вельмі спажыўную ежу, частымі былі хваробы і голад, смерць ад кіпцюроў драпежнікаў. Сярэдняя працягласць жыцця чалавека складала не больш за 20 гадоў.

Недасканалыя прылады працы і цяжкасці пры здабыванні ежы вымушалі весці вандроўны спосаб жыцця. Толькі ў рэдкіх выпадках найстаражытнейшыя людзі

стала сяліліся ў тых мясцінах, дзе было лягчэй здабываць ежу.

Колькасць асоб у статку не перавышала 20—30 чалавек. Састаў яго не быў пастаянным. Людзі часта сыходзіліся і разыходзіліся.

Першабытныя чалавечыя статкі маглі існаваць толькі ў цёплых краінах, дзе было больш багатае прыроднае асяроддзе і не было вялікай патрэбы ў адзенні і жыллі.

Збіральніцтва. *(Апісанне тубыльнага племені* ***кубу*** *з в. Суматры)*

«У асноўным кубу жывуць вандроўным жыццём і бесперапынна бадзяюцца па сваёй акрузе ў пошуках спелых лясных пладоў. Там, дзе іх напаткае вечар, яны плятуць з галін дрэва просты парасон, які ахоўвае іх ад непагадзі.

Увесь свой час і намаганні яны трацяць на пошукі ежы. Харчуюцца фруктамі, ягадамі, каранямі і клубнямі, якія выкопваюць вострымі палкамі. З задавальненнем ядуць і яшчарак, жаб, вусеняў і лічынкі жукоў...

Здараецца ім спусташаць птушыныя гнёзды з пяшчотнымі птушанятамі, лавіць у ручаях рыбу, ракаў, крабаў, знаходзіць тлустых слімакоў і ракавіны... Паляванне і рыбная лоўля адыгрываюць у побыце кубу нязначную ролю, таму што ў іх няма патрэбных прылад. Каб запоўніць свае страўнікі, ім трэба было працягла і напружана займацца збіраннем ежы... Калі ежы шмат, яны ядуць да адвалу, да знясілення, але часта кладуцца спаць нашча...

Кубу яшчэ не дайшлі да думкі, што можна пакінуць на потым некалькі бананаў ці клубняў. Яны збіраюць роўна столькі, каб замарыць голад, і з'ядаюць без астачы тое, што назбіралі».

? **1.** Чым продкі чалавека адрозніваліся ад астатніх жывёл? **2.** Назавіце асноўную прыкмету чалавека. **3.** Якімі прыладамі працы карысталіся найстаражытнейшыя людзі? **4.** Назавіце галоўныя заняткі людзей гэтага часу. **5.** Якія цяжкасці былі ў жыцці найстаражытнейшых чалавечых статкаў?

§ 2. Старажытнейшыя людзі і іх заняткі

1. Авалоданне агнём. Чалавек, у адрозненне ад жывёл, з часам перастаў баяцца агню. Ён авалодаў ім, адчуўшы яго вялікую карысць. Спачатку людзі бралі агонь ад лясных пажараў і вывяржэнняў вулканаў. Агонь пільна вартавалі і імкнуліся падтрымліваць яго ўвесь час. Пры зменах месца пасялення асцярожна пераносілі тлеючыя галавешкі на новыя кастрышчы, дзе хаваліся ад сцюжы і непагадзі.

На агні людзі смажылі і пяклі ежу. Яна рабілася больш смачнай і карыснай, а чалавек больш моцным і працаздольным.

Агонь ратаваў людзей ад драпежнікаў. Чалавек з палаючай галінай атрымаў магчымасць пужаць звяроў і вымушаў іх адступаць. З дапамогай агню людзі асвоілі вельмі зручныя для тых часоў месцы жыхарства — *пячоры*. Да гэтага ў іх сяліліся такія буйныя і небяспечныя звяры, як пячорныя мядзведзі і львы.

На агні рабіліся і ўдасканальваліся драўляныя і касцяныя прылады працы спосабам абпальвання.

З часам людзі заўважылі, што пры моцным шараванні аднаго вельмі сухога кавалка дрэва аб другі з'яўляецца тленне. Простае дзьмуханне дае магчымасць даволі хутка

распаліць сухое лісце, траву. Так людзі навучыліся самастойна здабываць агонь і паспяхова карыстацца ім пры паляванні.

Карыстанне агнём яшчэ больш павялічыла перавагу чалавека над жывёльным светам.

Здабыванне агню жыхарамі Камчаткі ў XVIII стагоддзі.

«Агонь яны здабывалі з выкарыстаннем вельмі простых сродкаў. Гэта сухія драўляныя дошчачкі, на краях якіх свідравалі ямачкі. У іх ставілі таксама сухія кругленькія палачкі, якія з націскам хутка круцілі. Калі з'яўляліся іскрынкі — падносілі скамечаную сухую траву і моцна дзьмулі да атрымання агню. Усе гэтыя прылады абгортвалі берастам і заўсёды насілі з сабой...»

2. Развіццё прылад працы. Хуткае ўдасканаленне асноўных дадатных якасцей чалавека пачалося прыкладна сто тысяч гадоў таму назад. Мужчыны гэтага часу мелі рост каля 160 см і моцную фізічную будову. Мускулатура была больш развітой, чым у сучаснага чалавека. Гэта сведчыць аб тым, што людзі тысячагоддзямі вымушаны былі займацца цяжкай фізічнай працай. Вялікіх памераў дасягнуў аб'ём мозга — ад 1200 да 1600 см^3. Чалавек стаў здольным рабіць шмат разнастайных прылад працы.

Людзі навучыліся ўдала падбіраць пароды каменя для вытворчасці прылад працы. Лепшым з іх быў *крэмень*. Пачаткова яму надавалі правільную прызматычную форму, ад якой адколвалі доўгія, тонкія і лёгкія пласціны з вострымі краямі. З іх потым рабіліся *нажы, скрэблы, праколкі*. З дрэва і

косці выточвалі рукаяткі. Потым людзі навучыліся прымацоўваць вострыя каменныя *наканечнікі* да драўляных *коп'яў*. Пры паляванні іх кідалі з адлегласці.

Дасканалыя крамянёвыя прылады працы дазволілі рабіць з касцей і рога *шылы* і *іголкі*. Прыкладна 20—30 тысяч гадоў таму назад чалавек навучыўся выразаць з косці і рога *гарпуны* — зазубраныя наканечнікі коп'яў, якія застравалі ў целе жывёлы. З гарпуном чалавек займаўся і рыбалоўствам. З берага ён падпільноўваў вялікую рыбу і ўсаджваў у яе гарпун.

Перыяд у жыцці чалавецтва, калі асноўныя прылады працы рабіліся з каменя, завуць ***каменным векам****. Ён цягнуўся звыш 2 мільёнаў гадоў.*

3. Пахаладанне на Зямлі. Каля ста тысяч гадоў таму назад прырода ўчыніла жорсткае выпрабаванне для людзей, якія жылі ў Еўропе і на поўначы Азіі. Рэзка пахаладала. Падоўжыліся зімы з моцнымі маразамі, за кароткае лета не паспявалі раставаць снягі і льды. Паўночная Еўропа пакрылася льдамі таўшчынёй больш за два кіламетры.

Абшары на поўдзень да Чорнага і Міжземнага мораў ператварыліся ў тундру. Зніклі цеплалюбівыя жывёлы. На іх месцы пасяліліся статкі велізарных, аброслых шэрсцю сланоў — *мамантаў*, паўночных аленяў і зубраў.

У гэтых суровых умовах жыцця людзі не толькі выжылі, але і ўдасканаліліся. Там, дзе не было пячор, стала неабходным будаваць жыллё. Археолагі знайшлі рэшткі збудавання гэтага часу з жэрдак, касцей і

біўняў маманта і рагоў, якія пакрываліся звярынымі шкурамі. Спатрэбілася цёплае адзенне, якое шылі з апрацаваных шкур жывёл. Замест нітак ужывалі сухажыллі.

4. Рост ролі палявання. Удасканаленне каменных і касцяных прылад працы павялічыла вынікі палявання. Яно дазволіла чалавеку здабываць большую колькасць спажыўнай ежы. Групы мужчын пачалі паляваць на статкі дзікіх аленяў, быкоў і коней.

Высачыўшы статак, паляўнічыя знянацку пужалі жывёл прарэзлівымі гукамі і палаючымі факеламі, гналі іх да абвеснага абрыву ці ў вузкія цясніны. У такіх выпадках жывёлы самі разбіваліся ўшчэнт.

Жывёл наўмысна гналі і да іншых паляўнічых, якія з коп'ямі і гарпунамі сядзелі ў засадзе. Гэта было вельмі небяспечным заняткам, і шмат людзей гінула ад раз'юшаных статкавых жывёл.

Людзі палявалі і на такіх гігантаў жывёльнага свету, як маманты. На шляхах іх пастаянных пераходаў выкопвалі велізарныя ямы-пасткі. Накрывалі зверху жэрдкамі, а потым галлём і ў самы патрэбны момант пужалі маманта кіданнем каменняў, гукамі і агнём. Калі масіўная жывёліна пападала ў пастку, яе дабівалі коп'ямі.

Паспяховае загоннае паляванне давала шмат мяса, тлушчу і шкур. Але такое здаралася не часта, голад быў пастаянным спадарожнікам старажытнейшых людзей. Тым не менш ужыванне мясной ежы дадаткова спрыяла павелічэнню фізічных і разумовых здольнасцей чалавека.

Загоннае паляванне

«У Сібіры мядзведзяў палююць з дапамогай ям, у якія забіваюць абпаленыя і гладка завостраныя калы. Мядзведзя вымушаюць хутка бегчы, і ён, набегшы на яму, валіцца жыватом на кол».

! **1.** Якую карысць атрымалі людзі ад авалодання агнём? **2.** Якія поспехі былі дасягнуты старажытнейшымі людзьмі пры вытворчасці каменных і касцяных прылад працы? **3.** Як адбіўся ледніковы час на жыцці старажытнейшых людзей? **4.** Успомніце асаблівасці палявання на статкавых жывёл і мамантаў.

§ 3. Узнікненне радавога грамадства

1. Удасканаленне чалавека ў выніку працоўнай дзейнасці. Выраб больш дасканалых прылад працы і карыстанне імі спрыялі развіццю самога чалавека. Здабыча агню, апрацоўка каменя, дрэва, косці, шыццё адзення рабілі больш спрытнымі чалавечыя рукі з добра развітым вялікім пальцам. З яго дапамогай людзі аднолькава зручна і дакладна карысталіся танюсенькай касцяной іголкай і цяжкімі каменнымі прыладамі.

Жыццё ўдасканальвала даследчыя здольнасці людзей. Ім трэба было трапна знаходзіць месцы, дзе раслі харчовыя і лекавыя расліны, вадзіліся жывёлы і дзе на іх зручна было паляваць.

Удасканаленне прылад працы, змяншэнне іх вагі дазволілі будаваць жыллё ў найбольш прыгодных умовах. Гэта значна павялічыла плошчу выкарыстання чалавекам прыродных багаццяў.

Загоннае паляванне патрабавала спрыту,

хуткасці і зладжаных дзеянняў дастаткова вялікіх па колькасці асоб калектываў. Да палявання на моцных і небяспечных статкавых жывёл трэба было папярэдне старанна падрыхтавацца. *Грамадскае жыццё рабілася складаным і зладжаным. Яно спрыяла развіццю розуму і мовы людзей.*

2. З'яўленне «чалавека разумнага». Прыкладна 30—40 тысяч гадоў таму назад склаўся чалавек сучаснай будовы і выгляду. За вялікія працоўныя здольнасці і валоданне асэнсаванай мовай яго сталі зваць **«чалавекам разумным».** У рост ён дасягаў 175 см, а аб'ём мозга стаў у два разы большым, чым у «чалавека ўмелага». Паходка зрабілася прамой і ўпэўненай.

Да гэтага часу людзі рассяліліся па ўсіх кантынентах, акрамя Антарктыды. Жыццё ў розных прыродных умовах стала адбівацца на іх знешнім выглядзе. «Людзі разумныя» сталі адрозніваццa паміж сабой па колеру скуры. Пачалі ўтварацца розныя **расы.** Так, у Афрыцы ўзнікла чарнаскурая раса. Еўрапейцы, у іх ліку і славяне, набылі белы колер скуры. Жоўтая раса стварылася ў Азіі.

3. Узнікненне мастацтва. Прыкладна 30 тысяч гадоў таму назад «чалавек разумны» пачаў займацца мастацкай дзейнасцю. Самыя старажытныя малюнкі розных памераў археолагі знайшлі ў цяжкадаступных скалістых пячорах на поўдні Францыі і Іспаніі. На сценах і столях пячор захаваліся шматлікія малюнкі такіх жывёл, як маманты, саблязубыя тыгры, алені, бізоны, кабаны, дзікія коні. Некаторыя карціны былі намаляваны некалькімі фарбамі прыроднага

паходжання — жоўтай, чырвонай, бурай, чорнай.

Старажытныя майстры навучыліся спрытна абіваць выступы і ўпадзіны на скалах, надаючы ім аб'ёмны знешні выгляд дзіка, мядзведзя ці іншай жывёлы.

Тут жа знойдзены зусім маленькія фігуркі дзікіх жывёл з рога і косці. Іх выразалі з дапамогай невялікіх, але вельмі вострых крамянёвых *разцоў* і *скрабкоў*.

Нават сучасных мастакоў здзіўляе высокі ўзровень мастацкай дасканаласці ў паказе дзікіх жывёл у сцэнах палявання. «Чалавек разумны» тых часоў меў вострую назіральнасць, добра ведаў асаблівасці цялеснай будовы жывёл і іх павадкі.

Заняткі мастацтвам дадатна спрыялі развіццю духоўных якасцей чалавека. Ён рабіўся больш добрым і спачувальным. Нас не можа не ўзрушыць, напрыклад, такі малюнак старажытнага мастака з Паўночнай Афрыкі: сланіха хобатам абараняе сланяня ад нападу львіцы.

Мастацкая дзейнасць чалавека — яшчэ адно адрозненне яго ад прадстаўнікоў жывёльнага свету.

4. Утварэнне радавых абшчын. З паяўленнем «чалавека разумнага» жыццё людзей было яшчэ вельмі цяжкім. Калі шанцавала, паляўнічыя здабывалі шмат мяса і шкур. Але вельмі часта яны заставаліся ні з чым. У такіх выпадках ад голаду маглі выратаваць толькі блізкія людзі, якія паспяхова займаліся збіральніцтвам ці *рыбалоўствам*. Людзі пачалі бачыць перавагу ў больш цесных і сталых сувязях паміж сабой. Сумесная праца і агульная барацьба з цяжкас-

цямі і небяспекамі спрыялі ператварэнню першабытнага статка ў пастаянны і добра арганізаваны калектыў. Так, прыкладна 30 тысяч гадоў таму назад утварыліся **роды**, ці **радавыя абшчыны**. Гэта групы людзей у 50—160 асоб, якія жылі ў вялікай пячоры ці ў некалькіх збудаваннях. Яны лічыліся сваякамі — *родзічамі*, таму што паходзілі ад аднаго продка.

Асноўным заняткам мужчын было паляванне, лоўля рыбы і вытворчасць прылад працы. Жанчыны збіралі карысныя расліны, гатавалі ежу, шылі адзенне са шкур. Яны гадавалі маленькіх дзяцей, якія з трох-чатырох гадоў дапамагалі дарослым. Дзеці збіралі плады, зерне, выкопвалі спажыўныя карані, падносілі сухое галлё да вогнішчаў.

Уся здабытая ежа і іншыя сродкі для існавання належалі ўсяму роду. Ежу справядліва размяркоўвалі паміж усімі родзічамі.

Для мастацтва гэтага часу характэрна распаўсюджванне касцяных і гліняных фігурак жанчын. Гэта сведчыць аб вялікай павазе да жанчыны-маткі, удзячнасці ёй за вельмі патрэбную і цяжкую працу на карысць усёй радавой абшчыне.

Вялікай павагай карысталіся і **старэйшыны** — самыя дасведчаныя і вопытныя члены роду. Яны вучылі моладзь, кіравалі вытворчасцю прылад працы, паляваннем, размеркаваннем здабычы.

Такім чынам, родам, ці радавой абшчынай, завецца калектыў сваякоў, якія паходзілі ад агульнага продка, супольна працавалі і мелі агульную маёмасць.

Такі парадак жыцця старажытных людзей, калі яны супольна працуюць, маюць агульную маёмасць і аб'ядноўваюцца ў статак ці род, называецца **першабытнаабшчынным ладам.** *Людзей гэтай пары называюць* **першабытнымі людзьмі.**

Род. *(Паводле Л. Г. Моргана)*

«...Такім чынам, род уяўляе сабой супольнасць кроўных сваякоў, якія паходзяць ад аднаго агульнага продка.

Першапачаткова сваякі былі звязаны адзін з адным мацярынскім паходжаннем. У старажытным родзе лік паходжання абмяжоўваўся жаночай лініяй. Род ахопліваў усіх такіх асоб, якія вялі паходжанне ад адной праматкі па жаночай лініі. Ён уключаў, такім чынам, гэту праматку з яе дзецьмі, дзяцей яе дачок і дзяцей яе патомкаў да бясконцасці...

Пры ліку паходжання па мужчынскай лініі род ахопліваў усіх асоб, якія вялі сваё паходжанне ад агульнага прапродка і яго дзяцей, дзяцей яго сыноў і дзяцей яго патомкаў па мужчынскай лініі да бясконцасці...»

? **1.** Якім чынам праца спрыяла ўдасканаленню чалавека? **2.** Чым «чалавек разумны» адрозніваўся ад «чалавека ўмелага»? **3.** Якім было самае старажытнае мастацтва? **4.** У чым радавая абшчына адрозніваласяад чалавечага статка? **5.** Як размяркоўваліся працоўныя абавязкі ў родзе?

Раздзел II.

Фарміраванне ўмоў для ўзнікнення першых цывілізацый

§ 4. Першыя земляробы і жывёлаводы

1. Пацяпленне на Зямлі і яго ўплыў на жыццё чалавецтва. Каля 13 тысяч гадоў таму назад на Зямлі значна пацяплела. На поўначы Еўропы пачаў раставаць *ляднік*. Тундры паволі зарасталі лясамі і хмызнякамі, больш паўнаводнымі рабіліся рэкі. Прывычныя да холаду жывёлы адышлі на поўнач. Зусім вымерлі маманты. Паступова вывеліся статкі вялікіх траваедных жывёл. Чалавек быў вымушаны перайсці да палявання на аленяў, дзікоў і іншых больш дробных звяроў. Людзі працягвалі займацца рыбнай лоўляй і збіраннем ягад, грыбоў, арэхаў, карысных раслін.

Вялікія змены ў клімаце і прыродным асяроддзі пачалі адбывацца ў краінах на поўдзень ад Еўропы, Пярэдняй Азіі і паўночнай Афрыкі. У ледавіковы перыяд вятры з поўначы зімой і ўлетку прыганялі сюды дажджавыя хмары. Тут было цёпла і вільготна. Быў багаты раслінны і жывёльны свет і добрыя ўмовы для палявання і збіральніцтва.

Але з пацяпленнем клімату амаль перасталі выпадаць дажджы ў Пярэдняй Азіі. Сталі высыхаць лясы і стэпы, знікаць рэкі і азёры. Пачалі ўтварацца такія вялікія сучасныя пустыні, як Аравійская і Сахара. Значна пагоршыліся ўмовы жыцця тубыльных людзей.

2. Новыя вынаходкі «чалавека разумнага». Каля 12 тысяч гадоў таму назад людзі навучыліся рабіць малюсенькія, памерам усяго ў 1—3 см, завостраныя крамянёвыя пласцінкі правільных геаметрычных форм. У археалогіі яны завуцца **мікралітамі,** што значыць *«маленькія апрацаваныя камяні»*.

Іх выраб спрыяў вынаходству *лука* і стрэл з маленькімі вострымі наканечнікамі. Паляўнічыя атрымалі меткую і дальнабойную прыладу, больш дасканалую, чым звычайнае кап'ё. З лука на адлегласці можна было забіваць як вялікіх, так і дробных жывёл і птушак.

У гэты час вынайшлі *сякеру,* прывязаўшы рубіла да драўлянай ручкі. З яе дапамогай секлі дрэвы і апрацоўвалі іх.

Для рыбнай лоўлі навучыліся вязаць *плыты,* а з тоўстых і доўгіх бярвён выдзёўбвалі *лодкі.* З дапамогай прылад з мікралітаў выразалі з косці рыбалоўныя кручкі, плялі сеткі.

Паляванню спрыяла прыручэнне *сабакі.* Ён высочваў і гнаў звера, пільна вартаваў сваіх гаспадароў і іх жыллё. *Сабака стаў першай хатняй жывёлай.*

3. Узнікненне земляробства. У розных месцах *Пярэдняй Азіі* і ў наш час сустракаюцца зараснікі дзікіх *ячменю* і *пшаніцы.* Старажытныя людзі рана звярнулі ўвагу на збожжавыя як на карысную і смачную ежу. Маючы цвёрдую абалонку, зерне добра захоўвалася. Археолагі ў вялікай колькасці знайшлі нажы для жніва. Лязо іх утваралі мікраліты, устаўленыя ў касцяныя ручкі.

Але каб прыгатаваць з зярнят ежу, трэ-

ба было абавязкова разбурыць абалонку, якая не пераварвалася ў страўніку. Для гэтага людзі ўжывалі каменныя *цёркі* і *ступкі*. Іх таксама знайшлі пры раскопках. Дзікія збожжавыя доўгі час збіраліся і ўжываліся мясцовымі жыхарамі.

Прыкладна 11 тысяч гадоў таму назад людзі навучыліся самі сеяць і збіраць збожжавыя.

Спачатку для апрацоўкі глебы карысталіся палкамі-капалкамі. Потым пачалі рабіць вузкія драўляныя *лапаты* і *матыкі* з наканечнікамі з рога і косці. Жалі *сярпамі* з рога і косці з каменнымі ўкладышамі.

У старажытным *земляробстве* самую цяжкую работу выконвалі мужчыны. Жанчыны рабілі ўсё астатняе. *З Пярэдняй Азіі земляробства распаўсюдзілася ў іншыя краіны.*

4. Прыручэнне жывёл. Паляванне з лукам і дапамогай сабакі спрыяла здабычы большай колькасці мяса. З'явілася магчымасць дакормліваць маладняк дзікіх жывёл непасрэдна каля жылля ў загонах з жэрдак. Гэта паскорыла прыручэнне жывёл.

Людзі з часам заўважылі, што козы і авечкі лёгка даюць прыплод у няволі. Яны і сталі першай хатняй жывёлай. Потым былі прыручаны каровы і свінні.

Поспехі земляробства спрыялі хуткаму выкормліванню хатніх жывёл. Гэта дазволіла пастаянна выкарыстоўваць іх мяса, малако, шкуры. Паступова паніжалася роля палявання ў жыцці «чалавека разумнага».

Жывёлаводства ўзнікла прыкладна ў той жа час, як і земляробства. Як сведчыць археалогія, вельмі рана з'явіліся народы,

якім адначасова было вядома земляробства і жывёлагадоўля. Іх адкрыццё з'яўляецца самым значным поспехам чалавецтва за ўсю яго гісторыю. Да гэтага часу людзі толькі карысталіся багаццямі Зямлі, беручы неабходнае для сябе з нежывой прыроды, расліннага і жывёльнага свету. *Земляробы і жывёлаводы сваім розумам і працай пачалі вырабляць самыя неабходныя для жыцця прадукты.*

5. Жыццё ў першых пасёлках земляробаў і жывёлаводаў. Амаль увесь год земляробы павінны былі працаваць на сваіх палях. Каля іх будавалі *ста́лае жыллё.* Спачатку гэта былі плеценыя з галін дрэў хаціны, абмазаныя глінай. Потым іх змянілі чатырохвугольныя глінабітныя збудаванні. У іх з камянёў і гліны рабілі ачагі. Адпаўшыя ад іх абпаленыя кавалкі гліны выкарыстоўвалі як першы посуд. Потым з гліны пачалі рабіць і абпальваць посуд для захавання вадкасцей, збожжа і варкі ежы.

Галоўным матэрыялам для вырабу асноўных прылад заставаўся камень. Каля 7 тысяч год назад яго навучыліся свідраваць, падсыпаючы пясок пад свідравальнік, зроблены з полай косці.

Людзі спрытна плялі карзіны, вяроўкі, сеткі з пруткоў, воласу, палосак скуры і інш. З пляцення развілося прадзенне з воўны і льну. З атрыманых нітак рабілі тканіны на даволі простым станку. З тканін шылі адзенне больш зручнае, чым са шкур.

6. Род і племя. Земляробства і жывёлагадоўля былі справай шматлікіх калектываў.

На малюнках старажытных людзей бачна, што першых пастухоў было больш, чым кароў. Вялікіх намаганняў патрабавала падрыхтоўка залежнай зямлі пад палі, будаванне агароджаў з бярвён і жэрдак.

Таму асобны род сам не мог праіснаваць. Ён жыў неразлучна з суседнімі свойскімі родамі, якія складалі **племя.**

Племя было мнагалюдным і складаным грамадствам. Яго галоўнымі справамі кіраваў **савет старэйшых людзей.** Яны азначалі месцы палявання для асобных родаў, выбіралі мясціны для новых палёў і выпасу хатніх жывёл. Старэйшыны ўладкоўвалі ўсе галоўныя жыццёвыя справы. Іх сумленнасць і сапраўды карысныя намаганні для ўсяго племені выклікалі давер і павагу людзей. Таму ўсе сапляменнікі дакладна выконвалі іх загады. Для рашэння найбольш значных для племені спраў старэйшыны склікалі **сход усіх дарослых мужчын.**

Прымітыўнае земляробства

«Некалькі дарожак накрэст падзялялі вялікі абгароджаны абшар на надзелы, на якіх узвышаліся вельмі акуратна размешчаныя, даволі высокія паўкруглыя клумбы. Яны мелі каля 75 см у дыяметры... У кожнай клумбе былі пасаджаны розныя расліны, такія, як: салодкая бульба, цукровы трыснёг, тытунь і шмат іншай зелені...

Клумбы насыпаны са старанна здробненай зямлі. Усяго гэтага дасягаюць, як я ўбачыў, вельмі проста, але з вялікімі намаганнямі, з дапамогай самых простых прылад: простага завостранага кала даўжынёй больш за 2 м... і вузкай лапаты ў 1 м даўжынёй.

І вось з чаго складаецца працэс апрацоўкі

[зямлі]. Двое, трое ці больш мужчын становяцца ў рад і ўсе разам утыкаюць свае калы як мага глыбей у зямлю. Потым таксама разам уздымаюць прадаўгаватую глыбу зямлі. Затым ідуць далей і вывальваюць цэлыя рады такіх глыб. Некалькі чалавек таксама пры дапамозе калоў разбіваюць гэтыя глыбы на драбнейшыя. За імі рухаюцца жанчыны... вузкімі лапатамі разбіваюць вялікія камякі зямлі, робяць клумбы і нават пераціраюць зямлю рукамі».

? **1.** Які ўплыў зрабіў канец ледніковага перыяду на жыццё чалавецтва? **2.** Якія поспехі адбыліся ў паляванні? **3.** Дзе і калі ўзнікла земляробства? **4.** Як узнікла жывёлагадоўля? **5.** За што паважалі племянных старэйшын?

§ 5. Канец радавога ладу

1. Адкрыццё металургіі. Першымі металамі, вядомымі чалавеку, сталі метэарытнае жалеза, самародныя золата і медзь. Раней за ўсё чалавек пачаў апрацоўваць самародную *медзь* метадам халоднай коўкі. Першыя медныя вырабы зроблены прыкладна 10 тысяч гадоў таму назад.

Потым медзь апрацоўвалі ў гарачым стане, куючы самародкі пасля нагрэву ў кастрышчах. Хутка заўважылі, што медзь даволі лёгка выплаўляецца з руды. Яе было зручна разліваць у раней зробленыя з гліны і каменя формы. Так пачалі адліваць тапары, кінжалы, упрыгожанні і іншыя вырабы.

З пачаткам апрацоўкі медзі канчаецца каменны век і адкрываецца ***век металаў.*** Пастаянны выраб меднай зброі і прылад працы пачынаецца ў Пярэдняй Азіі пры-

кладна 7 тысяч гадоў таму назад. У іншых краінах медны век пачаўся на некалькі тысячагоддзяў пазней.

Медзь у прыродзе сустракаецца даволі рэдка. Яна лічылася вельмі дарагім металам для вырабу розных рэчаў. Нягледзячы на мяккасць, медзь дала магчымасць рабіць больш дасканалыя прылады працы і зброю: лапаты, сярпы, пілы, наканечнікі коп'яў і стрэл. З медзі ўпершыню сталі рабіць цвікі, дрот, ліставы метал, трубы і інш.

Зламаныя каменныя прылады выкідвалі. А затупленыя медныя рэчы можна было перарабляць на новыя.

Здабыча медзі з руды і яе апрацоўка спрыялі ўзнікненню вельмі важнай прафесіі — кавальства.

2. Пераход да плужнага земляробства. Земляробы заўважылі, што ўраджаі павялічваюцца, калі сеяць зерне ў глыбокія доўгія барозны. Для іх атрымання некалькі чалавек цягнулі за сабой вялікую матыку, якую звалі *ручным ралам.* Потым да рала прымацавалі ручкі. Налягаючы на іх, можна было паглыбіць баразну. Так вынайшлі *плуг.* Пазней у плуг пачалі ўпрагаць быкоў ці аслоў.

Выкарыстанне цяглавай жывёлы спрыяла павелічэнню плошчы палёў і палепшыла якасць іх апрацоўкі. Значна ўзрасла ўраджайнасць.

Пераход да плужнага земляробства, як і здабыча і апрацоўка металаў, спрыялі павышэнню **вытворчасці працы.** *Так завецца колькасць прадуктаў працы, якую чалавек можа зрабіць у пэўны час.*

3. Узнікненне суседскіх абшчын. Распаўсюджванне плужнага земляробства змяніла адносіны паміж свойскімі сем'ямі ў радавых абшчынах. Асобныя сем'і атрымалі большую самастойнасць. Маючы цяглавую жывёлу і земляробчыя прылады, яны атрымалі магчымасць пракарміць сябе ўласнай працай.

Але захоўвалася абшчынная ўласнасць на зямлю, агульныя выпасы для жывёлы. Асобныя сем'і бралі драўніну, палявалі і збіралі расліны, ягады і грыбы ў абшчынных лясах.

Засталіся і сумесныя абавязкі па ператварэнню залежнай зямлі ў абшчынныя палі, збудаванню ірыгацыйных канаў, ахове калектыўнай маёмасці.

Перыядычна старэйшыны перадзельвалі абшчынную зямлю на асобныя сямейныя надзелы, якія апрацоўваліся кожнай сям'ёй уласнымі прыладамі працы і цяглавымі жывёламі. Сем'і самастойна збіралі ўраджай і самі карысталіся ім.

Так вялікія радавыя абшчыны пачалі дзяліцца на дробныя гаспадаркі асобных сямей. Свойскія адносіны паміж імі змяніліся на суседскія з агульнымі абавязкамі. Суседская абшчына прыйшла на змену радавой. Яе складалі сяляне-абшчыннікі, якія мелі свае гаспадаркі.

4. Пераход да качавога жывёлаводства. Паступова частка плямён адсялілася ў стэпы і пачала займацца тут выпасам жывёлы ў прыродных умовах.

З ростам пагалоўя статкаў жывёла хутка з'ядала стэпавую траву і племя мяняла месца выпасу. Разам з сабой перавозілі на

запрэжаных быкамі вазах жанчын, дзяцей і ўсю маёмасць. Жылі ў лёгкіх шатрах са шкур ці ў кібітках. *Так жывёлаводы пераходзілі да качавога стану жыцця.*

Пры зручных выпадках земляробы і качавыя пастухі абменьваліся прадуктамі сваёй працы. За хлеб і агародніну жывёлаводы аддавалі земляробам лішкі жывёлы, шэрсці і шкур.

Спачатку жывёла была агульнай маёмасцю качавых родаў. Потым статкі былі падзелены паміж родзічамі. Але пасьба заставалася сумеснай справай уладальнікаў жывёлы.

Поспехі ў земляробстве, жывёлагадоўлі і рамястве спрыялі хуткаму павелічэнню колькасці людзей на Зямлі. Паскорылася рассяленне чалавецтва амаль па ўсіх кантынентах.

5. Узнікненне няроўнасці паміж плямёнамі. Выдзяленне знаці. Асобныя земляробчыя і жывёлаводчыя плямёны жылі ў розных умовах. На Зямлі існуюць лепшыя і горшыя прыродныя асяроддзі, больш і менш урадлівыя глебы. Таксама рознай якасці былі выпасы для жывёлы. Таму з часам з'явіліся багатыя і бедныя плямёны. Грабежніцкія войны за землі і багацці становяцца звычнай з'явай. Ствараюцца саюзы сяброўскіх плямён.

Жыццё плямён перабудоўваецца на вайсковы лад. На першы план выходзяць *ваенныя правадыры.* Яны ва ўласных інтарэсах карыстаюцца перавагамі сваёй пасады і ваеннымі поспехамі. Ім дастаецца большая і лепшая частка ваеннай здабычы.

Багатыя ваенныя правадыры і старэй-

шыны складаюць пануючы пласт грамадства — *знаць*. Яны перадавалі сваю знатнасць, багацце і пасады ў спадчыну сваім сынам. Стан у грамадстве цяпер вызначалі не чалавечыя здольнасці і вопыт, а паходжанне са знатнай сям'і.

З часам знаць павялічыла свае багацці і ўстанавіла сваю ўладу над плямёнамі і сялянскімі абшчынамі.

Утварэнне новых плямён. *(Паводле Л. Г. Моргана)*

Новыя плямёны, роўна як і новыя роды, утвараліся пастаянна шляхам натуральнага прыросту колькасці сапляменнікаў. Гэта вельмі простая з'ява. Спачатку адбывалася паступовае перасяленне людзей з якога-небудзь густанаселенага племяннога цэнтра. Паколькі гэта працягвалася з года ў год, на некаторай адлегласці ад першапачатковага знаходжання племені збіралася значнае насельніцтва. З цягам часу інтарэсы і пачуцці перасяленцаў павінны былі адасобіцца. Потым узнікалі адрозненні ў мове. За гэтым надыходзіла раз'яднанне і незалежнасць, хаця тэрыторыі старога і новага плямён гранічылі паміж сабой. Так утваралася новае племя.

? **1.** Як спрыялі вытворчасці працы апрацоўка медзі і вынаходства плуга? **2.** Што садзейнічала ўзнікненню суседскіх абшчын? **3.** Як з'явілася племянная знаць?

§ 6. Уяўленні першабытных людзей аб навакольным свеце

1. Першыя людзі ў прыродным асяроддзі. Старажытнейшыя людзі не адчувалі сваёй перавагі над жывёламі, раслінамі і нежывой прыродай. Яны верылі, што камні рас-

туць і, як жывёлы, здольны нараджаць падобных да сябе. Былі ўпэўнены, што жывёлы і расліны маюць сваю мову і гутараць паміж сабой.

Уся прырода была для першых людзей велізарнай жывой істотай, якая ўсё добра адчувала. Яна магла быць як у лагодным настроі, так і злавацца ў адказ на паводзіны нават асобнага чалавека. Людзі былі ўпэўнены, што з часам яны могуць ператварыцца ў розных жывёл і раслін. Такія ўяўленні аб прыродзе захоўваліся доўгі час.

Нават з утварэннем радавога ладу людзі верылі, што продкамі асобных родаў сталі пэўныя жывёлы і расліны. Так узніклі такія назвы, як, напрыклад, род бусла, ваўка, аленя. Калі аднойчы вучоны паказаў тубыльцу Аўстраліі фотакартку яго сародзіча, той упэўнена сказаў: «Гэта такі ж кенгуру, як і я».

2. Веды і ўменні старажытных людзей. Ужо збіральнікі і паляўнічыя добра ведалі карысныя і шкодныя расліны, шляхі пераходаў, павадкі і месцы знаходжання жывёл. Разгадвалі іх сляды. Ноччу знаходзілі дарогу па зорках. Ім былі вядомы змены пор года. Ведалі прыкметы перамен надвор'я.

З ужываннем раслінных, жывёльных і мінеральных сродкаў яны лячылі страўнікавыя захворванні, прастуды, залечвалі раны, пераломы касцей. Навучыліся рабіць халодныя і гарачыя прымочкі, ратавалі жыццё пры атрутных укусах, выдалялі хворыя зубы.

У мове старажытных людзей былі тысячы назваў розных жывёл, птушак, змей, дрэў, траў, розных камянёў. Але яны не

вельмі хутка лічылі. Марудна складалі і множылі. Лепш было з дзяленнем. З гэтым дзеяннем яны часцей сутыкаліся ў жыцці пры падзеле здабычы.

У навакольнай прыродзе яны ведалі як усё карыснае, так і шкоднае і небяспечнае.

Здольнасці першабытных людзей. *(Пра тубыльцаў Аўстраліі)*

Іх умельства высачыць жывёлу добра вядома. Аднак цяжка ўявіць сабе ўсё майстэрства ў гэтай справе, калі не бачыць іх за гэтай працай. Тубылец не толькі імгненна распазнае сляды жывёл і птушак.

Паглядзеўшы на напрамак свежых слядоў ці панюхаўшы ўваход у нару, ён можа адразу адказаць, ці ёсць там жывёла.

З самага ранняга дзяцінства хлопчыкі і дзяўчынкі практыкуюцца ў вызначэнні кожнага следу, пакінутага любой жывой істотай. Жанчыны часта забаўляюцца, з выключнай дакладнасцю малюючы рукамі на пясчанай глебе сляды розных жывёл.

Веданне імі раслін і спосабаў іх выкарыстання з'яўляецца сапраўды чаруючым. Тубылец у любой мясцовасці краіны заўсёды знаходзіць выйсце з цяжкага становішча, тады як іншаземец скарэй за ўсё памёр бы ў неабсяжных стэпах.

3. Узнікненне рэлігіі ў першабытных людзей. «Чалавек разумны» працягваў існаваць у вельмі жорсткіх прыродных умовах. Шмат людскіх жыццяў забіралі эпідэміі небяспечных хвароб, магутныя паводкі, вывяржэнні вулканаў, землетрасенні.

У час навальніц ад маланак пачыналіся велізарныя пажары, якія нішчылі ўсё жывое на вялікіх лясных абшарах. Марскія

штормы і ўраганы заўсёды былі небяспечнымі для рыбакоў. Калі статкі жывёл знікалі з акружэння паляўнічых, надыходзіла галодная смерць.

Чалавек не разумеў прыродных прычын, якія выклікалі гэтыя магутныя небяспечныя з'явы. Але ён імкнуўся дадумацца да іх вытокаў. Гэта прывяло да веры ў *звышнатуральныя істоты,* якія кіруюць усімі страшэннымі прыроднымі з'явамі і жыццём людзей. Яны сталі імкнуцца задобрыць гэтых магутных уладароў сусвету. Так пачалі ўзнікаць першабытныя рэлігійныя вераванні.

Людзям здавалася, што ўся прырода населена нябачнымі магутнымі духамі, ці дэманамі. Самыя моцныя з іх атрымалі назву *багоў.*

З адкрыццём земляробства і жывёлагадоўлі змяніліся рэлігійныя ўяўленні. Галоўнае месца сярод шматлікіх багоў занялі тыя, хто спрыяў поспеху ў гэтых занятках. Адным з іх стаў бог Сонца, ад якога залежала зямная цеплыня. Лічылі, што бог навальніц і грому даруе неабходную для палявых раслін вільгаць. З'явіліся ўяўленні аб багах, якія спрыялі пастухам і жывёлагадоўлі.

Першабытныя вераванні. *(Сведчанне эскімоса вучонаму)*

Мы не веруем, мы баімся. Мы баімся духа зямлі, які выклікае непагадзь і вымушае нас з боем выдзіраць ежу ў мора і зямлі. Мы баімся багіні месяца. Мы баімся галечы і голаду ў халодных хібарах са снегу. Мы баімся вялікай жанчыны, якая жыве на дне мора і пануе над марскімі жывёламі. Мы

баімся хваробы, якую заўсёды сустракаем каля сябе.

Не смерці мы баімся, а пакуты. Мы баімся зламысных духаў жыцця, паветра, мора, зямлі, якія здольны дапамагчы злым ведзьмарам зрабіць шкоду людзям.

Мы баімся духаў пакойнікаў, як і духаў жывёл, якіх мы забілі. Мы баімся ўсяго, што бачым вакол сябе. Мы баімся ўсіх нябачных рэчаў, якія таксама вакол нас.

4. Вобразы старажытных багоў. Багі ўяўляліся першабытным людзям у самым фантастычным выглядзе. Гэта відаць па каменных фігурах, якія знаходзяць археолагі. Падобныя драўляныя постаці бачылі этнографы ў першабытных народаў сучаснасці.

Фігуры першабытных багоў звычайна завуцца *ідаламі,* ці істуканамі.

Яны мелі чалавечы выгляд, але з наўмысна змененым абліччам. Былі ідалы з велізарнай галавой і зусім маленькім тулавам жанчыны ці мужчыны. Былі і са страшэнным выразам твару з вялікім ротам і шматлікімі выскаленымі зубамі. Сустракаліся ідалы з тулавам чалавека і галовамі звера, кракадзіла, рыбіны.

Людзі звярталіся да такіх багоў з просьбамі, якія завуцца **малітвамі.** Малітвы мелі самы просты жыццёвы сэнс. Чалавек прасіў поспеху ў паляванні, дажджу ў час засухі, выратавання ад голаду і хвароб.

Лічылася, што багі маюць звычайныя людскія патрэбы, што і ім трэба есці і піць. Таму да ідалаў прыносілі жывёл, збожжа, іншую ежу. Ахвяравалі і людзей, забіваючы іх каля ідала.

5. З'яўленне веры ў душу чалавека. Асваен-

не сельскай гаспадаркі і рамяства, пераход да аселасці значна палепшылі жыццё людзей. З'явілася больш часу для разумовай дзейнасці, і чалавек пачаў імкнуцца атрымаць адказы на галоўныя пытанні жыцця. Яго стала цікавіць, чаму людзі паміраюць. Чаму спячы нагадвае пакойніка? Чаму падобна на смерць страта прытомнасці пры хваробе ці пры сутыкненні з дзікім зверам?

Але чалавек, які спаў, прачынаецца і памятае, што ён бачыў у сне. Той, хто губляе прытомнасць, вяртаецца да жыцця. А памёршыя назаўсёды расстаюцца з ім.

Узнікла ўяўленне, што ў целе чалавека знаходзіцца галоўная ўмова жыцця — яго *душа*. Яна нябачная, падобная на паветра. Душа можа пакінуць чалавека часова — тады ён засынае ці траціць прытомнасць. З адлётам душы назаўсёды — чалавек памірае. Яго душа атрымлівае самастойнае існаванне і можа перасяляцца ў іншых людзей, жывёл і нават раслін. Такія першабытныя ўяўленні аб чалавечай душы атрымаюць развіццё ў рэлігіях старажытных цывілізацый.

Такім чынам, у заключную пару першабытнаабшчыннага ладу чалавецтва асвоіла земляробства, жывёлагадоўлю і вытворчасць металічных рэчаў. Гэта галоўныя ўмовы для ўзнікнення старажытных цывілізацый.

Слоўнік.

Эпідэмія — шырокае распаўсюджанне якой-небудзь заразнай хваробы.

Шторм — моцны вецер, бура на моры, акіяне.

Ураган — вецер разбуральнай сілы.

Фантастычны — створаны ўяўленнем, неверагодны, выдуманы.

? 1. Назавіце асноўныя здольнасці першабытнага чалавека. 2. У якіх умовах складаліся першабытныя вераванні людзей? 3. Якімі ўяўляліся старажытнаму чалавеку вобразы першых багоў? 4. Што спрыяла ўзнікненню ўяўлення аб чалавечай душы?

Лічэнне гадоў у гісторыі

1. Як лічылі час у старажытнасці. Неабходнасць ліку часу разумеў яшчэ першабытны чалавек. Ад гэтага залежала ўся яго гаспадарчая дзейнасць. Таму і лік часу вялі ў сувязі з гаспадарчымі справамі. Годам лічылі прамежак часу паміж зборамі ўраджаю ці з'яўленнем новай травы на выпасах.

Потым людзі заўважылі, што лік часу можна весці па Сонцу ці Месяцу. Спачатку так лічылі толькі дні (ад усходу да заходу Сонца) і месяцы (ад поўні да поўні), а затым і гады.

З цягам часу ўзнікалі новыя сістэмы ліку часу. Пачалі адлік часу ад асабліва памятнай падзеі. Год, у якім адбылася такая падзея, лічыўся першым. Наступныя гады былі другім, трэцім і так далей.

Быў распаўсюджаны і лік часу па гадах праўлення цароў. У розных краінах быў розны лік гадам. Гэта было вельмі нязручна.

2. Сучасны лік часу ў гісторыі. Наша эра. Каля дзвюх тысяч гадоў назад, адпаведна паданню, нарадзіўся Ісус Хрыстос. Таму ад года яго нараджэння і вядуць сучасны адлік часу. Усё, што адбылося пасля нараджэння Ісуса Хрыста, завецца **нашай эрай,**

а скарочана пішацца **н. э.** Калі мы чытаем 1945 ці 1067 год, то значыць, што столькі год нашай эры адбылося.

Але шмат падзей было да нараджэння Ісуса Хрыста. Лічыцца, што яны адбыліся да **нашай эры,** а пішацца да **н. э.**

Да нашай эры адлік гадоў ідзе ў адваротны бок. Напрыклад: пісьмо ўзнікла 3 тысячы гадоў да н. э. Ці амаль 5 тысяч гадоў назад, таму што гадоў нашай эры адбылося амаль дзве тысячы. Сто гадоў у гісторыі называюць **стагоддзе,** а дзесяць стагоддзяў — **тысячагоддзе.**

Задачы да ліку гадоў у гісторыі. 1. Які год быў раней: 50 год да н. э. ці 50 год н. э.? **2.** Рым быў заснаваны ў 753 годзе да н. э. Колькі гадоў назад адбылася гэта падзея? Колькі стагоддзяў? **3.** Вялікае егіпецкае царства ўтварылася каля 1500 года да н. э., а дзяржава Аляксандра Македонскага — каля 325 года да н. э. Колькі часу прайшло паміж гэтымі падзеямі? **4.** Рым быў заснаваны ў 753 годзе да н. э., а Мінск — у 1067 годзе н. э. На колькі гадоў Рым старажытнейшы за Мінск? На колькі стагоддзяў?

Частка другая. Цывілізацыі Старажытнага Усходу

Аддзел I. Старажытны Егіпет

§ 7. Прырода і насельніцтва Старажытнага Егіпта

1. Геаграфічнае становішча Старажытнага Егіпта. Граніцы краіны акрэсліла сама прырода *Паўночна-Заходняй Афрыкі.* Амаль дакладна з поўдня на поўнач цячэ самая доўгая рака свету — *Ніл.* Яго *даліна* вузкая, шырыня вагаецца ад 1 да 20 км.

З захаду і ўсходу да берагоў ракі блізка падыходзяць невысокія горы. За імі на тысячы кіламетраў цягнуцца вялікія пустыні.

Каля 200 км да ўпадзення ў *Міжземнае мора* Ніл раздзяляецца на некалькі рукавоў, і ўтвараецца шырокая пладаносная даліна. Яна мае выгляд раўнабедранага трохвугольніка, падобнага на грэчаскую літару дэльта. Таму так і завуць з даўніх часоў Паўночны Егіпет.

У 1200 км на поўдзень ад Міжземнага мора на плыні Ніла ўзвышаюцца каменныя скалы, ці *парогі.* У старажытнасці яны былі вялікай перашкодай для плавання ў паўднёвыя краіны.

У гістарычны час былі населены толькі даліна і дэльта Ніла. Дажджы ў Егіпце амаль не выпадаюць. Ніл з'яўляецца адзінай крыніцай вільгаці. Таму ўжо некаль-

кі тысячагоддзяў не забываецца трапны выраз, што «Егіпет ёсць падарунак ракі Ніл».

2. Роля Ніла ў жыцці егіпцян. Старажытныя егіпцяне не ведалі, што Ніл мае два вялікія вытокі — Белы і Блакітны Ніл. Яны пачынаюцца ў далёкіх краінах *Усходняй* і *Сярэдняй Афрыкі*.

Невядома было ім і тое, чаму так хутка і шырока разліваецца рака з сярэдзіны ліпеня па верасень пры зусім блакітным небе. У гэты час надыходзіць лета ў афрыканскіх краінах. Пачынаецца пара цёплых ліўняў і раставання горных леднікоў. Буйная вада цераз усе парогі імкліва цячэ на поўнач. Яна нясе з сабою вялікую колькасць шматкоў трапічнай расліннасці. Вада набывае прывабны зялёны колер.

Потым воды расталых леднікоў прыносяць у Ніл распушчаныя ў вадзе горныя мінералы чырвонага колеру. Вада ракі хутка чырванее.

У час паводкі ўзровень вады ў Ніле ўздымаўся ў некаторыя гады да 14 м. За чатыры месяцы вада прыносіла ў даліну вялікую колькасць прыродных угнаенняў. Яны асядалі на залітыя вадой палі. Толькі ў сярэдзіне лістапада рака ўваходзіць у свае звычайныя берагі. Тады і пачыналася сяўба, ураджай збіралі вясной.

За тысячагоддзі паводкі стварылі ў вузкай даліне Ніла магутны пласт мяккай урадлівай глебы бліскучага чорнага колеру. Таму жыхары звалі сваю краіну «Чорнай зямлёй» у адрозненне ад навакольных каменна-пясчаных пустынь.

3. Засяленне даліны Ніла. Але не адразу краіна стала заможнай і прыветлівай для

людзей. Яшчэ 8—10 тысяч гадоў таму назад клімат Паўночнай Афрыкі быў не такі сухі, як пазней. У час апошняга ледніковага перыяду тут пастаянна выпадалі дажджы, былі багатая расліннасць і жывёльны свет. Вадзіліся сланы, жырафы, антылопы, страусы, буйвалы.

З захаду, з боку Сахары, у Ніл упадалі паўнаводныя прытокі. Тады яго даліна была вялікім балотам. Тут ляталі хмары камароў, разносячы на суседнія прасторы ліхаманку. Было многа драпежных звяроў, атрутных змей, крыважэрных і бязлітасных кракадзілаў, магутных і не менш небяспечных бегемотаў.

Прыкладна 6—7 тысяч гадоў таму назад у Паўночнай Афрыцы амаль перасталі выпадаць дажджы. Стала знікаць буйная расліннасць. Стэпы пачалі ператварацца ў пустыні.

Плямёны мясцовых жыхароў перасяляюцца на ўсход, бліжэй да вільготнай даліны Ніла. Спачатку яны засялілі берагі заходніх яго прытокаў, дзе захавалася расліннасць і вадзілася дзікая жывёла. Потым былі асвоены краі нільскай даліны як афрыканскімі плямёнамі, так і прышэльцамі з Пярэдняй Азіі. Ужо ў V—IV тысячагоддзях да н. э. яны жылі асела, сеялі ячмень і пшаніцу, гадавалі быкоў, авечак, свіней.

Перасяленне людзей на берагі Ніла стала магчымым з пачаткам вытворчасці медных прылад працы. Асобныя плямёны насыпалі гаці, капалі абвадняльныя канавы, рабілі вадасховішчы. Так пачаўся пераход да абвадняльнага земляробства. Гэта значна змяніла жыццё нільскіх плямён, якія

сталі хутка ператварацца ў сельска-суседскія абшчыны. Павелічэнне ўраджайнасці дазволіла збіраць збожжа і гадаваць жывёлы больш, чым было неабходна для жыцця.

Пераход да абвадняльнай сельскай гаспадаркі паскорыў узнікненне старажытнаегіпецкай цывілізацыі.

4. Прыродныя багацці краіны. Акрамя мяккай глебы, урадлівасць якой абнаўлялася кожны год пасля паводкі, Егіпет меў і іншыя прыродныя багацці. У гарах паблізу ад даліны было шмат розных парод каменя. Яго выкарыстоўвалі ў будаўніцтве, рабілі прылады працы і ўпрыгожанні. З каменя егіпцяне рабілі самыя вялікія ў свеце скульптуры вагой да 1000 тон.

Шмат медзі здабывалі на *Сінайскім паўвостраве* і ў гарах на ўсход ад даліны Ніла. На паўднёвых межах Егіпта знаходзілі вельмі многа золата.

З гліны рабілі пасуду. У будаўніцтве шырокае прымяненне атрымала гліняная цэгла.

Егіпцяне шырока выкарыстоўвалі трыснёг, у асаблівасці — **папірус.** З яго вязалі лодкі, ужывалі ў будаўніцтве. Потым навучыліся рабіць значна распаўсюджаны ў старажытнасці матэрыял для пісьма. Маладыя пабегі папірусу скарыстоўвалі ў ежу.

Але ў Егіпце вельмі рана зніклі лясы. Драўніну прывозілі з далёкіх краін Азіі і Афрыкі. Здалёк прывозілі серабро, волава, жалеза.

У дэльце і ў гістарычны час вадзіліся бегемоты, кракадзілы, дзікі, было шмат птушкі. Ніл кішэў рыбай.

З глыбокай старажытнасці егіпцяне вельмі ўдала выкарыстоўвалі прыродныя багацці сваёй краіны.

Егіпет перад паводкай Нілу. *(Паводле П. Мельгунова)*

Трэба бачыць Егіпет у пару найбольшага спаду вады ў Ніле, каб зразумець, што зрабілася б з гэтай краінай, калі б яна пазбавілася сваёй кармілiцы-ракі. Да гэтага часу ўзровень вады ў Ніле зніжаецца да такой ступені, што ён далёка спадае ў свае вузкія берагі. Яго мутныя, глеістыя, лянівыя воды зусім пазбаўляюцца ўсякага руху. Абодва берагі ператвараюцца ў пясчаныя мелі ці крутую чорную гразь, да апошняй ступені перасохшую і патрэсканую на сонцы. За імі няма нічога, акрамя пяску і голай бязводнасці пустыні.

Слоўнік.

Мінера́л — прыроднае рэчыва, звычайна цвёрдае, якое ўваходзіць у склад зямной кары.

? **1.** Якую ролю адыгрываў Ніл у жыцці старажытных егіпцян? **2.** Як была заселена людзьмі даліна Ніла? **3.** Назавіце галоўныя прыродныя багацці Егіпта.

§ 8. Асноўныя заняткі старажытных егіпцян

1. Удасканаленне абвадняльнага земляробства. Старажытнейшыя егіпцяне засялілі далёка не ўсю даліну Ніла. Значная яе частка была пакрыта балотамі, заросшымі трыснягом і хмызняком. Асабліва шмат іх было ў дэльце.

Вялікія плошчы зямлі ў даліне засыпалі пяскі пустыні. Для атрымання дастатко-

вай колькасці ўрадлівых глеб трэба было выканаць вялікую папярэднюю работу. Гэту складаную задачу паспяхова вырашылі сваімі намаганнямі многія пакаленні егіпцян.

Для асушэння балот спачатку высякалі хмызнякі. Потым гэтыя нізіны агароджвалі валам з гліны, перамешанай з сечаным трыснягом. У гэтым вале рабіліся вароты. У час паводкі праз іх прапускалася толькі неабходная для паліву вада.

У патрэбных выпадках капаліся каналы да тых урадлівых мясцін, куды не даходзіла паводка.

Даліну Ніла паміж берагамі ракі і ўзвышшамі пустыні дзялілі падоўжнымі і папярэчнымі насыпамі і валамі на прамавугольнікі. У час разліву Ніла яны запаўняліся вадой. Праз некалькі месяцаў рачны глей асядаў. Калі была патрэба, праз вароты і каналы спускалі ў Ніл лішак вады.

Абвадняльныя каналы і іншыя збудаванні часта бурыла паводка. Іх пастаянна засыпаў пясок з пустыні. Таму яны патрабавалі догляду і ўзнаўлення. Гэта цяжкая праца егіпецкіх земляробаў спрыяла атрыманню высокіх ураджаяў.

2. Земляробства — галоўны занятак егіпцян. З удасканаленнем абваднення сельская гаспадарка дасягае больш высокага ўзроўню. Галоўнымі земляробчымі культурамі былі збожжавыя — ячмень і пшаніца. Пад іх выкарыстоўвалі глебы непасрэдна па берагах Ніла, якія добра абвадняліся паводкай. Іх таксама сеялі на высокіх землях з ужываннем вільгаці спецыяльна пракапаных каналаў.

Мяккія вільготныя глебы Егіпта добра апрацоўваліся звычайнай матыкай і лёгкім драўляным ралам. Вельмі простай была сама сяўба. Пасля высеву зерня ў глебу па полю праганялі авечак, ці коз, ці свіней. Яны ўтоптвалі зярняты ў глебу. Потым матыкамі жанчыны прыкопвалі тыя зярняты, якія засталіся на паверхні глебы.

Жалі толькі адны каласы. Малацілі з дапамогай жывёл, праганяючы іх па раскладзеным на ўтрамбаванай зямлі калоссі.

Звычайна на мяжы з пустыняй разбівалі сады і агароды. Для іх паліву капалі калодзежы і сажалкі. Расцілі фінікавыя пальмы, інжыр, вінаград, гранаты, яблыні. З агародніны былі вядомы цыбуля, часнок, салат, агуркі, рэдзька, рэпа.

Важнай земляробчай культурай быў лён, таму што ўсе егіпцяне насілі палатнянае адзенне і ўжывалі ў ежу льняны алей. З хатніх жывёл выключнае значэнне мелі аслы і буйная рагатая жывёла. Іх гадавалі не толькі для атрымання мяса і малака. Яны шырока выкарыстоўваліся пры земляробчых работах і для перавозкі цяжараў. Разводзілі коз, авечак, свіней. У птушніках трымалі гусей, качак, курэй.

Егіпцяне сталі першымі ў свеце пчалярамі. Яны ўмелі рабіць вуллі, садзіць у іх пчол і качаць мёд.

Вольныя земляробы складалі большасць насельніцтва краіны. Але жылося ім нялёгка. Улады забіралі значную частку ўраджаю.

Лёс селяніна. *(Паводле П. Мельгунова)*

Чарвяк з'ядае палову ячменю, бегемот астатняе.

Шмат у полі мышэй, налятае саранча, есць скаціна, крадуць вераб'і. Гора селяніну! Што засталося ў гумне — знеслі зладзеі.

А тут зыходзіць на бераг пісар. Ён хоча забраць ураджай. Яго прыслужнікі з палкамі, а негры з плёткамі. І кажуць: «Давай ячмень!» А яго ўжо няма.

Тады яны пачынаюць біць селяніна. Потым звязалі і кінулі ў калодзеж. Спусцілі ўніз галавой. Скруцілі жонку і дзяцей. Яго суседзі ад страху разбягаюцца.

3. Рамёствы і абмен у Егіпце. Збор высокіх ураджаяў, павелічэнне колькасці жывёлы спрыялі адыходу часткі егіпцян ад земляробства і жывёлагадоўлі. Яны перайшлі да іншых працоўных заняткаў, у якіх з'явілася патрэба. Гэта, напрыклад, выплаўка і апрацоўка медзі, вытворчасць складаных прылад працы, зброі, упрыгожанняў, лодак. Выканаўцаў гэтых спраў завуць *рамеснікамі*.

З пачаткам выкарыстання металаў вялікім попытам карысталіся прадукты працы металургаў. На ўсход ад даліны Ніла ўзніклі іх сталыя пасяленні ля медных залежаў.

Рамесная справа даволі складаны занятак. Ёй трэба доўга вучыцца. Звычайна бацькі перадавалі сакрэты рамяства дзецям з ранняга ўзросту.

Узнікла неабходнасць у абмене прадуктамі працы паміж земляробамі, жывёлаводамі і рамеснікамі. Для абмену таварамі патрэбны сродкі перамяшчэння. У Егіпце выдатным шляхам зносін быў Ніл. Па ім увесь год на лодках перавозілі збожжа, пра-

дукты жывёлагадоўлі, медзь, драўніну і рамесныя вырабы.

Рамеснікам было зручна сяліцца ў тых месцах, дзе было лягчэй выменяць свае вырабы на ўсё неабходнае. Так па берагах Ніла ўзнікаюць і множацца гарады.

Такім чынам, ужо ў IV тысячагоддзі да н. э. егіпцяне дабіліся вялікіх поспехаў ў вытворчасці ўсяго самага неабходнага для жыцця. Яны дасягнулі парога цывілізацыі.

Слоўнік.

Інжыр — паўднёвае дрэва з сакавітымі салодкімі пладамі.

? **1.** Якім чынам егіпцяне пераўтварылі даліну Ніла на сваю карысць? **2.** Якія расліны і жывёлы разводзіліся егіпцянамі? **3.** Як у Егіпце пачаўся абмен таварамі?

§ 9. Утварэнне дзяржавы ў Старажытным Егіпце

1. Канец першабытнаабшчыннага ладу ў Егіпце. З пераходам да аселасці і асваеннем абвадняльнага земляробства значна змянілася жыццё нільскіх плямён. Яны сталі ператварацца ў сельска-суседскія абшчыны. Былыя племянныя правадыры і радавыя старэйшыны захавалі права кіравання абшчынамі.

Зямля племені была падзелена паміж асобнымі сем'ямі. Яны мелі ўласныя прылады працы і жывёлу. Самастойна апрацоўвалі свае палі і збіралі ўраджай, частку якога аддавалі на карысць усёй абшчыне.

Пад кіраўніцтвам правадыроў і старэй-

шын намаганнямі ўсёй абшчыны ствараюцца і абнаўляюцца абвадняльныя збудаванні.

З цягам часу даліна Ніла была густа заселена, з'явіліся заможныя і бедныя абшчыны. Паміж імі пачынаюцца жорсткія кровапралітныя войны за багацці і зямлю.

Ад тых часоў захаваліся малюнкі на каменных дошчачках. На іх бачны ваенныя сутычкі на сушы і вадзе, шматлікія статкі захопленай жывёлы, доўгія чэргі звязаных вяроўкамі палонных. Раней палонных забівалі. Калі праца людзей стала больш прадукцыйнай, палонным захоўвалі жыццё і ператваралі іх у рабоў. Рабоў егіпцяне звалі *«жывыя забітыя»*.

У гэтай доўгай, упартай барацьбе моцныя абшчыны падпарадкоўваюць сабе слабейшых суседзяў. З'яўляюцца буйныя аб'яднанні абшчын на чале з правадыром мацнейшай з іх. Ён ператвараецца ў *цара* невялікай *дзяржавы*. Цэнтрам яе рабіўся ўмацаваны горад, дзе быў царскі палац, *храм* галоўнага бога гэтай мясцовасці, *кірмаш*. Тут жылі і працавалі рамеснікі, стаяла царскае *войска*.

Усяго к канцу VI тысячагоддзя да н. э. было больш за сорак падобных дзяржаў. Іх насельніцтва складалася са знатных людзей, вольных грамадзян рознай заможнасці і рабоў.

2. Узнікненне адзінай егіпецкай дзяржавы. Бесперапынныя войны шматлікіх маленькіх егіпецкіх дзяржаў працягваліся некалькі стагоддзяў. Яны скончыліся ўтварэннем дзвюх вялікіх дзяржаў, якія падзялілі ўсю краіну. Гэта *Ніжнеегіпецкае* і

Верхнеегіпецкае царствы. Першаму належала дэльта, а другому ўвесь паўднёвы Егіпет. Цары паўночнага царства насілі *карону* белага колеру, а паўднёвага — чырвонага. З утварэннем адзінай дзяржавы злучаная чырвона-белая карона гэтых царстваў стала знакам царскай улады да канца старажытнаегіпецкай гісторыі.

Каля 3000 г. да н. э. паўднёвы цар **Міна** захапіў Ніжнеегіпецкае царства. Так узнікла адзіная егіпецкая дзяржава.

На поўдні дэльты ён пабудаваў сталіцу — горад **Мемфіс.** Ад другой назвы гэтага горада — **Хет-ка-Птах** — і паходзіць слова «Егіпет».

Паводле ўяўленняў егіпцян, іх цар быў жывым богам. Таму асабовае імя цара лічылася святым і вымаўляць яго ўголас забаранялася. Цара звалі *пер-о,* што значыць «Вялікі дом», ці «Царскі палац». Ад *пер-о* і ўтварылася слова *«фараон»*. Так звычайна тытулуюць старажытнаегіпецкіх цароў.

Фараоны мелі бязмежную ўладу. Іх загады выконвалі тысячы чыноўнікаў розных рангаў.

3. Будаўніцтва пірамід. Нямымі сведкамі незвычайнай магутнасці егіпецкіх уладароў з'яўляюцца *піраміды.* Гэта збудаванні, дзе хавалі памершых фараонаў. Кожны старажытнаегіпецкі фараон пачынаў будаваць піраміду адразу пасля прыходу да ўлады. І будаваліся яны дзесяцігоддзямі. Да нашага часу ў добрым стане захаваўся першы цуд старажытнага свету — вялікая піраміда фараона **Хеопса.** Гэта самае вялікае збудаванне з каменю, зробленае за ўсю гісторыю чалавецтва. Піраміда мае вы-

шыню 146 м і складзена з 2300 тысяч велізарных гранёных глыб. Самыя лёгкія з іх важаць не меней чым 2,5 тоны. Вага самых цяжкіх дасягае 15 тон.

Уражвае не толькі сама велізарнасць гэтага гмаху, але і дасканаласць працы будаўнікоў. Камяні так шчыльна падагнаны адзін да аднаго, што паміж імі немагчыма прасунуць і ляза нажа.

І ў наш час дакладна невядома, як толькі з дапамогай медных, каменных і драўляных прылад працы егіпцяне будавалі піраміды.

Старажытны гісторык Герадот напісаў аб тым, як будавалі піраміду Хеопса. Узводзіць піраміду прымусілі ўсіх егіпцян. Былі нават зачынены храмы і спынены службы багам. Камень, здабыты ў каменяломнях на ўсходнім беразе Ніла, людзі павінны былі цягнуць да ракі. Там яго грузілі на караблі і перавозілі на другі бераг Ніла. Адтуль іншыя людзі дастаўлялі будаўнічы матэрыял да месца ўзвядзення піраміды. Пастаянна ў будоўлі працавала 100 тысяч чалавек. Праз кожныя тры месяцы іх мянялі на новых.

Толькі дзесяць гадоў будавалі дарогу, па якой дастаўлялі камень ад каменяломень. Саму піраміду складалі 20 гадоў.

У наш час па вузкаму ходу можна прайсці да памяшкання, дзе быў пахаваны Хеопс. Зараз там пуста. Амаль усе піраміды былі абкрадзены яшчэ ў старажытнасці.

Побач з пірамідай Хеопса высечаны з адной скалы сфінкс — статуя льва з галавой чалавека. Ён мае твар аднаго з *фараонаў*. Вышыня сфінкса большая за 20 мет-

раў, даўжыня тулава — 57 метраў. Ён мае жудасны выраз твару. З глыбокай старажытнасці яго завуць «бацькам жаху».

Будаўніцтва пірамід прынесла шмат пакут простым егіпцянам. Таму тысячагоддзямі трывала захоўвалася ў памяці народа самае нядобрае ўяўленне аб Хеопсе.

Слоўнік.

Чынóўнік — чалавек, які знаходзіцца на службе па кіраванню дзяржавай.

Пірамі́да — вялікае каменнае збудаванне з чатырохвугольнай асновай і зыходзячыміся ўверсе трохвугольнымі гранямі.

! **1.** У якіх абставінах складаліся сельска-суседскія абшчыны? **2.** Якімі былі самыя першыя дзяржавы на тэрыторыі Егіпта? **3.** Калі ў Егіпце ўзнікла адзіная дзяржава? **4.** Што сведчыць аб высокім развіцці будаўнічых уменняў егіпцян?

Успаміны вяльможы аб удзеле у будаўніцтве піраміды для фараона.

«Яго высокасць фараон загадаў мне прывезці вялікую каменную пліту з поўдня Егіпта. Усяго за 17 дзён я здалёку дацягнуў яе з каменяломні да берага Ніла. Там яшчэ за 17 дзён я збудаваў карабель даўжынёй у 30 і шырынёй у 15 метраў. Праз 17 дзён я давёз пліту да месца будаўніцтва піраміды».

§ 10. Росквіт старажытнаегіпецкай цывілізацыі

1. Егіпет пасля будаўніцтва вялікіх пірамід. Будаўніцтва пірамід дрэнна адбілася на жыццяздольнасці краіны. Дзяржава пача-

ла слабець з кожным годам, а потым і зусім развалілася. Жыццё краіны непасрэдна залежыць ад абваднення палёў вадой Ніла. Цяпер яна не магла туды папасці. Разбурыліся абвадняльныя сістэмы. На некалькі стагоддзяў перастала існаваць самая вялікая дзяржава свету.

Вельмі марудна Егіпет вяртаўся да жыцця. Потым дзяржава ажыла, але на кароткі час. Пачаліся народныя паўстанні. І ў гэты ж час краіну заваявалі моцныя ворагі, якіх завуць *гіксо́сы*. Справа ў тым, што да гэтага часу егіпцяне не ведалі аб існаванні коней. А гіксосы, як каняводы, мелі значную ваенную перавагу. У той час баявыя *калясніцы*, запрэжаныя конямі, былі галоўнай ударнай сілай.

У перыяд пасля будаўніцтва пірамід у егіпцян былі і поспехі. У гэты перыяд жыло многа таленавітых пісьменнікаў і паэтаў. Яны напісалі шмат цікавых твораў, у якіх адлюстравана жыццё простага народа: сялян, ткачоў, будаўнікоў і інш. Часта ў іх творах Хеопс выступае як сапраўдны губіцель народа, крывапівец. «Бацька гісторыі» Герадот піша: «Налічваюць 106 гадоў, у якія егіпцяне цярпелі ўсялякія беды... З нянавісці да гэтых цароў егіпцяне нехаця называюць іх імёны». У гэты час запісаны творы народнай творчасці, якія потым не будуць забывацца тысячагоддзямі.

У гэты час было пабудавана вялікае штучнае вадасховішча — **Мерыда́ва возера** («Вялікае возера»). З яго дапамогай у пустыні адваявалі шмат урадлівай зямлі.

2. Навакольны свет пасля будаўніцтва пірамід. За межамі Егіпта, у Пярэдняй Азіі,

за гэты час наступілі вялікія змены. З поўначы сюды прыйшлі народы, якім было вядома каняводства. Утварыліся новыя дзяржавы.

Адбыліся перамены ў гаспадарчым жыцці. Стала шырока ўжывацца *бронза* (сплаў медзі з волавам). А ў Егіпце не было свайго волава. У некаторых краінах навучыліся выплаўляць *жалеза* і рабіць жалезную зброю.

3. Вызваленчая барацьба супраць гіксосаў. У час іх гаспадарання егіпцяне нацярпеліся вельмі многа. Прыйшлі ў заняпад абвадняльныя сістэмы. Гіксосы проста рабавалі народ, не думаючы аб краіне. Народ падняўся на вызваленчую барацьбу, на чале яе сталі правадыры з горада **Фівы** на поўдні Егіпта. Ім дапамагалі прадстаўнікі афрыканскіх плямён. Захопнікі былі выгнаны з краіны. *З 1600 г. да н. э. пачынаецца эпоха росквіту старажытнаегіпецкай цывілізацыі.*

4. Ператварэнне Егіпта ў сусветную дзяржаву. Правадыры з Фіў, пад кіраўніцтвам якіх былі выгнаны захопнікі, пачалі аднаўляць краіну. Сталіцай краіны становяцца Фівы, вельмі вялікі і прыгожы горад. Усё новыя фараоны паходзяць з той сям'і, якая вярнула краіне незалежнасць. Яны ведалі аб тых пераменах, якія адбыліся ў навакольным свеце.

Фараоны сталі купляць і разводзіць коней. Рамеснікі навучыліся рабіць бронзу і баявыя калясніцы. Гэта лёгкія двухколавыя вазкі, у якія запрагалі пару коней. У калясніцу станавіліся два воіны: адзін правіў конямі, а другі страляў з лука ці меў

доўгае кап'ё. Для тых часоў гэта быў новы від зброі.

Каля 1500 г. да н. э. фараон **Тутмас III** пачаў свае ваенныя паходы ў Пярэднюю Азію, дзе можна было заваяваць багатыя краіны. Ён быў вельмі здольным палкаводцам і атрымаў шмат бліскучых перамог. Ён на поўначы заваяваў краіну **Мітанні**, якая была размешчана па берагах ракі **Еўфрат**. А таксама **Палесціну, Сірыю і Фінікію**, краіны на ўсходнім беразе Міжземнага мора. Яны славіліся лесам, тут было шмат багатых гандлёвых гарадоў.

Егіпцяне захапілі вельмі багатыя краіны, якія плацілі Егіпту золатам, лесам, тканінамі, табунамі коней. У Егіпет прыгналі і тысячы палонных, якіх ператварылі ў рабоў.

Найвышэйшага росквіту старажытнаегіпецкая цывілізацыя дасягнула пры першых пераемніках Тутмаса III. Яны не ваююць, а, карыстаючыся працай соцень тысяч рабоў, шмат будуюць. У іх час пабудаваны велізарныя палацы, храмы. Высякаюцца тысячы сфінксаў. Скульптуры фараонаў дасягаюць вышыні 20 метраў.

Потым пачынаецца барацьба за ўладу, у якую ўмешваюцца святары і храмавая знаць. Карыстаючыся гэтым, заваяваныя краіны вяртаюць незалежнасць.

Бяднее сярэдні пласт свабоднага люду. Многія з іх пападаюць у рабства за даўгі.

Пачынаюцца народныя хваляванні. Для барацьбы з імі фараоны сталі наймаць воінаў з ліку прадстаўнікоў афрыканскіх народаў.

У гэты час на Егіпет пачынаюць паспя-

хова нападаць іншыя народы. На поўдзень ад Егіпта ўтвараецца моцнае **Эфіопскае царства.** А ў гэты час ў арміі колькасць *наёмнікаў* перабольшыла лік егіпцян. Выкарыстаўшы такія абставіны, да ўлады прыходзіць звычайны наёмнік з ліку лівійцаў Шашонк. Ён нават захацеў вярнуць Егіпту былую моц, арганізаваўшы ваенны паход у Пярэднюю Азію.

Нягледзячы на перамогу ў Палесціне над **Ізраільскім і Іудзейскім царствамі,** Егіпет распадаецца на асобныя часткі, са сваімі незалежнымі царкамі. Надыходзіць канец незалежнасці краіны.

Старажытнаегіпецкая цывілізацыя праіснавала тры тысячы гадоў, зрабіла вялікі ўклад у культуру чалавецтва.

Слоўнік.

Гіксо́сы — у перакладзе з егіпецкай — «правадыры пастухоў з Азіі».

Лабіры́нт — палац са шматлікімі пакоямі і заблытанымі хадамі.

Наёмнік — воін, наняты за плату ў іншых краінах.

Скульпту́ра; ску́льптар — майстар, які лепіць з гліны, выразае з дрэва або каменю, адлівае з металу мастацкія творы; *скульпту́ра* — майстэрства ствараць такія вобразы.

! **1.** Чаму Егіпет быў хутка заваяваны гіксосамі? **2.** Чаму Фівы сталі новай сталіцай Егіпта? **3.** За што Тутмаса III называюць першым сусветным захопнікам? **4.** Што здарылася са Старажытнаегіпецкай дзяржавай пасля Тутмаса III?

Урывак з летапісу часоў Тутмаса III

Успрамянеў цар зранку. Яго Вялікасць паехаў на залатой калясніцы, упрыгожаны сваёй баявой зброяй. Яго Вялікасць пераадолеў ворагаў на чале свайго войска. Жах перад Яго Вялікасцю ўвайшоў у іх цела, іх рукі зрабіліся слабымі. Яны пакінулі сваіх коней, залатыя ды срэбраныя калясніцы. Быў захоплены шацёр галоўнага ворага. І ўсё войска ўзрадавалася. Яны ўсхвалялі Яго Вялікасць.

І вось уладальнікі той краіны прыпаўзлі на сваіх жыватах, каб схіліцца перад магутнасцю Яго Вялікасці ды спытаць дазволу дыхаць сваімі насамі. Бо велізарна моц Яго Вялікасці над усімі краінамі. І ўсе іх уладальнікі былі прыцягнуты да Яго Вялікасці з іх данінай срэбрам, золатам, каштоўным каменнем, збожжам, віном, быдлам і шмат чым іншым. Пасля гэтага Яго Вялікасць прызначыла новых уладальнікаў.

§ 11. Асноўныя рысы старажытнаегіпецкай рэлігіі

1. Жывёлы-багі. Іншаземных падарожнікаў у Егіпце вельмі здзіўлялі адносіны мясцовых жыхароў да дзікіх і хатніх жывёл, а таксама да розных птушак, рыб і насякомых. Амаль усе яны лічыліся багамі, некаторыя толькі ў пэўнай мясцовасці, а некаторыя па ўсёй краіне. З вялікай павагай адносіліся да кошкі, нельга было яе крыўдзіць. Забойства кошкі каралася смерцю.

Амаль па ўсяму Егіпту з павагай ставіліся да кракадзіла. Паляванне на яго было забаронена. Прыручаных кракадзілаў упрыгожвалі каштоўнымі камянямі і залатымі пацеркамі. Маленькія кракадзільчыкі вы-

хоўваліся ў храмах у спецыяльных сажалках. Іх кармілі ўсім салодкім і смачным. Калі кракадзіл раптоўна паміраў, яго хавалі з вялікімі ўшанаваннямі.

Вялікай пашанай карысталіся такія птушкі, як каршун, шулёнак, ібіс, а з насякомых гнаявік (скарабей).

Святымі лічыліся быкі, каровы, бараны. Але іх было вельмі шмат у кожнай мясцовасці. У такіх выпадках па ўсёй краіне выбіралі толькі аднаго па вельмі дакладных прыкметах. Бык павінен быць чорнай масці, але з белай плямай на лбе і з сівенькімі валаскамі на хвасце. Звычайна, пасля доўгіх пошукаў і даследавання, такога быка знаходзілі. Яго вялі ў самую першую сталіцу Егіпта, горад Мемфіс. Там быў спецыяльны храм, дзе бык у стане свяшчэннай асобы прабываў усё жыццё. У дзень яго смерці аб'яўлялася жалоба. Яго клалі ў *саркафаг* (труна) велізарных памераў і пераносілі ў асобы склеп.

Такія ўяўленні характэрны для першабытных рэлігій. Толькі ў Егіпце было шмат прыкладаў, калі багі мелі чалавечае тулава і галаву жывёлы.

2. Вера ў замагільнае жыццё. Егіпцяне ўяўлялі, што калі захаваць цела памёршага, то душа будзе жыць. Для гэтага з цела пакойніка вымалі ўнутранасці і клалі іх у чатыры пасудзіны, а цела на 70 дзён апускалі ў саляны раствор. Потым залівалі духмянымі смоламі, захутвалі ў палатняныя тканіны і клалі ў саркафаг *мумію*. Так завуць апрацаванае такім чынам цела.

Егіпцяне ўяўлялі замагільны свет поўным адлюстраваннем зямнога. І там памёр-

шаму пагражалі тыя ж небяспечнасці, што і на зямлі: змеі, кракадзілы, голад, жахі і нават новая смерць. Але не кожная душа трапляе на той свет. Душы памёршых судзіць бог замагільнага свету. Ён на вагах вызначае, грэшна ці бязгрэшна жыў чалавек на зямлі. Грэшніка яшчэ да замагільнага свету чакае знішчэнне ў страшэнных муках.

3. Абогатварэнне фараонаў. Яшчэ ў часы пабудовы пірамід жрацы распаўсюдзілі павер'е, што кожны чалавек можа быць жорстка пакараны фараонам нават на вялікай адлегласці. Што сам фараон толькі напалову чалавек, таму што яго бацькам з'яўляецца вярхоўны бог **Ра.** Што ўсё зямное, чалавечае ён атрымаў ад сваёй маці, простай жанчыны. Таму ў тытуле кожнага фараона ёсць словы: «сын Ра».

Кожны фараон, як і іншыя багі, меў свае храмы, жрацоў. Яму прыносілі ахвяры, ён меў свае святы. Пры смерці ён траціў жыццё як чалавек. Як бог ён пераходзіў да іншых багоў.

Такія ўяўленні наўмысна прыдумвалі і распаўсюджвалі сярод народа жрацы. Каб людзі баяліся ўлад і пакорна ім служылі.

4. Абогатварэнне ракі Ніл. Вам вядома, што ад разліваў Ніла залежала жыццё і дастатак усяго егіпецкага народа. Простыя людзі непасрэдна залежалі ад яго паўнаводнасці. Ім хацелася, каб кожны год ён прыносіў як мага больш вады. Ніл, па-егіпецку **Хапі,** быў самым паважаным богам сярод простага народа.

Слоўнік.

Саркафáг — грабніца ў выглядзе труны (звычайна з каменю).

Тыгул — ганаровае званне, якое прысвойвалася прывілеяваным асобам.

! **1.** Калі з'явіліся ўяўленні, што жывёла можа быць богам? **2.** Ці была ўжо ў Егіпце дзяржава, калі пачалі абогатвараць фараона?

Урывак з Герадота аб кульце жывёл

Калі ў доме памрэ кошка, дык усе яго жыхары павінны агаліць сабе бровы. Калі ж памрэ сабака, дык усе стрыгуць сабе валасы на галаве і ўсім целе.

Трупы кошак трэба адвезці ў горад **Бубасціс** і пахаваць там у свяшчэнных пакоях. Сабак жа хаваюць кожны ў сваім горадзе ў свяшчэнных дамавінах.

Жыхары Фіў лічаць боствам кракадзіла. Там трымаюць па аднаму хатняму кракадзілу. У вушы яму навешваюць завушніцы са шкла з золатам, а пярэднія лапы апранаюць у пярсцёнкі. Яму надаюць адмыслова прыналежную да яго свяшчэнную ежу. Пакуль ён жыве, гаспадары вельмі ўважліва клапоцяцца аб ім, а пасля смерці бальзамі́руюць і хаваюць у свяшчэннай дамавіне.

Усхваленне Ніла

Слава табе, Хапі!
Ты прыйшоў у гэту зямлю.
З'явіўся, каб ажывіць Егіпет.
Калі ты ўзбіраеш у сябе ваду, о Хапі,
Табе прыносяць ахвяры,
Прыводзяць быкоў на закланне,
Адкармліваюць птушак для цябе,
Ловяць для цябе львоў у пустыне,
Даруюць табе выдатныя рэчы.
Таксама як прыносяць ахвяры Хапі,
Прыносяць іх кожнаму богу.

З хронікі сярэдзіны III тысячагоддзя да н. э.

Аднойчы вялікі фараон, які быў роўны багам сваёй магутнасцю, прыняў удзел у вялікім свяце. Выпадкова нейкі вяльможа занадта блізка падышоў да яго. Раптам скіпетр фараона трапіў яму на нагу. Усе закалаціліся ад жаху, бо ўдар свяшчэннага скіпетра павінен быў забіць бедалагу на месцы. На шчасце, фараон гучна прамовіў: «Заставайся непарушны!» Гэта імгненна здзейснілася — крананне магічнага скіпетра Яго Вялікасці не прынесла вяльможы аніякай шкоды.

§ 12. Навука і адукацыя ў Старажытным Егіпце

Усе значныя культурныя адкрыцці егіпцяне зрабілі першымі ў свеце. Ім не было ў каго вучыцца. У егіпцян рана з'явілася агульнае ўяўленне аб усіх асноўных галінах ведаў. Пра гэта сведчыць стварэнне першай у свеце *энцыклапедыі*, напісанай 3 тысячы гадоў таму назад. Яна мела наступныя раздзелы: неба, вада, расліны, жывёлы, іншаземныя народы. Да нашага часу захаваліся навуковыя працы па *медыцыне, астраноміі, матэматыцы*. Першым і галоўным адкрыццём егіпцян было стварэнне *пісьменнасці*.

1. Пісьменнасць у Старажытным Егіпце. Ужо ў IV тысячагоддзі да н. э. было адкрыта так многа карысных ведаў, што іх нельга было ўтрымаць у памяці. З'явілася неабходнасць у іх захаванні для перадачы наступным пакаленням. Гэта і прывяло да ўтварэння адной з самых старажытных сістэм пісьма на свеце.

Спачатку егіпцяне больш малявалі, чым

пісалі, як мы. Калі трэба было азначыць пэўнае слова, рабілі маленькі малюнак. Усім былі зразумелымі намаляваныя фігуркі льва, арла, піраміды, плуга. Такім чынам пісалі і больш складаныя паняцці. Так, чалавечае вока са слязамі значыла «плакаць», а чалавек са звязанымі рукамі — «палонны». Гарызантальная палоска з зоркай над ёй чыталася, як «ноч».

Потым пісьмо значна спрасцілася. Асобныя *словы-малюнкі* сталі чытаць толькі як склады з двума ці трыма гукамі. З'явіліся *знакі-літары,* якія азначалі на пісьме толькі адзін зычны гук. Егіпцяне прапускалі на пісьме галосныя гукі.

Асобныя знакі-малюнкі завуцца *іерóглі-фамі.* На пісьме ўжывалася каля 750 іерогліфаў. Іншаземцы часцей за ўсё бачылі егіпецкія іерагліфічныя тэксты, высечаныя на сценах палацаў і храмаў, на скульптурах і іншых прадметах з каменя.

Але егіпцяне першымі вынайшлі вельмі зручны матэрыял для пісьма, падобны на нашу паперу. Яго рабілі з трыснягу пад назвай папірус. Ён густа рос па берагах Ніла, на балотах дэльты, дасягаючы ў вышыню 3—6 метраў. Сцябліны папірусу рэзалі на доўгія вузкія палоскі, накладвалі іх краямі адна на другую і склейвалі ў лісты, якія сушылі. Для напісання вялікіх тэкстаў лісты папірусу склейвалі ў доўгія палосы. Даўжыня самых вядомых сучасным вучоным папірусаў вагаецца ад 10 да 45 метраў. Добра гнуткія лісты і палосы папірусу скручваліся ў трубкі. Іх звычайна захоўвалі ў гліняных жбанах. Пісалі чарацінкай ці пэндзлікам з трыснягу, чарнілам.

Трэба памятаць, што беларускае слова «папера» паходзіць ад старажытнаегіпецкага «папірус».

Як была прачытана старажытнаегіпецкая пісьменнасць.

Мова і пісьменнасць старажытных егіпцян былі забыты шмат стагоддзяў таму назад. Многія вучоныя рабілі спробы раскрыць гэтыя тайны. У пачатку XIX стагоддзя ў Еўропу прывезлі вельмі цікавы надпіс. Ён высечаны на вялікім камені адразу на егіпецкай і грэчаскай мовах.

Яго стаў даследаваць вельмі здольны малады вучоны Шампальён. Ён да гэтага часу вельмі хутка вывучыў шмат розных моў. У гэтым тэксце ўласныя імёны абведзены паўкруглай рамкай. Шампальён першым у свеце ў 1822 годзе прачытаў такія вядомыя з гісторыі імёны, як Клеапатра, Тутмас. Ён напісаў першы падручнік і слоўнік старажытнаегіпецкай мовы. Шампальёна справядліва лічаць заснавальнікам сучаснай навукі аб гісторыі і культуры старажытнаегіпецкай цывілізацыі.

2. Медыцына ў Егіпце. Асабліва шанавалі ў краінах старажытнага свету егіпецкіх урачоў. Іх запрашалі на службу ў іншыя дзяржавы. У егіпцян былі ўрачы па розных хваробах. Гэта заўважыў яшчэ грэк **Герадот,** калі быў у Егіпце: «Кожны ўрач лечыць толькі адну хваробу. Таму ўсюды ў іх шмат урачоў. Адны лечаць вочы, другія галаву, трэція зубы, чацвёртыя страўнік, пятыя — унутраныя хваробы».

Урачоў вучылі ў «дамах жыцця», якія існавалі пры храмах. Там вучні перапісвалі папірусы медыцынскага зместу, напрыклад «Кніга сэрца», «Кніга хвароб вачэй».

Лячэнне пачыналі з апытання, потым рабілі агляд і мералі пульс. Урач быў павінен шчыра сказаць хвораму наступнае: 1) «Гэта хвароба, якую я буду лячыць», 2) «Гэта хвароба, з якой я буду змагацца» і 3) «Гэту хваробу нельга вылечыць».

3. Матэматыка. Зарадзіўшыся ў глыбокай старажытнасці, егіпецкая матэматыка аказала ўплыў на развіццё матэматычнай навукі ў суседніх краінах, перш за ўсё ў **Грэцыі.** Гісторык **Герадот** сведчыць: «Мяркую, што ў Егіпце была вынайдзена геаметрыя і адтуль яна прыйшла ў Грэцыю». Вядомы грэчаскі матэматык **Архімед** шмат гадоў вучыўся ў Егіпце.

Матэматыка развілася з практычных патрэб. З узнікненнем дзяржавы амаль увесь год па вёсках хадзілі *чыноўнікі-пісцы* з прыслужнікамі. Яны вялі падлік жывёлы, вымяралі засеяныя палі, каб вылічыць велічыню падатку з кожнага селяніна. Так узнікла вялікая патрэба ў *арыфметыцы.*

Захаваліся зборнікі егіпецкіх матэматычных задач. Ва ўмове адной з іх гаворыцца аб 7 дамах, аб 7 катах у кожным доме, аб 7 мышах, з'едзеных кожным катом, аб 7 каласках, з'едзеных кожнай мышшу, аб 7 мерах зерня, якія дае кожны колас. Умова: колькі мер збожжа выратавалі каты? **Адказ: 19 507.**

3. Астраномія. Ёй сталі цікавіцца для ўдасканальвання *календара* з развіццём земляробства. Таксама трэба было дакладна вызначаць пачатак разліву Ніла, які наступае роўна праз год. Егіпцяне склалі карту зорнага неба. Па зорках находзілі шлях у моры і пустыні.

Егіпецкі каляндар састаўлен на астранамічнай аснове. Год, які налічваў 365 дзён, яны падзялілі на 12 месяцаў. Ноч складалася з 12 гадзін. Дзень таксама дзяліўся на 12 гадзін.

Егіпцяне вынайшлі сонечныя і вадзяныя гадзіннікі.

4. Адукацыя. Як сведчаць егіпецкія мастацкія творы, у краіне быў высокі ўзровень пісьменнасці. Адзінай сістэмы адукацыі не існавала. Школы былі пры храмах і дзяржаўных установах. Не было асобных школьных будынкаў. Вядомы прыклады, калі дзеці пачыналі хадзіць у школу ва ўзросце пяці гадоў.

Спачатку вучылі пісаць і чытаць. Малодшым школьнікам для практыкавання ў пісьме выдавалі разлінаваныя гліняныя чарапкі ці плоскія каменныя дошчачкі. Каштоўны папірус атрымлівалі толькі вучні старэйшага ўзросту. Кожны вучань самастойна рыхтаваў чарніла чорнага і чырвонага колераў. Асноўны тэкст пісалі чорным колерам, а чырвоным — загалоўкі і першыя радкі.

Настаўнікаў па асобных прадметах амаль не было. У асноўным вучылі пісцы. Абавязковым было вывучэнне на памяць вядомых мастацкіх і рэлігійных твораў.

Існавалі вышэйшыя школы для будучых ваенных і паслоў у іншыя краіны. У іх вучні павінны былі хутка адказваць на такія, напрыклад, пытанні: Колькі патрэбна цаглін для пабудовы пляца пэўных памераў? Як паставіць на п'едэстал вялікую скульптуру? Колькі патрэбна людзей для перавозкі калоны пэўнай даўжыні і вагі?

У такіх школах вучылі музыцы, плаванню, скачкам, бегу.

Пры фараоне былі людзі з добрым веданнем замежных моў.

Такім чынам, старажытныя егіпцяне амаль першымі і самастойна стварылі дасканалую для свайго часу пісьменнасць, дабіліся значных поспехаў у медыцыне, матэматыцы, астраноміі. Іх каляндар амаль не адрозніваецца ад таго, якім карыстаемся мы. Яны ўмелі выхоўваць адукаваных людзей.

Слоўнік.

Энцыклапе́дыя — навуковая даведачная кніга.
Астрано́мія — навука аб нябесных целах.
Сістэ́ма — дакладны парадак.

! **1.** На якіх матэрыялах пісалі старажытныя егіпцяне? **2.** Чым былі вядомы егіпецкія медыкі ў старажытным свеце? **3.** Якія прадметы вывучаліся ў школах Старажытнага Егіпта?

Праслаўленне пісцоў.

Мудрыя пісцы
У часы пераемнікаў саміх багоў
Прадказваючыя будучыню,
Іх імёны захаваюцца навек.
Яны адышлі, завяршыўшы свой час,
Пазабываны ўсе іх сваякі.

Яны не будавалі сабе піраміды з медзі
І надмагільных помнікаў з бронзы.
Яны не пакінулі пасля сябе нашчадкаў,
Дзяцей, захаваўшых іх імёны.
Але яны пакінулі сваю спадчыну ў напісаным,
У запаветах, зробленых імі.

3 Зак. 390

И

§ 13. Літаратура, архітэктура і мастацтва ў Старажытным Егіпце

1. Літаратура. Яна не толькі адна з самых старажытных у свеце. Літаратура егіпцян існавала і ўдасканальвалася на працягу каля 2500 гадоў. Захаваліся казкі, аповесці, байкі, вершы рознага зместу. Імёны выдатных пісьменнікаў і паэтаў, як і вучоных, у краіне памяталі тысячагоддзямі.

Рана былі запісаны і шырока вядомы народныя казачныя паданні аб добрых і злых багах прыроды. Такія творы завуцца *міфамі*. Найбольш папулярным быў міф пра бога плоднасці **Асірыса**, яго жонку **Ісіду** і іх сына **Гора**. Лічылася, што Асірыс адкрыў для людзей земляробства, садаводства і вінаградарства. Стварыў ячмень і пшаніцу і, наогул, быў богам усёй карыснай расліннасці.

Але ў гэтай сям'і існаваў злы вораг — бог Сет, які ўяўляў сабой пякучыя пустыні і іх едкія пяскі. У самым канцы лета Сет гвалтоўна забівае Асірыса. У краіне ўсё перастае радзіць, пачынаюць дзьмуць сухавеі з пустынь, несучы хмары гарачага пяску. Потым Ісіда знаходзіць цела мужа і плача па ім. Простыя егіпцяне верылі, што ад слёз Ісіды і пачынае разлівацца Ніл. Што ад гэтых слёз ажывае Асірыс і ў краіне ўсё зноў пачынае радзіць. Сын Гор помсціць за гвалт над бацькам і забівае злога Сета. Тады знікаюць спякотныя вятры з пясчаных пустынь. Для простага люду канчаецца галодная пара.

Егіпцяне вельмі любілі чытаць прыгодніцкія аповесці, апавяданні аб падарож-

жах у далёкія афрыканскія краіны і ў Пярэднюю Азію.

І дзеці і дарослыя захапляліся казкамі «Два браты», «Аб праўдзе і крыўдзе», «Красамоўны селянін», «Аб пацярпеўшым караблекрушэнне».

Прыкладна ў XVIII стагоддзі да н. э. невядомы егіпецкі паэт напісаў наступныя вершаваныя радкі:

Створан помнік мною. Ён больш трывалы,
Чым медзь, ён вышэй царскіх пірамід.

Пройдзе яшчэ 18 стагоддзяў, і гэтыя радкі самым дакладным чынам паўторыць вядомы рымскі паэт **Гара́цый** у вершы аб вышыні яго паэтычнай творчасці. А яшчэ праз 18 стагоддзяў геніяльны рускі паэт **А. С. Пушкін** прачытаў твор Гарацыя і напісаў вядомы свой верш «Я памятник воздвиг себе нерукотворный».

Такім чынам, вялікія егіпецкія паэты пісалі такія цудоўныя вершы, што іх глыбокі змест не страціўся да нашай пары.

Егіпецкія павучэнні.

Вучонасцю дарма не выхваляйся!
Не лічы, што адзін усё ведаеш!
Не толькі ў мудрых —
У нявопытных шукай парады.

Мастацтва не ведае мяжы.
Ці можа мастак дасягнуць вяршынь майстэрства?

2. Егіпецкая архітэктура. Скульптура. Акрамя пірамід, у Старажытным Егіпце былі створаны самыя вялікія каменныя збуда-

ванні. Было пабудавана шмат велізарных храмаў. Некаторыя з іх па сваіх памерах пераўзышлі самыя вялікія піраміды.

Старажытныя іншаземныя падарожнікі лічылі самым вялікім будынкам у Егіпце храм на беразе Мерыдава возера. Ён быў пабудаваны ў XIX стагоддзі да н. э. на поўдзень ад дэльты Ніла і меў 3000 вялікіх памяшканняў. За гэта яго празвалі «Лабірынтам». Потым яго доўгі час не рамантавалі. Яшчэ ў старажытнасці «Лабірынт» разабралі на матэрыял для пазнейшых пабудоў.

Да нашых часоў захаваліся вялікія руіны 11 храмаў каля былой сталіцы егіпецкай дзяржавы горада Фівы. Яны занялі плошчу ў 1 кіламетр даўжынёй і 500 метраў шырынёй уздоўж усходняга берага Ніла. Там захаваўся сапраўдны лес з соцень самых высокіх і тоўстых каменных калон у свеце, пастаўленых за ўсю гісторыю чалавецтва. Іх вышыня вагаецца ад 16 да 22 метраў. Самыя тоўстыя маюць у дыяметры 7 метраў. На месцы, дзе стаіць толькі адна такая калона, можа змясціцца 100 чалавек.

Сапраўдным цудам сусветнай архітэктуры з'яўляецца пячорны храм на поўдні Егіпта ў **Абу-Сімбеле.** Яго вялікае нутро выразана ў сярэдзіне вялікай каменнай гары. Перад уваходам пастаўлены чатыры аднолькавыя скульптуры фараона **Рамсеса II** у сядзячым стане. Іх вышыня дасягае 20 метраў. Скульптуры такой вышыні былі і ў іншых месцах Егіпта.

У наваколлі храмаў і палацаў археолагі знайшлі сотні тысяч каменных скульп-

тур і *статуэтак*. Кідаецца ў вочы, што егіпецкія мастакі з вялікай далікатнасцю імкнуліся перш за ўсё перадаць выраз твару чалавека. Статуі размалёўвалі, вочы ў некаторых выпадках рабілі з крышталю і каштоўных камянёў.

З II тысячагоддзя да н. э. фараоны і знаць пачалі будаваць грабніцы, добра схаваныя глыбока пад зямлёй. Калісьці ў іх многія памяшканні былі пакладзены вялікія каштоўнасці. З цягам часу ўсё гэта было разрабавана. Але на сценах і столі захаваліся шматлікія рэльефы і малюнкі. Адзін вядомы вучоны назваў іх «энцыклапедыяй егіпецкага жыцця». Тут намалявана і выразана амаль усё. Бачны земляробы за працай, рамеснікі розных прафесій у сваіх майстэрнях. Гэта зроблена так дакладна, што лёгка даведацца, як егіпцяне выплаўлялі з руды медзь, рабілі цэглу, будавалі дамы, караблі. Цікавыя сцэны адпачынку егіпцян. Бачна, на якіх музычных інструментах яны іграліі, як танцавалі, лавілі рыбу і палявалі на драпежных звяроў і кракадзілаў.

Але лепей за ўсё егіпцяне малявалі родную прыроду. Лятаючых і плаваючых птушак, дробных і буйных драпежнікаў, рачную глыбіню з рознымі рыбамі і раслінамі.

Егіпцяне не толькі дасягнулі высокага майстэрства ў літаратуры, будаўніцтве і выяўленчым мастацтве. Яны сталі добрымі настаўнікамі для іншых старажытных цывілізаваных народаў.

Слоўнік.

Архітэктар — майстар па будаўніцтву будынкаў; *архітэктура* — майстэрства будаваць і ўпрыгожваць будынкі.

Статуэтка — невялікая скульптурная фігурка, якая звычайна служыць упрыгожаннем.

Статуя — скульптурны вобраз чалавека, групы людзей ці жывёл.

? **1.** Якім чынам прырода адлюстравалася ў міфах егіпцян? **2.** Назавіце найбольш значныя дасягненні егіпцян у будаўніцтве і скульптуры. **3.** Што малявалі старажытныя егіпцяне?

Археалагічныя раскопкі ў Паўднёвым Егіпце.

З 1960 года на самым поўдні Егіпта з'явіліся археолагі з дзесяткаў краін свету. Тут пачала будавацца вельмі высокая плаціна на Ніле для стварэння вялікага вадасховішча, даўжынёй каля 500 кіламетраў. Недалёка ад гэтых мясцін былі вельмі багатыя ў старажытнасці залатаносныя руднікі, і час захаваў сапраўдныя цуды архітэктуры. Але глыбокае штучнае возера затапляла вядомы пячорны храм фараона Рамсеса II у Абу-Сімбеле. Знікаў пад вадой вялікі востраў, дзе захаваўся храм багіні Ісіды. Некалькі цікавых збудаванняў было за межамі Егіпта. Яны таксама затапляліся нільскай вадой.

Да нашага часу ўсе гэтыя збудаванні выратаваны. Большасць з іх перанесена на больш высокія месцы па берагах вадасховішча.

Археолагі правялі шматлікія раскопкі. Знойдзены тысячы цікавых помнікаў старажытнай егіпецкай цывілізацыі.

Аддзел II.
Цывілізацыі старажытнай Пярэдняй Азіі

Пярэдняй Азіяй называюць заходнюю частку Азіяцкага мацерыка, якая мяжуецца з Міжземным і Чорным морамі. Большасць тэрыторый яе складаюць горы і пласкагор'і, паміж якімі працякаюць магутныя рэкі **Еўфрат** і **Тыгр**. Абедзве ракі бяруць пачатак у гарах на поўдзень ад Каўказа і ўпадаюць у **Персідскі заліў**. Краіну, размешчаную па іх сярэднім і ніжнім цячэннях, яшчэ ў старажытнасці назвалі **Міжрэччам**. Па-грэчаску — **Месапатаміяй**. Яе называюць таксама **Двурэччам**.

§ 14. Адкрыццё цывілізацыі старажытнага Міжрэчча

1. Першыя звесткі аб старажытнай цывілізацыі Міжрэчча. Вучоныя пакуль што не могуць адказаць на пытанне: дзе раней узнікла цывілізацыя — у Егіпце ці ў Міжрэччы? Прыродныя ўмовы іх прыкладна аднолькавыя. Абедзве краіны размешчаны ў далінах вялікіх рэк, якія ніколі не перасыхаюць, і акружаны непрыветлівымі спякотнымі пустынямі. Калі казаць аб Егіпце, то тут да нашых дзён захаваліся велізарныя піраміды, спісаныя іерогліфамі сцены велічных храмаў, небывалыя па памерах скульптуры фараонаў. У Міжрэччы ж даволі рэдка сустракаюцца адзінокія паўразваленыя цагляныя пабудовы сярод узгорыстай пустыні і балот.

«Бацька гісторыі» **Герадот** амаль у адзін і той жа час наведаў і Егіпет і Міжрэчча. Абедзве краіны ў аднолькавай ступені ўразілі яго сваёй культурай. Пры гэтым у Міжрэччы ён заўважыў і некаторыя перавагі перад Егіптам. **Герадоту** ўяўлялася, што ў Міжрэччы збіраюць самыя вялікія ў свеце ўраджаі. Але асабліва яго зачараваў горад **Вавілон**: не проста самы моцны і магутны, але і самы прыгожы з усіх гарадоў, якія **Герадот** бачыў раней.

Са старажытнейшых часоў біблейскі рай змяшчалі ў Міжрэччы, напэўна, таму, што яркая зеляніна пальмавых гаёў, пышныя сады з гранатавымі дрэвамі, урадлівыя палі, перасечаныя шматлікімі каналамі, уяўлялі сабой рэзкі кантраст у параўнанні з суседнімі бязводнымі пустынямі і мёртвымі гарамі.

Па ***Бібліі*** тут адбываецца будаўніцтва *вавілонскай вежы,* «вышынёй да нябёс», з якой звязваюць змешванне людскіх моў. У гэтых краях знаходзіцца адзін з сямі цудаў старажытнага свету — «вісячыя сады».

Міжрэчча не краіна з легенд і казак. Яна радзіма адной з самых старажытнейшых цывілізацый. Тут пісаліся яе першыя старонкі.

Тут выраслі вялікія ўмацаваныя гарады з палацамі і храмамі. Была створана густая сетка каналаў, з гацямі і *дамбамі.* Тут узніклі і першыя буйныя дзяржавы. Часта іх улада распасціралася далёка за межы Міжрэчча.

У новы час былая жытніца Старажытнага Усходу ператварылася ў стэпы і пу-

стыні, асабліва пасля спусташальных набегаў манголаў.

2. Першыя археалагічныя раскопкі ў Міжрэччы. Руіны старажытных гарадоў былі засыпаны пяском і пылам, над імі выраслі ўзгоркі. Ужо самыя першыя археалагічныя раскопкі ў XIX стагоддзі адкрылі велізарны палац з раскошна аздобленым уваходам, вялікімі пакоямі і заламі. На іх сценах былі размешчаны каменныя пліткі з выразнымі малюнкамі дзівосных крылатых звяроў, фігурамі барадатых людзей, карцінамі палявання на львоў. Былі створаны вобразы палонных са звязанымі рукамі, паказаны запрэжаныя конямі калясніцы, якія імкліва рухаліся.

У Егіпце нічога падобнага не знаходзілі. Ніколі яшчэ вучоныя не бачылі такіх карцін і ў такой колькасці. Калі гэтыя пліткі выкласці ў адну лінію, даўжыня яе складзе 2 кіламетры.

Былі раскапаны і іншыя палацы. Уражваюць іх вялікія памеры. Некаторыя з гэтых збудаванняў мелі ў даўжыню да 700 метраў, у шырыню — да 500 метраў. У іх было знойдзена шмат розных рэчаў. Больш за ўсё здзівілі велізарныя каменныя скульптуры крылатых быкоў з чалавечымі галовамі. На адной каменнай пліце паказвалася, якім чынам сотні чалавек перавозяць такую скульптуру.

Вельмі каштоўную знаходку зрабілі ў адным з палацаў асірыйскіх цароў, збудаваных 2650 гадоў таму назад. Там было знойдзена прасторнае памяшканне, запоўненае прадметамі з гліны, на якія раней не звярталі ўвагі. Гэта былі дошчачкі з

акруглымі краямі, густа пакрытыя знакамі, якія нагадвалі сляды птушак на мокрым пяску. Выявілася, што гэта «гліняныя кнігі» старажытных жыхароў Міжрэчча, а запоўненае імі памяшканне — самая першая *бібліятэка* на Зямлі.

3. Гліна і клінапіс. Чаму жыхары Міжрэчча выбралі такі незвычайны матэрыял для пісьма, як гліна? Як вы памятаеце, старажытныя егіпцяне пісалі чарнілам на папірусе, які вельмі падобны на нашу паперу.

Справа ў тым, што гліна была адным з самых распаўсюджаных прыродных багаццяў Міжрэчча. У першую чаргу з яе рабілі цэглу для ўзвядзення палацаў, храмаў і жылых памяшканняў. Спачатку цагліны сушылі толькі на сонцы. А потым іх сталі абпальваць у спецыяльных пячах. Такая цэгла ў сваёй трываласці не ўступала каменю. Глінай замазвалі шчыліны ў караблях, з яе рабілі пасуду, бочкі, лямпы і нават сярпы з касцяной, каменнай ці металічнай рэжучай часткай. Паводле старажытнай легенды, багі нават чалавека стварылі з гліны. А самі людзі ляпілі з гліны статуэткі багоў, духаў, жывёл.

Як пісалі на гліне? Бралі кусок гліны, намочвалі яго вадой і добра ўміналі, каб атрымаць густое, вязкае цеста. Затым яму надавалі такую форму, каб зручна было класці на далонь. Таблічкі былі круглыя, квадратныя ці прамавугольныя, плоскія ці злёгку выпуклыя. Але часцей за ўсё гэта былі прамавугольныя дошчачкі, даўжыня якіх была ў два разы большая за шыры-

ню. Гліна трошкі падсыхала — і можна было пісаць. Але чым?

Для пісьма рабілі з трыснягу палачку. Ролю нашага пяра, ці стрыжня, выконваў выразаны на канцы трохвугольнік. Калі яго прыціснуць да таблічкі з мяккай гліны — атрымаецца адбітак у выглядзе кліна. Таму сам від пісьма называецца *клінапіс*. З асобных кліноў атрымліваліся пісьмовыя знакі. Кожны з іх раней, да вынаходства клінапісу, меў выгляд маленькага малюнка. *У Міжрэччы, як і ў Егіпце, самая старажытная пісьменнасць складалася з асобных малюнкаў.*

4. Аб чым апавядаюць клінапісныя тэксты? Сакрэт чытання клінапісу быў забыты ў першыя вякі нашай эры. Адначасова з першымі раскопкамі вучоныя занава навучыліся чытаць клінапісныя тэксты. Асабліва вялікі інтарэс, і не толькі сярод вучоных, выклікаў змест апавядання, напісанага яшчэ ў III тысячагоддзі да н. э. Там быў апісаны сусветны патоп, калі пасля вялікага ліўня вада заліла ўсю Зямлю і загубіла ўсё жывое. Застаўся ў жывых толькі галоўны герой апавядання.

Вучоных здзівіла тое, што раней гэты расказ, з усімі падрабязнасцямі, быў вядомы з *Бібліі*. Да адкрыцця клінапісных тэкстаў лічылі, што ***Біблія*** з'яўляецца самай старажытнай на Зямлі кнігай. Аднак клінапісныя тэксты больш старажытныя, чым *Біблія*, і наогул з'яўляюцца аднымі з першых на Зямлі. *Яны маюць самы розны змест. Гэта і літаратурныя творы, старажытныя законы, навуковыя працы, летапісы. Іх змест дапамагае вывучыць цывілізацыю старажытнага Міжрэчча.*

Слоўнік.

Кантра́ст — рэзка вызначаная процілегласць.

Да́мба — вал з зямлі ці каменю, які захоўвае ад затаплення паводкай.

Леге́нда — народнае паданне.

Ле́тапіс — запіс падзей па гадах іх адбыцця.

? **1.** Што было вядома аб цывілізацыі Міжрэчча ў старажытнасці? **2.** Раскажыце аб першых археалагічных знаходках у Міжрэччы. **3.** Як узнік клінапіс? **4.** Аб чым апавядаюць клінапісныя тэксты?

Біблейскае апавяданне аб патопе

Гасподзь быў незадаволены паводзінамі людзей. Усе яны рабілі на зямлі штодзённае зло. Тады вырашыў ён знішчыць чалавечы род, затапіўшы ўсю зямлю вадою.

Адзіны праведны Ной знайшоў міласць у Бога. Вырашыў Гасподзь выратаваць Ноя і сказаў яму:

«Напоўнілася зямля крыўдай. Я знішчу яе разам з чалавекам. Ты ж зрабі каўчэг у трыста лакцёў з трыма ярусамі. Хай на яго ўзойдзе твой род, а таксама па пары ўсіх жывёл рознага полу. Бяры з сабой і ежу на некалькі дзён».

І Ной усё зрабіў, як наказаў яму Бог. Тады пачаўся дождж, які працягваўся сорак дзён і начэй. 150 дзён уздымалася вада. Памерла на зямлі ўсё жывое.

Але ўспомніў Гасподзь аб Ноі, і пачала вада пакідаць зямлю. А каўчэг затрымаўся на Араратскіх гарах. Каб даведацца, калі вада пакіне зямлю, Ной выпусціў голуба. Двойчы голуб вяртаўся ні з чым. На трэці раз ён прынёс у дзюбе галінку масліны. І даведаўся Ной, што высахла зямля.

І тады сказаў Гасподзь Ною:

«Выхадзі з каўчэга і вывадзі ўсіх. Няхай

яны памнажаюцца і рассяляюцца па зямлі».

Зноў Ной зрабіў, як наказаў Бог. А Гасподзь вырашыў не знішчаць чалавецтва, нягледзячы на тое што зло ў ім засталося.

§ 15. Міжрэчча на зары цывілізацыі

1. Прыродныя ўмовы і прыродныя багацці. Рэкі Тыгр і Еўфрат пачынаюць разлівацца ад раставання снягоў у гарах Арменіі. Тады вада багата залівае палі і робіць іх урадлівымі. Але часам рэкі раптоўна выходзілі з берагоў і рабіліся жорсткімі ворагамі, змывалі пасевы і бурылі абваднялыныя збудаванні. Яшчэ часцей разлівы рэк былі слабымі і вады не хапала для пасеваў. Надыходзіў голад.

Былі і сапраўдныя катастрофы, калі паводкі пакрывалі значную частку тэрыторыі краіны, бязлітасна губячы ўсё жывое. У такіх выпадках прырода са страшэннай сілай паказвала сваю перавагу над чалавекам.

Зіма тут цягнецца ўсяго 8 тыдняў. Ужо ў лютым зелянеюць лугі. Клімат тут больш гарачы і сухі, чым у любой іншай частцы свету. Улетку спёка даходзіць да 60 градусаў. У гэты час гіганцкія пясчаныя *смерчы* нясуцца над перасохлымі палямі. Яны пагражаюць жыццю чалавека і жывёл. Дажджы выпадаюць вельмі рэдка. А калі і пойдзе дождж, дык гэта сапраўдны вадзяны паток з неба. Пад блісканне маланкі ён ператвараецца на зямлі ў мора гразі, у якім можна лёгка ўтапіцца.

У Міжрэччы было шмат вельмі ўрадлівай зямлі, якая пры арашэнні давала бага-

цейшыя ўраджаі. Але тут не хапала вельмі важных прыродных багаццяў — драўніны, каменя і металу. Прасторныя гаі фінікавых пальм не давалі неабходнага будаўнічага матэрыялу. Лес, а таксама камень і металы прывозілі з далёкіх краін.

Аб значэнні гліны ў жыцці мясцовых жыхароў мы ўжо казалі. Шырока выкарыстоўвалі трыснёг, які рос тут у неабмежаванай колькасці. Тугія звязкі трыснягу замянялі драўляныя бярвёны. Яны ўжываліся як апоры для стрэх для жылля і іншых збудаванняў. З яго плялі кошыкі, міскі, шкатулкі і скрыні, абцягваючы іх скурай.

Пагубны летні лівень у Міжрэччы. *(Паводле вавілонскага верша)*

«Нікому не спыніць усё губячага патопу.
Калі грыміць неба і здрыгаецца зямля,
Калі матак і дзяцей агарнае страшэнная цемра,
Калі зялёны трыснёг гне пад маланкамі свае стромкія сцяблы.
І гіне паспеўшы да жніва ўраджай».

2. Засяленне Міжрэчча і стварэнне арашальных сістэм. Берагі рэк Тыгра і Еўфрата, як і Ніла, у старажытнасці былі забалочаныя. Першыя жыхары, якія з'явіліся тут у VII тысячагоддзі да н. э., сяліліся па краях далін і на ўзвышаных месцах. Ім ужо былі вядомы земляробства і жывёлагадоўля. Жылі яны стала ў трысняговых хацінах, абмазаных глінай. Для земляробства знаходзілі прыдатныя палоскі зямлі, перад сяўбой апрацоўвалі іх матыкамі. Сеялі ячмень, разводзілі авечак і коз, а потым — свіней. Бліжэй да берагоў рэк былі вялікія балоты

з трысняговымі зараснікамі, дзе вадзілася шмат небяспечных драпежнікаў. Клімат з хмарамі назойлівых насякомых быў нездаровы. Бурныя паводкі рэк Тыгра і Еўфрата губілі жывёлу, пасевы і жыллё.

На працягу многіх стагоддзяў людзі асушалі балоты, стваралі арашальныя збудаванні. Рачная вада была асновай для вытворчасці галоўных жыццёвых прадуктаў. Добра было, калі вады хапала. А ў час вясенніх паводкаў прыходзілася змагацца з яе лішкам.

3. Земляробства — асноўны занятак жыхароў старажытнага Міжрэчча. Палявыя работы пачыналіся восенню з разрыхлення матыкамі глебы. Сеялі ўручную, потым баранавалі. Усходы рупліва даглядалі, пастаянна палівалі.

Самай распаўсюджанай палявой культурай быў ячмень, хаця сеялі пшаніцу і проса. Ураджаі збожжавых былі вельмі высокімі. У некаторых выпадках з аднаго пасеянага зярняці вырастала 80. З алейных раслін вырошчвалі *сезáм (кунжýт)*. Яго насенне ўтрымлівала $^1/_3$ частку алею ад агульнай вагі.

Сеялі гарох, бабы, гарчыцу. Важнае месца займаў лён, з якога рабілі палатно. Льняное семя выкарыстоўвалася як лякарства.

Садаводства адносілася да самых ганаровых заняткаў. Садоўнікі лічыліся асабліва руплівымі і ўмелымі работнікамі. Фінікавая пальма была найбольш распаўсюджаным садовым дрэвам. Яна пладаносіла на працягу 50—70 гадоў, даючы ў год да 50 кілаграмаў фінікаў. Свежыя і сушаныя

фінікі былі звычнай ежай. З іх соку рабілі мёд. Размочаныя ў вадзе костачкі скармлівалі жывёле. Лісце ўжывалася для пляцення. З кары рабілі вяроўкі і пражу.

Былі вядомы смакоўніца, гранатавае і тутавае дрэва, вінаград. На агародах садзілі цыбулю, салату, кроп, рэпу, буракі, радыску, агуркі. Займаліся развядзеннем кветак, у садах раслі ружы і лілеі.

Шырока распаўсюджваецца развядзенне буйной рагатай жывёлы. Яе выкарыстоўвалі пры арашэнні, ворыве, малацьбе як цяглавую сілу. Ялавічыну ў ежу ўжывалі рэдка — яе больш ахвяравалі багам. У якасці мясных і малочных жывёл разводзілі авечак і коз. Ужывалі шмат свінога мяса. З хатніх птушак былі вядомы куры, гусі, галубы і паўліны. Для перавозкі цяжару і верхавой язды выкарыстоўвалі аслоў.

Збудаванне арашальных сістэм садзейнічала значнаму павышэнню ўраджайнасці. Жыхары Міжрэчча пачалі збіраць вялікія ўраджаі, з'явіліся лішкі ежы. Гэта адкрывала магчымасць частцы насельніцтва перайсці ад земляробства і жывёлагадоўлі да іншых заняткаў.

4. Узнікненне рамяства. Ужо ў V тысячагоддзі да н. э. ганчары пачынаюць рабіць пасуду па заказах іншых людзей. За гэту працу ім плацілі збожжам і іншымі прадуктамі. Каменярэзы навучыліся рабіць каменныя вазы, чашы, кубкі. З медзі рабілі кінжалы і долаты.

Прычынай маруднага развіцця рамяства ў Міжрэччы была адсутнасць сваёй драўніны, каменя і металаў. З IV тысячагоддзя іх здабывалі, робячы набегі на тыя краіны,

дзе было многа таго ці іншага патрэбнага матэрыялу. З развіццём гандлю неабходную сыравіну выменьвалі на збожжа, шэрсць ці куплялі за срэбра.

Галоўнымі матэрыяламі для рамяства служылі, у першую чаргу, тыя, якіх было шмат у Міжрэччы: гліна, трыснёг, шэрсць, лён, скура і іншыя.

У рэлігіі старажытнага Міжрэчча адкрыццё рамёстваў прыпісвалася богу вады і мудрасці. Яго паважалі як апекуна і заступніка ганчароў, будаўнікоў, ткачоў, караблебудаўнікоў, шаўцоў, кавалёў і чаканшчыкаў.

Развіццю гандлю ў Міжрэччы спрыяла выгаднае спалучэнне рэк з галоўнымі караваннымі шляхамі. Поспехі ў рамястве і гандлі спрыялі ўзнікненню гарадоў ужо ў IV тысячагоддзі да н. э. Самым вядомым з іх з'яўляецца горад Ур, які ўпамінаецца і ў *Бібліі*.

Такім чынам, насельніцтва старажытнага Міжрэчча зрабіла вялікія поспехі ў арашаемым земляробстве, жывёлагадоўлі і рамястве — галоўных умовах узнікнення цывілізацыі.

Слоўнік.

Сезáм (кунжýт) — паўднёвая травяністая расліна, з насення якой здабываецца алей.

Смакóўніца — паўднёвае дрэва з сакавітымі салодкімі пладамі, падобнымі на маліну.

Каравáн — група ўючных жывёл, якія перавозяць грузы, людзей у пустынях, стэпах.

? **1.** У чым рэкі Тыгр і Еўфрат адрозніваюцца ад ракі Ніл? **2.** Назавіце галоўныя прыродныя багацці

старажытнага Міжрэчча. **3.** Якія земляробчыя культуры адыгрывалі найбольш важную ролю ў жыцці старажытных жыхароў Міжрэчча? **4.** Раскажыце аб развіцці рамяства ў Міжрэччы.

§ 16. Старажытнейшыя дзяржавы Міжрэчча

1. Узнікненне дзяржавы ў Паўднёвым Міжрэччы. У IV тысячагоддзі да н. э. узнікае не менш дзесяці гарадоў. Кожны з іх меў навакольную акругу з некалькімі вёскамі. Гарады і іх уладары імкнуліся палепшыць сваё становішча. Гэта прывяло да бясконцых ваенных сутычак. У адрозненне ад Егіпта, Міжрэчча з усіх бакоў было адкрыта для пранікнення шматлікіх перасяленцаў. У такіх складаных абставінах узнікаюць *гарады-дзяржавы.* На чале іх былі правіцелі, якія адначасова з'яўляліся і *галоўнымі жрацамі.* Сэнс «правіцель» перадаваўся на пісьме словамі «вялікі чалавек».

Правіцелі імкнуліся пашырыць межы сваіх уладанняў. Захавалася выява перамоганоснага правіцеля з кап'ём, наканечнік якога быў апушчаны ўніз. Перад ім са звязанымі рукамі сядзелі пакораныя ворагі, якім выколвалі вочы.

У выніку такіх перамог павялічвалася тэрыторыя дзяржавы, расла ўлада іх правіцелей.

Праца рабоў у гэты час выкарыстоўвалася мала. У рабскае становішча пераўтваралі ў асноўным жанчын. Арашальныя пабудовы рабілі абшчыннікі, як бедныя, так і сярэдняга дастатку.

2. Што расказалі знаходкі ў царскіх грабніцах горада Ура. У горадзе археолагі знай-

шлі каля дзвюх тысяч грабніц, дзе былі пахаваны прадстаўнікі знаці. Побач было адкрыта 13 вельмі багатых царскіх захаванняў. Іх грабніцы ўяўлялі сабой падземныя цагляныя збудаванні з 4—5 памяшканняў. Знойдзенае ў іх дазваляе дакладна ўстанавіць, што адбывалася ў час пахавання цароў. Нябожчыка ўносілі ў склеп у суправаджэнні некалькіх знатных прыбліжаных. Гэтых людзей атручвалі ці забівалі. Пасля гэтага грабніцу замуроўвалі.

Потым пачыналася другая частка пахавальнай дзеі. Да грабніцы падыходзілі прыбліжаныя, слугі, конюхі, музыканты з інструментамі, жанчыны, салдаты. Заязджалі калясніцы і павозкі. Усе трымалі ў руках маленькія кубачкі. У іх была атрута, якую ўсе адначасова выпівалі. Лічылася, што ўсе яны разам з пакойным царом пераходзяць у замагільны свет. Там яны будуць далей служыць свайму ўладару.

Затым магільшчыкі клалі арфы на раптоўна памёршых музыкантаў і ўсё засыпалі зямлёй.

У грабніцы цароў былі пакладзены залатыя шлемы, зброя, срэбраныя і залатыя пасудзіны, музычныя інструменты, пакрытыя каштоўнымі металамі. Добра захаваліся калясніцы і збруя.

На вялікім драўляным сундуку і дошках захаваліся карціны, выкладзеныя з кавалачкаў лазурыту і ракавін. На іх бачны сцэны вайны: калясніцы, пешыя воіны, статкі прыгнанай жывёлы, палонныя. Намаляваны і карціны прыдворнага жыцця.

Значыць, улада цароў была вельмі моц-

най, калі з яго смерцю пазбаўлялі жыцця многіх людзей.

3. Узвышэнне Вавілонскага царства. У тым месцы Міжрэчча, дзе рэкі Тыгр і Еўфрат бліжэй за ўсё падыходзяць адна да другой, узнік горад **Вавілон.** Яго назва азначае *«Вароты бога»*. Ён размясціўся ў цэнтры Міжрэчча. Тут сыходзіліся самыя важныя гандлёвыя шляхі. Таму гэты горад стаў вялікім.

Самым вядомым царом Вавілона быў **Хамурапі,** які правіў у 1792—1750 гадах да н. э. Ён быў умелым правіцелем як у справах сваёй краіны, так і ў адносінах з суседнімі дзяржавамі.

Хамурапі бязлітасна распраўляўся са сваімі ворагамі. З маленькага царства ён стварыў вялікую дзяржаву, якая ахапіла ўсю Месапатамію. Пры царстве Хамурапі ўзводзіліся прыгожыя пабудовы, ствараліся доўгія каналы. Але самай галоўнай яго заслугай з'яўляецца выданне вядомых у старажытнасці *законаў*.

4. Законы цара Хамурапі. Гэта першыя дасканалыя законы старажытных цывілізацый. Заканадаўца абвясціў у глыбокай старажытнасці высакародныя задачы. Мэтай яго законаў было: «Каб моцны не прыгнятаў слабага, каб быць справядлівым да сіраты і ўдавы, каб выказаць справядлівасць да прыгнечанага». Але на самай справе законы Хамурапі былі суровымі. Злачынцаў жорстка каралі.

Слоўнік.

Лазурыт — цёмнаблакітны паўкаштоўны камень.

? **1.** У якіх абставінах узнікалі гарады-дзяржавы ў Паўднёвым Міжрэччы? **2.** Аб чым сведчаць знаходкі ў царскіх грабніцах Ура? **3.** Чаму горад Вавілон зрабіўся вялікім і магутным?

З законаў Хамурапі

Калі ў доме чалавека ўспыхне пажар, а ў гэты час іншы чалавек будзе красці рэчы пагарэльца — злодзея трэба забіць.

Калі чалавек заб'е чужога вала, ён павінен аддаць вала за вала.

Калі чалавек мае доўг, яго жонка, сын або дачка павінны быць у рабстве 3 гады. На чацвёрты год іх трэба адпусціць на волю.

Калі чалавек выбіў зуб іншаму чалавеку, то павінны і яму выбіць зуб.

Калі чалавек адкрыў ваду з канала, быў неахайны і затапіў палі суседзяў — ён павінен расплаціцца за ўсе страты.

Калі чалавек украдзе малое дзіця ў іншага чалавека — злодзея трэба забіць.

§ 17. Пярэдняя Азія ў першай палове I тысячагоддзя да н. э.

1. Пачатак жалезнага веку. Жалеза ў прыродзе намнога больш, чым медзі. Першае жалеза было здабыта чалавекам яшчэ ў III тысячагоддзі да н. э. у краях на паўднёвым захадзе ад Каўказа. Доўгі час яно было вельмі каштоўным металам і выкарыстоўвалася для вырабу дарагой зброі і ўпрыгожанняў.

У канцы II тысячагоддзя да н. э. рамеснікі вынайшлі добрыя печы для вытворчасці жалеза з руды. У такія печы засыпалі драўняны вугаль і жалезную руду. Вугаль падпальвалі і для лепшага гарэння асобымі

мяхамі заганялі ў печ паветра. Стваралася высокая тэмпература, і жалеза выплаўлялася з руды і сцякала на дно печы. Кавалі рабілі з яго цвёрдыя прылады працы і зброю.

Распаўсюджанне вытворчасці жалеза і прылад працы з яго дазволіла апрацоўваць цвёрдыя глебы за межамі рачных далін. Жалезныя лапаты, матыкі, лемяшы для плугоў дазволілі распаўсюдзіць цывілізацыю ў стэпы і перадгор'і Пярэдняй Азіі. *Жалезныя прылады працы спрыялі хуткаму развіццю рамяства.*

2. Узвышэнне Асірыі. З пачаткам жалезнага веку ўзрасла магутнасць **Асірыі.** Яна была размешчана ў паўночным Міжрэччы са сталіцай у горадзе **Ніневіі.** Асірыйцы стварылі вельмі моцную армію з многімі родамі войск. Яны пачалі ўжываць конніцу.

Асірыя ў VIII—VII стагоддзях да н. э. заваявала Вавілонію, Палесціну, Сірыю, Фінікію, перамагла Егіпет. Асірыйцы былі самымі жорсткімі і бязлітаснымі захопнікамі на Пярэднім Усходзе. Яны прыдумалі звыш жорсткія кары для заваяваных народаў: здымалі з жывых людзей скуру, жыватом садзілі на завостраны кол, распаленымі жалезнымі прутамі выколвалі вочы.

Захопнікі ганарыліся сваімі зверствамі. З усімі падрабязнасцямі сцэны расправы распісаны на рэльефах у палацах асірыйскіх цароў. Там бачны горы адсечаных людскіх галоў. Асірыйскія воіны з шаленствам высякаюць сады ў заваёваных краінах, бураць і паляць гарады, засыпаюць пяском арашальныя збудаванні.

З такой жа лютасцю яны адносіліся і да жывёл. Гэта бачна ў сцэнах царскіх паляванняў. Ім было прыемна глядзець на звера, прабітага шматлікімі стрэламі, які сцякаў крывёю.

У канцы VII стагоддзя да н. э. суседнія краіны аб'ядналіся супраць Асірыі. Галоўную ролю ў разгроме Асірыі адыграла *Вавілонскае царства,* якое зноў узвысілася. У 612 годзе да н. э. была захоплена і спалена Ніневія. Праз некалькі гадоў былі разбіты рэшткі асірыйскага войска.

Аб падзенні Ніневіі. *(Паводле Бібліі)*

«Гора табе, горад крывавы, поўны ашуканства, бесперапынных грабяжоў! Чутны лясканні бізуноў, іржанне коней і грукат хуткіх калясніц! Нясецца конніца, зіхаціць меч і блішчыць кап'ё! Шмат забітых і горы трупаў. Усе натыкаюцца на іх. Ніневія разбурана! Хто будзе шкадаваць яе? Бо хто не адчуў на сябе злосці тваёй?»

3. Старажытныя арыі. У другой палове III тысячагоддзя да н. э. у стэпах паміж рэкамі Дунаем і Волгай рассяліліся шматлікія плямёны арыяў. Яны былі качэўнікі-жывёлаводы. Тут, у стэпах, яны першымі прыручылі каня і зрабілі яго адным з галоўных памочнікаў чалавека.

Ішоў час, арыі ўсё далей рассяляліся за Волгу. У канцы III тысячагоддзя да н. э. яны канчаткова падзяліліся на дзве часткі — усходнюю і заходнюю.

Усходнія арыі перасяліліся далей на паўднёвы ўсход і ў II тысячагоддзі да н. э. дасягнулі Індыі. А заходнія ў канцы

II тысячагоддзя да н. э. рушылі на паўднёвы захад і пасяліліся на ўсход ад Міжрэчча. Тут яны падзяліліся на некалькі плямён, буйнейшым з якіх былі персы. Гэта мясцовасць пачала называцца **Іранам**, што азначае *«краіна арыяў»*.

4. Стварэнне Персідскага царства. Персы, як і іх продкі, былі качэўнікамі. Але к пачатку I тысячагоддзя да н. э. ва ўрадлівых далінах Ірана з'явіліся і персы-земляробы. Менавіта ў іх упершыню ў Іране з'явілася жалеза. Гэта паскорыла рост насельніцтва і пераход усё большай колькасці людзей да земляробства. Сталі ўтварацца першыя дзяржавы.

У сярэдзіне VI стагоддзя да н. э. уладар адной з персідскіх дзяржаў **Кір** з дынастыі **Ахеменідаў** змог падпарадкаваць сабе суседзяў і абвясціў сябе царом. Ён стварыў моцнае і дысцыплінаванае войска, яго асновай была конніца і пешыя стралкі з лука. Шмат што ў арганізацыі войска Кіра было падобна на армію Асірыі.

З часам персідская армія стане мацнейшай у Пярэдняй Азіі. У 538 годзе да н. э. Кір захапіў Вавілон. Многія з вавілонян не пярэчылі гэтаму. Яна бачылі ў Кіры магутнага саюзніка і заступніка.

Не спыніліся заваёвы і пасля смерці Кіра. Персы ўварваліся ў Егіпет і ў 525 годзе да н. э. захапілі яго. Так утварылася вялікае і моцнае царства, празванае **Персідскай дзяржавай.**

5. Персідская дзяржава ў канцы VI — пачатку V стагоддзя да н. э. Пасля захопу Егіпта межы Персідскай дзяржавы пашырыліся ад ракі Інда да Эгейскага мора

і Паўночнай Афрыкі. Царом персаў у гэты час стаў Дарый I.

Дзяржава была падзелена на часткі — *сатрáпіі.* Кожнай з іх кіраваў *сатрáп* — управіцель. Галоўным абавязкам сатрапа быў збор падаткаў. Падаткі на карысць цара і арміі былі вельмі вялікімі. Акрамя гэтага, шмат юнакоў забіралі ў царскае войска. З таго часу слова «сатрап» атрымала яшчэ адзін сэнс — «мучыцель», «жорсткі чалавек». У гэтым сэнсе слова ўжываецца і цяпер.

Дарый I пачаў адбіваць залатую манету са сваёй выявай. Пры ім узнікла конная пошта — коннікі, якія скакалі з усіх канцоў дзяржавы са звесткамі цару і назад з царскімі загадамі.

Персідскія парадкі ў многіх заваяваных краінах замянілі больш жорсткія законы і звычаі. Але незадаволеных сатрапамі і іх прыслужнікамі заставалася вельмі шмат. Часта па ўсёй дзяржаве выбухалі паўстанні. Яны жорстка і хутка падаўляліся.

Нягледзячы на велізарныя памеры дзяржавы, Дарый I марыў аб яе пашырэнні. Асабліва яго вабілі заможныя *грэчаскія гарады.* Таму з пачатку V стагоддзя да н. э. Персідская дзяржава пачала рыхтавацца да новага вялікага паходу. На гэты раз — на **Балканскі паўвостраў.**

На працягу VI стагоддзя да н. э. у Пярэдняй Азіі ўтварылася новае магутнае царства — Персідская дзяржава, якая неўзабаве ператворыцца ў сусветную.

Дарый I сам аб сабе.

Гаворыць Дарый-цар: «Па волі бога для праў-

дзівага я сябр, для несправядлівага я вораг. Маё жаданне — справядлівасць. Я не запальчывы. Калі я ў гневе, я цвёрда трымаю яго ў сваёй душы, я цвёрда паную над сабою. Я не жадаю, каб слабы цярпеў несправядлівасць праз моцнага. Але я не жадаю, каб і моцны цярпеў несправядлівасць праз слабага. Як кіраўнік войска — я выдатны кіраўнік войска. Я маю нястомную моц у руках і нагах, як коннік — я выдатны коннік. О, падданы, ведай, якая мая перавага. Не лічы хлуснёй тое, што я зрабіў».

● Што ставіць сабе ў заслугу Дарый I? Чаму менавіта гэта важна для яго падданых?

Надпіс Дарыя I каля Суэцкага канала.

«Гаворыць Дарый — цар: Я перс. З Персіі я заваяваў Егіпет. Я загадаў выкапаць гэты канал ад ракі Ніла, якая цячэ ў Егіпце, да мора, якое даходзіць да Персіі. Потым гэты канал выкапалі, як я загадаў. І караблі паплылі з Егіпта праз гэты канал у Персію. Такой была мая воля».

Слоўнік.

Рэльеф — выпуклы адбітак, малюнак на роўнай паверхні.

? **1.** Назавіце важнейшыя вынікі ўжывання жалезных прылад працы. **3.** У чым бачна жорсткасць асірыйцаў да заваёваных народаў? **3.** Хто такія арыі? **4.** Што вы ведаеце аб Персідскай сусветнай дзяржаве?

Магутнасць і жорсткасць цароў старажытнага Міжрэчча. *(Паводле Бібліі)*

«Вавілоняне народ жорсткі і нестрымальны, які ходзіць па ўсёй зямлі і заваёўвае чужыя пасяленні. Страшны і грозны ён, хутчэй барсаў яго

коні, яны спрытней вячэрніх ваўкоў. Скача ў розныя бакі яго конніца. Здалёк яна з'яўляецца, налятае, як арол на здабычу.

Ідзе ён для рабаўніцтва, бярэ палонных як пясок. Над царамі ён здзекуецца, князі яму служаць пасмешышчам. Над усякай крэпасцю ён смяецца — насыпае абложны вал і бярэ яе. Усіх ён чапляе як вудай, захоплівае ў невады свае, пры гэтым радуецца і святкуе».

Служба сувязі ў Персідскай дзяржаве

Няма ў свеце нічога хутчэйшага за гэтых пасланцоў, бо вельмі добра ўладкавана паштовая служба ў персаў. На працягу ўсяго шляху ў іх стаяць коні і людзі, гэткім чынам на кожны дзень падарожжа даводзіцца асобны конь і чалавек. Ні снег, ні дождж, ні спякота, ні нават ноч не ў стане перашкодзіць кожнаму конніку пераадолець з як мага большай хуткасцю адпаведны адрэзак шляху. Першы пасланец перадае звестку другому, другі — трэцяму. Гэтак звестка пераходзіць з рук у рукі, пакуль не дасягне адрасата.

§ 18. Культура Пярэдняй Азіі ў I тысячагоддзі да н. э.

1. Вавілон і яго пабудовы. Жыхары старажытнай Пярэдняй Азіі навучыліся будаваць добра ўладкаваныя гарады. У іх былі шырокія вуліцы, якія перасякаліся пад прамымі вугламі. Яны былі абсаджаны пальмамі і іншымі раслінамі.

Вельмі раскошнымі і вялікімі былі гарады-сталіцы — Ніневія і асабліва — Вавілон. Ён у плане ўяўляў амаль правільны прамавугольнік даўжынёй у 8 кіламетраў і шырынёй — у 4 кіламетры. Рака Еўфрат дзяліла

Вавілон на дзве паловы. Яны злучаліся шырокім мастом, апоры якога ўстаялі да нашых часоў. Горад акружаў шырокі і глыбокі роў, запоўнены вадой і абкладзены цэглай. Горад абаранялі два рады шырокіх сцен з зубчастымі вежамі. У сценах, вышыня якіх дасягала 100 метраў, было 8 варот, ад якіх ішлі прамыя і шырокія вуліцы.

Прасторная галоўная дарога, па якой праводзіліся мнагалюдныя шэсці, вяла да высокіх двайных варот. Яны былі выкладзены *ка́фляй* — сінімі і аранжавымі пліткамі з бліскучай паверхняй. На такім фоне былі рэльефы львоў з выскаленымі зубамі, свяшчэнных быкоў і фантастычных звяроў.

У цэнтры Вавілона знаходзіўся вялікі царскі палац. Яго сцены былі выкладзены кафлямі з яркімі залацістымі рэльефамі. Асабліва пышна былі ўпрыгожаны сцены прыёмнай палаца, дзе стаяў трон вавілонскага цара.

Побач з палацам узвышалася дзіўная пабудова — вядомыя ў старажытнасці «вісячыя сады», якія лічылі «цудам свету». Яны былі размешчаны на шырокай чатырохпавярховай уступчатай вежы. Там на асоба ўмацаванай падлозе паверхаў быў насыпаны тоўсты пласт урадлівай зямлі. На ёй раслі пальмы, дзівосныя расліны і пладовыя дрэвы, а таксама кветкі. Да кожнага паверха быў праведзены водаправод для арашэння садоў. У яго рабы качалі ваду з Еўфрата з дапамогай умела зробленых водапад'ёмных прыстасаванняў.

У сярэдзіне ўзвышалася Вавілонская

вежа. Гэта быў уступчаты сяміярусны храм галоўнага бога Вавілона, вышынёй у 90 метраў. Кожны ўступ быў афарбаваны ў асобны колер, а самы верхні — пазалочаны. На вежу ўзыходзілі па знешніх лесвіцах, на кожным ярусе былі пляцоўкі.

Простых вавілонян пераконвалі ў тым, што ў памяшканні на версе вежы жыве сам бог са сваёй жонкай. Права ўваходу сюды мелі толькі *вярхоўныя жрацы*. З храмавых вежаў Вавілоніі жрацы назіралі за рухам зорак і планет.

Ва ўсім старажытным свеце Вавілон славіўся сваімі базарамі, дзе гандлявалі таварамі з усяго свету.

2. Развіццё навуковых ведаў. Галоўнымі цэнтрамі пісьменнасці былі школы пры палацах і храмах. Школа называлася «дом таблічак». Дырэктара школы звалі «бацькам дома таблічак», а вучняў — «сынамі дома таблічак». Акрамя іншых настаўнікаў, у школах быў настаўнік малявання, а таксама «выхавацель з лазой», які наглядаў за паводзінамі вучняў і наведваннем імі ўрокаў.

У школе за партамі з гліны і каменя сядзелі вучні, будучыя пісцы, чыноўнікі, суддзі, рахункаводы.

Акрамя звычайных школ, былі і вышэйшыя вучылішчы. У іх прымалі толькі пісьменных юнакоў. Тут вывучалі такія прадметы, як святарныя навукі, астраномію, прыродазнаўства, фізіку, хімію, медыцыну.

Патрэбы школ і вучылішч абслугоўвалі бібліятэкі «гліняных кніг». Там таблічкі захоўваліся ў гліняных жбанах і скрынях, а таксама ў карзінах з лазы. Яны былі

размешчаны ў строгім парадку і з суправаджальнымі надпісамі. Да нашага часу захаваліся бібліятэчныя каталогі. У іх назвы букваро́ў, іншых падручнікаў, слоўнікаў вавілонскай мовы і замежных моў.

У школах вучылі ліку і вымярэнням. Захаваліся зборнікі задач. Іх рашалі з ужываннем дробных лікаў. Былі вядомы ўзвядзенне ў ступень, здабыванне кораня, рашэнне ўраўненняў з адным і двума невядомымі. Вучоных-матэматыкаў называлі «мудрыя пісцы лічбаў».

Геаметрыя служыла і практычным мэтам. Трэба было вылічаць памеры поля, колькасць збожжа для высеву. Кожны год пасля паводак, якія змывалі межы палёў, неабходна было занава перамяраць плошчы надзелаў. Трэба было вылічваць колькасць грунту для ўзвядзення плаціны. Вызначаць грузападʼёмнасць карабля, ёмкасць карзіны, бочкі, жбана.

Назіранне за зоркамі і планетамі і за пераменамі ў прыродзе прывяло да складання першых астранамічных і метэаралагічных даведнікаў. Гэтыя назіранні прывялі да з'яўлення *календара*. Час абароту Месяца вакол Зямлі складаў месяц. Яго было прынята дзяліць на 4 часткі, ці *тыдні*. У вавілонян, як і ў нас, быў сямідзённы тыдзень. Яны паспяхова прадказвалі *зацьменні* Месяца і Сонца.

Аб развіцці вавілонскай медыцыны сведчыць праца, выкананая на 40 таблічках. Яна складаецца з пяці частак. Найбольш цікавай і карыснай з'яўляецца тая, дзе пералічаны прыкметы розных хвароб. Вядомы кіраўніцтвы для ўрачоў па хваробах

вушэй, вачэй, дыхальных шляхоў, хваробах печані, страўніка. У Міжрэччы ўжо ў III тысячагоддзі да н. э. з'явілася эмблема бога здароўя ў выглядзе дзвюх змей вакол жэзла. Гэта вельмі падобна на сучасны сімвал медыцыны. Вавілонскіх урачоў за іх уменні ахвотна запрашалі ў іншыя старажытныя краіны.

3. Фінікійцы і ўзнікненне алфавіта. На ўсходніх берагах Міжземнага мора жыў невялікі па колькасці народ — *фінікійцы*. Яны насялялі вельмі багатую мясцовасць. На ўзбярэжжы мора былі выдатныя ўмовы для земляробства і садаводства. Паблізу раслі кедравыя і дубовыя гаі. Тут канчаліся галоўныя караванныя і пачыналіся марскія гандлёвыя шляхі. Вось чаму тут узніклі багатыя гандлёвыя гарады, самым вядомым з якіх быў **Цір**.

Гарадскія жыхары займаліся гандлем і рамяством. Асабліва ўмела фінікійцы апрацоўвалі металы і ткалі далікатныя ваўняныя тканіны. Яны фарбавалі іх у вынайдзеную ў старажытнасці вельмі прыгожую фарбу — *пурпур*. Гэтыя тканіны незвычайнага чырвонага колеру ўжываліся ў многіх краінах толькі царамі і знаццю.

Але больш за ўсё фінікійцы славіліся мараплаваннем і караблебудаваннем. Яны не толькі добра ведалі краіны па берагах Міжземнага мора, але і выплывалі ў **Атлантычны акіян** і дасягалі далёкіх мясцін у **Еўропе** і **Афрыцы**. Вялікімі былі геаграфічныя веды фінікійцаў. На берагах і астравах Міжземнага мора яны заснавалі шэраг сваіх сяленняў — *калоній*. Самай багатай і вялікай з іх стаў **Карфаген**.

Фінікійцы зрабілі важкае культурнае вынаходства. Яны стварылі самую простую пісьменнасць. Як вам вядома, самыя старажытныя пісьменнасці ўзніклі ў Егіпце і Паўднёвым Міжрэччы ў IV тысячагоддзі. Але яны былі складанымі і грувасткімі, змяшчалі сотні пісьмовых знакаў.

Фінікійцы ўдасканалілі *егіпецкае пісьмо*, у якім некаторыя знакі абазначалі не толькі словы, але і зычныя гукі. Яны прыдумалі алфавіт, які складаўся з 22 зычных гукаў-літар. З самага пачатку літары знешне нагадвалі малюнкі прадметаў ці жывых істот. Пазней фінікійскі алфавіт быў прыстасаваны для пісьма на розных мовах. Беларускі алфавіт таксама мае фінікійскае паходжанне.

Найбольш значныя дасягненні старажытнай культуры Пярэдняй Азіі былі ўспрыняты пазнейшымі цывілізацыямі.

Герадот аб плаваннях фінікійцаў.

Па загаду егіпецкага фараона Неха ў VI ст. да н. э. фінікійцы зрабілі плаванне вакол Афрыкі. У гэты час быў пабудаваны канал, які звязаў Ніл з Чырвоным морам.

Фінікійскія караблі з Міжземнага мора падняліся па Нілу, а потым па каналу выйшлі ў Чырвонае мора. Караблі паплылі на поўдзень уздоўж афрыканскага ўзбярэжжа. Каб не страціць шлях і не згубіцца ў бязмежным акіяне, фінікійцы плылі так, каб заўсёды бачыць берагі Афрыкі.

Плаванне было вельмі працяглым. Вясной караблі падыходзілі да берага. Фінікійцы апрацоўвалі зямлю і чакалі збору ўраджаю. Назапасіўшы харчоў, яны плылі далей. На трэці год караблі прайшлі праз Гібралтарскі праліў і ўвайшлі ў

Міжземнае мора. Хутка яны былі ўжо ў Егіпце. Гэта было доказам таго, што Афрыка з усіх бакоў абкружана морамі.

Слоўнік.

Бібліятэ́чны катало́г — спіс кніг, складзены ў пэўным парадку.

Кало́нія — паселішча жыхароў дзяржавы ў іншых краінах.

? **1.** Раскажыце аб найбольш значных пабудовах Вавілона. **2.** Якім прадметам вучылі ў школах і вучылішчах старажытнага Міжрэчча? **3.** Назавіце асноўныя дасягненні фінікійцаў.

Апісанне школы (дома таблічак) у Старажытнай Месапатаміі

У доме таблічак наглядальнік
Зрабіў мне заўвагу: «Чаму ты спазніўся?»
Я напалохаўся, сэрца маё хутка закалацілася,
Падышоўшы да настаўніка, я скланіўся да зямлі.
Бацька дома таблічак паглядзеў маю таблічку,
Ён быў ёй незадаволены і ўдарыў мяне.
Бацька дома таблічак паклаў перада мною іншую таблічку.
Было на гэтай таблічцы і тое, чаго я не разумеў,
Чаго не змог прачытаць.
Тады наглядальнік зрабіў мне заўвагу:
«Чаму ты размаўляў без дазволу?»
— І ўдарыў мяне.
Настаўнік сказаў:
«Чаму ты кланяўся без дазволу?»
— І ўдарыў мяне.
Чалавек з палкай сказаў:
«Чаму ты ўстаў без дазволу?»
— І ўдарыў мяне...
Лёс пісца абрыд мне,
Лёс пісца я ўзненавідзеў.

Аддзел III.
Старажытная Індыя

§ 19. Індская цывілізацыя

1. Месцазнаходжанне і прырода Старажытнай Індыі. На поўдні Азіі, за Гімалайскім хрыбтом, размешчана дзіўная краіна — **Індыя.** Яе гісторыя налічвае ўжо амаль 8 тысяч гадоў. Але сучасная Індыя адрозніваецца па сваіх памерах ад старажытнай краіны пад гэтай назвай.

Па сваёй плошчы **Старажытная Індыя** была прыкладна роўнай Егіпту, Месапатаміі, Малой Азіі, Ірану, Сірыі, Фінікіі і Палесціне, разам узятым.

Натуральна, што на такой велізарнай тэрыторыі былі разнастайныя прыродныя ўмовы.

На захадзе працякала рака **Інд.** Дажджы выпадалі параўнальна рэдка. Але ўлетку былі вялікія паводкі. Былі тут і прасторныя стэпы.

На ўсходзе неслі свае воды ў **Індыйскі акіян** рэкі **Ганг** і **Брахмапу́тра.** Тут заўсёды ішлі праліўныя дажджы, а ўся зямля была пакрыта гразкімі балотамі і *джунглямі* — непраходнымі зараснікамі дрэў і хмызнякамі, дзе нават удзень пануе змрок. Тут вадзіліся тыгры, пантэры, сланы, атрутныя змеі і мноства разнастайных насякомых.

Сярэдзінная і паўднёвая часткі Індыі

ў старажытнасці ўяўлялі сабой гарыстыя прасторы, дзе заўсёды было спякотна і выпадала многа дажджоў.

Але багацце вільгаці далёка не заўсёды было карысным. Густая расліннасць і балоты былі цяжкай перашкодай для старажытных земляробаў, якія мелі каменныя і медныя тапары. Таму першыя сталыя пасяленні ўзнікаюць у Індыі на менш лясістым паўночным захадзе краіны. У даліны Інда была і яшчэ адна перавага. Яна была размешчана бліжэй да старажытных цывілізацый Пярэдняй Азіі, што палягчала сувязі і гандаль з імі.

2. Цывілізацыя даліны Інда. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя вучоныя нічога не ведалі аб існаванні ў Індыі старажытнай цывілізацыі. Першыя археалагічныя раскопкі пачаліся ў 1921 годзе, калі была адкрыта вялікая культура. Яе ўзрост быў прыкладна аднолькавым з **Егіпецкай** і **Шумерскай цывілізацыямі.**

Былі знойдзены гарады, пабудаваныя яшчэ ў III тысячагоддзі да н. э. Некаторыя з іх пераўзышлі па памерах тагачасныя егіпецкія гарады. Гэта дзве сталіцы самай вялікай дзяржавы III тысячагоддзя да н. э., якія зараз называюць **Махенджа-Дара** і **Харапа.** Адлегласць паміж імі складала крыху менш за 650 кіламетраў. Яны знаходзіліся ў сярэдзіне вялікай тэрыторыі, на якую працягнулася Індская цывілізацыя.

Колькасць насельніцтва Махенджа-Дары і Харапы было прыкладна аднолькавым — каля 100 тысяч чалавек. Абодва гарады таксама складаліся з дзвюх частак. Гэта ўмацаваны цаглянай сцяной верхні горад.

Ніжняя частка не была ўмацаванай. Шырыня вуліц даходзіла да 10 метраў. У абодвух гарадах былі вялікія збожжасховішчы. Напэўна, старажытныя жыхары даліны Інда збіралі добрыя ўраджаі.

Росквіт цывілізацыі прыходзіцца на час з 2300 па 1900 гады да н. э. Затым жыццё ў даліне Інда паступова заціхае. Прыблізна ў 1750 годзе да н. э. жыхары пакінулі Махенджа-Дару. Цывілізацыя канчаткова знікае да сярэдзіны II тысячагоддзя да н. э. Прычыны гэтай з'явы вучоным пакуль невядомы.

Раскопкі ў Махенджа-Дара.

У 1921—1922 гг. ля ракі Інд пачаліся раскопкі. Праводзіў іх археолаг Д. Маршал. Адразу ён зразумеў, што зрабіў вялікае адкрыццё. У трох кіламетрах ад ракі быў раскапаны горад, які меў каля пяці кіламетраў у даўжыню і прыблізна столькі ж у шырыню. Ад ракі яго абаранялі штучныя насыпы. Сам горад быў падзелены на дванаццаць прыблізна аднолькавых кварталаў, ці «астравоў». Кожны з іх быў 384 м з поўначы на поўдзень і 228 м з усходу на захад. Кожны «востраў» у сваю чаргу меў роўныя прамыя вуліцы. Цэнтральны «востраў» у заходняй частцы быў штучна ўзняты на пануючую вышыню каля 6—12 метраў. Гэта ўзвышша было пабудавана з гліны і сырой цэглы. Сам жа «востраў» наогул быў умацаваны квадратнымі вежамі, якія таксама былі зроблены з цэглы. Гэта была галоўная частка горада.

Такім чынам была адкрыта найстаражытнейшая цывілізацыя Індыі, якая да гэтага часу захоўвае шмат сваіх таямніц.

3. Гаспадарка старажытных індцаў. Галоў-

ным заняткам жыхароў даліны Інда было земляробства. Але яны не ведалі арашэння, якое шырока выкарыстоўвалася ў той час у Егіпце ці Міжрэччы. Часта разліваўся Інд, ды і дажджы тут не былі рэдкасцю. Расцілі пшаніцу, ячмень, гарох, проса, джут і, упершыню ў свеце, *бавоўну*. Для вырошчвання гэтых культур хапала вільгаці.

Жывёлагадоўля была падсобным заняткам, але добра развітым. Разводзілі кароў, авечак, коз, свіней, аслоў. Ужо прыручылі сланоў і курэй. Коні сталі вядомы на закаце цывілізацыі.

Рамяство ў індскіх гарадах таксама было дастаткова развітым. Для вырабу прылад працы выкарыстоўвалі *бронзу* і *свінец*. Жалеза яшчэ не ведалі. Упрыгожанні рабілі з золата.

Асвоілі *плаўку* і *пайку медзі* і *сплаваў*. Вядома было і *мастацкае ліцё*. Знойдзены нажы, наканечнікі коп'яў і стрэл, тапары і шмат іншага. Добра рабілі каменныя рэчы.

Важную ролю адыгрывалі прадзенне і ткацтва. Ужо тады Індыя вывозіла *бавоўняныя тканіны* ў суседнія краіны. Расквітнела ганчарная справа. Высокага ўзроўню майстэрства дасягнулі *ювеліры*. Яны апрацоўвалі каштоўныя металы і камяні, слановую косць і ракавіны.

Высокага ўзроўню дасягнуў *сухапутны* і *марскі гандаль*. У 1950 годзе археолагі знайшлі першы ў гісторыі чалавецтва спецыяльны *порт* для стаянкі караблёў у час адліву мора.

Найбольш актыўны гандаль ішоў з Паўднёвым Міжрэччам. Сюды з Індыі выво-

зілі бавоўну, вырабы з косці, каштоўных камянёў. У Індыю прывозілі ячмень, агародніну, фрукты. Былі гандлёвыя сувязі нават з востравам **Крыт** у Міжземным моры. Індыйскія вырабы траплялі ў Егіпет. Напэўна, індцы гандлявалі і з суседнімі качавымі народамі і нават пабудавалі горад на рацэ **Амудар'я.**

4. Грамадскі лад і культура. Пакуль мала звестак аб грамадскім ладзе і культуры індскіх гарадоў. Справа ў тым, што яшчэ не разгадана пісьменнасць старажытных індцаў. Іх першыя надпісы з'явіліся каля 2400 года да н. э. У пісьме індцаў было 396 *знакаў-іерогліфаў*. Яны пісаліся на медных таблічках або на гліняных чарапках. Агульны лік іерогліфаў у адным надпісе рэдка перавышаў 10 знакаў, а найбольшая колькасць — 17.

Нават без разгадкі пісьмовых тэкстаў вучоным вядома, што ў III і першай палове II тысячагоддзя да н. э. у даліне Інда існавала вялікая дзяржава. Жыхары дзяліліся на некалькі грамадскіх класаў. Дакладна невядома, хто быў на чале дзяржавы. Але вялікую ролю ў жыцці грамадства адыгрывалі *жрацы*.

У рэлігіі старажытныя індцы пакланяліся *багіні-матцы* і *трохтварнаму богу*, апекуну жывёлаводаў. Абогатварыліся некаторыя расліны і жывёлы, асабліва *бык* і *аднарог*. Магчыма было пакланенне вадзе як жыватворнай сіле. Аб гэтым сведчаць шматлікія культавыя басейны ў гарадах Махенджа-Дара і Харапа. Верылі ў замагільнае жыццё.

Такім чынам, ужо ў III тысячагоддзі

да н. э. у Індыі існавала цывілізацыя, утварылася вялікая дзяржава з грамадскімі класамі. Жыхары даліны Інда стварылі вялікую гарадскую культуру, падобную егіпецкай і месапатамскай.

Слоўнік.

Джут — травяністая расліна, валокны якой ідуць на выраб грубых тканін, вяровак.

Ювелі́р — майстар, які вырабляе ўпрыгожанні з каштоўных металаў, з каштоўнымі камянямі.

Аднаро́г — марская жывёліна сямейства дэльфінавых з доўгім біўнем у верхняй сківіцы.

! **1.** Якім заняткам спрыяла прырода Індыі ў старажытнасці? **2.** Чаму старажытнейшыя дзяржавы ўзніклі ў даліне Інда? **3.** Чым адрознівалася жыццё старажытных індцаў ад жыцця іншых старажытных цывілізаваных народаў III — пачатку II тысячагоддзя да н. э.?

Як захаваў жыццё продак усіх індыйцаў. *(Паданне аб сусветным патопе)*

Ён меў імя Ману. Раніцай, калі ён мыўся, яму ў рукі трапілася малюсенькая рыбка. Яна сказала яму чалавечым голасам: «Вырасці мяне, і я выратую цябе. Праз некаторы час усё жывое згубіць сусветны патоп. А я аднаго цябе выратую». «Але як мне цябе вырасціць? — спытаў Ману. Рыбка адказала: «Пакуль мы маленькія, нас амаль заўсёды глынаюць вялікія рыбіны. Спачатку ты мяне гадуй у жбане. Калі мне стане цесна — выкапай мне звычайную яму і дзяржы мяне ў ёй. Калі і там мне стане цесна, выпусці мяне ў мора. Там я ўжо буду ў бяспецы».

Гэта парода рыб, з рогам над вачыма, вельмі хутка расце. Яна сказала Ману: «Наступіць год, у якім

адбудзецца патоп. Таму ты паслухай мяне і збудуй карабель. Калі патоп пачнецца — узыдзі на яго і я цябе выратую». Ману ўсё так і зрабіў.

Ужо ў час патопу рыба прыплыла да карабля Ману, прычапіла канат карабля да свайго рогу і пацягнула яго да вялікай поўночнай гары. На самым версе расло вялікае дрэва. Рыба сказала Ману: «Прывяжы карабель да дрэва, каб вада не знесла яго ўніз, пакуль ты будзеш на гары. А як толькі вада пачне спадаць — ты паволі спускайся ўніз.

Такім чынам ён спусціўся. З тых пор гэты склон гары завецца «Сход Ману». Патоп тады згубіў усё, толькі адзін Ману і застаўся ў жывых.

§ 20. Прыход арыяў і каставы лад у Старажытнай Індыі

1. Пранікненне арыяў. Вы ўжо ведаеце, што *арыйскія плямёны* падзяліліся на дзве часткі. Заходнія *арыі* накіраваліся на паўднёвы захад у **Іран.** А ўсходнія ў сярэдзіне II тысячагоддзя да н. э. з паўночнага захаду праніклі ў Індыю. Арыі былі *качэўнікамі* і таму рухаліся дастаткова хутка. Першыя з *індаарыяў,* ці ўсходніх арыяў, яшчэ паспелі застаць апошнія гарады індскай цывілізацыі. Жыхароў гэтых гарадоў прышэльцы-качэўнікі празвалі дасамі, ці «чужымі». Часта арыі да мясцовых жыхароў ставіліся варожа.

Розніліся індаарыі і індцы і колерам скуры. У арыяў яна была светлай, у індцаў — цёмнай.

Паступова знікаюць індскія пасяленні, а самі індцы змешваюцца з індаарыямі. К пачатку I тысячагоддзя да н. э. Індыю засяляў адзін народ — *індыйцы.* Менавіта

яны і былі заснавальнікамі новай цывілізацыі і культуры. Развіваючыся, яна праіснавала потым амаль *тры тысячы гадоў*. Прамымі нашчадкамі гэтай цывілізацыі стаў сучасны індыйскі народ і яго суседзі.

2. Гаспадарчае жыццё індыйцаў. Цывілізаваныя індскія гарады знікалі. Арыі ж значна адставалі ад індцаў у гаспадарчым развіцці. Асноўным іх заняткам заставалася жывёлагадоўля. Як вы памятаеце, арыі былі першымі, хто прыручыў *каня*. Разводзілі таксама *кароў*. Усе прылады працы былі меднымі і каменнымі. Вялікі ўплыў на жыццёвы лад аказвалі войны.

З пранікненнем у Індыю індаарыі многія ўменні запазычылі ў тубыльных жыхароў. Яны хутка прыстасаваліся да мясцовых прыродных і кліматычных умоў.

К канцу II — пачатку I тысячагоддзя да н. э. індыйцы ў асноўным перайшлі да земляробства. Узнаўляліся пасевы пшаніцы, ячменю, проса. У I тысячагоддзі да н. э. зноў асвоілі бавоўну і джут. Асабліва добрыя ўраджаі збіралі земляробы даліны ракі Ганг.

Разам з канём і каровай сваё месца ў гаспадарцы занялі слон, авечка, каза і асёл. Значна дапамагалі чалавеку ў барацьбе з непралазнымі джунглямі сланы.

Хутка асвоіўшы бронзу, ужо ў пачатку I тысячагоддзя да н. э. індыйцы навучыліся здабываць *жалеза*. Тапары і іншыя прылады працы з жалеза паскорылі асваенне новых зямель. Будаваліся *плаціны* і *каналы* для адводу лішкаў вады.

Неўзабаве адрадзілася *рамяство*. Акрамя вытворчасці вырабаў з бронзы, жалеза,

медзі, былі добра развіты ганчарная справа і ткацтва. Індыйцы рабілі настолькі якасныя баваўняныя тканіны, што адзенне з іх можна было прасунуць праз маленькі пярсцёнак. Гэтыя тканіны былі вельмі дарагімі. У гонар багіні пашы Сіты іх назвалі *«сіцец»*. Разам з паркалем ткаліся і больш простыя баваўняныя тканіны.

Лічыцца, што індыйцы першымі навучыліся рабіць *цукар* з *цукровага трыснягу*.

Гандаль быў развіты слаба. Ён абмяжоўваўся абменам таварамі паміж суседнімі пасяленнямі.

3. Грамадскі лад індыйцаў у канцы II—I тысячагоддзя да н. э. Прышлыя ў Індыю плямёны індаарыяў перамешваліся з мясцовым насельніцтвам. З цягам часу сталі ўзнікаць *суседскія абшчыны*. Але кроўныя сувязі захоўваліся і ў межах абшчын. Арыі, як і раней, дзялілі людзей на «сваіх» і «чужых». Як захопнікі яны паставілі «чужых» у залежны ад сябе стан спачатку ў абшчыне, а потым і ў індыйскім грамадстве.

Быў падзел і сярод саміх арыйскіх плямён. Яшчэ з другой паловы II тысячагоддзя да н. э. усе арыі падзяліліся на тры няроўныя па свайму грамадскаму становішчу групы — ***варны***. Першай і самай высокай варнай былі *брахманы* — жрацы, настаўнікі, знатакі правіл грамадскага жыцця. Другая варна — *кшатрыі*. Яе складала ваенная знаць. У трэцюю варну ўваходзілі земляробы, рамеснікі і гандляры. У пачатку I тысячагоддзя да н. э. з'явілася і чацвёртая варна — *шудры*, што значыць слугі. У гэтую варну ўваходзілі ўсе неарыі.

Яны павінны былі прыслужваць тром першым варнам.

Але самымі горшымі лічыліся *недатыкальныя*. Яны не ўваходзілі ні ў адну з варн і выконвалі самую «чорную» працу.

З развіццём рамяства, ростам насельніцтва і ўскладненнем грамадскага жыцця ўнутры варн узнікла больш дробнае дзяленне па роду заняткаў, якое атрымала назву ***каст***. Чалавек пападаў у пэўную касту ад нараджэння. Калі ты нарадзіўся ў сям'і брахмана, ты — брахман. Калі ў сям'і шудр — ты заўсёды шудра.

Далейшае развіццё індыйскага грамадства прывяло ў сярэдзіне I тысячагоддзя да н. э. да ўтварэння царстваў на чале з *раджамі*. Па-старажытнаіндыйску раджа значыць «цар». А ў канцы IV стагоддзя да н. э. у Індыі ствараецца велізарная па тэрыторыі дзяржава.

Такім чынам, у I тысячагоддзі да н. э. у Індыі была створана яшчэ адна цывілізацыя. Пазней яна пераўзышла дасягненні індскай цывілізацыі. У гэты час склаўся каставы лад, які захаваўся да нашых часоў. Узнікла магутная дзяржава.

? 1. Хто такія індаарыі? 2. Чаму буйнейшыя пасяленні ўзніклі ў даліне Ганга? 3. Што такое касты, чым яны адрозніваюцца ад варн?

Грамадскі лад старажытных індыйцаў па Законах Ману

Дзеля ўсеагульнага дабрабыту Брахма стварыў са сваіх вуснаў, рук, ног і ступняў адпаведна брахмана, кшатрыя, вайш'я ды шудру. Для кожнага з іх былі ўстаноўлены адпаведныя заняткі.

Навучанне, вывучэнне Ведаў, ахвярапрынашэн-

ні сабе і іншым, даванне і атрыманне міласціны Брахма ўсталяваў брахманам. Брахман заўсёды першы.

Ахова падданых, даванне міласціны, ахвярапрынашэнне, вывучэнне Ведаў і недалучэнне да людскіх прыхамацей Брахма замацаваў за кшатрыямі. Але ні пры якіх умовах кшатрый не мае дазволу браць больш за чацвёртую частку ўраджаю сваіх падданых.

Жывёлагадоўлю, а таксама даванне міласціны, ахвярапрынашэнне, вывучэнне Ведаў, гандаль, грашовыя справы ды земляробства Брахма падаў вайш'ям.

Але ж толькі адзіны занятак Брахма пакінуў шудрам — быць у згодзе з першымі трыма.

§ 21. «Веды» — вялікі пачатак

Гісторыя індаарыяў, а з I тысячагоддзя да н. э. і ўсіх індыйцаў непарыўна звязана з *Ведамі*. Веды — святарныя кнігі старажытных індыйцаў. Само слова «Веды» дакладна супадае па сэнсу з беларускім «веды».

Усяго Ведаў было чатыры: *Веда гімнаў, Веда мелодый, Веда аб прынясенні ахвяр* і *Веда парад*. Яны прызначаліся для штодзённага жыцця. Гэтыя Веды былі абавязковымі для кожнага індыйца, іх карыснасць ніколі не аспрэчвалася. Самі кнігі былі састаўлены паміж 1500 і 1000 гадамі да н. э. Усё далейшае духоўнае жыццё старажытных індыйцаў стваралася на аснове Ведаў. Таму індыйскую культуру I тысячагоддзя да н. э. называюць *Ведыйскай культурай*, а саму цывілізацыю — *Ведыйскай цывілізацыяй*.

1. Санскрыт — мова Ведыйскай культуры. Адным з найбольш значных дасягненняў Ведыйскай культуры з'яўляецца мова ***санскры́т***. Гэта слова ў перакладзе азначае «дасканалы». Менавіта на ёй гаварылі індаарыі, менавіта на ёй напісаны Веды і ўсе астатнія творы індыйскай літаратуры. У ёй ёсць словы, падобныя на беларускія і рускія. Напрыклад, «веды», «швета» — «свята», «брахман» — «рахманы», па-руску — «кроткий».

На аснове санскрыту была створана своеасаблівая пісьменнасць. Алфавіт налічвае 48 літар, з якіх — 12 галосных. Усе словы на пісьме, за рэдкім выключэннем, пішуцца злітна. Падзел робіцца толькі на радкі.

З санскрыту ўзніклі многія сучасныя мовы Індыі — *хіндзі, урду, бенгальская* і іншыя.

Творцамі і апекунамі санскрыту лічыліся *багі* і *брахманы*. Кожны чалавек, які прызнаваў сябе арыем, павінен быў ведаць гэту мову. «Чужыя», як і шудры і недатыкальныя, пазбаўляліся магчымасці вывучаць гэту мову пад страхам жорсткай кары.

2. Літаратура. Акрамя Ведаў, якія лічыліся асновай асноў, Ведыйская культура стварыла шмат самых разнастайных твораў. Усе яны былі напісаны на санскрыце. Многія з іх з'яўляюцца вялікім багаццем у скарбонцы сусветнай літаратуры. Першае месца ў гэтым шэрагу належыць вялікім паэмам ***«Махабхара́та»*** і ***«Рамая́на»***.

«Махабхарата» складаецца з дванаццаці частак. У ёй апавядаецца аб барацьбе за ўпраўленне царствам паміж прадстаўніка-

мі двух знатных родаў. Пяць братоў Пандаваў, сыны цара Панду, змагаюцца з прадстаўнікамі рода Каўраваў. Старэйшы з Пандаваў прайграў ім царства ў косці, і ўсе браты былі прагнаны з краіны. У паэме апавядаецца аб вандраваннях братоў, іх прыгодах, бойках з Каўравамі. Пасля многіх намаганняў Пандавы вярнулі сабе царства.

«Рамаяна» апавядае аб жыцці і подзвігах царэвіча Рамы. Ворагі прагналі яго з роднага дома. Ён разам з жонкай-прыгажуняй Сітай і братамі апынуўся ў лесе. Тут яны змагаліся са злымі дэманамі і веліканамі і заўсёды перамагалі. Аднойчы, калі Рама і яго браты адсутнічалі, цар злых дэманаў украў Сіту. Даведаўшыся аб гэтым, Рама і браты збіраюць войска. Ім дапамагаюць малпы, мядзведзі і нават самі багі. У іх ліку быў і бог агню **Агні.** Ён і пасылае вогненную калясніцу для паядынку з царом дэманаў. Рама перамагае і вызваляе Сіту.

Акрамя вялікіх паэм, старажытныя індыйцы пакінулі дзівосныя казкі, байкі, міфы і легенды. *Многія з гэтых твораў перакладзены на шмат сучасных моў.*

3. Рэлігіі Старажытнай Індыі. Ведыйская цывілізацыя стварыла адразу дзве вялікія рэлігіі — ***індуізм*** і ***будызм.*** Індуізм бярэ свае пачаткі з Ведаў. Менавіта Веды — першыя і галоўныя кнігі індуізму. Індуізм I тысячагоддзя да н. э. адрозніваецца ад сучаснага. Але гэта розныя гістарычныя ступені адной рэлігіі. Яе паклоннікі, індуісты, у той час верылі не ў аднаго бога, а шанавалі многіх. Галоўнымі сярод іх былі

бог агню **Агні**, грозны бог вод **Варуна**, бог-памочнік і ахоўнік усяго — **Мітра**. Быў і бог багоў, вялікі разбуральнік — шасцірукі **Шыва**. Яго параўноўваюць са стараіндыйскім богам — апекуном жывёлы. Вобраз Шывы — доказ узаемасувязі культур тубыльнага насельніцтва і прышлых арыяў.

Акрамя таго, нараўне з багамі, шанаваліся Веды, мова санскрыт і брахманы, ахоўнікі культуры і святых Ведаў. Іх лічылі жывымі багамі.

Прыкладна ў VI стагоддзі да н. э. у Індыі з'яўляецца новая рэлігія, якая з часам стане сусветнай. Названа яна ў гонар першага яе прыхільніка — царэвіча **Сідкарты**. Яго празвалі ***«Буда»*** — ***«асвечаны»***. У будызме няма багоў, ён не прызнае нічога, што існуе. Адзіным богам з'яўляецца Буда. Яго за тое і шануюць, што ён першым гэта зразумеў.

Будызм вельмі хутка распаўсюдзіўся ў старажытнаіндыйскім грамадстве. У III стагоддзі да н. э. будызм прыняў імператар Ашока. Але ў пачатку нашай эры ён быў выцеснены з краіны індуізмам і стаў распаўсюджвацца ў больш усходніх краінах.

Менавіта ў гэты час і ствараецца галоўная святая кніга сучаснага індуізму — ***Бхагавáт-Гíта*** — «Бажэсцвенная песня».

Такім чынам, Ведыйская цывілізацыя з'яўляецца адным з самых бліскучых дасягненняў чалавецтва за ўсю яго гісторыю.

? **1.** Чаму індыйская цывілізацыя другой паловы II—I тысячагоддзя да н. э. называецца «Ведыйскай»? **2.** Што вы ведаеце аб мове Ведыйскай цывілізацыі?

3. Якія літаратурныя творы ведыйскай пары вы ведаеце? **4.** Якія асаблівасці старажытных індыйскіх рэлігій?

Старажытнаіндыйская мудрасць.

Як пчала, набраўшы соку, адлятае, не пашкодзіўшы кветкі, яе фарбаў і паху, дык хай і чалавек так абыходзіцца з іншымі людзьмі.

Добра сказанае слова іншаму чалавеку, які разумее добрае, гэтак жа прыемна, як прыгожая і духмяная кветка.

Як з вялікага вораху кветак можна зрабіць шмат вянкоў, так і чалавек, з моманту нараджэння, можа зрабіць шмат добрых спраў.

У кветак пах не распаўсюджваецца супраць ветру. Людское дабро пранікае ўсюды.

Паляўнічы і пара галубкоў. *(Легенда з індыйскай кнігі Махабхарата.)*

Жыў у Індыі паляўнічы. Са хцівасцю лавіў ён птушак у лесе, каб прадаваць на рынку. Пры гэтым ён разлучаў птушыныя сем'і, забыўшыся на закон багоў.

Аднойчы ў лесе пачалася страшэнная бура. У гэты момант паляўнічы выпадкова злавіў знясіленую галубку. Бура скончылася, але ўжо надыходзіла ноч і ён павінен быў правесці яе ў лесе. На дрэве, пад якім ён сеў, жыў галубок. Галубок бядуе па зняволенай галубцы.

«Куды загінула мая
Галубка, вечная падружка?
Такая страшная пара!
Як выйдзе жывенькаю птушка?
Што мне з жыцця, калі яго
Не будзе ўжо з кім каратаці?
Жыццё і свет тады — не свет,
І сам не свой у сваёй хаце».

Галубка пачула галубка, але просіць, каб ён быў гасцінным гаспадаром для госця-паляўнічага. Гэта закон багоў.

Галлё сухое і лісткі
Збірае, колькі сілы мае,
Кудысьці злётаў па агонь,
Развёў і госця зноў пытае.
А паляўнічы да яго:
«Дай есць, галодны я сягоння».
Тут бедны галубок схмурнеў:
Не знае, дзе яду спагоне.
Падумаў трохі галубок
І штосьці выдумаў такое...
«Спакоен,— кажа,— госцік, будзь.
І голад твой я заспакою».
Сказаўшы гэта, над агнём
Ён тройчы звольна акруціўся
І, як маланка, як страла,
Ў агонь, як ёсць, жыўцом зваліўся...

Паляўнічага ахапіў жах. Ён спаліў свае прылады і адпусціў галубку.

«Дружок ужо на свеце тым;
З кім варкаваць, як даўней, буду?
Нядолю-долю з кім дзяліць?..
Жыццё ўжо мне няспыннай жудай.
Пайду за ім, пайду к яму.
Прымі мяне к сабе, мой любы!»
І з гэтым словам, як і ён,
Звалілася ў агонь-загубу.

Страх і жаль устрос паляўнічым. Ён ужо ніколі не лавіў птушак. Зрабіўшыся жабраком, ён пакутаваў за грахі. А галубкі, якія выканалі закон багоў, зрабіліся святымі.

Аддзел IV.
Гісторыя старажытнакітайскай цывілізацыі

§ 22. Узнікненне старажытнакітайскай цывілізацыі

1. Краіна і насельніцтва. Кітайская цывілізацыя ўзнікла на ўсходзе азіяцкага кантынента. Людзі асвоілі тэрыторыі шырокіх прыморскіх раўнін, па якіх цякуць вялікія рэкі — ***Хуанхэ́*** і ***Янцзы́***. Паступова з усходу на захад, уверх па цячэнню гэтых рэк, рэльеф Кітая ўздымаецца. Раўніна пераходзіць у нагор'і, а затым і ў скалістыя горныя хрыбты на захадзе краіны.

Найбольш урадлівай з'яўляецца даліна Хуанхэ. На працягу стагоддзяў гэта працавітая рака прыносіла з нагор'яў сярэдняга Кітая *лёс*. Ад часцінак жоўтага лёсу, які нясе рака, яна і атрымала сваю назву — Хуанхэ *(«Жоўтая рака»)*. Сваім колерам лёс вельмі падобны на пясок, які моцна зляжаўся. Сёння з яго складаюцца берагі і даліна Хуанхэ. Але, у адрозненне ад пяску, лёс з'яўляецца даволі ўрадлівай глебай. Яе апрацоўка не патрабуе значных намаганняў, галоўнае, каб было дастаткова вільгаці.

Таму жыццядзейнымі для Кітая былі не толькі воды ракі, але і дажджы, якія прыходзілі з усходу ад бязмежных прастораў Ціхага акіяна. Чым далей на захад, тым менш выпадае ападкаў. Таму гэтыя раёны часта наведваюць моцныя засухі.

Але не толькі жыццё неслі сезоны даж-

джоў. Іх ваду ўбірала ў сябе рака-волат, і яе жоўтыя хвалі лёгка разбуралі берагі і ўтваралі новае рэчышча. Пры гэтым гінулі дзесяткі кітайскіх паселішчаў. Таму мясцовыя жыхары баяліся Хуанхэ і звалі яе *«ракой, якая блукае»*, *«ракой тысячы бедстваў»*. Нават старажытнакітайскі іерогліф *«няшчасце»* выконваўся як разліўшаяся вада. Гэтыя з'явы знайшлі адлюстраванне ў міфах аб вялікіх драконах, якія жывуць у вадзе гэтай ракі.

Паўднёвыя землі па берагах Янцзы таксама вельмі ўрадлівыя. Але ў старажытныя часы тут было шмат густых лясоў. Таму па яе берагах людзі пачалі сяліцца пазней.

На поўнач ад даліны Хуанхэ за невялікімі гарамі раскінуліся шырокія стэпы і пустыні. Там жылі вандроўныя плямёны жывёлаводаў. Гэтыя плямёны часта рабілі набегі на земляробчых кітайцаў.

2. Першыя звесткі аб старажытнакітайскай цывілізацыі. Узнікненне старажытнакітайскай цывілізацыі адносяць да II тысячагоддзя да н. э. У гэты час у сярэднім цячэнні Хуанхэ з'явіліся першыя земляробы. Матыкамі яны апрацоўвалі мяккую глебу ў пойме ракі. Сеялі ў асноўным проса і пшаніцу, ужывалі агародніну. Частку прадуктаў давала і жывёлагадоўля.

Аб маёмаснай розніцы паміж людзьмі мы ведаем з археалагічных даследаванняў магіл па берагах Хуанхэ. У адны магілы разам з нябожчыкам ставіліся толькі гаршкі з ежай. Другія магілы ўяўлялі сабой падземныя збудаванні. У пасмяротны шлях нябожчык браў не толькі ежу, але і

залатыя рэчы, багатую зброю, коней. Разам з гаспадаром хавалі і яго падначаленых, каб яны служылі яму на тым свеце. Па ўсяму відаць, што некаторыя з іх былі ўжо рабамі ці палоннымі.

Рэчы, знойдзеныя ў магілах, сведчаць аб добрым развіцці рамяства. Многія прылады працы і зброі рабілі з *бронзы*.

Сапраўднага майстэрства кітайскія рамеснікі дасягнулі ў вырабе *шаўковых тканін*. Ніткі для гэтай тканіны давалі так званыя *шаўкоўнічныя чарвякі — шаўкапрады*. Патрэбны былі значныя намаганні і цярпенне, каб атрымаць «ураджай».

Кітайцы выпрацавалі і самастойную сістэму пісьма.

У гэты ж час з'явіліся першыя гарады. Часта гарады аддзяляліся ад ракі земляными *дамбамі*, каб засцерагчыся ад паводак. Услед за гарадамі ўзніклі і першыя *дзяржавы*. Складалася *цывілізацыя*.

3. Эканамічны ўздым у Кітаі ў сярэдзіне I тысячагоддзя да н. э. К сярэдзіне I тысячагоддзя да н. э. налічвалася ўжо некалькі самастойных дзяржаў. Усе яны вялі паміж сабой працяглыя войны. Таму гэты перыяд у гісторыі Кітая атрымаў назву *«Ваюючыя царствы»*.

Нягледзячы на бесперапынныя войны, насельніцтва Кітая адчувала сваю блізкасць. Ва ўсіх дзяржавах размаўлялі на розных дыялектах адной мовы. Палітычнае кіраванне і сацыяльныя адносіны былі вельмі падобныя. Такім чынам ствараліся ўмовы для збліжэння.

Войны не маглі перашкодзіць і гаспадарчаму развіццю. Пачаўся вялікі экана-

мічны ўздым. У V стагоддзі да н. э. жалеза прыйшло на змену бронзе. Жалезныя прылады працы і зброя хутка распаўсюджваліся ў кітайскім грамадстве.

Аб развіцці гандлю сведчыць узнікненне грошай з металу.

Адбываліся змены і ў земляробстве. Быў створаны плуг з жалезным наканечнікам. З поўдня ў Кітай прыйшла тэхніка апрацоўкі *рысу*. Ён цяпер прыносіў па 2—3 ураджаі ў год. Гэта значна павялічыла колькасць прадуктаў. У апрацоўцы палёў пачалі выкарыстоўваць быкоў. «Жывёлы, якія выкарыстоўваліся для ахвярапрынашэнняў у храмах, зараз працуюць на палях»,— так гаворыць сучаснік.

Усё гэта дало магчымасць пачаць засваенне больш аддаленых ад Хуанхэ зямель. Каб забяспечыць будучы ўраджай вадой, рабіліся *ірыгацыйныя каналы*. Разам з павышэннем ураджайнасці расла і *колькасць насельніцтва*. Даліна Хуанхэ была заселена цяпер вельмі шчыльна. Шмат гарадоў налічвала ўжо дзесяткі тысяч жыхароў.

? **1.** Чаму першыя земляробы пасяліліся ў даліне Хуанхэ? З якімі цяжкасцямі яны тут сустрэліся? **2.** Аб чым сведчыць паяўленне магіл з рознымі рэчамі ў II тысячагоддзі да н. э.? Што гэта за з'ява? **3.** Што вяло да змен у Кітаі ў сярэдзіне I тысячагоддзя да н. э.?

Міф аб героях Гуне і Юю

Калісьці ўвесь свет быў заліты паводкай. Людзі, як звяры, жылі ў пячорах. Гунь, нашчадак багоў, вырашыў ім дапамагчы. Ён украў у багоў *сі-*

жан, зямлю, якая сама расце. З маленькіх часцінак сіжана ён пачаў будаваць дамбы.

Але багі вельмі раззлаваліся за крадзеж і забілі Гуня. У апошні момант у яго нарадзіўся сын — Юй. Паданні гавораць, што ён нарадзіўся ў выглядзе дракона і мог прымаць звярыны выгляд.

Пасля забойства Гуня багі ўбачылі, што зрабілі злую справу. Тады яны вырашылі дапамагчы Юю. Яны далі яму костку барана, на якой было нешта пазначана рыскамі.

Юй здагадаўся, што ён павінен рабіць, каб перамагчы паводку. Ён пачаў хадзіць па краіне і будаваць каналы. У адных месцах Юй рабіў гэта адзін, бо быў вельмі магутны. Але часта збіраў людзей, каб яны яму дапамагалі.

Так багі і людзі справіліся з паводкай.

● Што, на вашу думку, з'явілася прычынай узнікнення гэтага міфа?

Жоўтым птушкам добра пархаць
Сярод зялёных вяршынь дрэў.
Хто з уладаром у апошні шлях?
Чжун-хан, волат, Чжун-хан, гігант.
Раўняўся ён сотні ў бітве адзін.
У змаганні вораг бег ад яго,
А перад магілай дрыжыць ён сам.
Сіняе неба! Закон твой суровы.
Няўмольна твая вышыня.
Магіла яшчэ не запоўнена.
Жывымі закопваем смельчакоў.
Кожны з іх даражэй нам за сто.

● Аб якім звычаі гаворыць гэты кітайскі верш? Якое стаўленне аўтара?

§ 23. Утварэнне адзінай кітайскай дзяржавы

1. Аб'яднанне краіны. У III ст. да н. э. самым моцным сярод усіх ваюючых царстваў зрабілася дзяржава Цынь. Паступова, у выніку заваяванняў і дыпламатычных перамоў, гэта царства падпарадкавала ўвесь тагачасны Кітай.

У 221 г. да н. э. былы цыньскі цар прыняў тытул Цынь Шыхуан-дзі, што значыла «Першы імператар дынастыі Цынь».

Цынь Шыхуан-дзі шмат зрабіў для практычнага аб'яднання краіны. Па яго загаду на тэрыторыі Кітая цяпер дзейнічала адно заканадаўства, адзіная манета. Нават пісьменнасць была апрацавана такім чынам, каб яе разумелі ва ўсіх канцах краіны.

2. Будаўніцтва Вялікай Кітайскай сцяны. Але ж Цынь Шыхуан-дзі застаўся ў памяці народа больш не як вялікі рэфарматар, а як жорсткі, бязлітасны ўладар.

Да гэтага часу ўжо некалькі стагоддзяў на поўнач ад Кітая, у стэпах сучаснай Манголіі, існаваў племянны саюз *сюнну*. Плямёны сюнну ўвесь час нападалі на асобныя кітайскія царствы, а потым і на імперыю Цынь. Часта яны даходзілі да берагоў Хуанхэ.

Каб процістаяць нападам ваяўнічых суседзяў, Цынь Шыхуан-дзі загадаў пачаць будаўніцтва сцяны ўздоўж паўночнай мяжы імперыі. План будаўніцтва без перабольшвання быў грандыёзным. Сцяна цягнулася на 4000 кіламетраў. Праз кожныя 2—3 кіламетры стаялі магутныя *вежы*. Шырыня сцяны была такой, што на ёй лёгка маглі раз'ехацца дзве калясніцы. Яна

атрымала назву **Вялікай Кітайскай сцяны.** Будаўнічыя работы працягваліся з перапынкам больш за тысячу гадоў.

Але ў памяці кітайскага народа падзеі будаўніцтва Вялікай Кітайскай сцяны засталіся як страшэнная трагедыя. Мільёны простых кітайцаў удзельнічалі ў працах. На паўночную мяжу зганяліся сяляне, рабы, воіны і асуджаныя. Вырашалася і яшчэ адна задача: гэта будаўніцтва засцерагала краіну ад перанаселенасці. Для будаўнікоў прадуктаў не хапала, умовы працы былі вельмі цяжкімі. Шмат людзей памірала. Паданні сведчаць, што нябожчыкаў хавалі прама ў сцяне. Таму гавораць, што сцяна пабудавана на касцях. Кітайскі гісторык абураецца: «Зрывалі горы, засыпалі цясніны, пракладвалі прамы тракт. Як танна цанілі працу простага народа!»

3. Грабніца Цынь Шыхуан-дзі. У 1974 г. кітайскія археолагі пачалі раскопваць грабніцу Цынь Шыхуан-дзі. І адразу гэта прывяло да сенсацыйных знаходак.

Рэдкі выпадак: месца магілы гэтага імператара было добра вядома са звестак старажытнакітайскіх гісторыкаў. Яны ж распавядалі аб вялікім будаўніцтве грабніцы яшчэ пры жыцці Цынь Шыхуан-дзі. Для пахавальнай камеры была высечана ўнутранасць цэлай гары. Для гэтага сагналі сотні тысяч кітайцаў. Пахаванне было вельмі багатым. Некалькі тысяч чалавек было прынесена ў ахвяру.

Нягледзячы на тое што навукоўцы добра ведалі месца грабніцы, доўгі час не вяліся ніякія археалагічныя работы. Усіх палохалі незвычайна вялікія памеры грабні-

цы — на плошчы ў некалькі квадратных кіламетраў. Было варашана весці раскопкі паступова і ўважліва.

Зараз раскапаны толькі тры ямы, якія знаходзяцца перад усходняй брамай у грабніцу. У іх быў размешчаны вайсковы атрад: 7 тысяч воінаў у баявым парадку з калясніцамі. Фігуры воінаў і коней выкананы з *керамікі*. Зброя ў іх з металу. Ва ўсім войску няма ніводнага аднолькавага твару.

І ўсё гэта толькі маленькая частка збудавання, якая нават не размешчана на тэрыторыі самой грабніцы. Але ўжо адно гэта ставіць грабніцу Цынь Шыхуан-дзі ў шэраг агульначалавечых помнікаў. А пакуль што нам застаецца толькі чакаць, якія таямніцы захоўвае магіла імператара Цынь...

4. Узнікненне імперыі Хань. Нягледзячы на тое што імперыя Цынь існавала толькі 14 гадоў, уплыў яе на гісторыю Кітая вельмі значны. Яна залажыла асновы адзінай дзяржавы.

Але ўлада самога Цынь Шыхуан-дзі была ў краіне ненавіснай. Як толькі ён памёр у 210 г. да н. э., адразу супраць дынастыі Цынь пачалося паўстанне. Пасля цяжкай барацьбы ўлада над Кітаем апынулася ў руках дынастыі Хань.

Перыяд уладарання дынастыі Хань (II ст. да н. э.— II ст. н. э.) з'явіўся часам росквіту старажытнага Кітая. Колькасць насельніцтва наблізілася да 60 мільёнаў чалавек. Добрае становішча ўнутры краіны дало магчымасць пачаць барацьбу з ваяўнічымі суседзямі.

5. Заваёўніцкія войны імперыі Хань. Пер-

шы ўдар быў нанесены па старому ворагу — плямёнам сюнну. Вялікае кітайскае войска пачало паход у паўночныя стэпы. Паселішча сюнну бязлітасна знішчалася разам з жанчынамі і дзецьмі. Войска сюнну было знішчана.

Рэшткі плямёнаў сюнну пакінулі сваю краіну і перабраліся ў **Сярэднюю Азію.** А праз некалькі стагоддзяў яны ўжо апынуліся на другім канцы еўразіяцкага мацерыка і пачалі непакоіць граніцы Рымскай імперыі. У Еўропе яны былі вядомы як *гунны.*

Умацаваўшы паўночныя граніцы Кітая, войска імперыі Хань пачало наступленне на захад. Ханьскія імператары марылі падпарадкаваць сабе гарады, якія стаялі на *Вялікім шаўковым шляху.* Гэты шлях пачынаўся ў Кітаі, дзе выраблялі шоўк. Праз Сярэднюю Азію, Персію, Блізкі Усход шаўковыя тканіны траплялі ў Еўропу. Усюды яны цаніліся як самыя дарагія каштоўнасці. Спосаб вытворчасці шоўку кітайцы трымалі ў тайне.

Гэты гандаль даваў вялікі прыбытак і тым краінам, праз якія праходзіў Вялікі шаўковы шлях. Аднак кітайскія імператары хацелі атрымліваць увесь прыбытак.

Войскі імперыі Хань змаглі захапіць некаторыя заходнія гандлёвыя гарады. Але пранікнуць у Сярэднюю Азію яны ўжо не здолелі. Тым не менш граніцы Кітая былі значна пашыраны.

Такім чынам, у канцы III—II ст. да н. э. склалася адзіная кітайская дзяржава. Старажытны Кітай апынуўся на вяршыні сваёй магутнасці.

? **1.** У чым прычыны аб'яднання Кітая ў адзіную дзяржаву ў III ст. да н. э.? **2.** Як адбілася ўлада Цынь Шыхуан-дзі на становішча ў Кітаі? Паспрабуйце разгледзець праблему з розных бакоў. **3.** У чым прычыны заваёўніцкіх войнаў імперыі Хань?

Вяртанне воіна з паходу

У пятнаццаць гадоў пайшоў з войскам у паход,
Толькі ў восемдзесят вярнуўся дадому.
Увайшоўшы ў вёску, селяніна спытаў:
«Адкажы, хто ў маёй сям'і застаўся жывы?»
«Глядзіце — хату сваю вам відаць».

Магільны пагорак з кіпарысамі побач.
Адвар і кашу хутка згатовіў,
Але ж для каго? Хто сядзе есці са мною?
Выйду з хаты, стану тварам да ўсходу,
І слёзы гаротныя з адзення змываюць пыл.

● Паспрабуйце скласці апавяданне аб вяртанні кітайскага воіна ў сваю вёску.

§ 24. Старажытнакітайскае грамадства. Народныя паўстанні

1. Уяўленне кітайцаў аб свеце. Старажытнакітайская народнасць склалася ў даліне ракі Хуанхэ. Кітайцы пачалі называць сябе *«хуася»*. Усе іншыя атрымалі агульную назву *«барбарыньцы чатырох краін свету»*. Хуася лічылі сябе цывілізаваным народам, а ўсе іншыя плямёны, на іх думку, стаялі на больш нізкай ступені развіцця.

Вось як да гэтага ставіліся сучаснікі: «Барбарыньцы — гэта шакалы і ваўкі, ім нельга ісці на ўступкі. Хуася — гэта сваякі, і іх нельга пакінуць у бядзе!»

Сваю краіну кітайцы называлі *«Сярэдзінная дзяржава»*, ці *«Паднябесная імпе-*

рыя». Гэтыя назвы пайшлі ад веры ў тое, што Кітай знаходзіцца ў сярэдзіне свету і яго народ апякуе само **Неба**, якое лічылася вярхоўным богам.

2. Імператарская ўлада. На чале кітайскага грамадства стаяў імператар. Лічылася, што ён быў *Сынам Неба* і меў боскую прыроду. Таму падданыя павінны былі адносіцца да таго, як да бога ў чалавечым выглядзе. Самі аб сабе імператары гаварылі: «Я — адзін сярод людзей». Імператары былі жрацамі, і толькі яны мелі права весці перамовы з Небам.

Улада імператараў была неабмежаваная. Усе людзі лічыліся яго слугамі і павінны былі выконваць любы яго загад. Імператар быў уласнікам усёй зямлі ў дзяржаве. За карыстанне зямлёй кітайцы плацілі падаткі.

3. Падзел насельніцтва Кітая на рангі. Усё насельніцтва Кітая было падзелена на *рангі*. Для кожнага з рангаў былі акрэслены свае правы і абавязкі. «Адзенне залежыць ад рангу, а карыстанне багаццем — таксама ад рангу. Розная колькасць піцця і ежы, крой вопраткі, колькасць жывёлы і рабоў, забароны на ўжыванне вызначаных формаў лодак, калясніц і хатняга посуду. Пры жыцці чалавека захоўваецца розніца ў галаўных уборах, адзенні, колькасці палёў і памерах жылля: пасля смерці — у памерах унутранай і знешняй труны, савана і магільнай ямы». Нават некаторыя словы для адных і тых жа рэчаў у людзей розных рангаў былі рознымі.

Прыналежнасць чалавека да акрэсленага рангу захоўвалася праз сям'ю. Пе-

райсці з аднаго рангу да другога было магчыма ў асноўным на дзяржаўнай службе. Ранг можна было купіць.

Такі грамадскі лад замацоўваўся і ў рэлігійных сістэмах.

4. Рэлігійныя сістэмы Кітая — канфуцыянства і даасізм. Адным з найбольш вядомых дзеячаў у кітайскай гісторыі з'яўляецца **Кун Цю** (551—479 гг. да н. э.). Еўрапейцам ён вядомы як **Канфуцый**. Ад яго імя атрымала сваю назву і сістэма поглядаў на свет, якую ён распаўсюджваў,— *канфуцыянства*.

На думку Канфуцыя, у старыя часы людзі жылі пад уладай мудрых цароў і прыносілі багам належныя ахвяры. Таму ні ў чым яны не ведалі патрэбы. Зараз жа людзі больш думаюць аб сабе, чым аб багах і краіне, таму і жыццё іх стала цяжкім.

Канфуцый лічыў, што чалавечая мудрасць зможа звярнуць былыя часы. Але для гэтага людзі павінны сумленна выконваць усе абрады багам, прытрымлівацца старых традыцый. Асобнае месца ў канфуцыянстве займае пакланенне продкам.

Дзяржава павінна будавацца так, як і сям'я. Калі ў сям'і галоўным з'яўляецца старэйшы, то на чале дзяржавы стаіць імператар. Калі слова старэйшага — закон для ўсёй сям'і, так і загад імператара — закон для ўсёй краіны.

У імперыі Хань канфуцыянства зрабілася дзяржаўнай рэлігійнай сістэмай.

Заснавальнікам *даасізму* ў Кітаі лічыцца **Лао-цзы**, які жыў па паданню ў адзін час з Канфуцыем. Кітайцы малююць яго ў выглядзе дзеда з вялікай сівой барадой,

які едзе на быку. Але ці сапраўды існаваў гэты чалавек, мы не ведаем.

Даасісты лічаць, што жыццё ўсяго свету заключана ў нейкім *«дао» — «шляху»*. Чалавек не ў стане зразумець дао, тым больш змяніць яго. «Дао, якое магчыма выразіць у словах, не з'яўляецца сапраўдным дао». Таму прыхільнікі даасізму лічаць, што паколькі чалавек не ў стане ўздзейнічаць на свет, то лепш для яго і не спрабаваць рабіць гэта.

Як бачна, абедзве рэлігійныя сістэмы патрабавалі ад чалавека безумоўнага падпарадкавання існуючаму дзяржаўнаму ладу.

5. Жыццё простага народа. Цяжкія войны паступова спусташалі імперыю Хань. Паслухаем сучасніка: «Краіна стамілася ад бесперапынных войнаў, людзі засмучаны, запасы вычарпаліся і не ў стане пакрыць расходаў».

Увесь цяжар становішча ў імперыі лёг на плечы простага люду, асабліва земляробаў. Іх праца на рысавых палях, залітых вадою, была ўпартай барацьбой з прыродай: «Калі селянін працуе на полі, тулава яго заліта вадою, ногі ў гразі. Пякучым сонцам выпалены валасы і скура. Да крайнасці напружана цела». Галеча прыходзіла ў сем'і, у якіх мужчын бралі на вайну. Але павелічэнне падаткаў канчаткова знішчала шмат вёсак. Сялянства хутка бяднела.

6. Становішча рабоў. Але як ні цяжка было сялянам, становішча рабоў было яшчэ горшым. А ў гэты час шмат вольных сялян трапляла ў рабства. Дастаткова было не

аддаць пазыку, не заплаціць падаткаў. Голад прыводзіў да таго, што, каб пракарміць сям'ю, бацькі прадавалі ў рабства сваіх дзяцей. Дзяржава рабіла рабамі не толькі самога асуджанага, але і ўсю яго сям'ю.

Колькасць рабоў значна павялічылася. Па ўсёй краіне ўзнікалі новыя рынкі рабоў, дзе іх трымалі як жывёлу. Раба можна было пазнаць па кляйму на твары і голенай галаве.

Галеча вольнага насельніцтва і рост колькасці рабоў-кітайцаў сведчыла аб крызісе ў імперыі Хань.

7. Народныя паўстанні. Адлюстраваннем цяжкага становішча народных мас у імперыі Хань з'явіліся частыя паўстанні.

У I ст. н. э. адбылося вялікае паўстанне *«чырванабровых»*. Назва пайшла ад звычаю сялян фарбаваць бровы, каб адрозніваццa ад салдатаў імператара. Паўстанцы змаглі захапіць сталіцу і забілі імператара. Але новыя дзяржаўныя войскі нанеслі ім паражэнне.

Праз стагоддзе Кітай ускалыхнула народнае паўстанне *«жоўтых павязак»*. На чале стаў **Чжан Цзяо.** Выкарыстоўваючы сродкі народнай медыцыны, ён лячыў простых людзей і быў добра вядомы сярод сялянства. На гэты раз рух ахапіў амаль усю краіну. Паўстанцы пагражалі самому існаванню імперыі. На дапамогу войскам імператара прыйшлі атрады вялікіх землеўладальнікаў. Разам яны нанеслі паражэнне арміі «жоўтых павязак». Па ўсёй краіне знішчаліся прыхільнікі Чжан Цзяо, нават і тыя, хто толькі лічыўся падазроным. Не шкадавалі жанчын і дзяцей.

Але нішто ўжо не магло выратаваць імперыю Хань. Праз некалькі гадоў пасля паўстання «жоўтых павязак» імперыя распалася на некалькі незалежных дзяржаў.

? **1.** Якім чынам будавалася кітайскае грамадства? Як вы зразумелі, што такое рангі? **2.** Што пагоршыла становішча простага люду ў імперыі Хань? **3.** У чым значэнне народных паўстанняў у Кітаі ў I—II стагоддзях н. э.?

Афарызмы Канфуцыя:

Не шкадуй аб тым, што людзі цябе не ведаюць,
А шкадуй аб тым, што ты не ведаеш людзей.

Калі ты слушна сябе паводзіш,
То за табой пойдуць і без загаду.
Калі ж ты вядзеш сябе няслушна,
То ніхто не паслухае, нават калі загадаеш.

Чаго сабе не пажадаеш,
Таго не рабі і іншым.

Чалавек можа зрабіць шлях вялікім,
Шлях не зробіць вялікага чалавека.

Толькі тое памылка,
Што нельга выправіць.

Ці памылка гэта:
Не памятаць аб сваім целе
і сваіх бацьках
З-за выбуху злосці?

Не гавары непатрэбнага,
Ніхто не ўстрымае твой язык,
Слова не ў стане памерці.

§ 25. Культура Старажытнага Кітая

1. Пісьменнасць. Першыя звесткі аб кітайскай пісьменнасці адносяцца да XIV ст.

да н. э. Прынцыповай розніцы паміж надпісамі таго часу і сучасным кітайскім пісьмом няма. Кітайская пісьменнасць выкарыстоўвае *іерогліфы*, як гэта было і ў старажытным Егіпце. Кожны пісьмовы знак азначае цэлае слова.

Гэта вельмі цяжкая сістэма пісьма, і трэба было некалькі гадоў вучыцца, каб яе засвоіць. Таму ў Кітаі пісьменнасцю валодалі толькі багатыя.

Першыя кітайскія надпісы былі зроблены на касцях жывёлы. На іх пісалі пытанні да багоў. Напрыклад: «Калі галовы людзей прынесці ў ахвяру, цар атрымае дапамогу?» Потым гэтыя косці кідалі ў агонь і па трэшчынах вешчуны чыталі адказ багоў.

Потым пачалі пісаць на *дошках з бамбуку*. Дошкі звязвалі вяроўкамі і, каб падняць нават малую кнігу, трэба было быць сапраўдным волатам.

У імперыі Цынь ужо ведалі *пісьмо на шоўку*. Але гэта быў вельмі дарагі матэрыял.

Праблема была вырашана, калі ў I стагоддзі да н. э. зрабілі *паперу*. Яе выраблялі з ануч, бамбуку і кары дрэў. Дзякуючы таннасці паперы пачалі карыстацца толькі ёю.

2. Сыма Цянь. Мы добра ведаем падзеі ў Старажытным Кітаі дзякуючы працам кітайскіх гісторыкаў. Да гэтага маюць дачыненне таксама і тыя, хто збярог нам гэтыя кнігі на працягу тысячагоддзяў.

Найбольш вядомым гісторыкам з'яўляецца **Сыма Цянь** (145—90 гг. да н. э.) і яго праца *«Гістарычныя запіскі»*. Сыма Цянь

аб'ехаў увесь Кітай, сабраў многа паданняў, гістарычных звестак і пісьмовых крыніц. Абапіраючыся на вялікі матэрыял, ён напісаў гісторыю Кітая.

3. Навуковыя веды. Старажытнакітайская цывілізацыя дасягнула значных поспехаў у развіцці розных навук.

Найбольш патрэбнай у штодзённым жыцці была *матэматыка*. Быў нават зроблены агульны зборнік, які меў назву *«Матэматыка ў дзевяці кнігах»*. З яго мы даведаліся, што кітайцам былі вядомы, напрыклад, тэарэмы Піфагора і рашэнне ўраўненняў.

Блізка да матэматыкі стаяла *астраномія*. Кітайскія навукоўцы даволі добра вылічылі час сонечнага года — 365,25 дня. Яны ведалі 783 зоркі.

Астраномія таксама выкарыстоўвалася ў сельскай гаспадарцы. Былі напісаны спецыяльныя кнігі, у якіх сельскагаспадарчыя работы падпарадкоўваліся каляндарным перыядам. Былі і *агранамічныя трактаты* аб паляпшэнні ўраджайнасці розных культур.

Зараз ва ўсім свеце вялікую папулярнасць набывае *кітайская медыцына*. Яе пачаткі знаходзяць у сярэдзіне I тысячагоддзя да н. э., а мабыць, і яшчэ раней. У медыцыне карысталіся метадам *іголкаўколвання*. Кітайскім медыкам мы павінны падзякаваць і за знаёмства з *чаем*. Спачатку ён быў адным з лекаў, якія падтрымлівалі сілы хворага. Потым яго пачало ўжываць усё насельніцтва.

Шмат кітайскіх гандляроў вандравалі па суседніх краінах. Іх звесткі далі пача-

так *геаграфіі*. Усе гэтыя веды былі сабраны ў *«Кнізе гор і мораў»*. Старажытным кітайцам быў ужо вядомы *компас*.

4. Літаратура і мастацтва. Добрай крыніцай да вывучэння жыцця старажытных цывілізацый з'яўляецца мастацтва.

Старажытныя кітайцы вельмі любілі *паэзію*. Да нас дайшло шмат паэтычных зборнікаў. Кожны адукаваны кітаец павінен быў памятаць вялікую колькасць вершаў. Таму нават найбольш старажытныя дайшлі і да нашых дзён.

Вершы чыталіся пад музыку. «Словы могуць ашукаць, людзі могуць прыкідвацца, толькі музыка не ў стане хлусіць»,— так выказвалася павага да музыкі.

Дамы і палацы не дайшлі да нас, бо былі зроблены з дрэва. Але па гліняных ці бронзавых мадэлях мы ведаем, якімі яны былі. Яшчэ больш даюць археалагічныя даследаванні імператарскіх палацаў. Яны будаваліся на каменным фундаменце, які ўздымаўся над зямлёй. На ім ставіліся слупы, якія трымалі дах. Паміж слупамі рабілі сцяну з гліны, пазней з цэглы. Дах пакрывалі *чарапіцай*.

У палацах пачаў узнікаць і кітайскі *жывапіс*.

5. Асаблівасці развіцця кітайскай цывілізацыі. Ад Бліжняга Усходу і Індастана, дзе фарміраваліся іншыя старажытныя цывілізацыі, Кітай быў вельмі аддалены. Да таго ж існавалі прыродныя перашкоды — высокія снежныя горы і бязводныя пустыні. Толькі ў II стагоддзі да н. э. быў пракладзены Вялікі шаўковы шлях. Але гэты гандаль так і не прывёў да сустрэчы з ін-

шымі цывілізацыямі, бо шлях быў працяглы і цяжкі.

Вось чаму кітайская цывілізацыя мае вялікія своеасаблівасці развіцця. Не маючы культурнага ўзаемаўплыву, цывілізацыі Еўропы і Кітая ішлі ў развіцці навукі і вытворчасці асобнымі шляхамі. Некаторыя адкрыцці кітайцаў, напрыклад компас, еўрапейцы пазней зрабілі самастойна. Іншыя дасягненні потым прыйшлі з Кітая і зрабіліся ў Еўропе роднымі, напрыклад вытворчасць шоўку і паперы, выкарыстанне рысу і чаю ў ежы. А некаторыя метады лячэння, напрыклад іголкаўколванне, так і засталіся толькі кітайскімі дасягненнямі. Зараз імі карыстаецца ўвесь свет.

Кітайцы выпрацавалі своеасаблівую духоўную культуру, сваю іерагліфічную пісьменнасць. Яны і сёння прытрымліваюцца сваіх традыцый, што робіць непаўторнай гэту краіну.

Пад уплывам кітайскай цывілізацыі пачалі развіццё і суседнія народы: *в'етнамцы, японцы, карэйцы.*

Кітайская цывілізацыя ўнесла значны ўклад у сусветную культуру.

? **1.** Што ў кітайскай пісьменнасці агульнае з пісьменнасцю іншых краін і што адметнае? **2.** Якія навукі ўзніклі ў старажытным Кітаі? Чаму ў Кітаі ўзніклі тыя ж навукі, што і ў іншых старажытных краінах? **3.** Чаму культурнае развіццё Кітая ішло сваім уласным шляхам? Што дала кітайская цывілізацыя свету?

Кітайскі верш.

Жыццё для кожнага падуладна лёсу.
Ніхто не ў стане пазбягаць памылак.

І, няспынна ўмацоўваючы душу,
Я не палохаюся набліжэння смерці.

Ўвесь час я пакутую і сумую
І без жадання цяжка ўздыхаю.
Як брудзен свет! Ніхто не ведае мяне,
І душу адчыніць я не магу нікому.

Я ведаю, што я памру, но перад смерцю,
Сябе шкадуючы, я не адступлю.
Няхай з глыбі стагоддзяў мудрацы
Узорам велічным прадстануць прад вачамі.

Частка трэцяя. Гісторыя антычнай цывілізацыі

Аддзел I. Старажытная Грэцыя

Раздзел I. Ранняя Грэцыя

§ 26. Крыта-мікенскае грамадства і яго культура

1. Прырода Грэцыі. Старажытныя грэкі насялялі поўдзень Балканскага паўвострава, астравы Эгейскага і Міжземнага мораў, заходняе ўзбярэжжа Малой Азіі. Усюды былі зручныя бухты для стаянкі караблёў. Цераз Крыт грэкі дасягалі Егіпта, а праліў Басфор Фракійскі выводзіў іх у Чорнае мора.

Амаль трэць Балкан складаюць горы. Урадлівых далін мала. Грэкам заўсёды не хапала ўласнага хлеба. Грэкі вырошчвалі ячмень, аліўкі, вінаград. Казінае малако, сыр — самая распаўсюджаная ежа.

У Лаконіцы залягалі жалезная руда, на в. Эўбея — медзь, у Атыцы — серабро і белы мармур. Добрая гліна знаходзілася ўсюды. Большасць насельніцтва жыла ў гліняных мазанках.

2. Палацы на Крыце і Балканах у III—II тыс. да н. э. Грэчаскія плямёны ахейцы і іянійцы прыйшлі з прыдунайскіх раёнаў у канцы III тысячагоддзя. У 1900 г. англійскі вучоны Эванс у час раскопак адкрыў трохпавярховы Кноскі палац на Крыце. Велічыня і планіроўка палаца былі такімі, што чалавек не мог знайсці самастойна вы-

хад. Грэкі назвалі яго *лабірынтам* («заблытанасцю»). У падземным паверсе размяшчаліся майстэрні і кладоўкі, у якіх хаваліся зброя, запасы харчавання. Палац быў цэнтрам дзяржавы, якой кіраваў цар. Малюнак аднаго з цароў захаваўся на тынкоўцы ўнутранай сцяны. Цару Мінасу, як расказана ў міфе, падначаленыя плямёны адпраўлялі чалавечыя ахвяры. У палацы хаваўся Мінатаўр, які і пажыраў юнакоў. Захаваўся малюнак Мінатаўра — фантастычнай істоты, чалавека з бычынай галавой. Ён увасабляў бажаство грознай стыхіі землетрасення, бушуючага мора і іншых сіл прыроды. На другім малюнку паказана гульня з сапраўдным быком, якому людзі пакланяліся як увасабленню сіл прыроды. Верылі ў існаванне многіх багоў. Іх узначальвала *«вялікая багіня»*, *«уладарніца»*. Так яе называлі. Захавалася статуэтка багіні, трымаючай змей. Яна лічылася вялікай мацерай людзей, жывёл і раслін. Цар быў вярхоўным *жрацо́м*.

Навокал палаца размяшчаліся паселішчы прымітыўных глінабітных хацін беднякоў. Сяляне і рабы аддавалі ў палац частку жывёлы, зерня, аліўкавага алею, віна. Яны будавалі дарогі, арашальныя каналы. Лішкі вырабаў рамеснікаў ішлі на продаж у Егіпет, Сірыю, на Кіпр.

3. Мікены і Пілас. Цэнтрам *ахейцаў* былі Мікены на Пелапанескім паўвостраве. Нямецкі археолаг Г. Шліман у 1876 г. раскапаў магілы Мікенскай цытадэлі. Ён знайшоў залатыя пярсцёнкі, посуд, зброю, панцыры з ліставога золата, залатыя маскі пахаваных людзей. Падобныя палацы знахо-

дзіліся ў суседнім Тырынфе, у Піласе (Паўднёва-Заходні Пелапанес) і іншых месцах. Яны былі невялічкімі, але незалежнымі дзяржавамі. Цытадэлі будаваліся з вялізных камянёў. Таўшчыня сцен дасягала 4,5 м. Унутры сцен будавалі казематы. У такіх месцах таўшчыня сцяны складала 17 м.

Вучоныя знайшлі ключ к разуменню таблічак знакаў *лінейнага складовага пісьма*. У Пілоскім архіве зарэгістравана каля 1500 жанчын-рабынь і дзяцей. Вядомы невялікія атрады рабоў-мужчын. *«Рабы і рабыні бога»*, гэта значыць храма, арандавалі дзялянкі зямлі абшчыны ці багатых людзей. Свабодныя сяляне і рамеснікі складалі асноўную масу насельніцтва. Дварцовыя чыноўнікі выдавалі кавалям бронзу і іншую сыравіну. Яны сачылі, куды расходаваўся кожны наканечнік кап'я ці стралы. Так цар кантраляваў усё.

У сярэдзіне XV стагоддзя да н. э. вывяржэнне вулкана на в. Фера (сучасны Сантарын, размешчаны на поўнач ад Крыта) разбурыла паселішчы. Кноскі дварэц вытрымаў. З поўдня Балканскага паўвострава грэкі-ахейцы ўварваліся на Крыт і захапілі яго. Яны перанялі ад крыцян лінейнае пісьмо, рэлігію, жывапіс, навучыліся будаваць водаправоды і каналізацыю.

У 1240—1230 гг. да н. э. ахейцы разбурылі Трою на ўзбярэжжы Малой Азіі. *Траянцы* таксама адно з грэчаскіх плямён. Траянская вайна і іншыя войны аслабілі ахеян.

На рубяжы XIII—XII стагоддзяў да н. э. грэчаскае племя *дарыйцаў, фракійцы і іліі-*

рыйцы, якія прыйшлі з паўночнай часткі Балкан, апусташылі поўдзень Балкан. Паступова дарыйцы засялілі Пелапанес.

Аб жыцці грэкаў у XI — сярэдзіне VIII стагоддзя да н. э. мала звестак. Пастаянныя сувязі паміж Тырынфам і Аргасам (апошні таксама знаходзіўся ў Пелапанесе) з іншымі маленькімі дзяржавамі перапыніліся.

4. Эпас. *Зараз пад эпасам разумеюць сукупнасць твораў, аб'яднаных агульнай тэмай.* Такой тэмай у паэме «Іліяда» была Траянская вайна, а ў «Адысеі» — вандраванні цара Адысея пасля вайны. Гэтыя паэмы стваралі многія людзі, а апрацаваў адзін таленавіты паэт. Дакладна невядома, што гэта быў менавіта **Гамер.**

У «Іліядзе» і «Адысеі» ёсць даставерныя звесткі, а таксама казкі, паэтычны вымысел. Ужо старажытныя грэкі сумняваліся, ці быў гістарычнай асобай цар Мікен Агамемнан — галоўнакамандуючы грэчаскімі войскамі.

Гамер расказвае, колькі караблёў направіла кожная грэчаская дзяржава ахейскіх грэкаў супраць Троі. Па думцы Гамера, Пілас падпарадкоўваўся Агамемнану. Пілоскія дакументы гэта не пацвярджаюць.

5. Міфы. Спачатку ўзніклі міфы. Яны захаваліся ў эпасе.

Першабытны чалавек думаў і гаварыў аб тым, што бачыў, успрымаючы вонкавы выгляд акружаючых яго прадметаў, напрыклад дуба, кіпарыса, сасны. У такога чалавека пераважалі зрокавыя ўражанні. Ён не ўмеў яшчэ назваць гэта адным словам «дрэвы». Ён не ўжываў слова «жывёлы», а кожны раз называў каня, казу, авеч-

ку і іншых. Чалавек не адрозніваў нават сябе ад раслін, жывёл, ад усяго астатняга. *Міф — такі расказ, у якім чалавек з дапамогай народнай фантазіі пераносіў роднасныя адносіны паміж людзьмі на ўсю прыроду, на ўвесь свет.* У міфе расказчык не ставіў пытанні і не шукаў адказы, чаму расліны і жывёлы растуць, змяняюцца. Міфы паклалі пачатак пазнанню навакольнага свету.

З цягам часу людзі накапілі шмат такіх ведаў. Асабліва шанавалі расказы бацькоў, старэйшых людзей. Складаюцца вусныя апавяданні, эпас, больш дасканалы спосаб пазнання, чым міф.

6. Рэлігія. Гамер ставіць пытанні і дае адказы. Напрыклад, ён лічыў, што Зеўс-грамавержац рабіў чалавека рабом. Свабодным людзям бог дараваў багацце. Зеўс на савеце ўсіх багоў вырашаў, ці пачынаць вайну паміж ахейцамі і траянцамі. Багіні Гера, родная сястра і жонка Зеўса, і Афіна, бог Пасейдон панесліся з нябёс дапамагаць ахейцам. Багі Апалон і Арэс, багіня палявання Артэміда сталі на бок траянцаў. Багі і багіні, «душой нязгодныя» адзін з другім, непасрэдна самі ўдзельнічалі ў бітвах. Каб апраўдаць уладарніцтва знаці над абшчыннікамі, Гамер сцвярджае, што Ахіл, цар і герой ахейцаў,— сын цара Пелея і марской багіні Фетыды. А траянскі цар Эней кажа Ахілу: «Я — сын Анхіза і Афрадыты». Анхіз — цар траянскі, Афрадыта — багіня любві. Эней пры гэтым заўважае: ведаем, што мы сыны багінь, але самі не бачылі сваіх бацькоў. *Такое мысленне, усведамленне, пры якім людзі гавораць аб*

тым, што ніколі не бачылі, прынята называць рэлігіяй. Гэта слова ўжываў рымскі вучоны Цыцэрон. Яно мела шмат значэнняў. Бліжэйшымі да сучаснага значэння гэтага слова з'яўляюцца *«сумленнасць»*, *«набожнасць»*. У сучаснай навуцы існуе іншае вызначэнне рэлігіі. *Рэлігія — фантастычнае адлюстраванне ў свядомасці людзей прыроды і адносін паміж людзьмі.* Людзі не маглі растлумачыць жывёльнага, расліннага свету. Стварылі фантастычную фігуру Мінатаўра — чалавека з бычынай галавой. Анак пазней большасць багоў і багінь у скульптуры рабіліся падобнымі да сапраўдных людзей. Людзі не маглі растлумачыць, чаму з'явіліся свабодныя і рабы, багатыя і бедныя.

Слоўнік.

Міф — грэч. расказ.

Э́пас — грэч. слова, мова, апавяданне.

Ара́кул — жрэц, прадказанне жраца, месца, дзе яно даецца.

Пантэ́он — храм, сход усіх багоў.

? **1.** Як аднесліся грэкі да Траянскай вайны ў VI ст.? **2.** Чым адрозніваліся палац і паселішчы вакол яго? **3.** Што пераняли грэкі ад крыцян і мікенян? **4.** На каго падзялялася насельніцтва Крыта і Піласа? **5.** Што называецца міфам, эпасам, рэлігіяй?

Міфы аб багах апавядаюць пра іх фантастычнае нараджэнне і такое ж нерэальнае, прыдуманае іх жыццё. Зеўс — бацька алімпійскай сям'і багоў і людзей. Прадракальнік сказаў бацьку Зеўса Крону, што ўласны сын пазбавіць яго ўлады. Вось чаму Крон праглынаў сваіх дзяцей. Маці вырашыла

выратаваць нованароджанага Зеўса. Яна спавіла камень і дала яго Крону, які, не разабраўшыся, праглынуў камень. Зеўса патаемна выхавалі на востраве Крыт. Жонка Зеўса Меціда («Мысль»), дачка Акіяна, падрыхтавала чароўнае піццё. Крон выпіў яго, адрыгнуў камень і дзяцей. Але Зеўс даведаўся, што сын ад Меціды пазбавіць улады яго самога. Зеўс паступіў мудрэй Крона: ён праглынуў цяжарную жонку. У выніку з галавы Зеўса нарадзілася багіня Афіна. Цэлы ланцуг жудасных фантазій! Багі і багіні нараджаліся, але не так, як людзі. Дзеля захавання ўлады багі-бацькі глыталі ўласных дзяцей.

Зеўс раздзяліў уладу над светам з братамі. Пасейдон правіў морам, Аід — падземным светам і царствам мёртвых. Гера, царыца багоў, як і Зеўс, валодала воблакамі і бурай, громам і маланкай і пасылала ўраджай. Яна дапамагала, як думалі грэкі, рожаніцам. Зеўс і Гера нарадзілі Арэса, бога вайны. Старажытнагрэчаскі паэт Гесіёд лічыў Геру сёмай жонкай Зеўса. У Зеўса было многа жонак, як у траянскага зямнога цара Прыяма. Старэйшая багіня Лето нарадзіла Зеўсу Апалона, Артэміду. Апалон — бог дзвярэй, потым, у гамераўскую эпоху, пакравіцель арыстакратаў. Артэміда — уладарніца звяроў, дрэў і расліннасці.

Гамер апісаў дванаццаць галоўных багоў і багінь, якія жылі на гары Алімп. Акрамя іх, было многа другарадных багоў. Гамер не ўвёў у алімпійскі пантэон багоў Дыяніса, сына Зеўса і царэўны Сямелы. Пасля смерці маці Зеўс вынасіў яшчэ ненарадзіўшагася Дыяніса ў сваім сцягне. Садаводы стваралі вобраз Дыяніса ў выглядзе пня, земляробы — у выглядзе быка ці казла. Значыць, быў час, калі людзі пакланяліся дрэвам і жывёлам. Яшчэ пазней Дыяніса сталі паказваць барадатым мужчынам, затым — юнаком. Гамер таму не лічыў

Дыяніса алімпійскім богам, што яму пакланяліся земляробы, абшчыннікі. Яны думалі, што Дыяніс дапамагае вырасціць ураджай усялякай расліннасці, вінаграду, зрабіць крэпкае віно. А Гамер праслаўляў арыстакратаў-воінаў, пірацкія паходы, маляўніча апісваў, як ахейскі герой Ахіл валачэ забітага Гектара, прывязаўшы ногі да калясніцы. Не выпадкова ў пачатку V ст. да н. э. адносіны да такіх гераічных учынкаў змяніліся, бо арыстакратыя страціла ўладу. На гераічны эпас напісалі пародыю «Вайна жаб і мышэй». І ў гэтай паэме дзейнічае Арэс, «вайны падбухторшчык». Зеўс насмешліва запытаў Афіну, ці жадае яна прыйсці на дапамогу мышам. Афіна адмовілася, бо мышы ліжуць яе лампаднае масла і пагрызлі адзенне. У гэтай «вайне воляю Зеўса канец наступае».

У Гамера кожны цар, герой паходзіць непасрэдна ад багоў. Калі міф апавядае аб багах, то жрацы, большасць грамадзян, законы бацькоў сцвярджалі, што гэта праўда, і настойвалі на дакладнасці ўсяго сказанага. Гэтым рэлігія адрозніваецца ад міфа або казкі пра людзей. У старажытных грэкаў міфы, эпас і рэлігія не былі аддзелены адзін ад другога.

Паданне аб «Адысеі» адносіцца да казкі аб мараплаўцах. Гістарычнай, праўдзівай асновай яго з'яўляецца рэальная небяспека загінуць у час марской буры ці ад нападу піратаў. Небяспека афарбавана адкрытым вымыслам, у які не верылі. Сірэны — птушкі з жаночай галавой — цудоўнымі спевамі заманьвалі мараплаўцаў к востраву, дзе караблі разбіваліся аб скалы. Каб не паддацца зману, Адысей заляпіў воскам вушы сваіх маракоў, а сябе загадаў прывязаць да мачты. Так ён і спевы пачуў, і не звярнуў да сірэн.

Дыяніс і марскія разбойнікі. Лічылася, што Дыяніс прайшоў па Грэцыі, Сірыі, Азіі, дайшоў да Індыі і

вярнуўся цераз Фракію ў Грэцыю. Аднойчы ён апынуўся ў марскіх разбойнікаў. Разбойнікі папрасілі зрабіць цуд. Тады яны паверацъ, што Дыяніс — бог. Дыяніс ператварыў парус у вінаградную лазу, а разбойнікаў — у дэльфінаў. Папрасілі сабе на згубу!

Некалькі подзвігаў Геракла. Шмат міфаў складзена пра героя Геракла. Калі цар Амфітрыён быў на вайне, Зеўс з'явіўся ў абліччы Амфітрыёна да яго жонкі Алкмены. Так нарадзіўся Геракл. Раўнівая жонка Зеўса Гера паслала да дзіцяняці дзвюх змей, але маленькі Геракл іх задушыў. Калі Геракл стаў бацькам, Гера наслала на яго вар'яцтва і Геракл забіў сваіх дзяцей. Дэльфійскі аракул (яго давала жрыца Апалона піфія) загадаў Гераклу служыць цірынфскаму цару Эўрысфею 12 год, каб ачысціцца ад злачынства.

За час гэтага служэння Геракл здзейсніў 12 подзвігаў. Ён задушыў льва каля горада Нямеі, што ў Аргалідзе. З дапамогай героя Іялая ён забіў дзевяцігаловую гідру ў балоце каля горада Лерна. У ваколіцы горада Сцімфалы медныя птушкі з бронзавымі крыллямі разрывалі на часткі людзей і жывёлу. Багіня Афіна дала Гераклу два медныя цімпаны, выкананыя богам Гефестам. Узышоўшы на ўзгорак, Геракл ударыў у цімпаны. Птушкі напалохаліся і ўзляцелі над лесам. Яны дажджом сыпалі свае пер'і — стрэлы, але не пападалі яны ў Геракла. А Геракл паразіў усіх птушак стрэламі свайго лука. Загадаў Эўрысфей ачысціць ад гною жывёльны двор Аўгія, цара Эліды. Адных белых і чырвоных быкоў было больш за пяцьсот. Геракл папрасіў у Аўгія дзесятую частку статка за работу. Аўгій згадзіўся, думаючы, што немагчыма за адзін дзень выканаць такую работу. Геракл зрабіў праломы з двух бакоў сцяны, акружаючай двор, запрудзіў дзве рэчкі. Вада выйшла з берагоў і знесла

гной. Аднак Аўгій не аддаў дзесятую частку быкоў. Цераз некалькі гадоў Геракл уварваўся ў Эліду з вялікім войскам, забіў Аўгія і забраў усё яго багацце. У гонар перамогі Геракл прынёс ахвяры алімпійскім багам і ўстанавіў Алімпійскія гульні.

● У гонар чаго Геракл устанавіў Алімпійскія гульні?

Раздзел II. Росквіт грэчаскага грамадства

§ 27. Ад першабытнай абшчыны да дзяржавы

1. Удасканаленне прылад працы і жыццё абшчыны. Дарыйскае заваяванне адкінула Грэцыю назад. Ад мікенскай эпохі засталіся дасягненні: ганчарны круг, апрацоўка металаў, карабель з парусам, вырошчванне алівы і вінаграду. На тэрыторыі Грэцыі ўсталяваўся *першабытнаабшчынны лад*. Аднак у X—IX стагоддзях да н. э. распаўсюджваюцца жалезныя прылады працы. Долата і цясло знойдзены на Крыце, у Афінах, а ў Тырынфе — серп. Вострымі і цвёрдымі прыладамі працы кожны чалавек паасобку, не толькі абшчыны людзей, мог усё вырабляць больш хутка. Гэта быў тэхнічны пераварот. І ўсё ж гаспадарка была натуральнай. У абшчыне людзі амаль усё выраблялі самі, а не куплялі.

Гамер апісаў шчыт Ахіла, быццам бы зроблены самім богам кавальскага рамяства Гефестам. На адным малюнку земляробы аруць зямлю, падганяючы валоў. На другім

жняцы працуюць вострымі сярпамі. Дзеці ахапкамі падаюць калоссі вязальшчыкам. У абшчыне зямлю па *жэ́рабю* дзялілі. Гаспадароў надзелаў перыядычна мянялі, каб лепшымі землямі маглі карыстацца і другія. У часы, аб якіх апавядае «Адысея», перадзелы зямлі спынілі. Абшчына адводзіла надзелы ў 20—30 га прадстаўнікам радавай знаці. Раб Адысея Эўмей пасвіў на абшчынных землях 12 царскіх статкаў буйных рагатых жывёл і 60 статкаў дробных (авечак, коз) і свіней.

Рамеснікаў у гэты час называлі *«дземіўргамі»*, гэта значыць працуючымі на абшчыну. Да рамеснікаў адносілі ўсіх, хто не займаўся земляробствам: кавалёў, цесляроў, спевакоў, жрацоў, лекараў і іншых. Вядомы рамеснікі па металу, дрэву, скуры, гліне. Аседлым рамяством было кузнечнае, астатнія — вандроўным. Аднак раздзяленне працы паміж рамеснікамі і земляробамі амаль не было. Чалавек вырабляў саху і апрацоўваў зямлю. Героі «Іліяды» і «Адысеі» не ведаюць нават слова *«купец»*. Радавая знаць не паважала гандляроў. А *пірацтва* лічылася доблесцю.

2. Разлажэнне першабытнай абшчыны. Надзел зямлі забяспечваў свабоду і правы абшчынніка. Земляроб быў членам народнага сходу, разам з усімі ўдзельнічаў у святах і прыносіў ахвяры багам. Неўраджай, нападзенне іншапляменнікаў, мнагадзетнасць і іншыя прычыны прыводзілі да драблення ці страты надзелу. Такіх грэкі называлі *фе́тамі*, батракамі. Адысей, баючыся жаніхоў сваёй жонкі Пенелопы (яны думалі, што ён загінуў), вярнуўся дадому пад

выглядам фета, жабрака. Знатны Еўрымах прапанаваў яму ежу, вопратку і абутак за службу фета. Гаспадар мог скасаваць умовы наймання па свайму жаданню. Фет не меў такога права. Феты, не знайшоўшыя месца працы, гублялі правы свабоднага чалавека.

У «Іліядзе» не ўпамінаюцца рабы-мужчыны. Ваеннапалонных забівалі. Жанчын і дзяцей бралі ў палон і ператваралі ў рабоў. Але раней наогул палонных не бралі.

У часы першабытнаабшчыннага ладу людзі карысталіся прымітыўнымі прыладамі працы. Яны яшчэ не навучыліся іх вырабляць. Яны не ведалі, як вырасціць такі ўраджай, каб забяспечыць жыццё. У такіх умовах палонны — лішні ядок. Яго вымушаны былі забіваць або рабіць членам роду, які працаваў разам з усімі. Толькі супольна працуючы, абшчыннікі маглі забяспечыць сябе неабходным. Таму царская дачка Наўзікая са сваімі служанкамі сама мые бялізну. А Адысей ганарыцца здольнасцю араць зямлю. *Рабы працавалі разам з членамі сям'і. Такое рабства ў навуцы прынята называць патрыярхальным. Яно абазначае ўладу бацькі («пáтэр») над усімі членамі сям'і, як над сваімі ўласнымі жонкай і дзецьмі, так і над рабамі.* Калі людзі навучыліся вырабляць дастаткова прадуктаў, працаваць хутчэй, патрыярхальная сям'я стала асноўнай гаспадарчай адзінкай, стала працаваць самастойна. Патрыярхальнае рабства існавала таму, што ў абшчыне выраблялася амаль усё неабходнае, гандаль быў неразвіты, раб не мог вырабіць прадукт на продаж.

Грошай яшчэ не было. За рабыню плацілі ад 4 да 20 быкоў, за даспехі — ад 9 да 100 быкоў. У «Адысеі» сустракаюцца пакупныя рабы-мужчыны, але больш было рабынь. Толькі цары і знаць валодалі рабамі. Імі станавіліся палонныя або захопленыя піратамі. Знатных палонных маглі выкупіць родзічы, абшчыннікі такой надзеі не мелі. Праца рабоў абагачала *арыстакра́таў*.

3. Свабодныя і залежныя людзі. Зямля лічылася ўласнасцю ўсёй абшчыны. Аднак з'явіліся багатыя *«многанадзельныя»* і бедныя *«безнадзельныя»* людзі. Землі многанадзельных апрацоўвалі феты, малазямельныя абшчыннікі і рабы. Гамер называе багатых і знатных *«ары́стай»* («найлепшымі»), а бедных — *«какой»* («дрэннымі»). Толькі арыстакраты мелі вольны час, каб практыкавацца ў бегу, кіданні кап'я, дыска, утрымліваць баявога каня, купіць панцыр, панажы, скураны шчыт, абіты меддзю, бронзавы шлем. Арыстакраты станавіліся ў першыя рады народнага апалчэння, служачы інтарэсам усёй абшчыны. Таму знаць кіравала абшчынай, вяршыла суд, тлумачыла волю багоў. Сход воінаў паступова траціў сваю галоўную ролю, якую ён адыгрываў пры першабытнаабшчынным ладзе. Кіруючых прадстаўнікоў знаці Гамер называе *«басілёямі»* (царамі). За ўсё гэта царам абшчына давала лепшы зямельны надзел, ганаровую долю мяса, віна на пірах і іншыя «дары».

У VIII—VI стагоддзях да н. э. грэчаскія металургі навучыліся лепш выплаўляць жалеза з руды і

закальваць жалезныя вырабы на накавальні, атрымліваць сталь. Майстар **Глаўк** з вострава Хіос навучыўся зварваць і паяць жалезныя кавалкі. Майстры **Ройк** і **Феадор** з вострава Самоса выраблялі тонкія і цвёрдыя лісты бронзы. Маючы жалезныя пілы, молаты, іншыя прылады, грэкі навучыліся будаваць караблі. Вялікія *трыёры* прыводзілі ў хуткі рух 180 грабцоў. Магчымасці аднаго чалавека ў вытворчасці павялічыліся. Рамяство стала асобнай галіной гаспадаркі, яно аддзялілася ад земляробства. Земляробы і рамеснікі пачынаюць гандляваць. Рамеснікі селяцца кучна, у адным месцы, што спрыяла развіццю гарадоў. У пачатку VII ст. да н. э. паявіліся срэбраныя грошы.

Выкарыстоўваючы працу фетаў і рабоў, ваеннарадавая знаць захоплівала абшчынныя землі. Даведзеныя да галечы сародзічы бралі ў доўг грошы, прасілі валоў для апрацоўкі сваіх кавалкаў зямлі. Аддаць яны павінны былі больш, чым пазычалі. Даўжнік, які не мог разлічыцца, спачатку губляў зямлю, потым аддаваў у рабства дзяцей, жонку і, нарэшце, самога сябе.

4. Паняцце аб дзяржаве-полісе. Расслаенне на багатых, людзей сярэдняга дастатку і бедных паскорылася. Паэт-селянін **Гесіёд** (жыў на рубяжы VIII—VII стагоддзяў да н. э.) у паэме «Праца і дні» расказаў аб жыцці жыхароў Беотыі. Гесіёд працаваў сам, жанчына-рабыня і хлопчык-раб. Ён наймаў на палявую працу фетаў, а на зіму — батрачку. Значыць, у яго час рабамі сталі валодаць не толькі арыстакраты, але і частка абшчыннікаў. Частка сялян папала ў даўгавое рабства. Рамеснікі, пасяліўшыся

ў горадзе, куплялі прывазных, купленых рабоў, якія працавалі ў розных майстэрнях.

Гесіёд у басні пра ястраба і салаўя расказаў, як кіравала абшчынай радавая знаць. Ястраб увасабляў басілеяў і іх суд, а салавей — селяніна. Схапіў ястраб салаўя вострымі кіпцюрамі і кажа:

Што ты, няшчасны, пішчыш? За цябе я дужэй!
Як ты ні спявай, а цябе панясу я, куды захачу.
І паабедаць магу я табой, і адпусціць на свабоду.

Таму Гесіёд назваў свой век жалезным. Ён тлумачыць, чаму не хоча жыць:

Дзеці з бацькамі, з дзецьмі — бацькі згаварыцца не змогуць.
Стануць чужымі таварыш таварышу, а гасцям — гаспадар.
Між братамі не будзе любві, як бывала калісьці...
Старэнькіх бацькоў хутка зусім паважаць перастануць,
Праўду заменіць кулак. Гарады падпадуць разбурэнню...
Дзе сіла, там будзе і права.

У гімне працы Гесіёд сцвярджае:

Голад, табе гавару я, заўсёды таварыш ляніўца.

Праца рабоў, батракоў на карысць Гесіёда, якая зрабіла яго заможным селянінам, не ўлічваецца.

Жудасны малюнак барацьбы паміж багатымі і беднымі, неабходнасць трымаць у пакорнасці рабоў, абараняць межы сваёй абшчыны зрабілі неабходным стварыць *новую арганізацыю свабодных грамадзян — дзяржаву*. Грэкі назвалі яе *пóлісам. Яна рэгулявала адносіны паміж беднымі і багатымі, каб яны ў барацьбе за зямлю, рабоў і грошы не перабілі адзін аднаго.*

5. Грэчаскія пасяленні за межамі Балканскага паўвострава. У VIII ст. да н. э. на востраве Эўбея развітымі цэнтрамі рамяства і гандлю сталі гарады Халкіда і Эрэтрыя. Каля 750 г. да н. э. частка жыхароў Халкіды на караблях пераехала ў паўднёвую Італію і заснавала г. Кумы. Пасяленцы з Карынфа дасягнулі вострава Сіцылія. На поўдні сучаснай Францыі з'явілася Масілія (сучасны Марсель). На поўначы Балкан заснавалі Пацідэю. Жыхары Мегар пабудавалі Візантый на беразе Баспорскага праліва. Гэта быў шлях у Понт Эуксінскі («Добры пуць»). Так грэкі называлі Чорнае мора.

6. Прычарнаморскія пасяленні. Выхадцы з Мілета (размешчаны на ўзбярэжжы Малой Азіі) пасяліліся на сучасным востраве Беразань (Буга-Дняпроўскі ліман). На правым беразе р. Буг з'явілася Ольвія (цяпер вёска Паруціна), Феадосія ў Крыме, Пантыкапей (сучасная Керч). На Каўказскім узбярэжжы вядомы Дыяскурыяда (раён Сухумі), Фасіс (цяпер Поці).

Такія пасяленні грэкі называлі *апо́йкіямі* (ад дзеяслова «пасяляць»), а рымляне — *кало́ніямі* (ад «апрацоўваць», «насяляць»). Новыя землі каланісты вымушаны былі шукаць таму, што на радзіме, нягледзячы на дасягненні земляробства, яны не маглі забяспечыць сябе хлебам і іншым харчаваннем. У грэчаскіх гарадах-дзяржавах вялася барацьба паміж багатымі і беднымі. Пацярпеўшыя паражэнне пакідалі радзіму. Яны рассылалі ганцоў па другіх полісах, прызываючы мала- і беззямельных стаць каланістамі. Горад, які выселіў каланістаў, называўся *метраполіей*. Ён падтрымліваў з калоніяй пастаянныя сувязі. Кала-

ністы гандлявалі з мясцовым насельніцтвам. Часта яны падпарадкоўвалі плямёны шляхам заваявання.

На рубяжы VI—V стагоддзяў да н. э. грэчаскія калоніі Керчанскага праліва і ўсходняга ўзбярэжжа Азоўскага мора аб'ядналіся ў Баспорскае царства. Пантыкапей стаў яго сталіцай. Гэты саюз супрацьстаяў напору скіфскіх плямён. Ён гандляваў з грэчаскімі полісамі.

Каланізацыя падняла гаспадарку і гандаль полісаў. Востраў Эгіна квітнеў за кошт вывазу ганчарных вырабаў у грэчаскія гарады. Атыка прадавала аліўкавы алей, Карынф — парфумныя пасудзіны.

? **1.** Што было намалявана на шчыце Ахіла? **2.** З дапамогай якіх прылад працы грэкі ажыццявілі тэхнічны пераварот? **3.** Як называецца такая гаспадарка, у якой усё вырабляюць, што спажываюць, і амаль нічога не купляюць? **4.** Па якіх прычынах абшчыннік губляў свае правы і станавіўся фетам? **5.** Чаму першапачаткова палонных забівалі або рабілі членамі роду? **6.** Хто валодаў рабамі ў часы Гамера і Гесіёда? **7.** Як самі грэкі называлі дзяржаву?

§ 28. Асаблівасці полісаў Спарты і Афін

1. Спартанцы і ілоты. Пасля захопу Пелапанеса дарыйцамі частка яго жыхароў перасялілася ў Малую Азію, другая змяшалася з заваёўнікамі, трэцяя пакарылася і плаціла даніну. У Лаконіцы дарыйцы заснавалі Спарту, а на поўначы Пелапанеса — самастойны поліс Аргас. Спартанцы ператварылі ахейцаў, якія насялялі Месенскую даліну, а таксама заваяваных лаконцаў у

ілóтаў. Зямля лічылася ўласнасцю спартанскай дзяржавы. Яе раздзялілі прыкладна на 9 тысяч надзелаў. Кожны надзел замацавалі за спартыятам-воінам. Некалькі ілоцкіх сямей сваім інвентаром і валамі апрацоўвалі зямлю, аддаючы гаспадару палову вырашчанай жывёлы, ураджаю. А тое, што засталося, ілоты маглі па ўласнаму жаданню нават прадаць. Грамадзянамі Спарты лічыліся толькі мужчыны 20-гадовага ўзросту і старэйшыя, хаця ілотаў было прыкладна ў дзесяць разоў больш, чым спартанцаў. Асобны гаспадар не меў права забіць ці прадаць ілота. Аднак пяць вярхоўных правіцеляў, *эфóраў*, перыядычна вырашалі тайна забіваць самых дужых ілотаў, бо баяліся іх выступленняў. Віны ў такога забітага не было, ілотам забаранялі насіць зброю. Рабілі гэта спартанскія юнакі, якія скрыта высочвалі свае ахвяры. Кожнага ілота бязвінна білі палкамі, каб ён памятаў аб рабскім становішчы.

2. Спартанскае выхаванне. Праца ілотаў пазбаўляла спартанцаў ад неабходнасці самім дабываць сабе неабходнае для жыцця. Спартанцы мелі вольны час займацца дзяржаўнымі і ваеннымі справамі. Хлопчыкі з сямі гадоў аддаваліся ў *агéлы* (літаральна «статкі»), лагеры, у якіх яны праходзілі муштроўку. Іх выхоўвалі вынослівымі, хітрымі, жорсткімі. З дваццаці гадоў да шасцідзесяці мужчыны служылі ў апалчэнні. Частку прадуктаў яны аддавалі ў мужчынскія дамы і там штодзённа абедалі. Хто не мог забяспечыць узнос у «дом», таго пазбаўлялі грамадзянскіх правоў. У «доме» яны аднолькава харчаваліся. Усе насілі простае адзенне.

Спартанцы пакінулі свабоднымі частку падпарадкаваных мясцовых жыхароў на граніцах сваёй дзяржавы. Іх сталі называць *перыёкамі*. Перыекі апрацоўвалі зямлю, займаліся рамяством, плацілі падатак, але грамадзянскіх правоў не мелі.

Прадметы раскошы, гандаль у Спарце былі забаронены. Так спартанцы за кошт працы ілотаў жылі ў абшчыне роўных. Эфоры сачылі за паводзінамі грамадзян.

3. Дзяржаўны лад Спарты. Эфоры маглі выгнаць цара, калі ён парушаў спартанскія законы. Але яны не мелі права адмяняць загады цара ў час вайны. Цароў было два. Пяць эфораў, два цары, 28 старэйшын раіліся аб дзяржаўных справах. Калі яны не маглі вырашыць спрэчкі, то звярталіся да *апэ́лы*, сходу грамадзян. Прымалася тая прапанова, за якую сход гучней крычаў. *Такое кіраванне дзяржавай, якое ажыццяўлялася «нямногімі» («алігай») людзьмі, самі грэкі называлі алігархічным (грэч. «архэ» — «улада»).*

Спартанская фаланга цяжкаўзброеных, трэніраваных, дысцыплінаваных і заўсёды сабраных разам пехацінцаў была непераможнай. Дзякуючы ёй Спарта ў сярэдзіне VI ст. да н. э. падпарадкавала сваёй *гегемоніі* («панаванню») полісы Пелапанеса Карынф, Сікіён, Мегары.

4. Афіны ў часы Драконта. Дарыйцы не змаглі захапіць Атыку. Тут склалася група афінян з іянійцаў і *пела́згаў*, якая гаварыла на іянійскім дыялекце грэчаскай мовы. Афіны размешчаны ў 5 км ад мора, маюць прыродную скалу *акро́-*

паль. Па паданню, герой **Тэзей** аб'яднаў на добраахвотных пачатках і сілай радавыя абшчыны. Спачатку толькі жыхары Афін пакланяліся багіні Афіне, а пасля аб'яднання — усе абшчыны. **У 621 г. архант Драконт** запісаў вусныя законы. Ён пазбавіў знатных людзей права тлумачыць законы так, як яны самі жадаюць. Драконт забараніў кроўную помсту, па якой родзіч забітага забіваў забойцу. Жорстка ахоўвалася прыватная ўласнасць. Нават за кражу агародніны каралі смерцю.

Радавую ўласнасць не адмянялі, але перадзелы зямлі не рабілі, яна, як пісаў Арыстоцель, была ў пачатку VI стагоддзя ў руках «нямногіх». Абшчыннікі бралі зямлю ў арэнду, пакідаючы сабе за працу адну шостую частку ўраджаю. Пракарміць сям'ю было немагчыма. Шмат афінян папала ў даўгавое рабства. Рамеснікі, гандляры Афін карысталіся працай прывазных, пакупных рабоў. Частка такіх выхадцаў з *дэмасу («народу»)* стала багатымі. Але эўпатрыды не дапускалі іх да кіраўніцтва полісам. Земляробы, рамеснікі і гандляры выступілі супраць знаці. Набліжалася грамадзянская вайна.

5. Рэформы Салона. У *эўпатрыдаў* хапіла мудрасці вылучыць са свайго асяроддзя збяднеўшага, але паправіўшага сваё становішча гандлем **Салона. У 594 г. да н. э.** яго выбралі архантам. Грэчаскі вучоны **Плутарх** піша, што Салон прыстасаваў законы да жыцця, а не жыццё да законаў. Гэта выражалася ў тым, што ў часткі земляробаў-абшчыннікаў, рамеснікаў і гандляроў з простага, нязнатнага народу з'явілася прыватная ўласнасць. Тэхнічны пераварот, які адбыўся дзякуючы прымяненню жалезных прылад працы і ўзбраення, вылучыў

на першае месца ў народным апалчэнні цяжкаўзброеных пехацінцаў *(гаплітаў)*. Але знаць трымала ўладу, кіраўніцтва войскам, суд, пакланенне багам у сваіх руках. Таму Салон падзяліў усіх грамадзян на 4 *разрады* не па іх радавітасці, а па колькасці маёмасці. Самыя багатыя, якія валодалі 500 *медымнамі* і больш зерня, віна ці аліўкавага алею маглі быць выбраны архантам і *ваенным стратэгам*. Нават людзі другога разраду (ад 300 медымнаў да 500, *коннікі)* не атрымалі такога права. Але ўсе грамадзяне сталі членамі народнага сходу, які выбіраў арханта, а таксама *Савет чатырохсот*, ваенных кіраўнікоў (стратэгаў), суддзяў. Усе, багатыя і бедныя, абавязаны служыць у *апалчэнні* за свой кошт. Членамі сходу былі мужчыны ад 20 год і старэйшыя. Жанчыны такога права не мелі. Нават з'яўленне на сходзе жанчыны выклікала смех. У Савет чатырохсот выбіралі з грамадзян першага, другога і трэцяга разрадаў. Апошнія мелі ад 200 да 300 медымнаў і называліся *зеўгітамі*. Фетамі называлі тых, хто збіраў ураджай меншы за 200 медымнаў. Яны служылі ў войску ў якасці лёгкаўзброеных і мелі права ўдзельнічаць у судзе. Другі разрад павінен быў служыць у конніцы.

Да рэформы Салона сваю маёмасць бацька меў права перадаць сыну. Калі сына ў яго не было, то дачка і зяць не лічыліся наследнікамі, а толькі ўнук, калі ён нараджаўся. Салон прыняў закон аб свабодзе завяшчання маёмасці. Гаспадар атрымаў права перадаць сваю маёмасць нават чужому чалавеку. Родавая знаць згубіла

права ўмешвацца ў справу перадачы спадчыны.

Салон вызваліў усіх даўгавых рабоў і ў далейшым забараніў даваць грамадзяніну пазыку пад залог яго цела. Прададзеных на чужыну Салон вярнуў дадому. У Атыцы аказалася дастаткова прывазных, купленых рабоў. Аднак Салон не вярнуў зямлю страціўшым яе, не зрабіў перадзелу ўсяго.

Так Салон пачаў ствараць *дэмакратычны лад. Гэта адбылося таму, што дзяржава (поліс) зрабіла законнай прыватную ўласнасць.* Салон хацеў дабіцца міру ў абшчыне грамадзян усіх чатырох разрадаў. Але ён жа вымушаны быў прыняць закон: «Хто ў час смут у дзяржаве не стане са зброяй у руках ні за тых, ні за другіх, той падвяргаецца ганьбе і пазбаўляецца грамадзянскіх правоў». Салон з жалем і роспаччу пісаў, што ён круціўся сярод сваіх грамадзян, як воўк сярод зграі сабак. Ён на 10 гадоў пакінуў Афіны, наказаўшы не мяняць законы.

6. Тыранія Пісістрата. Але паміж грамадзянамі пачалася жорсткая барацьба, якая цягнулася некалькі дзесяцігоддзяў. Стварылася тры групоўкі знатных родаў, якія ўзначальвалі **Лікург, Мегакл** і **Пісістрат.** Шмат грамадзян было перабіта. Загінулі Лікург і Мегакл. У 560 г. да н. э. уладу захапіў Пісістрат. Ён устанавіў *тыранію, гэта значыць сваю асабістую ўладу.* Спачатку Пісістрат адабраў уладу ў арыстакратаў, раздаў землі часткі загінуўшай знаці земляробам. Будаўніцтва храмаў Афіны, Зеўса, Апалона і іншых грамадскіх пабу-

доў забяспечвала працай рамеснікаў. Ганчары сталі вырабляць прыгожую *чырвонафігурную кераміку*, якую Афіны ўсюды прадавалі. Афіны сталі мацнейшай дзяржавай. А сыны Пісістрата **Гіпарх** і **Гіпій** узмацнілі жорсткасць сваёй улады і не змаглі яе ўтрымаць. Знатныя юнакі **Гармодзій** і **Арыстагітон** у 514 г. да н. э. забілі Гіпарха. Пачалася новая грамадзянская вайна.

7. Рэформы Клісфена. Па запрашэнню аднаго знатнага афінскага роду Спарта ўвяла ў Афіны атрад сваіх гаплітаў. Знатны **Клісфен** узначаліў выступленне афінян супраць спартанцаў. Гіпій вымушаны быў уцячы ў Персію. А Клісфен у **508—500 гадах да н. э.** правёў новыя рэформы. Ён раздзяліў тэрыторыю на 10 новых выбарчых округ. Старадаўнія знатныя роды, якія звычайна жылі на адной тэрыторыі, былі запісаны ў розныя округі, раздроблены. Яны страцілі магчымасць угаворваць абшчыннікаў галасаваць за іх і іх прапановы. Народны сход выбіраў па 50 членаў савета ад кожнай округі. Савет складаўся з 500 чалавек. Ад кожнай округі выбіралі аднаго стратэга. Ваеначальнікаў стала 10. Выбіраліся 6 тысяч суддзяў. Клісфен прыняў закон аб *астракізме* (галасаванне *«чарапкамі»)*. Калі які-небудзь стратэг ці архант за сапраўдныя дзяржаўныя заслугі атрымліваў такую вялікую павагу ў грамадзян, што мог скарыстаць яе ў асабістых мэтах, тады назначалі суд чарапкамі.

Судзілі не за тое, што ён ужо зрабіў злачынства. Кожны з 6 тысяч суддзяў тайна пісаў імя такога чалавека на чарапку і кідаў у урну. Калі большасць выказвалася за выгнанне, такі чалавек

на 10 гадоў пакідаў Афіны. Сям'я яго заставалася дома, маёмасць належала выгнанніку. Клісфен зрабіў яшчэ адзін крок у развіцці рабаўладальніцкай дэмакратыі ў Афінах, падрыхтаваўшы іх да адпору персідскай агрэсіі.

Слоўнік.

Архáнт — кіруючы.

Дэ́мас — народ.

Эўпатры́ды — маючыя *«знатных бацькоў»*.

Меды́мн — 52,5 л сыпкіх ці вадкіх цел.

Дэмакрáтыя — улада народа, ад слоў *«дэмас»* і *«кратос» («улада»)*.

? **1.** Хто і чыімі прыладамі працы апрацоўваў зямельныя надзелы спартыятаў? **2.** Чаму становішча перыекаў можна лічыць прывілеяваным у параўнанні са становішчам ілотаў? **3.** Як ахоўваў прыватную ўласнасць Драконт? **4.** Па якіх адрозненнях падзялялі людзей эўпатрыды і Салон? **5.** За што быў забіты Гіпарх? **6.** Як Клісфен раз'яднаў знатныя роды?

Плутарх аб крыпціях у Спарце

«Так званая крыпція — калі яна сапраўды з'яўляецца адным з устанаўленняў Лікурга, як лічыць Арыстоцель,— паслужыла, мабыць, прычынай, з-за якой узнікла ў Платона падобнае меркаванне аб канстытуцыі і яе аўтару.

Заключалася ж яна ў наступным: час ад часу кіраўнікі дзяржавы рассылалі па краіне юнакоў з ліку найбольш кемлівых, якія мелі пры сабе толькі кінжалы і самы неабходны запас прадуктаў. Днём яны адпачывалі, хаваючыся ва ўтульных месцах, ноччу ж, пакінуўшы свае сховішчы, хапалі ілотаў на дарогах і забівалі іх. Яны таксама часта нападалі на сельскія мясцовасці і забівалі самых моцных і мужных ілотаў. Так

Фукідзід у «Гісторыі Пелапанескай вайны» расказвае аб тым, як самых мужных ілотаў спартанцы ўзнагародзілі вянкамі ў знак таго, што яны сталі свабоднымі. Яны абыходзілі храмы багоў адзін за другім, а некалькі пазней усе зніклі (а было іх больш за дзве тысячы), так што ні тады, ні пасля ніхто не мог растлумачыць, якім чынам яны загінулі. Арыстоцель расказвае, што эфоры, займаючы пасаду, перш за ўсё аб'яўлялі вайну ілотам, каб забойства іх адбывалася на законнай падставе. Ды і ў астатнім яны абыходзіліся з імі надзвычай сурова і жорстка; так яны прымушалі іх піць у вялікай колькасці нязмешанае з вадой віно і, прыводзячы на сісіціі, паказвалі юнакам, наколькі агідная загана п'янства. Яны прымушалі іх спяваць непрыстойныя песні і танцаваць брыдкія танцы; песні і танцы, якія ўжывалі свабодныя, ілотам былі забаронены».

Ксенафонт (жыў у 433—355 гг. да н. э.) аб уладзе цароў у Спарце

«Я хачу яшчэ расказаць, якія ўзаемаадносіны Лікург устанавіў паміж царамі і абшчынай грамадзян, бо царская ўлада — адзіная, якая застаецца менавіта такой, якой яна была ўстаноўлена з самага пачатку. Другія дзяржаўныя ўстанаўленні, як усялякі можа пераканацца, ужо пераўтварыліся і працягваюць пераўтварацца нават цяпер. Лікург прадпісаў, каб цар, які вёў сваё паходжанне ад бога, выконваў усе грамадскія ахвяраванні ад імя дзяржавы. Ён таксама павінен быў весці войска туды, куды яму загадае радзіма. Цару даецца права браць ганаровую частку ахвяраванай жывёліны. У гарадах перыекаў цару дазваляюць браць сабе дастатковую колькасць зямлі, каб ён меў усё неабходнае, але не быў багацей, чым належыць. Каб цары не харчаваліся дома,

Лікург прадпісаў ім удзельнічаць у грамадскіх трапезах. Ён дазволіў ім атрымліваць двайную порцыю не для таго, каб цары елі больш за другіх, а для таго, каб яны маглі ўшанаваць ядой таго, каго пажадаюць. Акрамя таго, Лікург даў права кожнаму цару выбраць для сваёй трапезы двух таварышаў, якія называліся піфіямі. Царам таксама было дадзена права атрымліваць парася ад кожнай свінні, якая апарасілася; гэта было зроблена для таго, каб у цара ніколі не было недахопу ў ахвяраваных жывёлах, калі ў яго ўзнікне неабходнасць параіцца з багамі. Сажалка, якая знаходзілася паблізу ад царскага дому, забяспечвала вадой. Наколькі гэта карысна, ведаюць тыя, хто не мае такога вадаёма. Пры з'яўленні цара ўстаюць усе, акрамя эфораў, якія працягваюць сядзець на сваіх крэслах. Эфоры і цар штомесячна абменьваюцца клятвамі: эфоры прысягаюць ад імя поліса, цар — ад свайго імя. Цар клянецца кіраваць у адпаведнасці з законамі, якія ўстаноўлены ў дзяржаве, а поліс абавязуецца захоўваць царскую ўладу недатыкальнай, пакуль цар будзе верны сваёй клятве. Вось так ушаноўваюць цара ў Спарце пры яго жыцці».

Ксенафонт аб выхаванні спартанцаў

«Я хачу расказаць, як выхоўвалі дзяцей у Спарце і ў іншых месцах... Мерай харчавання дзяцей яны лічаць умяшчальнасць іх страўнікаў. Замест таго каб прыстаўляць да кожнага хлопчыка рабоў-педагогаў, Лікург устанавіў, каб хлопчыкамі распараджаўся чалавек з ліку тых, каму дазволена займаць самыя высокія пасады ў дзяржаве. Ён называецца педаномам. Лікург даручыў педаному сабіраць дзяцей і, наглядаючы за імі, строга караць тых, хто акажацца нядбайным. Лікург даў яму бічаносцаў з ліку юнакоў, каб яны, калі патра-

буецца, каралі дзяцей. Таму ў Спарце дзеці вельмі паслушныя і вызначаюцца вялікай скромнасцю. Замест таго каб распешчваць ногі дзяцей абуткам, Лікург патрабаваў умацоўваць іх хаджэннем басанож. Ён лічыў, што, адказаўшыся ад абутку, яны значна лягчэй будуць падымацца ўгару і больш бяспечна спускацца ўніз. Прызвычаеныя хадзіць басанож, яны лягчэй, чым абутыя, будуць прыгаць, падскокваць і хутчэй бегаць. Замест таго каб расслабляць цела адзеннем, Лікург пастанавіў, каб яны на працягу ўсяго года насілі адзін і той жа гімацый. Ён лічыў, што так юнакі будуць лепш падрыхтаваны і да жары і да холаду. Ён рэкамендаваў ірэну мець такую колькасць ежы, каб яго выхавальнікі ніколі не наядаліся да перасыці. Ён хацеў, каб ежа не абцяжарвала іх і каб яны прывыкалі жыць у нястачы. Лікург лічыў, што выхаваныя такім чынам юнакі, калі ўзнікне неабходнасць, лягчэй змогуць пераносіць цяжкасці. Больш таго, калі будзе загадана, яны змогуць расцягнуць запас хлеба на большы прамежак часу і менш будуць мець патрэбу ў прыправах; яны прыстасуюцца да ўсялякай ежы, і спосаб жыцця іх будзе больш здаровы. Лікург аддаваў перавагу, каб ежа садзейнічала росту юнакоў і рабіла іх целы больш гібкімі, лічачы, што гэта будзе лепш, чым калі яны будуць таўсцець ад ежы. Ён не хацеў прымушаць юнакоў празмерна пакутаваць ад голаду, але не даваў магчымасці атрымліваць без працы тое, у чым яны мелі патрэбу; таму ён дазволіў ім красці, каб яны не пакутавалі ад голаду».

Плутарх аб забойстве дзяцей у Спарце

«Бацька не меў права выхоўваць сваё дзіця, але павінен быў прыносіць нованароджанага ў вызначанае месца, якое называлі лесхой, дзе засядалі старэйшыя філы. Уважліва агледзеўшы яго

і знайшоўшы моцным і дужым, яны дазвалялі яго выкормліваць, назначыўшы яму ўчастак зямлі (клер) з ліку 9 тысяч надзелаў. Калі ж дзіця аказвалася брыдкім і кволым, яны загадвалі выкінуць яго ў месце, якое называецца Апацэты (прадонне паблізу Тайгета), паколькі лічылі, што яму самому будзе лепш не жыць, а для дзяржавы стане толькі абузай чалавек, які ад нараджэння аказваўся слабым і брыдкім. Па гэтай прычыне жанчыны абмывалі нованароджаных не вадой, а віном, выпрабоўваючы такім спосабам іх здароўе. Бо існуе павер'е, што дзеці, паражоныя эпілепсіяй і іншымі хваробамі, паміраюць ад нязмешанага віна, у той час як здаровыя атрымліваюць яшчэ большую сілу і жыццяздольнасць».

Арыстоцель аб барацьбе паміж знаццю і народам у Афінах у пачатку VI ст. да н. э.

«Пасля таго на працягу доўгага часу адбываўся разлад паміж знаццю і народам. Трэба мець на ўвазе, што наогул дзяржаўны лад быў алігархічным, але галоўнае было тое, што бедныя знаходзіліся ў заняволенні не толькі самі, а таксама іх дзеці і жонкі. Называліся яны пелатамі і шасцідольнікамі, таму што на такіх арэндных умовах апрацоўвалі палі багацеяў. Уся ж зямля наогул была ў руках нямногіх. Пры гэтым, калі гэтыя беднякі не аддавалі арэнднай платы, можна было забраць у кабалу і іх саміх, і дзяцей. Ды і пазыкі ва ўсіх забяспечваліся кабалой аж да часу Салона. Ён першы зрабіўся прастатам (абаронцай) народа. Зразумела, з тагачасных умоў дзяржаўнага жыцця самым цяжкім і горкім для народа было рабскае становішча. Між іншым, і ўсім астатнім ён быў таксама незадаволены, таму што ні ў чым, можна сказаць, не меў сваёй долі».

Арыстоцель аб раздоры ў Афінах

«З прычыны таго, што існаваў такі дзяржаўны парадак і большасць народа была ў заняволенні ў нямногіх, народ паўстаў супраць знатных. Раздор быў моцны, і доўгі час адны змагаліся супраць другіх; нарэшце, яны выбралі сумесна пасрэднікам і архантам Салона і даручылі яму ўладжванне дзяржавы, пасля таго, як ён склаў элегію, якая пачыналася словамі:

Так, разумею, і ў сэрца глыбока маркота запала:

Бачу, як хіліцца ніц краіна, некалі першая
Паміж іянійскіх зямель.

У ёй ён нападае на абедзве партыі, абараняючы ў той жа час адну ад другой, разбірае ўсю спрэчку, а пасля гэтага пераконвае аднолькава і тых і другіх спыніць узнікшую спрэчку.

І наогул вінаватымі гэтай смуты ён заўсёды вылучае багатых. Таму і ў пачатку сваёй элегіі ён гаворыць, што баіцца, як срэбралюбства людзей, так і напышлівасці іх, значыць, мяркуе, што з-за гэтага і ўзнікла варожасць».

Плутарх. Салон. Глава V.

Анахарсіс, госць Салона, даведаўшыся аб састаўленні Салонам новых законаў, стаў смяяцца. «Салон марыць стрымаць грамадзян ад злачынстваў і карыслівасці пісанымі законамі, якія нічым не адрозніваюцца ад павуціны: як павуціна, так і законы,— калі пападаюцца слабыя і бедныя, іх трымаюць, а моцныя і багатыя вырвуцца. На гэта Салон, кажуць, запярэчыў, што і дагавораў людзі прытрымліваюцца, калі парушаць іх нявыгадна ні таму, ні другому боку; і законы ён так прыстасоўвае да інтарэсаў грамадзян, што пакажа ўсім, наколькі лепш паступаць чэсна, чым парушаць законы».

Салон аб законе гонару

«З астатніх законаў Салона асабліва своеасаблівым і дзіўным з'яўляецца той закон, які патрабуе, каб грамадзянскага гонару быў пазбаўлены чалавек, які не далучыўся ў час смуты ні да той, ні да другой партыі. Аднак ён, мабыць, хоча, каб ніхто не адносіўся раўнадушна і безудзельна да агульнай справы, ахаваўшы ад небяспекі асабісты здабытак і адгаворваючыся тым, што не падзяляе гора і пакут сваёй радзімы; ён хоча, каб усякі неадкладна далучыўся да тых, якія клапоцяцца аб лепшых і больш справядлівых мэтах, падзяляў з імі небяспеку і дапамагаў ім, а не чакаў у бяспецы таго, што прадпішуць пераможцы».

Арыстоцель аб ранняй тыраніі

«Паколькі ў склад дзяржавы ўваходзяць два элементы — клас людзей немаёмных і клас людзей заможных, тыран павінен унушаць і тым і другім, што іх дабрабыт абапіраецца на яго ўладу і ўпарадкаваць справы так, каб адны ад другіх ні ў чым не цярпелі крыўды. А тых з іх, якія акажуцца мацнейшымі, ён пераважна павінен зацікавіць у падтрыманні яго ўлады. І калі тырану ўдасца дасягнуць гэтага, яму не прыйдзецца ні адпускаць рабоў на волю, ні разаружаць грамадзян: прываблівання аднаго з упамянутых класаў на бок улады тырана дастаткова, каб усялякага роду замахі на яе пацярпелі няўдачу. Было б лішнім распаўсюджвацца дэталёва аб усім гэтым. Мэта ўсіх гэтых мерапрыемстваў зразумела: тыран у вачах сваіх падданых павінен быць не тыранам, а домакіраўніком і царом, не ўзурпатарам, але апекуном; тыран павінен весці сціплы спосаб жыцця, не дазваляць сабе празмернасцей, знатных прываблівацъ на свой бок сваім абыходжаннем, а большасцю кіраваць пры дапамозе дэмагагічных прыёмаў. Непазбеж-

ным вынікам гэтага з'яўляецца не толькі тое, што праўленне тырана будзе больш прыгожым і зайздросным, што ён будзе ўладарнічаць над лепшымі, а не прыгнечанымі, што ён не будзе ніколі ўзбуджаць нянавісці і ўсяляць страх, але і тое, што ўлада тырана стане больш даўгавечнай і, нарэшце, што сам тыран у сваім маральным абліччы паўстане ці чалавекам абсалютна схільным да дабрачыннасці ці на паўдарозе да яе, чалавекам не нягодным, а нягодным напалову».

§ 29. Войны грэкаў з персамі

1. Паход персаў на Грэцыю. У VI ст. да н. э. персы захапілі грэчаскія гарады Малой Азіі. Спачатку яны падтрымлівалі гандаль, не абкладалі грэкаў вялікімі падаткамі. Персідскі цар **Дарый I** пачаў правіць жорстка.

Грэчаскія гарады паднялі паўстанне супраць персідскіх тыранаў. Першымі паўсталі жыхары горада Мілета. Візантый, Кіпр, востраў Хіос і іншыя полісы падтрымалі паўстаўшых. Афіны і Эрэтрыя адправілі 25 караблёў на дапамогу. Але сілы былі няроўныя. Паўстанне было падаўлена. Дарый I зразумеў, што без падпарадкавання Балканскай Грэцыі яму цяжка будзе захаваць панаванне над грэкамі Малой Азіі і наогул у басейне Эгейскага мора.

У 492 г. персідскі военачальнік Мардоній павёў 30 тысяч воінаў і 600 караблёў на Балканы. Ён захапіў шэраг гарадоў, востраў Фасос, поўдзень Фракіі. Македонскі цар Аляксандр прызнаў сваю незалежнасць ад Персіі. Аднак у час марской буры каля мыса Афон затанула 300 персідскіх ка-

раблёў. Мардоній не змог прыйсці на поўдзень Балкан.

У 491 г. персы адправілі сваіх паслоў у гарады-дзяржавы грэкаў з патрабаваннем «зямлі і вады», гэта значыць поўнай пакорлівасці. Востраў Эгіна, гарады Фесаліі і Беотыі пакарыліся. Магутны Аргас заявіў аб неўмяшанні ў вайну. Афіны ж скінулі паслоў са скалы, а спартанцы — у калодзеж, параіўшы там знайсці «зямлю і ваду». Потым Спарта адправіла сваіх добраахвотнікаў у Персію, каб Персія змагла адпомсціць за сваіх паслоў.

Персія была адзінай дзяржавай, а Грэцыя раздробленай на мноства незалежных полісаў.

2. Марафонская бітва. У 490 г. да н. э. новая магутная армія персаў захапіла востраў Эўбею. Жыхары Эрэтрыі сталі рабамі. Потым персы высадзіліся каля мястэчка **Марафон**, у 42 км на поўнач ад Афін. Сюды прывёў персаў афінскі тыран **Гіпій**. Афінскі стратэг **Мільтыяд**, бацьку якога забілі Гіпарх і Гіпій, распрацаваў план ваенных дзеянняў грэкаў. На дапамогу афінянам прыйшлі іх саюзнікі платэйцы. А спартанцы спазніліся з дапамогай. Грэкаў было намнога менш, чым персаў. Цэнтр баявой лініі грэкаў быў слабейшы. Персы яго прарвалі. Але правае крыло афінян і левае платэйцаў перамаглі персаў і злучыліся ў тыле персаў. Гэта забяспечыла перамогу. Грэкі забілі 6400 персаў, а самі страцілі 192 чалавекі.

Існуе паданне, што воін прыбег у Афіны, каб паведаміць аб перамозе. Больш верагодна другое.

Уся армія бегла ў Афіны, каб абараніць родны горад аб ворагаў, бо персы плылі пасля Марафона к Афінам. Афіняне апярэдзілі іх. Прыхільнікі Гіпія ў Афінах, аб якіх паведамляе Герадот, пабаяліся адкрыта, як Гіпій, перайсці на бок персаў. У алімпійскіх гульнях быў устаноўлены бег на дыстанцыю ў 42 км 195 м.

3. Фермапільская бітва. Персы і грэкі пачалі рыхтавацца да новай вайны.

У Афінах грамадзяне раздзяліліся на два лагеры. Фемістокл, які належаў да другога разраду коннікаў, як піша гісторык Фукідзід, лепей за ўсіх мог прадказаць падзеі самай далёкай будучыні. Ён прапанаваў пабудаваць флот, грабцамі зрабіць афінскіх фетаў. Арыстыд, прыхільнік землеўладальнікаў, сцвярджаў, што трэба клапаціцца аб гаплітах, бо яны перамаглі пры Марафоне. Арыстыда выгналі астракізмам. Багатых абавязалі за свой кошт пабудаваць караблі. У 487 г. архантаў сталі выбіраць не толькі з пяцісотмернікаў, але і з коннікаў. Каб дабіцца гэтай рэформы, з часу Салона прайшло 107 гадоў. Так паступова ўмацоўвалася дэмакратыя.

А калі пагроза новага нашэсця персаў стала відавочнай, Арыстыда вярнулі з выгнання. 31 грэчаскі поліс аб'ядналіся ў антыперсідскі саюз на чале са Спартай. Паседжанні саюзнікаў праходзілі ў Карынфе. Стварылі агульную армію і флот.

У **480 г. да н. э.** вялікая армія Ксеркса падышла да горнага прахода **Фермапілы.** 7000 грэкаў закрылі праход. Сярод іх быў спартанскі цар Леанід і з ім 300 гаплітаў. А персідскі флот не дапускалі пра-

рвацца цераз Еўбейскі праліў. Спартанцы пад выглядам адступлення заманьвалі персаў у цясніну і перамагалі ў рукапашных схватках. Аднак персы знайшлі здрадніка, які па горнай сцежцы вывеў атрад персаў у тыл абаронцам Фермапіл. Разведчыкі сказалі Леаніду аб акружэнні. Спартанскі цар застаўся са сваімі воінамі, з фіванцамі і феспійцамі абараняць Фермапілы, а астатнім воінам загадаў адступіць. Загінулі ўсе, і цар Леанід, але адступіўшыя змаглі прадоўжыць барацьбу. Удзячныя грэкі паставілі ў Фермапілах помнік. Сіманід напісаў:

Вандроўнік, скажы ты спартанцам пра наша сканнанне,
Тут мы касцьмі паляглі, запавету краіны адданыя.

Фіванцаў і феспійцаў не памянулі!

4. Саламінская бітва. Персы прайшлі па сушы і занялі пакінутыя жыхарамі Афіны. Афінскі флот стаў у **Саламінскім праліве.** Агульнагрэчаскі савет прадпісаў афінянам адысці ад Саламіна і абараняць вузкі Істмійскі перашыек, каб не пусціць персаў у Пелапанес. Фемістокл патрабаваў склікаць яшчэ адзін савет. Ён прыгразіў саюзным грэкам вывезці афінян на Захад. Толькі тады саюзнікі згадзіліся даць бой каля вострава Саламін. Арыстыд стаў дарадчыкам Фемістокла. Афінскі паэт Эсхіл апісаў Саламінскую бітву. Цяпер і караблі Эгіны змагаліся супраць персаў. Грэкі дачакаліся ўваходу цяжкіх персідскіх караблёў у вузкі праліў і пачалі тараніць іх сваімі больш лёгкімі і манеўруючымі караблямі. Больш за 200 з іх загінула.

У 479 г. грэкі перамаглі персаў у бітве пры Платэях і ў марской бітве пры Мікале. Спартанскі палкаводзец Паўсаній пачаў насаджаць спартанскую гегемонію ў антыперсідскім саюзе грэкаў. Афіны выкарысталі незадаволенасць саюзнікаў і прапанавалі ў 478 г. да н. э. стварыць марскі саюз для барацьбы з персамі пад сваім кіраўніцтвам. Каля 400 полісаў басейна Эгейскага мора ўвайшлі ў гэты саюз.

Спарта патрабавала, каб Афіны не будавалі абарончыя сцены. Фемістокл настаяў на іх узвядзенні. Стратэгам Афін быў выбраны Кімон, прадстаўнік буйных землеўладальнікаў. Ён паспяхова змагаўся з персідскім флотам і дабіваўся саюза са Спартай. Фемістокл лічыў, што Персія больш не будзе нападаць на Балканскую Грэцыю і з ёй трэба заключаць мір. Кімон і савет афінскіх старэйшын (Арэапаг) абвінавацілі Фемістокла ў зносінах з персамі і падверглі астракізму.

5. Становішча ў Спарце і Афінах. Між тым у Спарце ў 465 г. да н. э. ілоты падняліся на вайну супраць сваіх прыгнятальнікаў. Як піша афінскі камедыйны паэт Арыстафан, спартанскія паслы ад страху бледныя, як смерць, прасілі дапамогі ў афінян. Кімон, нягледзячы на пратэсты дэмакратаў, павёў 4000 афінскіх гаплітаў у Спарту супраць ілотаў. Але спартанцы абвінавацілі афінян у зносінах з ілотамі і запатрабавалі вывесці афінскі атрад. Дэмакраты ў 462 г. да н. э. дабіліся выгнання Кімона астракізмам за недальнабачную дапамогу Спарце.

У час грэка-персідскіх войн унутранае становішча ў Афінах было складаным. Савет старэйшын *(Арэапаг)* падтрымліваў алі-

гархаў. Правадыр дэмакратаў **Эфіяльт** правёў рэформу, па якой адабраў ад Арэапага важнейшыя справы, заставіўшы разбіраць справы аб кроўнай помсце, падпалах, забойствах. Роля савета 500 і суда ўзрасла. У 461 г. Эфіяльта тайна забілі. Яго замяніў Перыкл, які раней падтрымліваў Эфіяльта.

6. Малая пелапанеская вайна. Мір паміж персамі і грэкамі яшчэ не быў заключаны, а вайна пачалася паміж самімі грэчаскімі полісамі. Ваявалі Спарта і яе саюзнікі, з аднаго боку, Афіны і іх саюзнікі, з другога. Афіны, дзякуючы магутнаму флоту, перашкаджалі гандляваць другім грэчаскім полісам. Вайна вялася з 457 па 446 гг. да н. э. У час гэтай Малой пелапанескай вайны Афіны перанеслі агульнасаюзную казну з вострава Дэлас у Афіны і пачалі траціць яе не толькі на вайну супраць персаў, а і на свае патрэбы.

7. Значэнне перамогі грэкаў. Афіны паслалі вялікі атрад караблёў на дапамогу Егіпту, які хацеў вызваліцца ад персідскага ўладарніцтва. Аднак афіняне былі разгромлены. Кімон вярнуўся з выгнання ў 454 г. да н. э. і нанёс паражэнне персідскаму флоту пры востраве Кіпр. У **449 г. да н. э.** сілы Персіі і Афін падарваліся, і яны заключылі мір. Персія адмовілася ад сваіх уладанняў у Малой Азіі, але захавала вялікі востраў Кіпр. Персідскі флот страціў права заходзіць у Эгейскае мора. Невялікія грэчаскія полісы перамаглі міравую персідскую дзяржаву таму, што змагаліся за сваё жыццё, каб не стаць рабамі персаў. Гэта ўсведамлялі, па сведчанню паэта **Эсхіла**, гісторыкаў **Герадота** і **Плутарха**, самі грэкі.

Усё, што адбывалася ў грэчаскіх полісах у час грэка-персідскіх войнаў і ў наступным паўстагоддзі, знаходзілася пад іх уплывам.

Слоўнік.

Гегемо́нія — грэч. панаванне, першынство.

? **1.** Якія полісы Грэцыі выканалі патрабаванне персаў даць «зямлі і вады»? **2.** Хто з грэкаў перамог персаў пры Марафоне, а які поліс спазніўся на дапамогу? **3.** Як спартанскі цар Леанід захаваў грэчаскую армію пры Фермапілах? **4.** У чым абвінавацілі Фемістокла? **5.** Што страціла Персія па міру 449 г. да н. э.?

Марафонская бітва. *(Апісанне Герадота)*

«Калі персы ўбачылі, што афіняне нападаюць на іх бягом, яны падрыхтаваліся к таму, каб даць ім адпор. Персам здавалася, што на афінян напала якоесьці пагібельнае шаленства, яны ж асмеліліся кінуцца бягом на праціўніка, нягледзячы на тое, што іх было вельмі мала і яны не мелі ні конніцы, ні лучнікаў. Так думалі варвары. Тым часам афіняне ўсім войскам уступілі ў рукапашны бой і змагаліся з варварамі доблесна. Наколькі нам вядома, афіняне былі першымі з элінаў, якія атакавалі праціўніка бягом, афіняне былі таксама першымі, якія не задрыжалі ад выгляду мідыйскага адзення і ад выгляду воінаў, адзетых па-мідыйску. Да таго часу ўжо адно імя мідыйцаў наганяла жах на элінаў. Бітва пад Марафонам працягвалася доўга. У цэнтры баявога строю, дзе з боку варвараў стаялі персы і сакі, перамагло войска цара. Атрымаўшы перамогу, персы прарвалі строй афінян і пагналі іх у глыбіню мацерыка. Але на абодвух флангах перамога была на баку афінян

і платэйцаў. Перамогшы праціўніка, яны сталі праследаваць бягучых варвараў, а самкнуўшы абодва флангі, уступілі ў бой з тымі варварамі, якія прарвалі цэнтр, і ў гэтай сутычцы афіняне перамаглі. Прымушаных уцякаць персаў афіняне праследавалі і забівалі, пакуль не дасягнулі мора. Тут яны патрабавалі агню і кінуліся на караблі...»

Фермапільская бітва. *(Апісанне Герадота)*

«Лакедэманяне праявілі ў бітве надзвычайную доблесць, яны паказалі, што з'яўляюцца ўмелымі воінамі і змагаюцца з няўмелым ворагам. Зусім нечакана для ворага лакедэманяне раптам паварочвалі спіны і, здавалася, усім войскам кідаліся на ўцёкі. Заўважыўшы гэта, варвары з крыкам і шумам пачыналі іх праследаваць. Але як толькі яны даганялі лакедэманян, тыя паварочваліся тварам да ворага і знішчалі вялікае мноства варвараў. У спартанцаў таксама былі ахвяры, але невялікія. Паколькі персы ніяк не маглі прабіцца, нягледзячы на атакі, якія яны прадпрымалі асобнымі атрадамі, і на ўсялякія іншыя спробы, яны вымушаны былі адступіць.

Расказваюць, што ў час гэтых атак цар, які назіраў за ходам бітвы, тры разы ўскокваў з крэсла, ахоплены жахам за сваё войска. Так змагаліся яны ў той дзень, і на наступны дзень варвары не дасягнулі вялікага поспеху».

Пастанова афінскага Народнага сходу перад Саламінскай бітвай

«Багі!

Пастанавілі савет і народ.

Прапанову ўнёс Фемістокл, сын Неокла, з дэма Феарыі. Горад даверыць Афіне, заступніцы Афін, і ўсім іншым багам, каб яны ахоўвалі і абаранялі краіну. Самі ж афіняне і ксены, якія жывуць у Афінах, няхай перавязуць дзяцей і жанчын у

Трэзену (пад заступніцтва Пітфея, архагета краіны). А старых і маёмасць няхай перавязуць на Саламін.

Казначэі і жрыцы няхай застаюцца на Акропалі, ахоўваючы маёмасць багоў.

Усе астатнія афіняне і ксены, дасягнуўшыя паўналецця, няхай узыдуць на падрыхтаваныя караблі і змагаюцца супраць варвараў за свабоду сваю і іншых элінаў разам з лакедэманянамі, карынфянамі, эгінетамі і іншымі элінамі, якія пажадаюць раздзяліць агульную небяспеку».

§ 30. Развіццё рабаўладальніцкай дэмакратыі ў Афінах і Перыкл

1. Роля дэмаса ў Афінах і яго самасвядомасць. Фемістокл прыцягнуў да службы на флоце фетаў, якія па колькасці пераўзыходзілі багатыя разрады грамадзян. Флот адыграў рашаючую ролю ў перамозе над персамі. Плутарх захаваў для патомкаў выказванне афінян перад Платэйскай бітвай: «А ў нас ранейшая зброя і ранейшая сіла ў руках, і толькі адвагі прыбавілася, дзякуючы перамогам; і змагаемся мы не проста за зямлю і за свой горад, як тады, а за трафеі пры Марафоне і на Саламіне, каб усе паверылі, што яны пастаўлены не Мільтыядам і не Лёсам, а афінянамі».

2. Рэформы Перыкла і вызначэнне дэмакратыі. Перыкл прадоўжыў палітыку Фемістокла. Ён перамог знатнага Кімона. Кімон бясплатна аддаваў бедным плады садоў, ежу і адзенне. А Перыкл прапанаваў праграму ўдзелу ўсіх грамадзян у кіраўніцтве полісам. У 457 г. да н. э. зеўгітам прадаставілі права быць выбранымі на пасаду

арханта. Каб дабіцца гэтага, з часоў Салона спатрэбілася 137 гадоў. Арханты, члены савета 500, 6000 суддзяў, воіны і матросы атрымлівалі жалаванне з казны. Сыны загінуўшых на вайне да 18 гадоў выхоўваліся за кошт дзяржавы, а потым ім выдавалі бясплатна зброю. Багатыя ж за свае грошы будавалі караблі, праводзілі спаборніцтвы гімнастаў і ўдзельнікаў харавых спеваў. Такія кіраўнікі, як Кімон, Перыкл і іншыя праходзілі ўсебаковае навучанне за свой кошт, каб кіраваць дзяржавай, войскам, вайсковым атрадам, караблём, пабудаваным за свой кошт. Гэта была іх праца на карысць поліса, *грамадская павіннасць*. Той, хто хацеў жыць у раскошы, нічога не робячы, траціў сваё багацце і выбываў з кола грамадзян, кіруючых дзяржавай. Земляробы і рамеснікі, гандляры таксама працавалі і служылі ў апалчэнні. Так праяўляўся агульны інтарэс афінскіх грамадзян да жыцця ў полісе. Права фета стаць архантам ці стратэгам было запісана, але ажыццявіць фет яго не мог. Калі таленавіты, але бедны Лахет выбіраўся стратэгам, то падаваў у Народны сход спіс усяго неабходнага для выканання сваіх абавязкаў. Арыстафан яго за гэта высмейваў. Усе, хто атрымліваў жалаванне, працавалі на карысць поліса, а не жабравалі.

Афінская дэмакратыя забяспечвала правы грамадзян, бо галоўныя пытанні вырашаў Народны сход. 14 разоў падрад кожны год Перыкла перавыбіралі першым стратэгам. ***У 451 г. да н. э.*** *Перыкл правёў закон, па якому грамадзянінам лічыўся толькі той, у каго бацька і маці былі афі-*

нянамі. У 445 г. 5000 чалавек былі асуджаны на продаж у рабства за незаконнае прысваенне грамадзянскіх правоў. А 14 000 грамадзян сталі прэтэндэнтамі на атрыманне бясплатнага хлеба ў гэтым годзе. У 431 г. у Атыцы жыло 40—47 тысяч грамадзян мужчын, а ўлічваючы жанчын і дзяцей, — 120—140 тысяч душ. Калі памерлі ад хваробы два дарослыя сыны Перыкла ад першай жонкі, то яго сын Перыкл, якога нарадзіла другая жонка Аспазія, не лічыўся грамадзянінам, бо Аспазія была метэчкай, хаця і багатай, таленавітай. Перыкл звярнуўся да Народнага сходу, які дараваў яго сыну грамадзянскія правы.

Гісторык **Фукідзід**, сучаснік Перыкла, даў навуковае вызначэнне дэмакратыі свайго часу: *«Называецца гэты лад дэмакратычным, таму што ён трымаецца не на меншасці, а на большасці грамадзян».* Гэта значыць, што перавага аддаецца поглядам, інтарэсам, патрабаванням большасці грамадзян. Той, хто хацеў правесці закон супраць дэмакратыі і суддзі гэта маглі даказаць, пазбаўляўся грамадзянскіх правоў. *Паняцце «дэмакратыі» («улады народа») узнікае ў сярэдзіне V стагоддзя, да н. э.,* хаця пачатак ёй палажыў яшчэ Салон. З тых часоў грэкі і людзі ўсяго свету ў наш час ужываюць гэта слова. Змест дэмакратыі залежыць ад будовы дзяржаў, ад канкрэтных дзеянняў іх кіраўнікоў і грамадзян.

3. Прывілеі грамадзян і супольная праца ўсіх жыхароў. Аспазія нарадзілася ў Мілеце. Кожны, хто назаўсёды пасяляўся ў Афінах, лічыўся метэкам. Метэкі былі свабоднымі людзьмі, але грамадзянскіх правоў

не мелі. Валодаць зямлёй, домам, памяшканнем майстэрні яны не мелі права. Наогул спартанец, карынфянін або грамадзянін іншага поліса не мог купіць зямлю ў Афінах, а афінянін — у іншым полісе. *Валодаць зямлёй, домам — выключнае права грамадзян.* Афінянін можа прадаць зямлю толькі другому афіняніну. Паверхня зямлі належыць грамадзяніну, а яе нетры — полісу. Гэта дало падставу назваць такую прыватную ўласнасць на зямлю і іншую нерухомую маёмасць сумеснай прыватнай уласнасцю актыўных грамадзян. *Грамадзяне вымушаны ствараць такое аб'яднанне, поліс, каб трымаць у паслушанні рабоў, метэкаў, незадаволеных беднякоў.* Метэкі маглі валодаць рабамі, караблямі, займацца гандлем і рамяством. Таму яны пасяляліся ў Афінах, якія былі цэнтрам рамяства, гандлю, навукі і мастацтва. Метэкі адмаўляліся ад перавагі грамадзянства ў сваім полісе. Яны разам з грамадзянамі-афінянамі служылі ў апалчэнні, але не ўдзельнічалі ў Народным сходзе, не выбіраліся ні на якія дзяржаўныя пасады. Улады Афін заўсёды стараліся, каб прыязджалі метэкі, бо яны ўсе сілы аддавалі рамесніцкай і гандлёвай дзейнасці, узбагачаючы Афіны. Сам Перыкл запрасіў Кефала, бацьку вядомага прамоўцы Лісія, прыехаць з Сіракуз. Кефал пакінуў сынам майстэрню шчытоў, у якой працавала 120 рабоў. Захаваўся надпіс на стэле, які пералічвае 94 рамеснікі, якія будавалі храм. З іх — 45 метэкаў, 9 — чужаземцаў, 20 — рабоў, 20 — грамадзян. Іх сумесная праца стварала багацце Афін.

Слоўнік.

Казна́ — грашовыя і іншыя сродкі дзяржавы.
Палі́тыка — мастацтва кіраўніцтва дзяржавай.

? **1.** Як самі афінскія грамадзяне ўсведамлялі сваю ролю ў перамозе над персамі? **2.** За што дапамагаў бедным афінянам Кімон? **3.** За што плаціла дзяржава афінскім грамадзянам пры Перыкле? **4.** Чаму 5000 чалавек не атрымалі хлеба ў 445 г.? **5.** Як трэба ацаніць афінскую рабаўладальніцкую дэмакратыю, калі нават Перыкл не мог парушыць закон аб грамадзянстве? **6.** Якой маёмасцю метэкі не мелі права валодаць?

Афіны і Халкіда. *(Надпіс 446 г. да н. э.)*

«Савет і народ рашылі...

Па наступных пунктах няхай дадуць прысягу савет і суддзі афінян: я не выганю халкідзян з Халкіды і не зруйную іх горад і сумленнага чалавека без суда і пастановы народа афінскага, не пазбаўлю грамадзянскіх правоў, не пакараю выгнаннем, не арыштую, не заб'ю, не адбяру ні ў кога грошы, не пастаўлю на абмеркаванне прыгавор ні супраць абшчыны, ні супраць якой-небудзь прыватнай асобы без папярэджання...

Па наступных пунктах няхай дадуць прысягу халкідзяне: я не здраджу народу афінскаму ні хітрасцямі, ні падкопамі, ні словам, ні справай і не паслухаюся таго, хто задумае здрадзіць. А калі хто-небудзь здрадзіць, я паведамлю афінянам. І падатак я буду ўносіць афінянам такі, які выклапатаю ў афінян. І саюзнікам я буду наколькі змагу, лепшым і добрасумленным. І народу афінскаму буду дапамагаць і садзейнічаць, калі хто-небудзь будзе крыўдзіць народ афінскі, і буду падпарадкоўвацца народу афінскаму. Няхай дадуць прысягу з халкідзян усе паўналетнія. А калі хто не дасць

прысягі, той ды будзе пазбаўлены грамадзянскага гонару і няхай маёмасць яго будзе канфіскавана і дзесяціна яго маёмасці зробіцца свяшчэннай уласнасцю Зеўса Алімпійскага. Няхай пасольства афінян, калі яно прыйдзе ў Халкіду, разам з упаўнаважанымі для прыняцця прысягі ў Халкідзе прывядзе да прысягі і запіша халкідзян, даўшых прысягу».

Фукідзід аб дэмакратыі Афін

«Наш дзяржаўны лад не пераймае чужыя ўстановы; мы самі хутчэй служым узорам для некаторых, чым пераймаем другіх. Называецца гэты лад дэмакратычным, таму што ён трымаецца не на меншасці, а на большасці іх, грамадзян. У адносінах да прыватных інтарэсаў законы нашы прадастаўляюць раўнапраўе для ўсіх; што датычыцца палітычнага значэння, то ў нас у дзяржаўным жыцці кожны карыстаецца ім пераважны перад іншымі не ў выніку таго, што яго падтрымлівае тая ці іншая палітычная партыя, а ў залежнасці ад яго доблесці, якая здабывае яму добрую славу ў той ці іншай справе; роўным чынам скромнасць звання не служыць бедняку перашкодай да дзейнасці, калі толькі ён можа зрабіць якую-небудзь паслугу дзяржаве. Мы жывём свабодным палітычным жыццём у дзяржаве і не пакутуем ад падазронасці ва ўзаемных адносінах у паўсядзённым жыцці; мы не раздражняемся, калі хто робіць што-небудзь для свайго задавальнення, і не паказваем пры гэтым прыкрасці, хаця і бясшкоднай, але ўсё ж засмучаючай другога. Свабодная ад усялякага прымусу ў прыватным жыцці, мы ў грамадскіх адносінах не парушаем законаў больш за ўсё ад страху перад імі і падпарадкоўваемся асобам, надзеленым уладай у цяперашні час, асабліва прыслухоўваемся да ўсіх тых зако-

наў, якія існуюць на карысць тых, каго крыўдзяць...»

Алігархічны аўтар аб афінскай дэмакратыі

«Такім чынам, перш за ўсё я скажу, што ў Афінах справядліва бедным і простаму народу карыстацца перавагай перад высакароднымі і багатымі па той прычыне, што народ жа якраз і прыводзіць у рух караблі і дае сілу дзяржаве... вось гэтыя людзі і надаюць сілу дзяржаве ў значна большай ступені, чым гапліты, і знатныя, і высакародныя. І раз на самай справе так, то лічыцца справядлівым, каб усе мелі доступ да дзяржаўных пасад як пры сучасных выбарах па жэрабю, так і пры выбранні падняццем рук і каб давалася магчымасць выказвацца ўсялякаму жадаючаму з грамадзян. Затым такіх пасад, якія прыносяць ратаванне, калі заняты высакароднымі людзьмі, і падвяргаюць небяспецы ўвесь народ наогул, калі заняты невысакароднымі,— гэтых пасад народ наогул не дамагаецца, ён не знаходзіць патрэбным атрымліваць па жэрабю пасады ні стратэгаў, ні гіпархаў (начальнікаў конніцы). І сапраўды, народ разумее, што атрымлівае больш карысці, калі гэтыя пасады не выконвае сам, а дае іх выконваць найбольш магутным людзям. Затое ён імкнецца займаць тыя пасады, якія прыносяць у дом жалаванне і прыбытак».

Раздзел III. Заняпад грэчаскіх полісаў і падпарадкаванне іх Македоніі

§ 31. Пелапанеская вайна

1. Прыгнечанне саюзнікаў Афінамі. Пасля перамог грэкаў Персія не нападала на Бал-

канскую Грэцыю. Але Афіны па-ранейшаму вымагалі ад саюзнікаў узносы, якія траціли на свае патрэбы. Суд паміж жыхарамі саюзных полісаў вяршылі афінскія суддзі. Для гэтага тых, хто судзіцца, абавязвалі прыязджаць у далёкія Афіны. Калі саюзны Самас пачаў вайну супраць другога члена саюза Мілета, дэмакрат Перыкл разбурыў сцены Самаса, аблажыў яго жыхароў вялікай *кантрыбуцыяй*. Жыхары астравоў Фасаса і таго ж Самаса захацелі выйсці з падпарадкавання Афінам. Алігарх Кімон падавіў выступленне і гэтых саюзнікаў.

Афінскі флот непадзельна панаваў у Эгейскім моры. Афіняне заставілі калонію Карынфа Пацідэю ўвайсці ў свой саюз. Афіны забаранілі Мегарам, члену Пелапанескага саюза, якім кіравала Спарта, гандляваць на рынках афінскіх саюзнікаў. У 437 г. да н. э. Перыкл паказаў сілу ўсім саюзнікам, праплыўшы на 60 караблях у Чорнае мора. Спарта хацела ўстанавіць сваю гегемонію ў Грэцыі. У 431 г. да н. э. Пелапанескі саюз аб'явіў Афінам вайну. Спартанцы ўсім гаварылі, што яны хочуць вызваліць афінскіх саюзнікаў ад афінскага прыгнечання.

Вайна працягвалася 27 гадоў. Спарта мела мацнейшую пяхоту. Пелапанескія саюзнікі асаджалі Афіны, спальваючы пасевы і аліўкавыя гаі. Афіны разам з Керкірай панавалі на моры. Перыкл разараў прыбярэжныя гарады Пелапанеса. У пачатку вайны насельніцтва Атыкі, вымушанае ратавацца за афінскімі сценамі ад скучанасці і бруду, захварэла чу-

мой ці тыфам. Памёр кожны чацвёрты воін.

2. Суд над сябрамі Перыкла. Ворагі Перыкла прыцягнулі да суда яго сяброў. Скульптара **Фідзія** — за тое, што ён быццам бы ўкраў частку золата, з якога было зроблена адзенне статуі багіні Афіны. Ворагі не ведалі, што адзенне можна зняць са статуі і ўзважыць. Філосафа **Анаксагора** абвінавацілі ў тым, што ён не паважаў алімпійскую рэлігію. Анаксагор лічыў, што Сонца не такое малое, як здаецца. Яно — расплаўлены камень, велічынёй з паўвостраў Пелапанес. На жонку Перыкла **Аспазію** ўзвялі паклёп, што яна сама прыводзіць у яго спальню рабынь. Аспазія не лічылася законнай жонкай Перыкла, бо была *метэчкай*. Нарэшце, самога Перыкла аб'явілі зачыншчыкам вайны, якая прывяла Афіны да бедстваў. Перыкла аштрафавалі на 50 талантаў (1 талант роўны 26,2 кг серабра). Праз некалькі месяцаў яго зноў выбралі на пасаду стратэга, але Перыкл хутка памёр.

3. Ход вайны ў 430—415 гадах да н. э. Алігархі саюзнага Афінам горада Міцілены пры садзейнічанні Спарты адпалі ад Афін. Дэмакраты Міцілены, атрымаўшы зброю, патрабавалі ад багатых алігархаў хлеба. Афіны выкарысталі раздор сярод міціленцаў, увялі свой гарнізон і пакаралі смерцю 1000 міціленскіх мужчын. Большасць саюзнікаў Афін выходзіла з саюзу.

У 425 г. да н. э. афіняне пад кіраўніцтвам стратэгаў **Дэмасфена** і **Клеона** захапілі Пілас на ўзбярэжжы Месеніі, населе-

най ілотамі. Ілоты сталі перабягаць у Пілас. Потым афіняне ўзялі ў палон 292 пелапанескіх гаплітаў. Спарта папрасіла міру. Афіны пад уплывам Клеона не прынялі прапановы. Афінскі паэт **Арыстафан** высмеяў Клеона ў тэатры на пастаноўцы камедыі «Коннікі». Клеон пасля перамогі карыстаўся аўтарытэтам, меў уладу. Артысты баяліся выконваць ролю Клеона. Арыстафан сам яе выканаў. Такіх непрымірымых дэмакратаў, як Клеон, Арыстафан назваў самымі брыдкімі. Клеон — гарбар, што замяніў такога ж паскудніка, які гандляваў пянькой. Такія не дбаюць аб Афінах. Клеон гандлюе скуранымі шчытамі, багацее, а дэмасу не падараваў нават і аднаго падноска. Трэба выразаць кавалак скуры са спіны Клеона і зрабіць абутак народу, параіў Арыстафан. У такой гратэскавай літаратурнай форме Арыстафан выступіў супраць вайны. Вось чаму і лічыцца, што афінскі тэатр — выхавацель грамадзян.

Пасля гібелі Клеона ў баі за горад Амфіпаль стратэг **Нікій** заключыў у 421 г. да н. э. мір. Гісторык Фукідзід назваў гэты мір гнілым. Вайна працягвалася. У 415 г. Афіны адправілі вялікую марскую эскадру пад кіраўніцтвам **Алківіяда** для заваявання вострава Сіцылія, населенага грэкамі. Туды быў вымушаны адправіцца і Нікій. Але афінскія алігархі абвінавацілі адплыўшага Алківіяда ў тым, што ён паздзекаваўся над бюстамі бога гандлю Гермеса. За Алківіядам паслалі быстраходную трыеру «Саламінію». Алківіяд, даведаўшыся, што яго завочна прыга-

варылі да смерці, сказаў: «Я дакажу, што жывы». І ўцёк у Спарту. У Сіцыліі афінян перабілі, узятых у палон направілі рабамі ў каменяломні, Нікія пакаралі смерцю.

Па парадзе Алківіяда спартанцы захапілі Дэкелею, якая знаходзілася на поўнач ад Афін. Туды перабегла 20 тысяч афінскіх рабоў. Афінскае рамяство прыйшло ў заняпад. Такую ролю адыгрывала праца рабоў.

4. Першы алігархічны пераварот. Афінскія *алігархі* паднялі галаву. Яны стварылі камісію *«дзесяці»* (так яе назвалі) замест савета 500. Для скасавання дэмакратычнага ладу алігархі адмянілі жалаванне членам савета, воінам, суддзям, выдачу дапамогі бедным. Колькасць афінскіх грамадзян скарацілі да 5000. Астатнія разарыліся ў час вайны, не маглі за свой кошт набыць зброю. Алігархі не дабіліся, як абяцалі, міру ад Спарты. Дэмакратычнае войска афінян, якое знаходзілася на в. Самасе, скінула алігархаў. Алківіяд здрадзіў Спарце. Ён дабіўся дапамогі Афінам з боку Персіі. Персія ж дапамагала слабейшаму: то Спарце, то Афінам, каб яны абяссільвалі адзін аднаго.

Афіны прызвалі на флот усіх здольных насіць зброю. Залатыя і сярэбраныя прадметы храмаў былі ператвораны ў грошы. У 406 годзе да н. э. афіняне нанеслі паражэнне пелапанескаму флоту пры Аргінускіх астравах. Але марская бура перашкодзіла падабраць паўшых афінскіх матросаў. Народны сход асудзіў на смерць 8 афінскіх стратэгаў-пераможцаў, у тым

ліку Перыкла, сына Перыкла і Аспазіі. У 405 г. да н. э. спартанскі палкаводзец Лісандр разграміў афінскі флот пры Эгаспатамах («Казіных рэчках»), што ўпадае ў праліў Гелеспонт.

5. Другі алігархічны пераварот і паражэнне Афін. Алігархі Афін пад кіраўніцтвам **Крыцыя** ўстанавілі праўленне *«Трыццаці»* тыранаў. Такую назву праўленне атрымала па колькасці тыранаў. Тыраны пастанавілі, што кожны з «Трыццаці» можа забіць багатага грамадзяніна, метэка, а маёмасць яго прысвоіць. Ферамен, іх таварыш, запратэставаў супраць такога тэрора — і Ферамена пакаралі смерцю. Тыраны сабіралі грошы на ўтрыманне ўвайшоўшага ў Афіны спартанскага гарнізона. Жыхары галадалі. У 404 г. да н. э. сцены Афін былі зрыты. Саюзнік Спарты Карынф патрабаваў знішчыць Афіны як поліс. Спарта пабаялася ўзмацнення Карынфа і не згадзілася. Афінскі саюз распусцілі, флот выдалі Спарце. «Вызваленне» былых афінскіх саюзнікаў закончылася тым, што цяпер яны павінны былі ўносіць дань Спарце, а не Афінам. Дэмакраты Афін уцякалі ў дэмакратычныя Фівы. У хуткім часе яны пасля адыходу з Афін спартанскага гарнізона выгналі алігархаў і аднавілі дэмакратычны лад у Афінах.

Спарта і яе пелапанескія саюзнікі перамаглі, а Грэцыя ў цэлым прайграла. У 495—487 гг. пачалася Карынфская вайна. Карынф і Афіны — былыя ворагі — разам ваявалі супраць Спарты. Войны паміж грэкамі прывялі да таго, што мір быў заключаны на ўмовах, якія прадыктаваў

персідскі цар. Пасля Пелапанескай вайны яе ўдзельнікі ніколі не змаглі дасягнуць былой магутнасці.

Слоўнік.

Кантрыбу́цыя — лац. *«падатак»* на пераможаную дзяржаву.

Тэро́р — лац. *«страх»*, насілле, фізічнае знішчэнне людзей.

? **1.** Чаму афінскія саюзнікі былі незадаволены Афінамі? **2.** За што судзілі Перыкла? **3.** Чаму Арыстафан сам выканаў ролю Клеона ў тэатры? **4.** Для чаго афіняне адправіліся ў Сіцылію? **5.** Як вы дакажаце, што алігархі адмянілі дэмакратычны лад у Афінах? **6.** Чаму Персія дапамагала то Спарце, то Афінам?

Фукідзід аб грамадзянскай вайне на Керкіры.

У 425 г. да н. э. на востраве Керкіра, які быў саюзнікам Афін, пачалася грамадзянская вайна. Пацярпеўшыя паражэнне алігархі Керкіры ўмацаваліся на гары Істоне. Афіняне дапамаглі керкірскім дэмакратам. Яны захапілі Істону. Яе абаронцы, іх сем'і ўцяклі на другое ўзвышша. Афінскія стратэгі патрабавалі здачы ў палон на ўмовах, што палонных вывезуць у Афіны, і там Народны сход вырашыць іх лёс. Афінскія караблі вывезлі іх спачатку на востраў Пціхію. Афінскія воіны ахоўвалі алігархаў, каб яны не ўцяклі, а таксама ад нападу керкірскіх дэмакратаў. Афіняне выставілі яшчэ адну ўмову. Калі хто-небудзь адзін з палонных захоча ўцячы, адказваць будуць усе. Афіняне перастануць абараняць іх ад керкірскіх дэмакратаў. Афіняне ўвялі кругавую паруку, каб палонныя самі сябе вартавалі. Тады керкірскія дэмакраты пайшлі на хітрасць. Яны падаслалі свайго чалавека пад выглядам

алігарха, які быццам бы можа выратаваць палонных на сваім караблі. Палонныя згадзіліся. Дагавор страціў сілу. Як забівалі керкірскія дэмакраты керкірскіх алігархаў (гэта паняцці гісторыка Фукідзіда), даведаемся са слоў яго самога, якія працытуем: «Атрымаўшы палонных у свае рукі, керкіране (дэмакраты) зачынілі іх у вялікім памяшканні і потым сталі выводзіць іх адтуль па дваццаць чалавек зараз; звязаўшы іх адзін з другім, яны праводзілі іх паміж двума радамі гаплітаў, размешчаных з абодвух бакоў. Гапліты білі і калолі пленнікаў, калі хто пазнаваў у тым, хто праходзіў, свайго ворага. Па баках ішлі людзі з бічамі ў руках і падганялі тых, хто вельмі павольна рухаўся наперад. Каля шасцідзесяці чалавек былі такім чынам выведзены і забіты, аб чым не ведалі тыя, хто застаўся ва ўпамянутым памяшканні. Палонныя думалі, што іх выводзяць для таго, каб перамясціць у якое-небудзь другое месца. Калі ж зняволеныя здагадаліся і ад некага даведаліся аб тым, што адбылося, яны пачалі звяртацца да афінян з просьбаю, калі пажадана, забіць іх; адмаўляліся выходзіць з памяшкання і аб'явілі, што па меры сіл не дапусцяць, каб хто-небудзь увайшоў у яго. Керкіране і самі не мелі на ўвазе ламацца ўнутр сілай, а ўзышлі на дах, разабралі столь, кідалі ўніз чарапіцу і стралялі з лукаў. Заняволеныя засцерагаліся, як маглі, прычым большая частка з іх самі пазбаўлялі сябе жыцця: адны ўсаджвалі сабе ў шыю кінутыя ў іх стрэлы, другія душылі сябе паясамі ад ложкаў, якія там знаходзіліся, ці палоскамі матэрыі, адарванымі ад гімацыяў (плашчоў)... Калі наступіў дзень, керкіране склалі трупы ўдоўж і ўпоперак на калёсы і вывезлі іх за горад; усіх жанчын, якія былі захоплены ва ўмацаванні, яны зрабілі рабынямі». Фукідзід лічыць, што

афінскія стратэгі садзейнічалі збіванню безабаронных.

Арыстоцель аб праўленні трыццаці тыранаў у Афінах у 404 г. да н. э.

«Але калі яны ўмацавалі сваю ўладу ў дзяржаве, яны не сталі літаваць нікога з грамадзян, а забівалі ўсіх, хто толькі вылучаўся па маёмасці ці па паходжанню, ці карыстаўся павагай. Так яны рабілі, стараючыся незаўважана ўстараніць небяспечныя элементы і жадаючы грабіць іх маёмасць. Так, за кароткі час яны загубілі не менш паўтары чысячы чалавек.

Калі, такім чынам, у дзяржаве справы сталі ісці ўсё горш і горш, Ферамен, які абураўся тым, што адбывалася, стаў угаворваць сваіх таварышаў спыніць такі нястрыманы спосаб дзеянняў і прадаставіць удзел у кіраванні лепшым людзям. Яны спачатку запрацівіліся гэтаму, а потым, калі ў народзе распаўсюдзіліся чуткі аб прамовах Ферамена і да яго спачувальна стала адносіцца большасць жыхароў, яны спалохаліся, каб ён не стаў прастатам (заступнікам) народа і не скінуў іх панаванне... Наступіла ўжо зіма, калі Фрасібул (правадыр дэмакратаў) заняў Філу. Трыццаць вывелі супраць іх сваю армію, але вярнуліся, пацярпеўшы няўдачу. Пасля гэтага яны вырашылі наогул усіх грамадзян абяззброіць, а Ферамена загубіць... Пасля пакарання смерцю Ферамена яны адабралі зброю ва ўсіх, акрамя трох тысяч, і наогул ва ўсіх адносінах сталі праяўляць жорсткасць і злачынную схільнасць. Накіраваўшы паслоў у Лакедэмон, яны абінавачвалі Ферамена і прасілі сабе дапамогі. Калі лакедэманяне выслухалі гэтых паслоў, яны паслалі гармостам (правіцелем) Калібія з атрадам прыкладна каля семісот воінаў. Яны прыйшлі і сталі гарнізонам на Акропалі».

§ 32. Рабства. Разарэнне сялян і рамеснікаў

1. Прымяненне працы рабоў. У V—IV стагоддзях да н. э. у грэчаскіх полісах рабы працавалі ў розных галінах гаспадаркі. Вядомы афінскі стратэг Нікій, якога сіцылійцы прыгаварылі да смерці, аддаваў у арэнду 1000 сваіх рабоў, якія дабывалі сярэбраную руду. Руднік быў уласнасцю поліса. Бацька прамоўцы **Дэмасфе́на** валодаў дзвюма майстэрнямі нажоў і баявых мячоў, у якіх працавала 32 і 20 рабоў. Шмат рабоў працавала ў ганчарных майстэрнях, на будаўніцтве, выконваючы цяжкую працу. Але былі і дзяржаўныя рабы. Пасля Саламінскай бітвы афіняне купілі 300 скіфскіх стралкоў, якія служылі паліцэйскімі. Багатыя грамадзяне, якія працавалі на дзяржаўных пасадах, мелі рабоў-памочнікаў, абучаных грамаце. У вучонага Арыстоцеля была жонка-рабыня Герпіліда. Дзяржава не прызнавала такую жонку законнай. Але Герпіліда мела чатыры рабыні і раба Пірэя. Філосаф **Сакра́т** належаў да разраду зеўгітаў, але раба не меў. Зеўгіты мелі аднаго-двух рабоў, як раней Гесіёд. Большасць фетаў рабоў не мела. Бясспрэчна, становішча розных рабоў было неаднолькавае. Іх і называлі грэкі па-рознаму. Асноўнай назвай раба ў V стагоддзі да н. э. было *«ду́лой»* — «несвабодны». Рабоў называлі таксама *«чалавеканогімі»*. Асобную катэгорыю складалі *ваеннапалонныя,* таму што іх маглі выкупіць родзічы. Па прыблізных падліках, у Афінах рабы складалі трэцюю частку насельніцтва. Пераважалі рабы-мужчыны.

Арыстоцель падзяліў прылады працы на неадушаўлёныя (тапары, ткацкія чаўнакі і іншыя) і адушаўлёныя (рабы). Калі б ткацкія чаўнакі самі ткалі, панам не патрэбны былі б рабы»,— пісаў Арыстоцель.

2. Крыніцы рабства. Вайна была асноўнай крыніцай рабства. Арыстоцель так апраўдваў рабства: «Паляваць трэба як на дзікіх жывёл, так і на тых людзей, якія, будучы ад прыроды прызначанымі да падпарадкавання, не жадаюць падпарадкавацца; такая вайна па прыродзе сваёй справядлівая». Арыстоцеля не цікавіць, чаму прызначаныя для рабства людзі не хочуць падпарадкавацца. Ён адмаўляе іх права на свабоду. *Арыстоцель у адрозненне ад Гамера не адводзіць ніякай ролі богу Зеўсу ў лёсе раба. Прычынай рабства ён лічыць прыроду чалавека. Але і Гамер, і Арыстоцель — абодва апраўдваюць рабства.*

На грэчаскія рынкі прывозілі рабоў з Паўночнага Прычарнамор'я, з Фракіі, Малой Азіі. Жыхароў усіх гэтых месц грэкі пагардліва лічылі варварамі. Рабоў прадавалі як жывыя прылады працы, як скаціну. Дэмасфен паведамляе, што адзін кваліфікаваны раб-мужчына каштаваў 200 драхм. Гапліт, цяжкаўзброены пехацінец, за адзін дзень службы атрымліваў 1 драхму. За дзіця плацілі 72 драхмы. Рабы ніколі не каштавалі так танна, каб іх не трэба было шанаваць так, як гаспадар шануе рабочую жывёлу. Каб рабы лепш адносіліся да працы, ім абяцалі водпуск на свабоду за заслугі. Такія

рабы станавіліся *вольнаадпўшчанікамі*. Арыстоцель завяшчаў не прадаваць сваіх хлопчыкаў-рабоў, якія яму служылі, а адпусціць на свабоду. Ён абяцаў свабоду тром рабам сваёй дачкі пасля выхаду яе замуж. Сярод іх быў раб Алімпій з сынам. Значыць, у Алімпія была рабская сям'я. Нараджэнне рабынямі дзяцей таксама было крыніцай рабства. Дзеці рабоў — уласнасць гаспадара. Рабоў, якія наогул не ведалі свабоды, гаспадары цанілі як найбольш пакорлівых.

Крыніцай рабства былі міжгрэчаскія войны і нават унутраныя. З асаблівай жорсткасцю вялася Пелапанеская вайна. Спартанцы ўзялі асадай саюзныя Афінам маленькія Платэі. Яны ўчынілі над палоннымі суд, задаючы кожнаму ваеннапалоннаму адно пытанне: «Ці зрабіў ты якую паслугу Спарце і яе саюзнікам?» Адказ быў вядомы. Ваюючыя на баку Афін не маглі аказаць такую паслугу. Так спартанцы пакаралі смерцю 200 палонных платэйцаў і 25 афінян. Платэйскія жанчыны сталі рабынямі.

Спартанскі палкаводзец Калікратыд узяў прыступам Мефімну на востраве Лесбасе. Ён не дазволіў прадаць мефімнян у рабства. «Ніхто з элінаў не будзе рабаваны»,— сказаў Калікратыд. Афіняне ж былі прададзены ў рабства. Значыць, не прыналежнасць да элінаў вырашала справу. Афіняне — асноўныя ворагі Спарты ў час Пелапанескай вайны. Афіняне пакарылі нейтральны ў вайне востраў Мелас, заселены раней спартанскімі каланістамі. Фукідзід піша: «Афіняне забілі ўсіх захопленых

дарослых меліян, а дзяцей і жанчын пераварылі ў рабоў».

Арыстоцель лічыў, што такое рабства адпавядае законам вайны і не асуджаў яго. Аднак існаваў іншы погляд на рабства. Адзін з герояў згубленай трагедыі паэта **Эўрыпі́да** ў сярэдзіне V стагоддзя да н. э. казаў: «Адно я табе аб'яўляю — не давайся жывым добраахвотна ў рабства, калі ў цябе ёсць магчымасць памерці свабодным».

Спатрэбілася яшчэ паўстагоддзя, пасля часу Арыстоцеля, каб з'явілася вучэнне філосафа **Зяно́на** з вострава Кіпра (ён жыў у 336—264 гадах да н. э.), якое адвяргала думку Арыстоцеля аб прычынах рабства. Зянон сцвярджаў, што чалавек — частка космасу, усяго чалавецтва. А чалавецтва заснавана на ўсеагульнай роўнасці. Няроўнасць людзей — супраціўна прыродзе. *Зянон вучыў, што рабства — з'ява, вынік грамадскага, супольнага жыцця людзей, а не волі бога Зеўса ці прызначэння прыроды.* У розныя часы жылі Гамер, Арыстоцель і Зянон. Па-рознаму яны тлумачылі прычыну рабства. Але яно прадаўжала існаваць.

3. Разарэнне грамадзян. Палепанеская вайна і бясконцыя іншыя войны пасля яе прывялі да гібелі мноства грамадзян. Афіны ў адной толькі Сіцыліі ў 415—413 гадах да н. э. страцілі каля 10 тысяч гаплітаў і 40 тысяч грабцоў. Багатыя грамадзяне мелі многа рабоў. Яны ўмелі так арганізаваць працу рабоў у майстэрнях пад кантролем рабоў-наглядчыкаў, што выраблялі прадукцыі больш, чым майстры, якія

працавалі самі, або якія мелі аднаго ці двух рабоў. Яны маглі прадаваць вырабы танней. Так бедныя майстры разараліся. Рабская праца на карысць багатых людзей рабіла бедных грамадзян яшчэ бяднейшымі. Фетаў станавілася ўсё больш. Самастойная фізічная праца рамесніка ці земляроба нізводзіла іх да становішча раба, таму да такой працы грамадзяне сталі адносіцца пагардліва, не так паважана, як у часы Гесіёда. Фізічная праца — доля раба. А раб таксама быў не зацікаўлены ў сваёй працы, бо сам належаў гаспадару, а не толькі тое, што ён вырабляў. Грэчаскі вучоны **Афінéй** (жыў у II—III стагоддзях н. э.) пісаў, што багаты жыхар Факіды Мнасон, які купіў 1000 рабоў, «пазбавіў самых неабходных сродкаў да існавання такую ж колькасць грамадзян». Грамадзяне засталіся без рабочых месц.

Грэчаскія вучоныя, напрыклад, **Платон**, раілі не купляць рабоў, якія гаварылі на адной мове, бо яны маглі дагаварыцца аб паўстанні. Той жа Афіней пісаў: «Гэта многа разоў станавілася ясным з частых паўстанняў месенян». Месенянамі называлі спартанскіх ілотаў.

Слоўнік.

Дрáхма — манета вагой у 4,366 грама серабра.

Вáрвары — ад грэч. гукападражальнага *«Барбарызэйн»* — «мармытаць».

Кваліфікавáны — лац. *«кваліс» («які»)*, узровень падрыхтоўкі чалавека да працы.

? **1.** У якіх галінах гаспадаркі прымянялася праца рабоў? **2.** Ці танна каштаваў раб? **3.** Якія прычыны

рабства называлі Гамер, Арыстоцель, Зянон? 4. Што прыводзіла да разарэння бедных грамадзян?

Афінскі філосаф Платон (жыў у 427—347 гг. да н. э.) аб рабах

«Рабы ж ніколі не стануць сябрамі ўладароў, так як людзі нягодныя не стануць сябрамі людзей прыстойных... Уладанне рабамі цяжкае. Гэта шматразова было даказана фактам узнікнення частых паўстанняў месенян (ілотаў). Колькі здараецца бед у тых дзяржавах, якія валодаюць вялікай колькасцю рабоў, гаворачых на адной і той жа мове.

Каб рабы лягчэй падпарадкаваліся, яны не павінны быць паміж сабой суайчыннікамі, а наадварот, па магчымасці больш адрозніваццa па мове».

§ 33. Узвышэнне Македоніі і ўстанаўленне яе ўлады над грэкамі

1. Барацьба грэчаскіх полісаў з Македоніяй. Македонія аддзелена ад Фесаліі Тэмпейскай далінай і гарой Алімп. Цар **Філіп II** падпарадкаваў знаць, якая раней займалася вайной і паляўніцтвам. Ён навучыўся ў беатыйскага военачальніка **Эпамінóнда** будаваць строй воінаў *(фалáнгу)* з 16 радоў у глыбіню. Наперад выстаўляліся коп'і даўжынёй 5,5 м. Наперадзе фалангі ішлі лёгкаўзброеныя воіны, якія завязвалі бой і потым адступалі. Па баках фалангу ахоўвала конніца.

У 355 г. да н. э. Факіда захапіла надзел зямлі, якая належала дэльфійскаму храму, прысвечанаму богу Апалону, а потым храмавы скарб, залаты і сярэбраны. Фівы аб'явілі Факідзе вайну і папрасілі дапа-

могі ў Філіпа. Вайна атрымала назву свяшчэннай. Факідзян падтрымалі Спарта і Афіны. Філіп аб'явіў сябе абаронцам агульнагрэчаскай святыні. Ён разграміў факідзян, утапіў 3 тыс. палонных, а цела іх камандуючага распяў на крыжы. Грэкі зразумелі, што Філіп мае намер падпарадкаваць усю Грэцыю.

Афінскае грамадства раскалолася на прыхільнікаў і праціўнікаў гегемоніі Македоніі ў Грэцыі. Прамоўца **Ісакра́т** і іншыя настаялі на тым, каб Народны сход прызнаў усе заваёвы Філіпа II у Грэцыі. Афіны не паслалі дапамогу грэчаскаму гораду Алінфу, які быў разгромлены Філіпам. «Вы атрымалі золата, вы прадалі радзіму»,— абвінавацiў прыхільнікаў Ісакрата другі прамоўца **Дэмасфе́н.** Ён узначальваў дэмакратычную групоўку грамадзян. Дэмасфену ўдалося стварыць саюз Фіў, Афін, Эўбеі, Мегар, Ахаі супраць Філіпа. У **338 г. да н. э.** каля Херанеі адбылася бітва. Дэмасфен удзельнічаў у ёй у якасці гапліта. Грэкі былі разгромлены.

У 337 г. да н. э. Філіп сазваў агульнагрэчаскі кангрэс. Ён абвясціў Элінскі саюз грэчаскіх гарадоў. Забаранілі войны паміж полісамі, адмену даўгоў, адабранне маёмасці, усялякія перавароты. Кангрэс аб'явіў свяшчэнную вайну Персіі. Аднак у 336 г. да н. э. Філіп быў забіты. Царом стаў яго 20-гадовы сын Аляксандр.

2. Заваяванні Аляксандра Македонскага. У 334 г. да н. э. аб'яднанае грэка-македонскае войска пад кіраўніцтвам **Аляксандра** разграміла персаў на рацэ Гранік (яна

ўпадае ў Мармуровае мора). Пачаліся паходы па ўладаннях Персіі. Восенню 333 г. да н. э. Аляксандр у бітве пры Ісе (поўнач Сірыі) атрымаў яшчэ адну перамогу і захапіў у палон маці, жонку і дзве дачкі персідскага цара **Дарыя**, а ў Дамаску — абоз з яго казной і скарбам. Частка гарадоў Сірыі і Фінікіі здалася добраахвотна. Паслы горада Ціра прапанавалі Аляксандру дары, але адказаліся пусціць войска ў горад. Горад размяшчаўся на скалістым востраве. 7 месяцаў яго асаджалі. З дапамогай флоту пакарыўшыхся гарадоў востраў акружылі караблямі. Аляксандр адхіліў прапанову Дарыя аб заключэнні міру. Пабудавалі дамбу ад берага да вострава даўжынёй 800 м. З боку мора інжынерам Аляксандра ўдалося незаўважана зрабіць пралом у сцяне. Тады пачаўся агульны штурм. 8000 мацнейшых абаронцаў забілі. Армія грабіла і забівала жыхароў, 30 000 чалавек прадалі ў рабства. Такі ж лёс напаткаў Газу.

Егіпецкія жрацы віталі Аляксандра як вызваліцеля ад персідскага іга і ўсклалі на яго галаву двайную карону фараона. Для паказу сваіх добрых адносін да старажытных егіпецкіх законаў і багоў Аляксандр з атрадам воінаў зрабіў паход у аазіс бога Амона. Жрацы прызналі Аляксандра фараонам і богам, сынам Амона. На самай справе Аляксандр не вызваліў Егіпет, а падпарадкаваў сабе. Ён заснаваў Александрыю пры Егіпце, падкрэсліўшы, што горад не ўваходзіць у склад Егіпта.

Пакуль Аляксандр знаходзіўся ў Егіп-

це, Дарый сабраў новую армію, узмацніў яе баявымі сланамі і калясніцамі з вострымі сярпамі. У 331 г. да н. э. адбылася найвялікшая бітва пры Гаўгамелах. У цэнтры перамагалі македонцы, а на левым флангу — персы. Зыход бітвы яшчэ не быў вырашаны. Але Дарый спалохаўся і павярнуў сваю калясніцу назад. За ім пабеглі яго гвардыя і наёмнікі. Персы пацярпелі знішчальнае паражэнне. Намеснік Дарыя *(сатра́п)* Мазей здаў горад Вавілон без бою Аляксандру. Македонскі цар пакінуў яго сатрапам, а вавілонскае войска падпарадкаваў македонскім стратэгам. Пасля нядоўгага адпачынку Аляксандр разграбіў і спаліў калыску персідскага царства горад Персэпаль і яго храмы. Гэта неабгрунтаваная дзікая жорсткасць. Ён хацеў апраўдацца перад паўстаўшымі грэкамі на Балканах: маўляў, помсціць за аграбленне персамі грэчаскіх святынь у 492—480 гг. да н. э.

Дарый уцякаў на ўсход сваёй дзяржавы. Вяльможы перасталі давяраць Дарыю і арыштавалі яго. Баючыся, што Аляксандр захопіць Дарыя ў палон, яны закалолі цара. Тады Аляксандр абвясціў сябе мсціўцам за забойства Дарыя.

Аляксандр адпусціў дадому тых грэкаў і македанян, якія гэтага хацелі, папоўніў армію мясцовымі жыхарамі і рушыў у Сярэднюю Азію, у даліну сучаснага Кабула. Потым, перайшоўшы раку Амудар'ю, уступіў у Сагдыяну. Таленавіты Спітамен арганізаваў партызанскую вайну супраць чужынцаў. Старажытны пісьменнік **Курцый Руф** пісаў, што Аляксандр

«загадаў паліць вёскі, забіваць усіх дарослых» без разбору. Ён забіў 120 тыс. чалавек, астатніх ператварыў у рабоў.

Толькі ў 327 г. да н. э. армія рушыла на Індыю. У гарах і пустынях македонская фаланга страціла свае баявыя якасці. Важнейшай у баі стала конніца. Індыя была заваявана з вялікімі стратамі. Воіны Аляксандра адмаўляліся прадаўжаць паход. Дайшоўшы да Аравійскага мора, Аляксандр павярнуў армію па сушы і па моры на зварот у Вавілон. Бітваў на гэтым шляху Аляксандр не даваў. Ад смагі, голаду і стомленасці загінула тры чвэрці воінаў.

3. Дзяржава Аляксандра і яе распад. З Вавілона Аляксандр кіраваў вялізнай дзяржавай. Ён пачаў палітыку «зліцця народаў». 10 тысяч воінаў, грэкаў і македанян, жаніліся на персіянках. Аляксандр ураўняў у правах персаў з камеданянамі. Ён вызваў незадаволенасць македонскіх воінаў. Македонскі цар захаваў уладу мясцовых сатрапаў, аднак у войска назначыў сваіх камендантаў. Ён загадаў вярнуць на радзіму ў свае гарады выгнаннікаў. Грэчаскія жрацы, як і егіпецкія, уключылі Аляксандра ў пантэон алімпійскіх багоў. Аляксандр пачаў адносіцца да ўсіх, як былы персідскі цар.

Калі ў **323 г. да н. э.** Аляксандр памёр, то яго дзяржава распалася. Яе асобныя часткі, у мінулым самастойныя дзяржавы, не былі аб'яднаны адзінай гаспадаркай. Цела цара яшчэ не пахавалі, а палкаводцы пачалі ваяваць паміж сабой за ўладу. Выдзеліліся вялікія самастойныя царствы: Македонскае, Егіпецкае, Сірыйскае.

! **1.** У час якой вайны і які поліс запрасіў Філіпа, македонскага цара, умяшацца ў справы грэчаскіх полісаў? **2.** Хто аб'явіў вайну Персіі? **3.** Чаму адносіны Аляксандра да Ціра з'яўляюцца асабліва несправядлівымі? **4.** Як Аляксандр стаў сынам егіпецкага бога Амона? **5.** Як вы адносіцеся да вайны Спітамена супраць Аляксандра?

Дэмасфен (афінскі прамоўца, жыў у 384—322 гг. да н. э.) аб Філіпе і Македоніі

«Пры гэтым вы ведаеце таксама і тое, што калі грэкі цярпелі якія-небудзь крыўды ад лакедэманян ці ад нас, то яны пераносілі гэтыя крыўды ўсё ж такі ад сапраўдных сыноў Грэцыі, і ўсялякі адносіўся тады да гэтага такім жа дакладным чынам, як, калі б, напрыклад, законны сын, які атрымаў у валоданне вялікае багацце, пачаў распараджацца чым-небудзь нядобра і няправільна: усялякі палічыў бы яго заслугоўваючым за гэта самае ганьбавання і асуджэння, але ніхто не рашыўся б гаварыць, што ён не мае права рабіць. А вось калі б раб ці які-небудзь падкідыш пачаў марна траціць і матаць багацце, на якое не меў права, тады, о Геракл! — наколькі ж больш абуральным і больш вартым гневу прызналі б вы гэта ўсё! Але аб Філіпе і аб тым, што ён робіць зараз, не мяркуюць такім чынам, хаця ён не толькі не грэк і нават нічога агульнага не мае з грэкамі, а і варвар — то ён не з такой краіны, якую можна было б назваць з павагай, але гэта — няшчасны македанянін, ураджэнец той краіны, дзе раней і раба нядрэннага немагчыма было купіць».

Ісакрат (афінскі прамоўца, жыў у 436—338 гг. да н. э.) аб Філіпе

«Калі я раздумваў сам-насам аб гэтым, я прыйшоў да выраду, што Афіны змогуць захаваць

стан міру толькі ў тым выпадку, калі найбуйнейшыя дзяржавы вырашаць, спыніўшы міжусобіцы, перанесці вайну ў Азію і калі яны пажадаюць дабіцца ў варвараў тых пераваг, якія яны зараз імкнуцца атрымаць у элінаў...

А зараз перайду да самога прадмета прамовы. Я хачу сказаць, што неабходна, не забываючы таксама аб асабістых інтарэсах, паспрабаваць прымірыць паміж сабой дзяржавы аргосцаў, лакедэманян, фіванцаў і нашу. Калі ты здолееш аб'яднаць іх у саюз, то без цяжкасцей прывядзеш да згоды і іншыя. Усе ж яны знаходзяцца ў залежнасці ад упамянутых і пры пагрозе небяспекі звяртаюцца да аднаго з іх за дапамогай і атрымліваюць яе там. Таму, калі ты схіліш да разважлівасці толькі чатыры дзяржавы, то і астатніх пазбавіш ад многіх бед...

Таму я лічу, што табе карысна ўзначаліць вайну супраць яго (персідскага цара), у той час як астатнія такія маладушныя. Усе іншыя патомкі Геракла, якія скаваны дзяржаўнымі законамі, абавязаны падпарадкавацца той дзяржаве, у якой яны жывуць, а ты, аказаўшыся як бы вольным чалавекам, павінен лічыць сваёй айчынай усю Эладу...»

Плутарх аб адукаванасці Аляксандра

«Таму цар Філіп прызваў Арыстоцеля, самага славутага вучонага з грэчаскіх філосафаў, і за навучанне Аляксандра расплаціўся з ім вельмі прыгожым і дастойным спосабам: Філіп аднавіў ім жа самім разбураны горад Стагіру, адкуль Арыстоцель быў родам...

Мне здаецца, што і любоў да лéкарства Арыстоцель усяляў Аляксандру больш, чым хто-небудзь. Другі цар цікавіўся не толькі адцягненым бокам гэтай навукі, але, як можна зрабіць вывад з яго пісем, прыходзіў на дапамогу захварэўшым сябрам,

назначаў розныя спосабы лячэння і лекавы рэжым. Наогул Аляксандр ад прыроды быў схільны да вывучэння навук і чытання кніг. Ён лічыў і нярэдка гаварыў аб гэтым, што вывучэнне «Іліяды» — добры сродак для дасягнення ваеннай доблесці. Спіс «Іліяды», выпраўлены Арыстоцелем і вядомы пад назвай «Іліяда са шкатулкі», ён заўсёды меў пры сабе, хаваючы яго пад падушкай разам з кінжалам...

Знаходзячыся ўжо ў Азіі, Аляксандр даведаўся, што Арыстоцель абнародаваў у кнігах некаторыя з гэтых вучэнняў, і напісаў яму адкрытае пісьмо ў абарону філасофіі, тэкст якога апавяшчае: «Аляксандр Арыстоцелю жадае дабрабыту! Ты паступіў няправільна, калі абнародаваў вучэнні, прызначаныя толькі для вуснага выкладання. Чым жа мы будзем адрозніваццa ад астатніх людзей, калі тыя самыя вучэнні, на якіх мы былі выхаваны, зробяцца агульным здабыткам? Я хацеў бы пераўзыходзіць іншых не столькі магутнасцю, колькі ведамі аб вышэйшых прадметах. Будзь здароў!»

«Расказваюць, што аднойчы на царскім баляванні пры вялікім зборы запрошаных Калісфен (сваяк Арыстоцеля, які як гісторык удзельнічаў у паходах Аляксандра) даручыў сказаць хвалебную прамову за кубкам віна ў гонар македанян, і ён гаварыў на гэтую тэму з такім красамоўствам, што прысутныя стоячы апладзіравалі і кідалі яму свае вянкі. Тады Аляксандр прывёў словы Эўрыпіда аб тым, што прыгожа гаварыць аб вельмі прыгожым прадмеце — справа няцяжкая, і сказаў: «Цяпер пакажы нам сваю сілу, сказаўшы абвінаваўчую прамову супраць македанян, каб, пазнаўшы свае памылкі, яны сталі лепшымі». Тут ужо Калісфен загаварыў па-іншаму, у адкрытай прамове ён прад'явіў македанянам многія абвінавачванні. Ён сказаў, што разлад сярод грэкаў быў

адзінай прычынай поспехаў Філіпа і яго ўзвышэння, і ў доказ сваёй слушнасці прывёў верш: «Часта ў разладах пашана выпадае на долю нягодніку». Гэтай прамовай Калісфен выклікаў супраць сябе лютую нянавісць з боку македанян, а Аляксандр сказаў, што Калісфен паказаў не столькі сілу свайго красамоўства, колькі сілу сваёй варожасці да македанян... Між іншым, дзякуючы таму, што Калісфен упарта, як належыць філосафу, змагаўся супраць звычкі падаць ніц перад царом і адзін асмельваўся адкрыта гаварыць аб тым, што вызывала патаемнае абурэнне ў лепшых і старэйшых з македанян...» Ворагі Калісфена ўзвялі паклёп, што Калісфен удзельнічае ў змове супраць Аляксандра. Арыштаваны Калісфен памёр у турме.

Плутарх. З біяграфіі Аляксандра. У час бітвы на рацэ Гранік

«Многія кінуліся на Аляксандра, якога лёгка было пазнаць па шчыту і па султану на шлеме: з абодвух бакоў султана было па пяру дзіўнай велічыні і белізны. Пушчаны ў цара дроцік прабіў згіб панцыра, але да цела не дакрануўся. Тут на Аляксандра кінуліся адначасова два персідскія военачальнікі, Рэсак і Спітрыдат. Ад аднаго цар ухіліўся, але кап'ё ад удару аб панцыр зламалася, і Аляксандр узяўся за меч. Спітрыдат, спыніўшы каня з боку ад змагаючыхся і хутка прыпадняўшыся ў сядле, нанёс Аляксандру ўдар персідскай шабляй. Грэбень шлема з адным з пер'яў адляцеў і шлем ледзьве вытрымаў удар, так што лязо шаблі даткнулася да валасоў Аляксандра. Спітрыдат зноў прыпадняўся, але перса апярэдзіў Кліт, па прозвішчу Чорны, які пракалоў яго наскрозь кап'ём. Адначасова ўпаў і Рэсак, якога Аляксандр паразіў мячом...»

Спрэчка Кліта з Аляксандрам на баляванні

Калі Аляксандр заўважыў, што Кліт, мабыць, хоча апраўдаць самога сябе, называючы баязлівасць бядою, Кліт ускочыў з месца і ўсклікнуў: «Але гэта самая баязлівасць выратавала цябе, народжаны багамі, калі ты ўжо падставіў сваю спіну мячу Спітрыдата! Дзякуючы ж крыві македанян і гэтым вось ранам, ты так узняўся, што адрокся ад Філіпа, называеш сябе сынам Амона (бога Егіпта)... Аляксандр жа, звярнуўшыся да Ксенадоха Кардыйскага і Арцемія Калафонскага, сказаў: «Ці не здаецца вам, што грэкі прагульваюцца сярод македанян, нібы паўбагі сярод дзікіх звяроў?» Кліт не сунімаўся, ён патрабаваў, каб Аляксандр пры ўсіх выказаў тое, што думае, альбо каб ён не запрашаў больш да сябе на баляванне людзей свабодных, якія прывыклі гаварыць адкрыта, а жыў сярод варвараў і рабоў, якія будуць пакланяцца яго персідскаму поясу і беламу хітону. Аляксандр ужо не мог стрымаць гнеў: схапіўшы ляжаўшы каля яго яблык, ён кінуў яго ў Кліта і пачаў шукаць свой кінжал... Кліта, не жадаючага ўступіць, сябры з цяжкасцю выштурхнулі з балявальнай залы, але ён зноў увайшоў праз другія дзверы, з найвялікшай дзёрзкасцю чытаючы ямбы з «Андрамахі» Еўрыпіда:

Які дрэнны наш звычай, калі трафей
У элінаў ставіць войска пераможцаў
Паміж ляжачых ворагаў, то не тыя
Праслаўлены, якія працавалі,
А правадыр адзін сабе хвалу бярэ.

Тут Аляксандр выхапіў кап'ё ў аднаго целаахоўніка і, кінуўшы яго ў Кліта, які адкінуў завесу і ішоў насустрач цару, пракалоў дзёрзкага наскрозь. Кліт громка застагнаў і ўпаў, і гнеў Аляксандра адразу ж згас. Аляксандр апамятаўся і ўбачыў

сяброў, якія маўкліва стаялі навокал, выцягнуў з трупа кап'ё і паспрабаваў усадзіць яго сабе ў шыю, але яму перашкодзілі — целаахоўнікі схапілі яго за рукі і гвалтоўна аднеслі яго ў спальню. Усю ноч Аляксандр плакаў...»

Рымскі гісторык Курцый Руф (па думцы многіх вучоных, каля 50 г. н. э. напісаў «Гісторыю Аляксандра») аб барацьбе палкаводцаў Аляксандра паміж сабой за ўладу

«Воіны ўпарта крычалі, што не пацерпяць ніякага цара, акрамя законнага наследніка, і патрабавалі запрасіць Арыдэя (зводнага брата Аляксандра).

Варожа настроены да Пердзіка (палкаводзец Аляксандра) Мелеагр (камандзір Аляксандра) прывозіць Арыдэя ў палац, і салдаты вітаюць яго і абвяшчаюць яго царом пад іменем Філіпа...

Лёс штурхаў македонцаў да міжусобіц, бо многія дабіваліся царскай улады... Пердзік бачыў сваё выратаванне толькі ў гібелі Мелеагра... Вырашана было падвергнуць войска ачышчэнню па звычаю продкаў, і выпадак здаваўся падыходзячым, так як былі спынены разлады. Абрад ачышчэння воінаў македонскія цары спраўлялі наступным чынам. На поле, куды выводзілася войска, па абодвух краях кідалі вантробы рассечанага сабакі; у прамежак паміж кінутымі вантробамі ставілі воінаў: з аднаго боку — коннікаў, з другога — фалангу. У назначаны для гэтага свяшчэннага абраду дзень цар з коннікамі і сланамі размясціўся супраць пяхоты, якой камандаваў Мелеагр... Войскі зыходзіліся, і адлегласць, якая раздзяляла два фронты, была невялікай. Тут цар з атрадам коннікаў, падскакаўшы да пяхоты, патрабаваў па падгаворванню Пердзіка выдачы на пакаранне смерцю зачыншчыкаў разладу, якіх ён, здавалася, павінен

быў засцерагаць. У выпадку адказу цар гразіў павесці на пяхоту ўсю конніцу і сланоў. Пяхота аслупянела ад нечаканага няшчасця. І сам Мелеагр, падобна сваім паплечнікам, разгубіўся і страціў мужнасць... Тады Пердзік, убачыўшы, што яны ашаломлены і цалкам разгублены, аддзяліў каля 300 чалавек ад астатніх і паставіў перад сланамі. Гэта былі тыя, хто паследаваў за Мелеаграм, калі ён пакінуў першы сход воінаў, які адбыўся пасля смерці Аляксандра. Сланы патапталі ўсіх іх, прычым Філіп не забараняў гэтага, хаця і не заахвочваў... Позна разгадаўшы вераломства Пердзіка, Мелеагр заставаўся тады спакойна ў страі, таму што насілле не было накіравана непасрэдна супраць яго. У хуткім часе ён згубіў надзею на выратаванне і ўбачыў, што ворагі рыхтуюць яму пагібель ад імя чалавека, якому ён сам надаў чын цара, Мелеагр уцёк у храм і там быў забіты...»

Раздзел IV. Культура грэкаў

§ 34. Школа, тэатр і навуковыя веды

1. Пісьменнасць і школа. Дасягненні грэчаскіх дзяржаў-полісаў у земляробстве, жывёлагадоўлі, рамястве і гандлі стварылі матэрыяльныя сродкі для развіцця ўсіх напрамкаў культуры. Частка грамадзян атрымала свабодны час для заняткаў навукай і мастацтвам. Нездарма грэчаскае слова *«схоле»* мае значэнне *«свабодны час»*, не толькі *«разумовыя заняткі»*. Сярэдневяковыя вучоныя прыдалі слову *«схоле»* значэнне *«школа»*,

якое ўжываем і мы. Земляробы, пастухі, рамеснікі, рабы разам з адукаванымі людзьмі і вучонымі забяспечылі раздзяленне працы на фізічную і разумовую. А навучанне грамадзян у школе паскорыла развіццё тэхнікі і гаспадаркі. Апошнія ў сваю чаргу паскаралі развіццё культуры. У Афінах рабаўладальніцкая дэмакратыя аказала жыватворны ўплыў на культуру. Грэчаскі філосаф **Ксенафан** (гады жыцця 570—480 гг. да н. э.) пісаў, што культура — не дар багоў, а вынік пошукаў лепшага, якія рабіў сам чалавек. **Пратагор** (480—410 гг. да н. э.) лічыў, што ўменні і навыкі ўласцівы чалавеку ад прыроды. Анаксагор, сябра Перыкла, падкрэсліў значэнне чалавечай рукі для развіцця культуры. Так вучоныя Грэцыі самі ўсведамлялі ролю чалавека ў развіцці культуры.

Грэкі перадавалі падзеі свайго жыцця, думкі спачатку з вуснаў у вусны, ад аднаго пакалення да другога, як Гамер. Гамер толькі адзін раз упамінае *«злавесныя знакі»*, яму незразумелыя і вядзьмарскія. Гэта былі пісьменныя знакі. Паводле міфа, грэчаскі алфавіт вынайшлі Палмед, пляменнік Агамемнона, ці Кадм, брат багіні земляробства Еўропы. Па другому міфу, Еўропа — дачка фінікійскага цара Агенора.

Гістарычна праўдзіва тое, што грэкі запазычылі алфавіт у фінікійцаў. У грэчаскай мове назвы літар не маюць прадметнага значэння. *А ў семіцкіх мовах (арабаў, старажытных яўрэяў, сірыйцаў і інш.) розныя літары абазначалі прадметы: «альфа» — алеф («жывёла»), «бэта» — бэт («дом»),*

«гама» — гімель («вярблюд»), «дэльта» — далет («дзверы») і гэтак далей. У беларускай мове гэта літары: *а, б, г, д.* Грэкі запазычылі пісьменнасць творча: яны прыдумалі знакі для абазначэння галосных.

Хлопчыкі навучаліся з сямі гадоў у школе, дзяўчынкі — дома, але ў асноўным рукадзеллю і дамаводству. Дзеці рамеснікаў і сялян маглі навучыцца чытанню і пісьму. Дзеці багатых прадаўжалі навучанне ў гімнасіях, слухалі лекцыі вучоных, такіх, як Арыстоцель, прамоўцаў. Вучыліся пісаць на дошчачках, пакрытых воскам. Металічная палачка з вострым і тупым канцом, якой выдзіралі літары, называлася *стылем.* Хто меў сродкі і час, вучыўся спяваць, іграць на ліры, танцаваць. Многія грэкі ведалі напамяць «Іліяду» і «Адысею».

2. Тэатр. Сапраўднай школай для дарослых былі самыя масавыя арганізацыі: Народны сход, які сабіраўся 4 разы ў месяц, і суд прысяжных. Як адзначалася вышэй, першы ўключаў усіх грамадзян, а другі складаўся з 6 тысяч чалавек. Па прыкладных падліках, у 431 г. да н. э. свабодных мужчын старэйшых за 18 гадоў у Афінах было 33 900 чалавек. Суд выбіралі кожны год. Адзін раз у 5 год членам суда мог стаць кожны грамадзянін.

Усіх грамадзян адукоўваў і выхоўваў тэатр. Слова гэта паходзіць ад дзеяслова *«тэаомай» — «гляджу».* Спачатку тэатральныя паказы праходзілі дзе пажадана. Потым на схілах узгоркаў пачалі будаваць месцы для гледачоў *(амфітэ́атр).* На роўнай пляцоўцы падножжа *(архе́стры)* выступалі акцёры і хор. Ззаду архестры размяшчалі

палатку *(скéнэ)*, дзе артысты пераапраналіся. Пазней палатку замянілі памяшканнем. На сцяне яго, павернутай да гледачоў, малявалі дэкарацыю. Тэатр, прысвечаны богу Дыянісу ў Афінах, змяшчаў 17 тысяч гледачоў. З далечыні гледачы не маглі бачыць міміку акцёра, таму з дрэва, палатна, бронзы рабілі трагічныя і камічныя маскі. Знаёмыя твары герояў арыстафанаўскіх камедый, паэта Еўрыпіда, філосафа Сакрата, Клеона мелі партрэтнае падабенства. Ужывалася прыстасаванне для ўзмацнення голасу.

У Афінах тыран Пісістрат зрабіў дзяржаўным для ўсіх грамадзян свята земляробаў, прысвечанае богу Дыянісу. Сяляне надзявалі маскі казлоў. Хор праслаўляў песнямі бога, які быццам бы дапамагае ім вырасціць ураджай. Пры Пісістраце з'явіўся першы акцёр, які вёў размову з хорам. *«Трагедыя»* азначае *«песня казлоў»*.

3. Творчасць паэтаў. Тэатральныя спаборніцтвы арганізоўваў архант. Ён падбіраў лепшыя з трагедый. Па дзяржаўнаму закону кожны з паэтаў прадстаўляў на агляд чатыры творы. У першай палове дня ставілі трагедыі, у другой — камедыі, каб гледачы адпачнулі за вясёлым відовішчам. Дзесяць спецыяльна выбраных суддзяў давалі клятву, што ўзнагародзяць аўтара сапраўды лепшага твора. З усіх выбіралі толькі тры лепшыя. На наступных Дыянісіях паэт павінен быў прадставіць новы твор, калі хацеў удзельнічаць у спаборніцтвах. На наведванне тэатра дзяржава выдавала бедным *«тэатральныя грошы»*, альбо адпаведны значок.

Эсхіл (525—456 гг. да н. э.) напісаў трагедыю «Персы», у якой расказаў аб сапраўдных падзеях грэка-персідскіх войн. А ў трагедыі «Прыкаваны Праметэй» па-свойму расказаў міф аб гэтым тытане. Тытан — бажаство старэйшага пакалення. Праметэй — брат Крона, бацькі Зеўса. Зеўс — бог неба, маланкі — не хацеў навучыць людзей, як карыстацца агнём. Праметэй украў агонь і перадаў яго людзям. Ён таксама навучыў людзей пісьму, рамяству, усім мастацтвам. Значыць, панавала думка, якая адрознівалася ад поглядаў Ксенафана, Пратагора, Анаксагора. Раззлаваны Зеўс прыкаваў Праметэя ланцугамі да скалы Каўказа. Ён пасылаў арла раздзіраць грудзі Праметэя і дзяўбці яго печань. За ноч раны гаіліся, печань адрастала. А потым арол зноў і зноў, на працягу тысячагоддзяў, прылятаў на крывавую трапезу. Зеўс пажадаў славы свайму сыну Гераклу і дазволіў яму забіць арла. У Афінах існаваў дэмакратычны лад. Вось чаму Эсхіл не баяўся паказаць Праметэя барацьбітом супраць тыраніі Зеўса. «Папраўдзе ўсіх багоў я ненавіджу!» — усклікнуў Праметэй.

Сафокл (497—406 гг. да н. э.) адлюстраваў у сваіх трагедыях «залаты век» Перыкла. У трагедыі «Анцігона» паэт паказаў, як яго гераіня выканала маральны закон сям'і, боскі закон. Яна пахавала забітага брата. Тым самым яна парушыла закон поліса. Брат Анцігоны хацеў захапіць царскі трон у другога брата, таму яго забаранілі хаваць. Новы цар пасадзіў Анцігону ў падзямелле, каб замарыць голадам. Яна забіла сябе сама. Сын цара хацеў вызваліць Анцігону, сваю нявесту, але ўбачыў яе мёртвай. Ён таксама пакончыў з сабой. Сафокл услаўляе асобу чалавека, яго веліч:

Многа ў прыродзе дзіўных сіл
А мацней чалавека — няма!

Еўрыпід (485—406 гг. да н. э.) стаў на абарону афінскіх жанчын, па-свойму расказаўшы аб адносінах Ясона і Медэі. У час паходу арганаўтаў за залатым руном Медэя супраць волі свайго бацькі дапамагла Ясону авалодаць руном і ўцякла з дому. Яна нарадзіла Ясону двух сыноў. Але Ясон захацеў ажаніцца на дачцэ карынфскага цара. Медэі ён заявіў, што робіць гэта дзеля іх двух сыноў, каб яны сталі багатымі. Тады пакрыўджаная Медэя сама забіла сыноў. Такім крывавым спосабам пры тагачаснай жорсткасці грамадства Медэя даказвала роўнасць жанчын і мужчын. І ў шлюбным праве жанчына не была роўнай з мужчынам. У Афінах муж мог пакінуць жонку, калі пажадае, жонка — толькі са згоды мужа.

4. Навуковыя веды. Гіпакрат з вострава Коса (460—370 гг. да н. э.) выхадзец з сям'і патомных урачоў. Існуе зборнік 58 медыцынскіх твораў, якія складаюць «Корпус Гіпакрата». Але невядома, ці Гіпакрат іх напісаў. Большасць твораў напісана ў V—IV стагоддзях да н. э. Раней людзі думалі, што здароўе і хваробы чалавека пасланы багамі. Гэтыя творы сведчаць, што прычыны хвароб залежаць ад навакольнага асяроддзя, ад стану крыві ў арганізме. Назвы твораў «Аб паветры, вадзе і мясцовасці», «Аб прыродзе чалавека» сведчаць, што вучоныя перасталі тлумачыць стан здароўя чалавека ўмяшаннем непрыродных сіл. Гіпакрат вучыў, што трэба падняць сілы самога чалавека, арганізма, каб яго вылечыць. Раілі прытрымлівацца дыеты ў харчаванні, прымянялі лекавую гімнастыку. «Клятва Гіпакрата» і зараз лічыцца асновай паводзін урача.

Хірургія, пачынаючы з часу Гіпакрата, у III ст. да н. э.— I ст. н. э. дасягнула значнага развіцця. Да нашага часу захаваліся не толькі назвы інструментаў, але і іх формы (клешчы, пілы, нажы, скальпелі). Хірургі ўмелі выдаляць *катара́кту* (памутненне хрусталіка), камні з мачавога пузыра, грыжу, ампуціравалі канечнасці.

Біялагічнай навукі, якая аддзялілася ад медыцыны і рэлігійных абрадаў, не існавала. Аднак пачатак яе быў закладзены.

Па міфалагічнаму вучэнню раней уся зямля была пакрыта вадой. Існавалі толькі рыбы. Калі некаторыя рыбы выйшлі на сушу, іх скура высахла, лопнула і з яе выйшлі людзі. Значыць, людзі задумваліся аб сваім паходжанні. Гэта думка не супадала з тым, што гаварылі жрацы: Зеўс стварыў людзей.

Новыя высновы зрабіў **Дэмакрыт** з Абдэры (горад у Фракіі, 460—371 гг. да н. э.). У доме багатага бацькі ён атрымаў адукацыю. Ён доўга жыў у Егіпце, Вавілоне, знаёмячыся з навуковымі дасягненнямі. Потым пераехаў у Афіны. Слава Дэмакрыта і Гіпакрата ў старажытныя часы стала такой, што аб іх узаемаадносінах напісалі раман. Дэмакрыт сядзеў на камні. Вакол яго ляжалі скруткі кніг, забітыя жывёлы з вынутымі вантробамі. Дэмакрыт то разглядаў вантробы, то чытаў ці раздумваў і нешта запісваў. Дэмакрыт сцвярджаў, што першапачаткова людзі выйшлі з вады і гразі, таксама, як чарвякі. Тварца людзей і мэты іх стварэння не было. Дэмакрыт даказваў, што спачатку з'явіліся жывёлы, а пасля — людзі. Яны навучыліся жыць дзякуючы ўласнаму вопыту. І гэта думка супярэчыць міфалагіч-

най, паводле якой людзей усяму навучыў Праметэй. Спачатку людзі жылі так, як звяры. Шмат часу прайшло, пакуль патрэба, імкненне выжыць, навучылі людзей рабіць харчаванне.

Арыстоцель, упамянуты намі, шляхам назірання зразумеў паступовы пераход у прыродзе ад нежывога рэчыва да жывых арганізмаў.

Геаграфія (грэч. «землеапісанне»). У гамераўскі час грэкі лічылі Зямлю круглым дыскам сярод Акіяна. Яны ведалі землі ад усходняга ўзбярэжжа Чорнага мора да Атлантычнга акіяна. Каля 550 г. да н. э. **Анаксімандр** саставіў карту. **Гекатэй Мілецкі** напісаў трактат «Апісанне Зямлі» (каля 500 г. да н. э.). **Парменід** (540—480 гг. да н. э.) лічыў Зямлю шарам. Арыстоцель аддзяліў Іспанію ад Індыі вузкім морам. Улічым, што Арыстоцель — настаўнік Аляксандра Македонскага, які зрабіў паход супраць Індыі, ідучы на ўсход. **Эратасфен** (282—202 гг. да н. э.), загадчык Александрыйскай бібліятэкі, даволі дакладна падлічыў даўжыню акружнасці зямнога шара.

Архімед (287—212 гг. да н. э.) жыў у Сіракузах, вучыўся ў Александрыі. Ён пабудаваў вінт, які адкачваў ваду з карабля, альбо падаваў яе з канала на поле. Архімед адкрыў формулу, па якой можна вылічыць даўжыню акружнасці. Ён сканструяваў сістэму рычагоў, дзякуючы якой можна было перавярнуць баявы карабель, захапіўшы яго крукам.

Матэматык **Герон**, па прозвішчу **Механік** (жыў у Александрыі ў час Цэзара) рашаў складаныя задачы і стварыў шмат пры-

бораў. З дапамогай *дыяптрыі* вымяралі адлегласць, вышыню крапасных сцен, гор. Ён стварыў рухавікі, якія працавалі на сціснутым паветры, а парай прыводзілі ў рух лялькі.

Слоўнік.

Біялóгія — грэч. *«біос»* — жыццё, *«логас»* — вучэнне, навука аб жыцці.

Кóрпус — лац. літаральна *«цела»*, збор твораў.

Медыцы́на — лац. *«медзіціна»* — урачэбная навука, навука аб захаванні здароўя чалавека.

Мі́міка — грэч. мастацтва выражаць пачуцці рухамі твару.

Трáпеза — *«стол»*, *«харчаванне»*.

Хірургі́я — грэч. *«ручная работа»*, галіна медыцыны.

? **1.** Як Ксенафан вызначыў прычыну ўзнікнення культуры? **2.** Які алфавіт запазычылі грэкі? **3.** Чаму навучалі ў школе хлопчыкаў і дзяўчынак? **4.** Якія сучасныя тэатральныя словы адпавядаюць старажытнагрэчаскім? **5.** Хто праводзіў тэатральныя спаборніцтвы? **6.** Якія паэты пісалі творы для тэатральных пастановак? **7.** Хто напісаў «Корпус Гіпакрата»?

§ 35. Філасофія, Алімпійскія гульні, рэлігійныя святы і вальнадумства

1. Дэмакрыт. Дэмакрыт стварыў вучэнне, што ўсялякае рэчыва складаецца з найдрабнейшых часцінак, якія не дзеляцца. Ён назваў іх *атамамі*. Назва захавалася ў сучаснай фізіцы, хаця вучоныя ўстанавілі, што атамы таксама дзеляцца. Арганізмы жывёлы, чалавека, усе расліны адміраюць, распадаюцца на атамы, а потым адбываецца

новае злучэнне атамаў, якое стварае новае цела. Значыць, рэчыва ніколі не знікае бясследна. Таму Дэмакрыт лічыў, што атамы ствараюць безліч міроў, не толькі зямлю. Дэмакрыт па-грэчаску называў рэчыва *«фюзіс»* (адсюль і *«фізіка»),* а ў рускую і беларускую мовы гэтае слова ўвайшло з лацінскай *(«матэрыа»).* Вучоныя, якія лічаць, што матэрыя заўсёды існавала, не створана багамі, атрымалі назву *філосафаў-матэрыялістаў.* Слова *«філасофія»* складаецца з двух старажытнагрэчаскіх слоў: *«філео»* — *«любіць»* і *«софіа»* — *«мудрасць».* Апошняе значэнне мае і жаночае імя. У адносінах да рэлігіі мудрасць Дэмакрыта выражана словамі: «Ніякага Лёсу няма. Людзі самі выдумалі Лёс, каб апраўдаць сваю вяласць і нерашучасць. Нішто не адбываецца так сабе, бяссэнсава, а ўсё лагічна і абумоўлена прычыннасцю. Усё, што мы звальваем на Лёс, мае зусім вызначаную прычыну».

У грэчаскім грамадстве існавала мудрасць іншага віду.

2. Платон. Платон (427—347 гг. да н. э.) з афінскага арыстакратычнага роду Кадрыдаў вучыў іншай, чым Дэмакрыт, мудрасці. Крыцій, кіраўнік трыццаці тыранаў, быў яго дзядзькам. Платон сцвярджаў, што навакольны свет, гэта значыць зямля, вада, расліннасць, дамы і іншыя прадметы не з'яўляюцца сапраўдным светам. Гэта толькі бледнае адлюстраванне свету *ідэй,* якія чалавек не можа пазнаць з дапамогай доследаў, а толькі розумам, мысленнем. Слова *«ідэа»* ў старажытнагрэчаскай мове мае шмат значэнняў. Бяззменна яно стала род-

ным у еўрапейскіх і беларускай мовах. Платон ужываў гэтае слова ў значэнні *«агульная ўласцівасць»*, *«пачатак»* рэчаў, прадметаў, іх *«нязменныя вобразы»*. *Прасцей кажучы, не чалавек з'яўляецца рэальным, сапраўдным, а думка аб чалавеку, ідэя чалавека.* Такое тлумачэнне свету, рэчаў прынята называць *ідэалістычнай мудрасцю, філасофіяй.* Мысленне Платона супрацьстаяла мысленню Дэмакрыта, поўнасцю адвяргала яго. На жаль, Платон перанёс навуковыя спрэчкі ў практыку адносін паміж канкрэтнымі вучонымі людзьмі. Ён прызваў знішчыць творы Дэмакрыта, а яго паслядоўнікаў судзіць. Платон пісаў: «Адных трэба караць смерцю, другіх бічаваць і заключаць у турмы, трэціх пазбаўляць грамадзянскіх правоў, чацвёртых караць жабрацтвам і выгнаннем за межы дзяржавы». Вось чаму ад твораў Дэмакрыта захаваліся толькі тыя часткі, якія былі перанесены ў творы паслядоўнікаў Платона з мэтай даказаць памылковасць думак Дэмакрыта.

3. Сакрат. Платон быў вучнем Сакрата. Сакрат — таксама прадстаўнік ідэалістычнай філасофіі. Але ён не прызываў да знішчэння сваіх навуковых спрачальнікаў. Сакрат (468—399 гг. да н. э.) — сын каменярэза. Спачатку і сам ён стварыў скульптуру, але потым цалкам аддаўся філасофіі. Ён не пакінуў нічога запісанага ўласнай рукой. Платон, стратэг і гісторык Ксенафонт, іншыя вучні Сакрата запісалі яго вучэнне. Сакрат тварыў у час Пелапанескай вайны, якая абвастрыла адносіны паміж грамадзянамі. Людзі перасталі паважаць пісаныя і няпісаныя законы. Сам Сакрат выстаяў як жыц-

цяздольны чалавек. Таму ён займаецца вывучэннем чалавека, сэнсу яго жыцця і прызначэння, магчымасці дасягнуць шчасця. Старажытнарымскі філосаф Цыцэрон пісаў, што Сакрат першы прымусіў філосафаў «разважаць аб жыцці і норавах, аб справах добрых і злых». Чалавек павінен пазнаць самога сябе. Па словах Ксенафонта, Сакрат высвятляў, што справядліва і што несправядліва, што з'яўляецца храбрасцю і што баязлівасцю. Ён гаварыў, што чалавек павінен ведаць, што такое дзяржава і чалавек, які кіруе дзяржавай, грамадзянамі.

У адносінах паміж грамадзянамі Афін, якія прынята называць палітыкай, ролю чалавека вызначыў стратэг Нікій, той, які заключыў мір са Спартай. А напісаў аб гэтым гісторык Фукідзід: «Дзяржава — гэта людзі, а не сцены і караблі». Зразумела, што людзьмі ў часы рабства лічылі толькі грамадзян. Пакуль Афіны клапаціліся аб дабрабыце большасці грамадзян, то людзі з дапамогай караблёў абаранілі радзіму, гэта значыць, вобразна кажучы, сцены Афін, ад магутнай Персіі. Калі большасць грамадзян стала фетамі, не мела сродкаў набыць зброю за свой кошт, Афіны, як і іншыя полісы Грэцыі, былі заваёваны Македоніяй.

Не ўсё, што прапаведаваў Сакрат, можна было ажыццявіць на справе. Але ён дзейнічаў так, як лічыў справядлівым. Будучы членам савета 500, адзін не згадзіўся са смяротным прыгаворам аргінускім стратэгам у 406 г. да н. э.

Сакрат адкрыта асуджаў тырана Крыція, які некалі таксама слухаў яго лекцыі.

Аднак сам Сакрат быў асмеяны Арыста-

фанам у камедыі «Воблакі». Арыстафан абвінаваціў Сакрата ў тым, што ён прыдумаў сваё, новае бажаство пад назвай *«дземóній»*. Сакрат сапраўды сцвярджаў, што яго «дземоній» даў яму розум. У кожнага чалавека ёсць свой «дземоній». Сакрат не адмаўляў алімпійскіх багоў, Дэльфійскага аракула, які праз жрыцу піфію быццам бы перадаваў волю бога Апалона. Піфія назвала Сакрата мудрэйшым. Аднак Сакрат гаварыў, што божая сіла стварыла ўсё так, як існуе зараз. Такое тлумачэнне не разумела большасць грамадзян. Яны думалі, што непасрэдна сам бог усё стварае і робіць. Сакрат гаварыў, што воблакі пасылаюць дождж, ствараюць гром, маланку. Сакрат разумна растлумачыў з'явы прыроды. Арыстафан жа высмейваў Сакрата: значыць, усім упраўляе не Зеўс, а Воблакі, паветраны Віхор. Арыстафан насмешліва казаў: Воблакі і Віхор — гэта багі Сакрата. Калі ўлічыць, што Сакрат смела крытыкаваў і Народны сход, і алігархаў, то стане зразумела, чаму Сакрата прыгаварылі да смерці. Яго сябры прапанавалі арганізаваць уцёк з афінскай турмы. Сакрат не згадзіўся. Ён і смерцю даказаў сваю правату.

4. Алімпійскія гульні. З 776 г. да н. э. спартыўныя спаборніцтвы ў бегу, скачках, барацьбе, кіданні дыска, кап'я, кулачным баі былі прызнаны ўсімі дзяржавамі Грэцыі. Па адной легендзе іх упершыню ўстанавіў Пелапс, выгнаны з Троі. У спаборніцтвах на калясніцы ён перамог цара Цісы Энамая і заваяваў права ажаніцца на яго дачцэ. Па другой легендзе, Геракл, сын Зеўса, заснаваў Алімпійскі храм, і ў гонар галоўнага бога Зеўса адзін раз у чатыры гады право-

дзіліся гульні. Лік часу грэкі вялі, пачынаючы з першай алімпіяды. Вучоныя нашага часу прадаўжаюць раскопкі алімпійскага стадыёна, дзе праводзіліся гульні.

Удзельнічалі ў спаборніцтвах толькі мужчыны-грамадзяне. Варвары (словаўжыванне грэкаў), такія, як продкі Аляксандра Македонскага, да гульняў не дапускаліся. Удзельнікі спаборніцтваў задоўга да іх пачатку прыязджалі на трэніроўкі. Для гэтага трэба было мець вольны час і вялікія сродкі. Полісы дамаўляліся аб спыненні войнаў на час гульняў. Дзесяць суддзяў у пурпуровых адзеннях, з лаўровымі вянкамі на галовах у суправаджэнні глашатаяў і ўдзельнікаў гульняў патаемным ходам выходзілі на стадыён. Калі хто-небудзь з гледачоў выказваў думку, што атлет не адпавядае высокім патрабаванням да ўдзельнікаў, то яго адхілялі ад спаборніцтваў. Пераможцаў *(алімпіёнікаў)* узнагароджвалі вянкамі з дзікай масліны, аб'яўлялі іх імя і радзіму. Алімпіёнікі прыносілі ахвяраванне Зеўсу Алімпійскаму, спявалі песні і гімны. У родны горад алімпіёнік уязджаў цераз пралом у сцяне. Гэтым грамадзяне выказвалі надзею, што ў час небяспекі ён абароніць ад ворагаў. Пераможца атрымліваў узнагароду 500 драхм. Такі грамадзянін па законах Салона належаў да першага разраду. У 394 г. н. э. хрысціянскі епіскап горада Мілана Амбруаз пераканаў рымскага імператара Феадосія, што алімпійскія гульні — крыніца язычніцтва, гэта значыць старажытнай грэчаскай рэлігіі. Гульні забаранілі. У 1896 г. яны былі адноўлены ў Афінах.

Мы адзначылі станоўчыя рысы Алімпійскіх гульняў. Але былі і адмоўныя. Усе грэчаскія полісы — і алігархічныя, і дэмакратычныя — лічылі ўсіх нягрэкаў варварамі. Варвараў, такіх, як македаняне, ці персы (культура персаў ва ўсіх адносінах не была горшай у параўнанні з грэчаскай), не дапускалі на алімпійскія гульні. Гэта раз'ядноўвала народы. А жанчыны грэчаскія не мелі права быць нават гледачамі гульняў. Правіцелі дабіваліся прысваення сабе чужой спартыўнай перамогі, падпарадкоўваючы гульні барацьбе за ўладу. Кімон, бацька Мільціяда, пераможцы персаў пры Марафоне, перамог у Алімпіі чацвёркай коней двойчы. Другі раз ён дазволіў аб'явіць пераможцай тырана Пісістрата. Герадот не паведамляе, ці пратэставалі алімпійскія суддзі супраць гэтай здзелкі, хаця аб такіх выпадках піша неаднаразова. За гэта тыран дазволіў Кімону вярнуцца з выгнання ў Афіны. Трэцюю перамогу Кімон не ўступіў. Сыны Пісістрата забілі Кімона. Тыраны маглі парушаць законы і правілы гульняў. Афінскі стратэг Алківіяд накіраваў у Алімпію сем калясніц, атрымаўшы першую, другую і чацвёртую перамогі. Аднак гэта не асабістыя перамогі Кімона і Алківіяда. Калі пераможца ў бегу, дыскабол ці кап'яносец дэманстравалі ўласныя сілы, то ўладальнікам калясніц перамогу прыносілі вазак і коні. Спаборніцтва на калясніцах — гэта спрэчка багацціяў уладальнікаў калясніц, а не асабіста іх удзельнікаў.

З VI ст. да н. э. недалёка ад Дэльф, на Крысейскай раўніне грэкі праводзілі Піфійскія гульні ў гонар бога Апалона. Яны пра-

водзіліся на трэцім годзе пасля Алімпійскіх гульняў. Спачатку спаборнічалі музыканты, а потым таксама атлеты і коннікі.

5. Рэлігійныя святы і вальнадумства. У VI—V стагоддзях да н. э. рэлігія грэкаў змянілася ў параўнанні з рэлігіяй таго часу, які апісаў Гамер. Галоўны бог Зеўс раней быў падаўцом дажджу і навальніцы, захавальнікам радавой уласнасці, потым уласнасці знатных родаў і меў прозвішча *Аградны*. Калі абшчыннікі сталі раўнапраўнымі і была прызнана дзяржавай прыватная ўласнасць, Зеўс атрымаў новае прозвішча *Агарай*. Агарой называлі месца сходаў, гарадскую плошчу і самі сходы народа. Зеўс Агарай стаў ахоўваць уласнасць усіх грамадзян і ўласнасць усяго поліса. Новыя абавязкі прыпісалі богу Апалону і іншым багам. Стаў раўнапраўным з іншымі багамі Дыяніс.

Заступніцай афінскага поліса, рамеснікаў і ганчароў стала багіня Афіна. Заступнікам Карынфа лічыўся бог Пасейдон. Ганчары спявалі песню-малітву:

Паслухай малітвы, Афіна! Рукою печ засцерагаючы,
Дай, каб выйшлі на славу гаршкі і бутэлькі, і міскі,
Каб абпаліліся добра і дастаткова прыбытку далі,
Каб прадаваліся бойка на рынку, на вуліцах жвава,
Каб ад прыбытку тлустага за песню і нас адарылі.

У свой час Гамер сцвярджаў, што багі непасрэдна самі ўдзельнічаюць у бітве ахейцаў і траянцаў. А калі ў VI ст. да н. э. Пісістрат паставіў на калясніцу прыгожую дзяўчыну ў адзенні багіні Афіны і сказаў, што яна багіня, якая вядзе тырана ў горад Афі-

ны, Герадот назваў гэта хітрай улоўкай і *забабонамі*.

Тыран Пісістрат у 565 г. да н. э. нанава ўстанавіў свята Панафінеі для пакланення багіні Афіне. Яно спраўлялася пасярэдзіне лета адзін раз у чатыры гады. Некалькі месяцаў афінскія дзяўчаты ткалі адзенне для статуі Афіны. Факельнае шэсце, музычныя і танцавальныя спаборніцтвы адкрывалі свята. Цэнтральным эпізодам была працэсія з ахвяраваннем жывёл. *Гекатóмба* — самае вялікае ахвяраванне са 100 быкоў. Быка прыбіралі лентамі і дабіваліся, каб ён сам ішоў да ахвяравальніка. Вантробы жывёлы даследаваліся, каб устанавіць, ці добра адносіцца да ахвяры бажаство. Вантробы і некаторыя іншыя часткі жывёлы спальвалі на алтары. Астатняе размяркоўвалі паміж грамадзянамі. Жрэц атрымліваў шкуру і галаву быка. У працэсіі ўдзельнічалі толькі грамадзяне. Калі свабодны чалавек, але неграмадзянін, метэк далучаўся да працэсіі, яму выносілі смяротны прыгавор. Музычныя, атлетычныя, конныя спаборніцтвы заключалі свята.

У лістападзе — снежні афіняне святкавалі Дыянісіі, пакланяючыся богу Дыянісу. Пісістрат заснаваў Гарадскія, ці Вялікія Дыянісіі. Яны святкаваліся пяць дзён. Асноўнай падзеяй было ўрачыстае нашэнне відарысаў бога Дыяніса ў працэсіі. Тры дні працягваліся драматычныя пастаноўкі ў тэатры.

Рабы ў час свята маглі атрымаць кавалак мяса ці кубак віна. Але наогул полісная рэлігія не брала пад ахову рабоў. Раба не ўгаворвалі працаваць ні спасылкамі на да-

памогу бога ні іншым чынам. Раба прымушалі працаваць сілай. А калі ён добра працаваў, маглі адпусціць на волю, зрабіць *вольнаадпушчанікам, але не грамадзянінам.* Ад жорсткага гаспадара раб мог ратавацца, прыбягаючы к храму. Але жрэц мог вярнуць яго былому гаспадару ці прадаць другому.

Не ўсе грэкі верылі ў багоў так, як вучылі Гамер і Гесіёд. Вальнадумства грэкаў было распаўсюджаным. Па-свойму мыслілі і Дэмакрыт, і Сакрат. Гесіёд пісаў, што сусвет узнік з Хаоса. Спачатку Гея-зямля нарадзіла ад Кронаса Зеўса. А Зеўс — цар бессмяротных багоў і смяротных людзей.

Філосаф жа **Анаксімен**, які жыў у 585—525 гг. да н. э. сцвярджаў: «Гэты космас не створаны нікім з багоў і нікім з людзей і ў прынцыпе павінен існаваць вечна». Філосаф **Ксенафан** пісаў, што Гамер і Гесіёд узвялі на багоў тое, што робяць людзі. Багі крадуць, адзін аднаго ашукваюць. Таму Ксенафан заключае, што багоў прыдумалі людзі:

Чорнымі мысляць багоў і курносымі ўсе эфіопы,
Сінявокімі іх жа і курносымі мысляць фракійцы.

Больш таго, Ксенафан пісаў:

Калі б рукі мелі быкі ці ільвы, або коні,
Калі б пісаць яны ўмелі, як людзі, што пажадана,—
Коні каням бы багоў прыпадобілі б...
Параўнаў бы іх вонкавы выгляд кожны
З тою пародай, да якой ён і сам на зямлі
прыналежыць.

Па-навуковаму дакладна выказаўся аб гэтым Арыстоцель: «Гэтак жа, як людзі пры-

падабляюць вонкавы выгляд багоў свайму выгляду, так дакладна яны распаўсюдзілі гэта ўяўленне і на ўклад жыцця багоў» *(Арыстоцель. «Палітыка»).*

Слоўнік.

Кóсмас — грэч. *«парадак», «сусвет», «сусветны парадак».*

Забабóны — памылковая, па думцы Герадота, вера.

? **1.** Што абазначае слова «філасофія»? **2.** Што лічыў атамамі Дэмакрыт? **3.** Што сказаў Дэмакрыт пра лёс? **4.** Якім словам абазначыў Платон агульныя ўласцівасці рэчаў і прадметаў? **5.** Як Платон адносіўся да вучэння Дэмакрыта? **6.** За што прысудзілі Сакрата да смерці? **7.** Падлічыце, колькі гадоў існавалі алімпійскія гульні ў старажытнасці. **8.** Што Герадот называў забабонамі?

§ 36. Архітэктура і скульптура

1. Архітэктура і жывапіс. Вянцом афінскай архітэктуры была планіроўка і пабудова Акропаля, прыроднай скалы, умацаванай сценамі. Архітэктар **Мнесікл** пабудаваў Прапілеі — урачысты ўваход на Акропаль. Там размяшчаліся самы велічны храм багіні Афіны Парфенон, храмы Афіны Нікі («Бяскрылай Перамогі»). Ніку (статую) зрабілі бяскрылай, каб яна нікуды не ўляцела. Так думалі афіняне. На Акропалі знаходзіўся і арсенал, дзе складалі металічныя часткі і зброю ваенных караблёў. Архітэктары **Ікцін** і **Калікрат** так сканструявалі **Парфенон,** а скульптар Фідзій так упрыгожыў яго стутуямі, што велічнае беламармуровае

збудаванне на фоне яснага блакітнага неба здавалася вельмі лёгкім. Гледачы параўноўвалі храм з птушкай, гатовай да ўзлёту. З усіх бакоў яго акружалі калоны. Яны вяршыліся плітой. Па назве племя дарыйцаў такую калону прынята называць дарычнай. Калоны храма Нікі мелі ўверсе завіткі, нагадваючыя жаночую прычоску. Гэта — іанічная калона. Афіняне належалі да грэчаскага племя іанійцаў. Самай прыгожай выглядала карынфская калона, уверсе якой былі выразаны лісты расліны. Дэталі храмаў фарбаваліся. Любімымі колерамі дарычных храмаў былі сіні і чырвоны. Грэчаскі храм — жыллё багіні ці бога. Заходзіць у храм мелі права толькі жрацы. Веруючыя выконвалі ўсе абрады каля ахвяравальніка, вялікай мармуровай пліты, размешчанай перад храмам. Аднак Парфенон адыгрываў не толькі рэлігійную ролю (пакланенне Афіне), але і свецкую, грамадзянскую. У Парфеноне хавалі дзяржаўную казну. Так выкарыстоўваліся галоўныя храмы і ў іншых полісах.

Архітэктура малаазійскіх грэкаў адрознівалася ад архітэктуры Еўрапейскай Грэцыі. Гіганцкая грабніца правіцеля Карыі **Маўзола** ў Галікарнасе пабудавана ў сярэдзіне IV ст. да н. э. На высокім квадратным цокалі ўзвышалася іанічная каланада, потым ступеньчатая піраміда. На самым версе размяшчаліся статуі Маўзола і яго жонкі, якія стаялі на калясніцы з чацверыком коней.

Антычнае горадабудаўніцтва дасягнула вышынь пасля заваяванняў Аляксандра Македонскага, які заснаваў некалькі дзе-

сяткаў Александрый. Александрыя егіпецкая была сталіцай Пталемееўскай дынастыі (323—30 гг. да н. э.). Вуліцы горада перасякаліся пад прамымі вугламі з улікам напрамку халаднаватых паўночных вятроў. У горадзе пабудавалі **Музейён** — навуковую ўстанову з вялікай бібліятэкай. Вучоныя тут вывучалі мовы, астраномію, матэматыку, батаніку, заалогію. У 392 г. н. э. у час барацьбы язычнікаў і хрысціян Музейён разбурылі.

Востраў Фарос звязалі з сушай з дапамогай насыпанай дамбы. У 299—279 гг. да н. э. архітэктар Састрат пабудаваў цуда свету маяк на востраве. На вышыні 110 м палілі агонь, які быў відзен маракам за многія дзесяткі кіламетраў. У 1326 г. маяк разбурыла землетрасенне. Яго таксама лічылі адным з сямі цудаў свету, хаця па ліку ён восьмы.

Адным з цудаў свету лічыўся храм Арцеміды Эфескай у Малой Азіі. Яго будавалі 120 гадоў па праекту архітэктара Херсіхрона з Кноса. Каб храм вытрымліваў землетрасенні, яго размясцілі на балоцістай глебе. Фундамент пакоіўся на тоўстай падушцы з драўнянага вугалю і шэрсці. У будаўніцтве ўдзельнічалі ўсе малаазійскія дзяржавы. Храм пераўзышоў усе вядомыя велічнасцю і прыгажосцю. Але прастаяў усяго каля 100 гадоў. У 356 г. да н. э. жыхар Эфеса **Герастрат** падпаліў храм, каб такім злачынствам увекавечыць сваё імя. Да нашых дзён захаваўся выраз «Герастратава слава». У 333 г. да н. э. пры падыходзе арміі Аляксандра Македонскага вяліся аднаўленчыя работы на сродкі эфесцаў. Храм

заняў плошчу 110×55 м. Яго акружалі 127 васемнаццаціметровых калон у два рады. Дах пакрылі мармуровай чарапіцай. У храме знаходзілася пятнаццаціметровая статуя багіні Арцеміды. Многа скульптур і карцін выстаўлялася ў спецыяльным памяшканні. Дзяржавы і прыватныя асобы змяшчалі ў храме свае грошы і каштоўнасці, як у банку. Храм квітнеў і ў час рымскага ўладарніцтва. У 263 г. готы разграбілі храм. На месцы Артэмісіёна пабудавалі хрысціянскую царкву. Але нізкая мясцовасць паступова была пакрыта наносамі ракі Канстра.

Вядома шмат грамадскіх, свецкіх, а не рэлігійных помнікаў і збудаванняў, акрамя тэатраў. Адным з такіх памяшканняў быў Толас. Ён меў круглую форму (дыяметр 18,32 м). На фундаменце з каменных пліт узвышаліся сцены з сырцовай цэглы, пакрытай тынкоўкай. Унутры шэсць каменных калон падтрымлівалі круглы чарапічны дах. Падлога была з утрамбаванай цаглянай гліны. 50 членаў савета 500 пастаянна дзяжурылі ў Толасе. А пры неабходнасці яны там і начавалі, як у 415 г. перад адплыццём караблёў у Сіцылію. Толас быў сімвалам дэмакратычнага ладу Афін.

За гарадской сцяной знаходзілася магіла легендарнага героя **Акадзема.** У яго гонар назвалі **Акадэміяй** гай, у якім пры Кімоне стварылі адкрытыя дарожкі, пасадзілі цяністыя алеі. Расліны арашалі вадой. Пабудавалі стракаты порцік, па-грэчаску *«стою»*, ці па латыні *«галерэю»*. Гэта адкрытае з аднаго боку памяшканне з дахам на калонах. Ад сонца ўсё было захавана і аднача-

сова асвятлялася пранікальным святлом. Порцік стаў любімым месцазнаходжаннем афінян, вучоных і філосафаў. На сцяне галерэі размяшчаліся карціны. **Мікон** намаляваў бітву афінян з амазонкамі, жанчынамі-ваяўніцамі, якія жылі на берагах Азоўскага мора. Асаблівай павагай карысталася карціна «Марафонская бітва», напісаная Міконам ці вучнем Фідзія **Паненам.** Некаторыя лічаць яе аўтарам жывапісца **Палігнота.** На карціне былі намаляваны Мільціяд, Калімах, галоўнакамандуючы і герой Эхетл. Перад порцікам размяшчалася бронзавая статуя Салона.

У канцы V ст. да н. э. было пабудавана новае памяшканне для паседжанняў савета 500 — Булеўтэрый. Прамавугольнае памяшканне 22,5×17,5 м з чатырма калонамі мела праходы паміж радамі лавак. Унутры стаялі статуі Зеўса Булея (саветніка) і Афіны Булеі (саветніцы). У старым Булеўтэрыі хавалі архіў дзяржаўных папер.

У самым вялікім памяшканні *Геліэі* (суд) змяшчалася 1500 суддзяў. У IV стагоддзі да н. э. каля сцяны Геліэі быў пабудаваны вадзяны гадзіннік. На вышэйшым узроўні знаходзіўся каменны басейн з вадой, якая выцякала ў размешчаную ніжэй вертыкальную шахту. Сцяжок на паплаўку паказваў узровень вады і такім чынам вызначаў час.

З сярэдзіны VI ст. да н. э. грэкі распісвалі керамічныя вазы, якія захаваліся лепш, чым драўляныя дошкі. На цёмным фоне паверхні малявалі чырвонай краскай юнакоў-спартсменаў, майстэрні, школы і іншае. Захаваўся малюнак «Карабель Адысея, які

плыве міма вострава Сірэн». Знакамітым быў жывапісец па вазах **Эўфроній.** У V ст. да н. э. жывапісец **Апаладор** вынайшаў краску, для якой прымяняўся жаўток яйца. Яго малюнкі на сценах і драўляных дошках мелі цені, перспектыву. Пра майстра **Зеўксіса** сталі вядомы анекдот. Ён намаляваў вінаград так, што птушка прылятала яго дзяўбці.

2. Скульптура. Наватарам у скульптурным майстэрстве быў **Паліклет.** Ён стварыў статую *«Дарыфор»* («Кап'яносьбіт») і юнака з павязкай спартыўнага пераможцы (440—410 гг. да н. э.). Паліклет матэматычна вылічыў, як велічыні членаў чалавечага цела (даўжыня галавы, ступні, пальца і іншыя) суадносяцца паміж сабой і ўсёй фігурай чалавека. Паліклет вынайшаў правілы перадачы аблічча рэальнага грамадзяніна поліса, героя ці бога. Дарыфор развіты фізічна, багаты духоўна, як свабодны грамадзянін, ён гатовы пастаяць за Айчыну. Гэтаму служылі алімпійскія гульні.

Назіранні за людзьмі, жывёламі паказвалі, што яны без руху становяцца не толькі непрыгожымі, але і няздольнымі да жыцця. Філосафы выразілі гэтую думку кароткім азначэннем: рух — спосаб жыцця. Скульптар **Мірон** увасобіў гэтую думку ў статуі **«Дыскабол»** («Кідальнік дыска»). Мірон улавіў імгненне, калі дыск вылятае з рукі спартсмена. Міфы і паэты апісвалі вобразы продкаў, герояў, алімпіёнікаў, багоў і багінь. Скульптары рабілі іх фігуры з гліны, мармуру, бронзы такімі, якімі ўяўлялі ў сваіх думках.

Твар і іншыя аголеныя часткі цела рабі-

ліся з падфарбаванай слановай косці, вочы — з каляровых камянёў. Залатыя валасы, бровы, вейкі ўпрыгожвалі твар. У залатым адзенні скульптура выглядала святочнай. Спалучэнне матэрыялаў і фарбаў рабіла скульптуру натуральнай.

Стварэнне вобразаў багоў і герояў — адзін напрамак у скульптуры. Другі прысвечаны гістарычным асобам: гісторыкам Герадоту, Фукідзіду, палітычнаму дзеячу Перыклу, філосафу Сакрату і іншым. Вобразы гістарычных асоб маюць партрэтныя рысы. Нават па копіях, якія захаваліся, можна іх пазнаць. Злыя языкі людзей, якія хацелі адхіліць ад улады Перыкла, абражалі яго за тое, што ў яго была доўгая галава. Мастак сумеў скрыць гэты фізічны недахоп Перыкла. Ён падняў баявы шлем, які звычайна прыкрывае і твар, на галаву. Галава зрабілася доўгай нібыта ад шлема.

Гіпакрат даказаў, што гімнастыкай можна лячыць людзей. А спартыўныя трэніроўкі рабілі цела не толькі моцным, але і прыгажэйшым. Спорт, медыцына, мастацтва гарманічна развівалі і выхоўвалі грамадзяніна. Але карысталіся гэтым у асноўным багатыя рабаўладальнікі, якія мелі вольны час і матэрыяльныя сродкі. Большая частка грамадзян у Афінах была назіральнікамі ўсяго гэтага.

Адным з цудаў свету была статуя бога Зеўса ў Алімпіі, дзе праводзіліся Алімпійскія гульні. Скульптар Фідзій зрабіў яе з пласцінак золата і слановай косці на драўлянай аснове. Статуя размяшчалася ў храме, столь якога падымалася на вышыню 17 м. Амаль да столі даходзіла галава ста-

туі бога Зеўса, які сядзеў на троне. У правай руцэ Зеўс трымаў фігуру Нікі, у левай — жазло. Храм не меў вокан. Святло праз дзверы падала на басейн з аліўкавым алеем. Адбітае паверхняй басейна, як люстэркам, яно асвятляла фігуру бога. Паломнікі не ведалі гэтага. Здавалася, што статуя сама выпраменьвае святло. Вадкасць падтрымлівала пастаянную вільготнасць у храме, каб пласцінкі з золата і слановай косці не адваліліся ад перасохлага ці набраклага дрэва. Захаваўся толькі відарыс статуі на манетах.

У 285 г. да н. э. майстар **Харэт** з горада Лінда (в. Родас) стварыў бронзавую статую Геліяса, юнага, светазарнага і магутнага бога Сонца. На каркасе з каменю і жалеза ўмацоўваліся бронзавыя лісты. Вышыня статуі складала 37 метраў. Яна стаяла каля ўваходу ў гавань горада і адначасова служыла маяком для мараходаў.

Старажытнарымскі прамоўца Цыцэрон і красамоўца Квінтыліян (жыў у I ст. да н. э.) адводзілі Фідзію як мастаку самастойную ролю. Цыцэрон пісаў:

«Калі гэты мастак стварaў вобраз Зеўса ці Афіны, то нідзе не шукаў мадэлі, якую ён мог бы пераймаць, а ў сябе самім чэрпаў ён найбольш яркія па прыгажосці вобразы; і тое, што ён упэўнена знаходзіў у сябе, накіроўвала яго майстэрскую руку».

Квінтыліян пісаў:

«Прыгажосць яго статуі Афіны і Зеўса прыдавала навізну нават і культавым уяўленням аб іх, так дасканала мастак разумеў высакародства і велічнасць багоў».

Слоўнік.

Булеўтэ́рый — ад грэч. *«булэ»* — савет, памяшканне, дзе засядаў савет.

Тэарэ́тык — ад грэч. *«тэорыя»* — *«назіранне»*, чалавек, які распрацоўвае пытанні аб ведах людзей, абагульняе вопыт, стварае правілы.

! **1.** Якія архітэктары пабудавалі Парфенон? **2.** Якія ролі выконвалі грэчаскія храмы? **3.** Чым займаліся вучоныя ў Музейёне? **4.** Назавіце цуды свету, створаныя грэкамі. **5.** Якія якасці грамадзян паказалі аўтары скульптур «Дарыфор» і «Дыскабол»?

Роля старажытных грэкаў у развіцці сусветнай гісторыі і культуры.

У II тысячагоддзі да н. э. ранняякласавае грамадства на Крыце, у Мікенах і Піласе было падобным на грамадства Старажытнага Усходу. Яно мела зносіны з краінамі Усходу. Кноскі дварэц быў цэнтрам манархічнай дзяржавы, гэта значыць дзяржавы, якой кіраваў толькі цар. Асноўнае насельніцтва жыло родавымі абшчынамі. Абшчыннікаў прымушалі працаваць на цара і арыстакратаў. У цэнтралізаванай дзяржаўнай гаспадарцы таксама працавалі рабы. У ахейскай Грэцыі цары і арыстакраты былі ў асноўным спажыўцамі таго, што стваралі працоўныя. Таму гэтыя дзяржавы былі разбураны і заваяваны дарыйцамі.

У пачатку першага тысячагоддзя ў Грэцыі ўзнікае новая дзяржаўнасць — горад-дзяржава, поліс. Ён забяспечыў хуткае і ўсе-

баковае развіццё гаспадаркі і грамадскага жыцця. Поліс быў заснаваны на антычнай форме ўласнасці, якая спалучала прыватную ўласнасць грамадзяніна з поліснай уласнасцю ўсёй абшчыны грамадзян. Антычная ўласнасць грунтавалася на горадзе, які быў пасяленнем земляробаў, рамеснікаў і гандляроў. Большая частка насельніцтва жыла ў горадзе. Жыхары карысталіся дабротамі гарадскога жыцця і ўпарадкавання. У палітычным жыцці афіняне далі ўзор дэмакратычнага ладу. Правы і абавязкі кожнага грамадзяніна былі дакладна вызначаны.

Спарта не мела горада. Яе грамадзяне жылі ў пяці пасёлках. Дзякуючы працы ілотаў і перыёкаў, яны былі арганізаваны паваеннаму.

Цяжка знайсці якую-небудзь галіну грамадскага жыцця сучаснай Еўропы і ўсяго свету, для якой не знайшлося б узору ў старажытнасці. Архітэктар Гіпадам будаваў горад па рэгулярнаму плану. Прамыя вуліцы, кварталы, цэнтральная плошча, галоўны храм, грамадскія пабудовы, тэатр, стадыён — усё гэта было ў антычным горадзе, як і ў сучасным.

У свеце ўзоры грэчаскай культуры не толькі проста пераймаліся, але і служылі развіццю новых напрамкаў. Карынфская калона імітуецца на варотах стадыёна «Дынама» ў Мінску, упрыгожвае Палац прафсаюзаў. Тэатральныя маскі, якія ўжываліся грэчаскімі акцёрамі, цяпер упрыгожваюць фасад Беларускага тэатра імя Янкі Купалы. У канцы XIX стагоддзя невядомы беларускі аўтар выкарыстаў старажытнагрэ-

часкія вобразы ў парадыйнай паэме «Тарас на Парнасе».

Аднак поліс цікавіўся развіццём здольнасцей толькі грамадзяніна. Толькі ў гэтым сэнсе ён клапаціўся аб чалавеку. Жанчыны, дочкі і жонкі грамадзян не мелі правоў. Свабоднае насельніцтва, напрыклад метэкі ў Афінах, перыекі ў Спарце, не дапускаліся да дзяржаўных спраў. А рабы не лічыліся нават і за людзей. Гэта стрымлівала развіццё грамадства і прывяло поліс да гібелі. Незацікаўленасць рабоў у працы, без якой не магла б развівацца і культура Грэцыі, праявілася і ў дзяржаве Аляксандра Македонскага. Тым не менш супольная праца свабодных і рабоў, грамадзян і неграмадзян, забяспечыла высокі ўзровень грамадскага жыцця і гаспадаркі, матэрыяльнай культуры. *Гэта дае падставу называць сукупнасць дасягненняў ва ўсіх галінах грамадскага жыцця полісаў* ***грэчаскай цывілізацыяй.***

Як вы засвоілі гісторыю Старажытнай Грэцыі?

XVII—XV стст. да н. э. Існаванне «дварцоў» на Крыце, у Мікенах, Піласе	Раскажыце аб лабірынце ў Кносе і яго ўпрыгожаннях.
1240—1230 гг. да н. э. Траянская вайна	У якіх паэмах расказана аб Траянскай вайне і яе героях? Як адносіліся да подзвігаў яе герояў Гамер, аўтар «Вайны «жаб і мышэй», Аляксандр Македонскі? Што такое эпас і міф?
X—IX стст. да н. э. Распаўсюджанне ўдасканаленых жалезных прылад працы. Разлажэнне першабытнай абшчыны	Якія віды рамяства развіваюцца ў гэты час? Хто такія феты? Як Гамер называе багатых і знатных людзей? Каго і як ператварылі ў рабоў? Што Гамер лічыў асноўнай прычынай рабства?
VIII—VI стст. да н. э. Канчатковае ўтварэнне рабаўладальніцкай дзяржавы (поліса)	Хто працаваў у гаспадарцы Гесіёда? Хто і як станавіўся даўгавым рабом? Як адносіліся да фізічнай працы сучаснікі Гесіёда? Што, па думцы Гесіёда, было прычынай багацця і беднасці? Якія адносіны існавалі паміж арыстакратамі і абшчыннікамі? Назавіце пасяленні грэкаў у Паўночным Прычарнамор'і. Чыёй працай карысталіся спартанцы? Чаму дзяржаўны лад Спарты называюць алігархічным?

VI ст. да н. э. Стварэнне рабаўладальніцкай дэмакратыі ў Афінах	На якія чатыры разрады падзяліў Салон грамадзян Афін? Працай якіх рабоў Салон забараніў карыстацца? Якую ўласнасць прызнаваў закон Салона аб свабодзе завяшчання маёмасці? Якім чынам Пісістрат забяспечыў працай земляробаў і рамеснікаў? Які закон Клісфена абараняў дэмакратыю?
V ст. да н. э. Барацьба грэкаў супраць персідскай агрэсіі. Умацаванне дэмакратыі ў Афінах. Рост супярэчнасцей паміж Спартай і Афінамі	Назавіце галоўныя бітвы грэка-персідскіх войн. Як Фемістокл падрыхтаваў Афіны да барацьбы з персамі? Як афіняне аднесліся да паўстання ілотаў у Спарце? За што забілі Эфіяльта? Чаму перамаглі грэкі?
Другая палова V ст.— першая палова IV ст. да н. э. Росквіт поліса і яго крызіс	Калі зеўгіты атрымалі права займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады? Хто лічыўся афінскім грамадзянінам па закону Перыкла? Чаму праца рабоў разарала бяднейшых грамадзян? Чаму рабы не былі зацікаўлены ў сваёй працы? Раскажыце аб выніках Пелапанескай вайны.
Другая палова IV ст. да н. э. Стварэнне грэка-македонскай дзяржавы на Балканах і на Усходзе	У час якой вайны і які грэчаскі поліс запрасіў Македонію ўмяшацца ў грэчаскія справы? Як адносіліся да Македоніі Дэмасфен і Ісакрат? Чаму Егіпет добраахвотна прыняў Аляксандра? Дзе адбылася народная вайна суп-

раць македона-грэчаскай агрэсіі? Для чаго Аляксандр ураўняў у правах македанян, грэкаў і персаў?

V—IV стст. да н. э. Росквіт грэчаскай культуры і яе збліжэнне з культурай Усходу

Як афінская дэмакратыя ўплывала на развіццё культуры? Назавіце імёны гісторыкаў, паэтаў, архітэктараў, скульптараў і прамоўцаў. Назавіце пісьменныя творы грэкаў і помнікі культуры. Якія навуковыя адкрыцці зрабілі грэкі?

Важнейшыя падзеі гісторыі Старажытнай Грэцыі

XVII—XV стст. да н. э.	«Дварцы» на Крыце, у Мікенах, Піласе
1240—1230 гг. да н. э.	Траянская вайна
594 г. да н. э.	Рэформы Салона
508—500 гг. да н. э.	Рэформы Клісфена аб падзеле тэрыторыі на выбарчыя акругі і аб астракізме
490 г. да н. э.	Марафонская бітва
487 г. да н. э.	Закон Фемістокла аб выбранні архантаў з ліку грамадзян другога разраду
480 г. да н. э.	Бітва пры Фермапілах
457 г. да н. э.	Закон аб выбарах архантаў з ліку зеўгітаў
451 г. да н. э.	Закон Перыкла аб афінскіх грамадзянах
431—404 гг. да н. э.	Пелапанеская вайна
338 г. да н. э.	Бітва пры Херанеі
334 г. да н. э.	Пачатак паходаў Аляксандра Македонскага
323 г. да н. э.	Смерць Аляксандра Македонскага

Аддзел II. Старажытны Рым

Раздзел I. Ранні Рым

§ 37. Прыродныя ўмовы і насельніцтва Апенінскага паўвострава ў старажытнасці

1. Геаграфічнае палажэнне Апенінскага паўвострава і прыродныя ўмовы.

Паўвостраў, які на геаграфічнай карце вельмі падобны на бот, яшчэ ў старажытнасці атрымаў назву **Апенінскі.** Горны ланцуг, што праходзіць з поўначы на поўдзень праз увесь паўвостраў, называецца Апенінскія горы. Яны невысокія, са шматлікімі далінамі. І горы і даліны паўвострава багаты разнастайным раслінным і жывёльным светам. Сакавітыя травы лугоў у глыбокай старажытнасці абумовілі адзін з асноўных заняткаў насельніцтва — развядзенне буйной рагатай жывёлы, вырошчванне цялят. Гэты занятак людзей і даў другую назву паўвостраву — **Італія,** а пазней такую ж назву атрымала і краіна, якая знаходзіцца тут у сучасны момант. Гэтая краіна-паўвостраў абмываецца *Адрыятычным, Іанічным, Тырэнскім* і *Лігурыйскім* морамі. Усе яны аб'ядноўваюцца ў адну сістэму *Міжземнамор'я.*

На поўначы Апенінскі паўвостраў ад мацерыковай Еўропы адмежаваны высокімі **Альпійскімі** гарамі, у якіх здабывалі *медзь* і *золата,* а ў Апенінах — *мармур,* трывалы і прыгожы будаўнічы камень. Даволі значныя запасы *жалезный руды, волава* і *медзі* знаходзіліся ў *Этрурыі,* а на востраве *Эльба — жалеза. Паўднёвая частка паўвострава* была багата запасамі *жалеза, медзі*

і *серабра*. У вусці р. *Тыбр* знаходзіліся вялікія запасы *солі* і *гліны*, з якой рабілі разнастайны посуд і чарапіцу.

Цёплы клімат, вялікая колькасць ападкаў, урадлівая глеба — усё гэта спрыяла развіццю земляробства на ўсёй тэрыторыі паўвострава. Так прыродныя ўмовы садзейнічалі хуткаму рассяленню тут чалавека ў часы сівой даўніны.

2. Насельніцтва паўвострава. Першапачаткова гэта былі плямёны розных назваў, але ўсіх іх гісторыкі называюць *італікамі*. Сярод плямён асабліва выдзяляліся *лацінны*, якія насялялі даліну р. Тыбр, *этрускі*, якія жылі на поўнач ад лацінаў і *сабіны* — на ўсход ад іх. Гэтыя плямёны і склалі першапачаткова насельніцтва горада Рыма. Як жа ўзнік горад — сталіца будучай вялікай дзяржавы?

3. Паходжанне Рыма. Легенда лацінаў, якая захавалася да гэтага часу, апавядае, што ў VIII стагоддзі да н. э. горад заснавалі два браты — **Ромул** і **Рэм**. Хто ж яны такія?

Цар аднаго з плямёнаў лацінаў **Амулій** прагнаў свайго старэйшага брата, забіў яго сына, а блізнят пляменніцы загадаў кінуць у раку Тыбр. Усе гэтыя жудасныя ўчынкі былі зроблены ім таму, што ён баяўся наследнікаў на царскі трон.

Па волі лёсу хлапчукі не загінулі, а былі выратаваны ваўчыцай і выхаваны сям'ёй пастуха. Аднаго з хлапчукоў назвалі Ромул, а другога — Рэм. Браты выраслі дужымі і смелымі. Яны і адпомсцілі цару: забілі яго. Удзячныя свайму лёсу, браты вырашылі заснаваць горад на тым месцы, дзе былі

выратаваны. Але, закладваючы горад, браты паспрачаліся з-за назвы горада і царскага трона. У бойцы быў забіты Рэм.

Ёсць і другі варыянт легенды: Рэм смеючыся пераскочыў лінію будучай сцяны горада. Разгневаны гэтым Ромул забіў яго. Такім чынам Ромул адзін стаў царом і горад быў названы яго імем — Рома (Рым). Удзячныя рымляне ў гонар заснавальніка паставілі бронзавую статую: ваўчыцу з хлапчукамі-блізнятамі. Статуя захоўваецца ў цэнтральным музеі Рыма.

Гэтую гісторыю горада Рыма апісаў старажытны рымскі гісторык **Ціт Лівій** (гл. с. 240—241).

Навука гісторыя прызнае, што Рым быў заснаваны на *Палацінскім узгорку*. З павелічэннем колькасці жыхароў горад пашыраўся і з цягам часу заняў сем узгоркаў. *«Горад на сямі ўзгорках»* — так інакш называлі і называюць Рым. Яшчэ яго называюць — *Вечны Горад*.

Чаму менавіта на ўзгорках вырас вялікі горад? Узгоркі ў тыя часы былі вельмі зручныя для абароны ад ворагаў. На беразе суднаходнай ракі Тыбр, непадалёку ад упадзення ў мора, было зручнае і бяспечнае месца. Зручнае таму, што рака і блізкае мора памагалі развіццю гандлю і звязвалі горад з іншымі краінамі Усходу і Грэцыяй. Ды і марскія разбойнікі (піраты) не маглі раптоўна напасці на горад.

Навука археалогія прыйшла на дапамогу вучоным у вызначэнні часу заснавання Рыма. Ён значна старэйшы, чым тлумачыць легенда аб яго заснавальніках *Ромуле* і *Рэме*. Раскопкі археолагаў па-

казалі, што першыя паселішчы на месцы будучага горада паявіліся каля паўтары тысячы гадоў да н. э. Пазней узвышшы засяляліся, збліжаліся пасяленні адно з другім і зліліся ў адно буйное паселішча, абнесенае сцяной. Вучоныя мяркуюць, што такое буйное паселішча было ўжо ў **VIII ст. да н. э.** Гэта якраз той перыяд, пра які гаворыцца ў легендзе аб заснавальніках горада. Рымскія вучоныя змаглі нават вылічыць дату заснавання горада — **21 красавіка 753 года да н. э.** Ад гэтай даты рымляне вялі летазлічэнне.

Слоўнік.

Апенінскі — ад кельцкага слова *«пэн»* — узгорак, узвышша, вяршыня.

Італія — лацінскае слова ад *«віталія, вітулюс»* — цяля, бычок.

? **1.** Чаму паўвостраў называецца Апенінскі? Італія? **2.** Параўнайце прыродныя ўмовы Апенінскага паўвострава з Балканскім паўвостравам Старажытнай Грэцыі. **3.** Як называлі насельніцтва Апенінскага паўвострава? **4.** Калі ўзнік горад Рым? **5.** Чаму Рым быў заснаваны на ўзгорках і недалёка ад мора?

Прырода старажытнай Італіі. (Страбон. *Геаграфія, II, 5, 27; IV, 1, 1)*

Страбон (каля 64—63 г. да н. э. — каля 20 г. н. э.), грэчаскі географ і гісторык, многа вандраваў, неаднаразова бываў у Італіі і апісаў яе прыроду і многія помнікі. Яго праца «Геаграфія» ў 17 кнігах захавалася амаль поўнасцю.

Цяпер абазначым самыя важныя ўмовы, дзякуючы якім рымляне пазней падняліся на такую вышыню. **Першая** з гэтых умоў заключаецца ў

тым, што *Італія,* накшталт вострава, акружана, як надзейнаю агароджаю, морамі, за выключэннем толькі нямногіх частак, якія ў сваю чаргу ахоўваюцца цяжкапраходнымі гарамі. **Другая** ўмова — тое, што хаця большая частка яе берагоў не мае гаваней, затое існуючыя гавані вялізныя і вельмі зручныя... **Па-трэцяе,** Італія размешчана ў розных кліматычных умовах, адносна якіх там маюцца разнастайныя жывёльныя, раслінныя і ўвогуле ўсе неабходныя для чалавека прадметы. У даўжыню *Італія* цягнецца большай часткаю ад поўначы на поўдзень; значная па даўжыні і шырыні *Сіцылія* далучаецца да *Італіі* як яе частка... Амаль па ўсёй яе даўжыні цягнуцца *Апенінскія горы,* якія па абодва бакі маюць раўніны і ўрадлівыя ўзвышшы, так што няма такой часткі *Італіі,* на долю якой не прыпадалі б зручнасці гор і раўнін. Да ўсяго гэтага трэба прыбавіць вялікія памеры і вялікую колькасць *рэк* і *азёр,* а таксама ў многіх месцах *цёплыя* і *халодныя* крыніцы, якія спрыяльныя для здароўя. Акрамя таго, знаходзіцца вялікая колькасць усякіх *металаў, будаўнічага матэрыялу, харчу* для чалавека і для хатняй жывёлы, так што нельга выказаць словамі ўсяго дастатку і высокіх якасцей *пладоў,* якія тут растуць...

● Назавіце важнейшыя ўмовы, якія садзейнічалі хуткаму развіццю гаспадаркі рымлян.

Легенда аб узнікненні Рыма. (Ціт Лівій. *Рымская гісторыя ад заснавання горада, I, 3—7)*

Ціт Лівій (59 г. да н. э. — 17 г. н. э.) — знакаміты рымскі гісторык, праславіўся сваёй працай «Рымская гісторыя ад заснавання горада» ў 142 кнігах. Да нашага часу ўсе кнігі не захаваліся, толькі 35 кніг дайшло поўнасцю, ад астатніх засталіся толькі рэшткі.

«...дзяцей было прыказана выкінуць у раку. Але па волі лёсу Тыбр выступіў з берагоў і разліўся,

так што нідзе нельга было падысці да яго сапраўднага русла і тыя, хто прынёс хлапчукоў, былі ўпэўнены, што немаўляты загінуць, хоць бы і ў ціхай вадзе затокі. Выканаўшы царскае даручэнне, яны пакінулі дзяцей у бліжэйшай затоцы. Але, калі вада спала, пакінутыя начоўкі з хлапчукамі аказаліся на сухім месцы. Ваўчыца, якая спускалася з навакольных гор на вадапой, направілася на плач дзяцей. Яна накарміла іх сваім малаком і ласкава аблізала іх. Потым дзяцей знайшоў царскі пастух і аддаў на выхаванне жонцы...

...хлопчыкі выраслі... *Ромул* і *Рэм* пажадалі залажыць горад у тым месцы, дзе яны былі выратаваны... Але паміж братамі ўзнікла сварка, у час якой быў забіты Рэм. Больш распаўсюджана, аднак, паданне, што Рэм, смеючыся над братам, пераскочыў праз новыя гарадскія сцены: разгневаны гэтым Ромул забіў яго, крыкнуўшы: «Так будзе з кожным, хто пераскочыць мае сцены». Такім чынам, Ромул адзін завалодаў царствам, а новы горад быў названы імем яго заснавальніка (Рома)».

● Чаму горад Рым атрымаў такую назву?

§ 38. Царскі перыяд у гісторыі Рыма

1. Ад першабытнай да суседскай абшчыны. У выніку *ўдасканалення прылад працы, добрых умоў для развіцця жывёлагадоўлі і земляробства паступова рода-племянная арганізацыя распадалася.* З роду выдзяляліся асобныя **сем'і (фаміліі)**, якія вялі сваю гаспадарку на выдзеленым абшчынай *ворным полі. Ворнае поле праз два гады па жэрабю падлягала перадзелу.* За два гады яно поўнасцю апрацоўвалася, таму што частка поля была пад папа́рам. *Ворнае поле было ўласнасцю абшчыны, а ўладаль-*

нікамі яго былі асобныя сем'і. У агульным карыстанні заставаліся *сенажаць, лес, воды, выган для жывёлы.*

Першабытная абшчына, якая распалася на сем'і, з цягам часу перастала існаваць і яе месца заняла *тэрытарыяльная суседская абшчына.* Хаця *кроўна-сваяцкія (радавыя)* інтарэсы былі яшчэ моцныя, але прыналежнасць да зямлі (тэрыторыі, акругі) паступова разбуралі іх, рабілі іх нетрывалымі. Сем'і былі вялікія, у іх складзе было некалькі пакаленняў: дзяды, бацькі, дзеці, унукі і праўнукі. Гаспадар **(па́тэр)** такой сям'і займаў галоўную ролю. Такія сем'і, на чале якіх стаяў патэр, атрымалі назву *патрыцыянскіх,* а іх члены іменаваліся *патры́цыямі.* **Патрыцыі** былі гаспадарамі зямлі і валодалі ўсімі палітычнымі правамі ў грамадстве.

Частка насельніцтва Рыма, якая паходзіла з пакораных плямёнаў, заваёваных тэрыторый ці перасялілася ў горад з іншых месц, называлася *пле́бсам.* **Плебе́і** не былі членамі радавой арганізацыі Рыма, таму яны не мелі права на надзел зямлі з абшчыннага поля. Між тым плебеі плацілі падаткі і служылі ў войску. Некаторыя з іх былі нават багатымі. *Плебеі займаліся рамяством, гандлем,* некаторыя з іх мелі невялікія ўчасткі ўласнай зямлі, прыдбанай рознымі спосабамі. У выніку развіцця гаспадаркі, а таксама іншай працоўнай дзейнасці адны багацелі, а другія бяднелі. У межах царскай эпохі няроўнасць у грамадстве з цягам часу паглыблялася.

2. Патрыярхальнае рабства. Асноўным заняткам рымлян была не толькі працоўная

дзейнасць, але і вайна. Шматлікія войны вяліся за багацце, тэрыторыю і насельніцтва, якое часткова перасялялася ў Рым. Войны давалі новыя землі і палонных. Вядома, што ў першабытным грамадстве палонных забівалі, з яго ж разлажэннем і пераходам на больш высокую ступень развіцця *нявольнікаў ператваралі ў рабоў* і часткова іх выкарыстоўвалі ў працы. Рабы ў Рыме лічыліся членамі сям'і, яны разам з гаспадаром працавалі і адпачывалі, нават елі за адным сталом. Праца і для гаспадара (патэра) не была яшчэ ганьбай. Таму такое рабства ў Рыме называлася *патрыярха́льным.*

Асновай багацця рымлян была зямля і рабы, а з багаццем рос і аўтарытэт сям'і. Гаспадары такіх сем'яў выбіраліся ў **сенат** і былі членамі *Народных сходаў. Народны сход* складаўся толькі з мужчын-воінаў.

Цар, сенат і Народны сход — галоўныя органы ўлады старажытнейшага Рыма.

3. Устанаўленне Рэспублікі. Рымскія цары ў выніку пастаянных войнаў далучылі да Рыма частку суседніх плямёнаў: *сабінаў, лацінаў* і *этрускаў.* Нават некалькі цароў, выхадцаў з *Этрурыі,* правілі Рымам. Адзін з іх, *Тарквініій Горды,* зусім не лічыўся з народам, а з асаблівай жорсткасцю бясчынствав, за што быў выгнаны з горада яго ж жыхарамі. Гэта было ў **510 (509) г. да н. э.** Такім чынам была знішчана царская ўлада. Замест цара выбіралі на адзін год двух **консулаў.**

Консулы кіравалі Рымам, *у час вайны яны былі галоўнакамандуючымі арміяй, а ў мірны час — суддзямі. Сенат* быў на-

дзелены вялікай уладай. Консулы раіліся з ім па ўсіх пытаннях. Казной таксама распараджаўся сенат, ён жа вырашаў пытанні вайны і міру. Усе падрыхтаваныя рашэнні сенат прапаноўваў Народнаму сходу на абмеркаванне і зацвярджэнне.

Так рымскае грамадства ад першабытна-абшчыннага ладу паступова пераходзіла да грамадства класавага, асновай якога ўсталёўвалася прыватная ўласнасць, ці ад царскага этапу да этапу больш развітога — **Рэспублікі.**

Слоўнік.

Фамілія — лацінскае слова — сям'я.

Патрыцыі — ад лацінскага слова — патэр, бацька.

Плебеі, плебс — лацінскае слова — народная маса, просты народ.

Сенат — ад лацінскага слова — стары; савет старэйшын, дзяржаўны Савет Рыма.

Рэспубліка — ад лацінскіх слоў, *рэс* — справа, *публіка* — народ. Улада народа.

? **1.** У выніку чаго праходзіў працэс разлажэння першабытнай абшчыны? **2.** Як ішоў працэс станаўлення тэрытарыяльнай, суседскай абшчыны? **3.** Хто такія патрыцыі? Плебеі? **4.** Што такое патрыярхальнае рабства?

Патрыцыі і плебеі. Цар. (Ціт Лівій. *Рымская гісторыя ад заснавання горада. I, 7)*

«Бацькамі» яны былі названы, безумоўна, з нагоды пашаны, якой карысталіся, дзеці іх атрымалі назву *«патрыцыі»*.

(Дыянісій Галікарнаскі. *Рымскія старажытнасці. II, 9—10, 14, 74) Дыянісій Галікарнаскі* — грэчаскі гісторык, сучаснік Ціта Лівія, напісаў працу «Рым-

скія старажытнасці». Яна складаецца з 20 кніг, захаваліся першыя 10, астатнія вядомы ў фрагментах.

«...Ромул аддзяліў ніжэйшых ад вышэйшых, даў законы і ўстанавіў, што каму з іх належыць рабіць: *патрыцыям* — выконваць службовыя пасады і жрэцкія, *плебеям* — апрацоўваць зямлю, карміць скаціну і займацца даходнымі рамёствамі...

Ромул даў *цару* такія правы: каб ён узначальваў свяшчэнныя дзеянні і ахвярапрынашэнні, каб захоўваў законы і норавы бацькоў, больш цяжкія праступкі разбіраў сам, а больш лёгкія даручаў сенату; збіраў сенат і склікаў народ і меў вышэйшую ўладу ў час вайны. *Сходу сената* ён даў такую ўладу, каб ён абмяркоўваў і падаваў галасы па ўсякай справе, якую яму даручыць цар. *Народу* ж ён прадставіў гэтыя тры правы: выбіраць на службовыя пасады, захоўваць законы і вырашаць аб вайне...»

● **1.** Што павінны рабіць плебеі па ўказанню цара? **2.** Якія паўномоцтвы сената? **3.** Якія правы народа?

Рым пры першых царах. *(Паводле апавядання гісторыка М. Б. Рабіновіча)*

...пры адным з рымскіх цароў пачалася вайна Рыма з горадам Альба-Лонгай.

Калі дзве варожыя арміі стаялі адна супраць другой, альбанскі правадыр прапанаваў вырашыць вайну адзінаборствам і тым пазбегнуць агульнага кровапраліцця.

«Хай найбольш дастойныя альбанцы і рымляне,— сказаў ён,— схопяцца паміж сабою. Іх паядынак вырашыць, каму падпарадкавацца, а каму ўладарнічаць».

Рымляне згадзіліся і выставілі трох братоў-блізнюкоў Гарацыяў. У войску ворага таксама выявілася трое братоў-блізнюкоў, аднаго ўзросту

з Гарацыямі. Гэта былі браты Курыа́цыі.

Па дадзенаму знаку юнакі агалілі мячы і кінуліся адны на другіх. З напружанай увагай войскі абодвух бакоў глядзелі за паядынкам... Пераможцамі аказаліся рымляне Гарацыі. Альбанцы, згодна ўмове, падпарадкаваліся ўладзе рымлян.

Горда паперадзе войска вяртаўся ў Рым пераможац Гарацый. Ён з урачыстасцю нёс свае баявыя даспехі і трафеі: зброю і адзенне трох Курыацыяў. У варотах горада яго вітаў натоўп рымлян. Сярод натоўпу знаходзілася і родная сястра Гарацыя. Яна з трывогай чакала брата. Яе хваляванне зразумела: яна была не толькі сястрою Гарацыяў, двое з якіх толькі што загінулі на полі бітвы, але і нявестай аднаго з братоў Курыацыяў.

Убачыўшы сярод трафеяў брата адзенне свайго жаніха, яна зразумела, што яго няма ў жывых. Распусціўшы валасы і ломячы рукі, яна стала моцна плакаць, паўтараючы імя свайго каханага. Гэта абурыла яе суровага брата. Гарацый стаў папракаць сястру, але тая прадаўжала рыдаць. Тады Гарацый у гневе пракалоў яе мячом, яшчэ не высахшым ад крыві пераможаных ім ворагаў. «Ідзі да свайго жаніха,— крыкнуў ён,— ты забыла забітых братоў, забыла сваю радзіму (бацькаўшчыну). Так будзе з кожным рымлянінам, які стане аплакваць ворага!»

За забойства сястры, па закону, Гарацый быў прыгавораны да пакарання смерцю... Але Гарацый звярнуўся да народа, за якім было апошняе слова. Бацька Гарацыя выступіў у абарону сына. «Мая дачка,— сказаў ён,— забылася пра радзіму, якую выратаваў яе брат. Каб гэта не зрабіў сын, я сам забіў бы яе...»

Не здзіўляйцеся, што бацька Гарацыя гаварыў так. Ён жа галава сям'і, а ў рымскай сям'і ўлада бацькі не мела абмежаванняў. Сям'я складалася

з некалькіх дзесяткаў (а то і болей) чалавек... Над усімі ўладарыў бацька сямейства. Ён меў права прадаць сваіх дзяцей у рабства і нават пакараць іх смерцю. Таму, калі б бацька сам забіў сваю дачку, то за гэта ніхто не мог бы асудзіць яго. Ён выкарыстаў бы сваё законнае права.

Народны сход апраўдаў Гарацыя, зброя якога толькі што выратавала горад ад рабства і дала перамогу над ворагам... Народны сход мог адмяніць смяротны прыгавор, вынесены рымскаму грамадзяніну. Народны сход прымаў альбо адхіляў законы, выбіраў асоб на вышэйшыя пасады, у тым ліку цара (рэкса), галоўнага правіцеля Рыма.

Цар у Старажытным Рыме насіў адзенне, якое адрознівала яго ад іншых: чырвоны высокі абутак, чырвоны плашч. Перад ім ішлі дванаццаць ліктараў-целаахоўнікаў. Ён сядзеў на асобым крэсле — троне. І ўсё ж гэта не быў сапраўдны самадзяржаўны ўладар, якімі былі ўсходнія дэспаты.

Улада цара не атрымлівалася ў спадчыну. Цар выбіраўся Народным сходам, які складаўся з мужчын-воінаў. Народны сход выбіраў племяннога важака, які станавіўся военачальнікам, жрацом і суддзёй...

● **1.** Якія правы былі ў Народнага сходу? **2.** Чым адрозніваўся цар Рыма ад усходніх цароў?

Раздзел II. Рымская рэспубліка

§ 39. Быць грамадзянінам Рэспублікі

1. Грамадзяне Рэспублікі. Рымскае грамадства эпохі Рэспублікі не было аднародным па свайму саставу. У яго ўваходзілі **групы** людзей, ці **класы**: *патрыцыі, плебеі* і *рабы;*

або *рабаўладальнікі, свабодныя вытворцы* і *рабы.* Усе яны адрозніваліся не толькі наяўнасцю ці адсутнасцю ўласнасці, але і юрыдычнымі правамі.

З канца IV стагоддзя да н. э. было забаронена ператвараць у рабоў за даўгі рымскіх грамадзян. Рабамі з гэтага часу ў асноўным былі ваеннапалонныя, таму ваяўнічасць Рымскай дзяржавы яшчэ больш узрасла. *Рабы ніякімі правамі не карысталіся.*

Паўната ўлады была ў патрыцыяў. Плебеі карысталіся меншымі правамі, нават большасць з іх была пазбаўлена грамадзянскіх правоў, таму што яны не былі карэннымі жыхарамі Рыма. Плебеі — юрыдычна свабодныя людзі, апрацоўвалі невялікія ўчасткі зямлі. Беззямельныя займаліся рамяством і гандлем. Многія з іх мелі рабоў.

2. Барацьба плебеяў з патрыцыямі. Плебеі пастаянна вялі барацьбу з патрыцыямі за раўнапраўе ў палітычных правах: яны патрабавалі не толькі права выбіраць у **магістра́ты,** але і права быць выбранымі. Такое права — быць выбранымі ў дзяржаўныя органы ўлады — вызначалася ўласнасцю, і перш за ўсё, уласнасцю на зямлю. Барацьба за зямлю, якую плебеі хацелі атрымаць з дзяржаўнага фонду, была асновай палітычнай барацьбы за ўладу.

Шматгадовая барацьба за раўнапраўе плебеяў з патрыцыямі ўвянчалася поспехам: плебеі дабіліся права штогод выбіраць сваіх абаронцаў — народных **трыбу́наў.** Трыбун меў вялікія паўнамоцтвы: нала-

жыць **вéта** на распараджэнне сената ці консула адносна плебеяў. У доме народнага трыбуна заўсёды былі адчынены дзверы, дзякуючы чаму плебеі ў любы момант маглі знайсці ў яго абарону сваёй асобы ці правоў.

Плебеі ў барацьбе з патрыцыямі *атрымалі права выбіраць консулаў, уступаць у шлюб з патрыцыямі, выбіраць жрацоў, часткова атрымалі зямлю на абшчынным полі.* З цягам часу плебеі сталі *паўнапраўнымі грамадзянамі Рыма,* але яны, дабіўшыся ўраўнення ў палітычных правах з патрыцыямі, яшчэ доўга *вялі барацьбу за права карыстацца зямлёй з дзяржаўнага поля.*

3. Рымскія грамадзяне і ганаровая служба. *У Рымскай Рэспубліцы кожны грамадзянін мог удзельнічаць у выбарах і быць выбраным ва ўсе дзяржаўныя органы.* Але за пасаду, нават самую высокую, нічога не плацілі. Любая дзяржаўная пасада — гэта гонар. Прадстаўнікі ўсіх дзяржаўных пасад выконвалі абавязкі бясплатна, прычым з вялікай адказнасцю. Часта прадстаўнікі вышэйшых органаў улады — консулы, сенатары і іншыя — нават аддавалі свае немалыя грошы на арганізацыю грамадскіх відовішчаў, будаўніцтва дарог, мастоў, тэатраў, цыркаў.

Ганаровая служба дзяржаве, а гэта значыць і ўсяму грамадству, была ідэалам кожнага грамадзяніна, але яна была для многіх недаступнай: жыццё патрабавала сродкаў існавання. *Толькі заможныя людзі маглі быць выбранымі ў магістраты.* Знявага службовых асоб дзяржаўных органаў

сурова каралася рымскімі законамі, таму што разглядалася як знявага Рымскай дзяржавы.

4. Рымскае войска. *Вялікім гонарам у Рымскай Рэспубліцы была служба ў арміі.* Дасягнуць дабрабыту ў жыцці і павагі ў грамадстве было магчыма толькі дзякуючы вайсковай службе. У дзяржаўныя органы ўлады выбіралі толькі тых, хто адслужыў пэўны тэрмін у войску. Армія камплектавалася толькі з тых юнакоў, сем'і якіх мелі вызначаную ў грошах пэўную маёмасць. Такая мера была ўведзена таму, што воін поўнасцю павінен сябе забяспечыць зброяй, а кавалерысты, акрамя таго, і канём са збруяй. Служба ў арміі працягвалася з 17- да 50-гадовага ўзросту.

Беднякам не дазвалялася служба ў пяхоце і конніцы, яны маглі служыць толькі ў флоце, воіны якога былі на поўным дзяржаўным утрыманні. Служба ў флоце для рымляніна была нават знявагай.

Усё рымскае войска падзялялася на **легіёны**, у кожным было па 4,5 тысячы (да 6 тыс.) воінаў. Легіён падраздзяляўся на невялікія атрады і мог весці бой на любой мясцовасці. У легіён уваходзіла *лёгкаўзброеная і цяжкаўзброеная пахота*, а таксама *конніца*.

Суровая дысцыпліна, фізічная загартоўка воінаў рабілі непераможнай рымскую армію. Такая баяздольная армія невялікай дзяржавы-горада садзейнічала расшырэнню тэрыторыі, а Рым станавіўся на чале другіх плямёнаў Італіі.

Слоўнік.

Магістра́т — лацінскае слова — начальнік, кіраўнік; дзяржаўны орган улады.

Трыбу́н — народны заступнік; абаронца плебеяў.

Ве́та — лацінскае слова — забараняю.

Легіён — лацінскае слова — баявая адзінка рымскай арміі.

? **1.** Якія групы (класы) склалі рымскае грамадства? **2.** Чаму ў Рыме была пастаянная барацьба паміж плебеямі і патрыцыямі? **3.** Якой уладай валодаў народны трыбун? **4.** Што азначае ганаровая служба магістрата? **5.** Хто мог служыць у рымскай сухапутнай арміі? у флоце?

Узнікненне плебейскага трыбуната. *(Ціт Лівій. Рымская гісторыя ад заснавання горада.* II, 23—24, 32—33)

«Плебеі, узрушаныя бясчынствам патрыцыяў, пакінулі Рым і пайшлі на Свяшчэнную гару (недалёка ад горада); тут ...узмацніўшы лагер валам і рвом, узяўшы толькі неабходнае для пражыцця, яны трымаліся некалькі дзён спакойна... У горадзе распаўсюдзілася моцная паніка, і ўзаемны страх трымаў усіх у напружаным становішчы... Што будзе далей, калі тым часам распачнецца якая-небудзь знешняя вайна? Тут, безумоўна, застаецца надзея толькі на згоду грамадзян! Праўдай ці няпраўдай, але яе трэба аднавіць у дзяржаве! З гэтай нагоды было вырашана адправіць да плебеяў пасрэдніка Мяненія Агрыпу, чалавека, які валодаў дарам слова, прыемнага плебеям, з асяроддзя якіх ён сам паходзіў...

Затым пачаліся перагаворы аб прымірэнні і дадзена была згода на выстаўленую плебеямі ўмову, каб у іх былі свае недатыкальныя магі-

страты, якія мелі б права аказваць дапамогу супраць консулаў, і каб ніхто з патрыцыяў не мог займаць гэтую пасаду. Такім чынам, былі выбраны два народныя трыбуны... і быў прыняты закон аб недатыкальнасці іх».

● Чаму плебеі пакінулі Рым і чаго яны дабіліся сваім выхадам з горада?

Арганізацыя рымскага войска. (Палібій. *Усеагульная гісторыя,* IV, 19—42)

Палібій (каля 201—120 гг. да н. э.) — грэчаскі гісторык, доўгі час жыў у Рыме, напісаў «Усеагульную гісторыю» у 40 кнігах, многія з якіх не захаваліся. Сведкай многіх падзей ён быў сам і яскрава апісаў іх.

...Калі ў вызначаны дзень навабранцы збяруцца, самых маладых з іх трыбуны залічваюць у лёгкаўзброеныя, наступныя за імі — у так называемыя гастаты (капейшчыкі), людзі найбольш квітнеючага ўзросту — у прынцыпсы (галоўныя воіны, цяжкаўзброеныя), а старэйшых — у трыарыі (цяжкаўзброеныя воіны другой лініі, пасля прынцыпсаў). Такія ў рымлян і ў такой колькасці дзяленні кожнага легіёна (баявой адзінкі арміі, у яго ўваходзіла 3000 цяжкаўзброеных і 1200 лёгкаўзброеных воінаў)...

Самым маладым з салдат трыбуны загадваюць узбройвацца мячом, дроцікам і лёгкім шчытом. Шчыт моцна збіты і для абароны дастаткова вялікі. На від ён круглы... Лёгкаўзброеныя, акрамя таго, носяць на галаве гладкую шапку, падчас воўчую скуру, як для прыкрыцця галавы, так і для таго, каб даць асобным начальнікам магчымасць адрозніць па гэтаму знаку мужных у бітвах ад нядбайных...

Воіны другога ўзросту, так называемыя гастаты былі ўзброены: шчытом, мячом з трывалым

клінком, двума кідальнымі коп'ямі; носяць яшчэ панажы і нагруднікі. Багацейшыя замест нагрудніка да даспехаў прыбаўляюць кальчугу. Аналагічна узброены прынцыпсы і трыарыі...

...Баязлівасцю і ганьбай для салдата з'яўляюцца вось якія праступкі: калі хто дзеля атрымання адзнакі несправядліва прыпіша сабе перад трыбунамі доблесны паступак: калі хто па баязлівасці пакіне пост, на які ён пастаўлены, ці таксама па баязлівасці кіне якую-небудзь зброю ў запале бітвы. Вось чаму іншыя салдаты, стоячы на пасту, асуджваюць сябе на верную смерць і нават пры мнагалікім ворагу не пакідаюць свае пасты з-за страху пакарання, якое чакае іх пасля вяртання з поля бітвы. Другія, хто згубіў у баі шчыт ці меч, альбо якую-небудзь іншую зброю, кідаюцца, як апантаныя, у рады ворага альбо ў надзеі прыдбаць згубленае, альбо ў свядомасці, што толькі смерць можа пазбавіць іх ад непазбежнай ганьбы і зняваг сваіх жа таварышаў.

● **1.** Якая зброя была ў воінаў лёгкай пяхоты? **2.** Якая зброя была ў воінаў цяжкай пяхоты? **3.** Якія паступкі для воіна былі самымі ганебнымі?

§ 40. Рым — уладар Міжземнамор'я

1. Рымляне — гаспадары Італіі. У выніку войнаў Рым значна расшырыў сваю тэрыторыю і колькасна павялічыў насельніцтва. Даволі дасканалая армія ажыццяўляла лозунг урада *«раздзяляй і ўладарнічай!»*. Сутнасць гэтых слоў — сеяць разлады сярод італікаў, пазбаўляць адзінства розныя плямёны. Такое становішча спрыяла параўнаўча лёгкай перамозе ў войнах з італікамі. У пераможаных рымляне адбіралі

большую частку ворнай зямлі і пашы. Такія землі паступалі ў дзяржаўны фонд, а часткова захопліваліся багатымі арыстакратамі-рабаўладальнікамі. Львіная доля зямель адводзілася для заснавання калоній — паселішчаў рымскіх грамадзян.

За некалькі дзесяцігоддзяў рымляне пакарылі і далучылі да сваіх уладанняў большасць італійскіх плямён. Але асабліва жорсткай была барацьба ў паўднёвай Італіі. Там грэчаскія гарады звярнуліся за знешняй дапамогай: запрасілі *цара Піра — сваяка Аляксандра Македонскага*. Пір таксама марыў аб стварэнні сусветнай дзяржавы і ахвотна згадзіўся на дапамогу ў вайне з Рымам. Прыбыўшы з вялікай арміяй і баявымі сланамі, Пір дабіўся значных перамог. Але адна з перамог каштавала яму большай паловы яго арміі, яна ў гісторыі атрымала назву *«Пірава перамога»* — раўназначна паражэнню.

Рымляне не палі духам, прызвалі ў легіёны столькі свежай сілы, што змаглі атрымаць перамогу над варожай арміяй. З разгромам Піра і грэкаў Рым стаў уладаром усёй Італіі. Толькі вузкі праліў аддзяляў уладанні Рыма ад багатага вострава Сіцылія.

2. Становішча ў Заходнім Міжземнамор'і. Сіцылію ў старажытнасці называлі *«жытніцай»*. Не абдзелены быў востраў і добрымі бухтамі, якія былі прыстасаваны пад прыстані. Усё садзейнічала развіццю марскога транспарту і гандлю. Стаўшы гаспадаром усёй Італіі, Рым выношваў планы далучэння Сіцыліі да сваіх уладанняў. Але на востраве ўжо была моцная самастойная

дзяржава *Сіракузы,* астатняя тэрыторыя была захоплена *Карфагенам.*

Магутная дзяржава Карфаген на паўночным беразе Афрыкі захапіла амаль усе тэрыторыі Міжземнамор'я. *Каварныя планы Рыма займецъ багатыя землі Сіцыліі і выйсці ў Міжземнае мора не маглі не сутыкнуцца з інтарэсамі Карфагена.* Спрэчка, якая ўзнікла паміж дзвюма моцнымі рабаўладальніцкімі дзяржавамі, магла быць вырашана ў тыя часы толькі вайной. **3. Барацьба Рыма з Карфагенам.** Вайна ўзнікла ў **264 г. да н. э.** Яна атрымала назву **Пунічнай,** таму што рымляне *карфагенян* называлі *пунійцамі.* Вайна працягвалася з перапынкамі **118 гадоў** і закончылася толькі ў **146 г. да н. э.** *Вайна падраздзяляецца на тры вайны ці перыяды.*

У выніку пераможнай для рымлян першай вайны былі атрыманы астравы *Сіцылія, Сардынія, Корсіка.* Гэта былі першыя заморскія землі, **правінцыі** Рыма. Але Карфаген хутка ўзнавіў свае сілы і магутнасць, а страты астравоў кампенсаваў захватам зямель і плямёнаў *Пірэнейскага* паўвострава. Гэта і прывяло да наступнай вайны, якая ўвайшла ў гісторыю як *другая Пунічная, ці Ганібалава вайна.* **Ганібал** — палкаводзец пунійцаў, яшчэ ў дзяцінстве даў клятву быць вечным ворагам Рыма. Гэтай клятве ён застаўся верны да канца свайго жыцця. Да нашага часу захаваўся крылаты выраз *«Ганібалава клятва»,* што азначае быць верным сваёй ідэі, мэце ўсё жыццё.

Нечакана для рымлян Ганібал павёў сваю армію з Пірэнейскага паўвострава сухапутным шляхам цераз горы *Альпы.*

Гэты шлях, вельмі цяжкі і складаны, выбраны быў менавіта ў паўночную Італію таму, што там жылі галы — ворагі Рыма. Яны і сталі надзейнымі саюзнікамі Ганібала ў вайне з Рымам. Некалькі сутычак з рымскімі легіёнамі прынеслі перамогу карфагенянам. З узнятым натхненнем Ганібал з арміяй прайшоў усю Італію і дасягнуў яе паўднёвай часткі. Тут каля невялікага горада **Каны** адбылася буйнейшая ў старажытнасці бітва. Рымляне з вялікімі стратамі былі разбіты.

Не атрымліваючы падтрымкі з Карфагена, Ганібал, ваюючы на чужой тэрыторыі, не меў падтрымкі і ў насельніцтва, таму што ён заваёўнік. Рымскі ўрад у сваю чаргу зрабіў шэраг захадаў, каб павялічыць колькасна і палепшыць якасна сваю армію. Гэтыя мерапрыемствы прынеслі станоўчыя вынікі: армія рымлян пачала атрымліваць перамогу ў бітвах з пунійцамі.

Рымская армія пад камандаваннем палкаводца Сцыпіёна атрымала канчатковую перамогу над карфагенскай арміяй на чале з Ганібалам **у 202 г. да н. э.** на тэрыторыі Афрыкі. **У 201 г. быў падпісаны мір,** умовы якога былі вельмі цяжкімі для Карфагена: *пунійцам забаранялася ваяваць без дазволу Рыма, усе ўладанні Карфагена пераходзілі да Рыма, пунійцы павінны былі выплаціць вялікую кантрыбуцыю.* З гэтай нагоды ў Рыме святкавалі раскошны **трыумф.** Пераможац **Ганібала Сцыпіён** атрымаў прозвішча *«Афрыканскі»*.

Так скончылася *Ганібалава вайна,* якая *канчаткова ўстанавіла ўладарніцтва рымлян ў Заходнім Міжземнамор'і.*

4. Рымляне — гаспадары ўсяго Міжземнамор'я. Карфаген, дзякуючы мудраму кіраўніцтву Ганібала, які стаў на чале *ўрада*, вельмі хутка ўзнавіў сваю магутнасць. Ненавісны рымлянам горад выклікаў у іх зайздрасць і знявагу. Арыстакраты-рабаўладальнікі патрабавалі аднаго: *знішчыць Карфаген*. Сенатар *Катон* заўсёды пачынаў і заканчваў свае прамовы заклікам: *«Карфаген павінен быць разбураны!»*

Шматлікае рымскае войска ў **149 г. да н. э.** высадзілася на ўзбярэжжы Афрыкі і адразу ж пачалася аблога Карфагена. Так пачалася *трэцяя Пунічная вайна*.

Тры гады жыхары Карфагена — жанчыны, дзеці, старыя — дапамагалі сваім воінам абараняць горад. Знясіленыя ад хвароб і голаду яны ўсё ж такі не змаглі адстаяць свабоду. Жудасная расправа чакала горад і яго жыхароў. Карфаген быў разбураны і сцёрты з твару зямлі. Рымляне нават правялі плугам баразну, а гэту тэрыторыю пасыпалі соллю ў знак таго, што тут забаронена было сяліцца людзям. Загінула карфагенская цывілізацыя. Гэта павінна стаць прыкладам: так будзе з кожным, хто адважыцца змагацца з Рымам.

У выніку апошняй вайны з Карфагенам, а таксама пераможнымі войнамі з іншымі народамі, *Рым стаў уладаром усяго Міжземнамор'я. Рымская дзяржава размяшчалася на тэрыторыі трох кантынентаў: Еўропы, Паўночнай Афрыкі і частцы Азіі.*

Слоўнік.

Правінцыя — лацінскае слова — падпарадкаваная, залежная вобласць за межамі Італіі.

Трыўмф — лацінскае слова — урачыстасць у гонар палкаводца-пераможцы.

? **1.** Як вы разумееце лозунг «раздзяляй і ўладарнічай!»? **2.** Які вынік войнаў рымлян з італікамі? **3.** Якія прычыны войнаў Рыма з Карфагенам? **4.** Якія вынікі войнаў Рыма з Карфагенам?

Войны рымлян з галамі. (Ціт Лівій. *Рымская гісторыя ад заснавання горада.* V, 36—39; 47)

«...хуткасць руху галаў навяла на Рым паніку... усе направіліся ў Рым і збегліся ў крэмль, забыўшыся нават заперці за сабою гарадскія вароты.

Галы, ў сваю чаргу, быццам ашаломленыя, трымаліся нерухома пры відзе такога дзіва, пры відзе такой неспадзяванай перамогі, і таксама ў страху стаялі нейкі момант як укопаныя, нібы не ў стане былі даць сабе справаздачу ў тым, што адбылося...

Галы ноччу так ціха падняліся на самы верх крамля, што не толькі не былі заўважаны вартай, але нават не разбудзілі сабак, такіх чуткіх да ўсякага начнога шораху. Але не выпалі яны з-пад увагі гусей... разбуджаныя іх крыкам і шумам узмахаў крылаў рымляне схапіліся за зброю і скінулі ўніз ворага. Адсюль і пайшла прымаўка: «Гусі Рым выратавалі».

Рымляне ў гонар такой важнай падзеі штогод у гэты дзень спраўлялі свята: неслі па цэнтральных плошчах і вуліцах горада багата ўпрыгожанага гусака і распятага на палках сабаку.

● Чаму рымляне спраўлялі свята гусей?

Казілін у аблозе. *(Паводле апавядання гісторыка А. І. Неміроўскага «Сланы Ганібала»)*

Незадоўга да бітвы пры Канах у Казіліне аказаўся невялікі атрад рымскіх воінаў і рымскіх

саюзнікаў, якія не паспелі далучыцца да легіёнаў. Вестка аб катастрофе пры Канах прымусіла воінаў затрымацца ў горадзе да паступлення распараджэнняў з Рыма. Распараджэнняў усё яшчэ не было, а тым часам Капуя паспела перайсці на бок Ганібала і адчыніць яму вароты. Не было сумненняў, што жыхары Казіліна, роднасныя па мове капуанцам, і якія таксама, як і яны, ненавідзяць рымлян, у спрыяльны момант паклічуць Ганібала. Таму рымскія воіны перабілі ўсіх казілінцаў.

Так узнікла рымская крэпасць у непасрэднай блізкасці ад Капуі. Гэта не на жарт трывожыла Ганібала. Ён паслаў невялікі атрад і прыказаў начальніку атрада ўступіць з рымлянамі ў перагаворы аб умовах здачы горада. Пунійцы прыблізіліся да горада, іх здзівіла паўнейшая цішыня і прызнакі пустаты. Лічачы, што рымляне, спалохаўшыся, самі пакінулі горад, пунійцы пачалі адбіваць вароты і лезці на сцены. Раптам вароты адчыніліся, і два рымскія атрады накінуліся на пунійцаў і пасеклі іх. Услед за гэтым быў пасланы больш мнагалікі атрад, але і ён не змог адолець некалькі соцень рымскіх храбрацоў.

Прыйшлося ісці супраць Казіліна самому Ганібалу з усёй сваёй арміяй і прыступіць да аблогі. Смешна было будаваць **гелеполу** (асадная башня) для аблогі такога гарадка, і Ганібал вырашыў абмежавацца абложнымі лесвіцамі і падкопамі.

Днём і ноччу карфагеняне капалі пад зямлёю траншэі. Выкапаную зямлю ноччу тайна прыбіралі на насілках. Але рымляне беспамылкова знаходзілі выхады траншэй і перагароджвалі іх сваімі папярэчнымі канавамі. Рымляне кідалі ў варожыя падкопы бочкі з пылаючым курыным пер'ем. Удушлівы дым выкурваў пунаў, як звяроў з нораў.

Такая ж няўдача чакала пунійцаў, калі яны ра-

білі спробу карыстацца таранамі і абложнымі лесвіцамі. Рымляне закідвалі ворагаў стрэламі і дроцікамі, рабілі частыя вылазкі. Пачалася пара дажджоў. Вада залівала падземныя хады. Многія воіны захварэлі ліхарадкай. Ганібалу нічога не заставалася рабіць, як зняць большую частку свайго войска. Перад горадам быў пабудаваны ўмацаваны лагер, і ў ім застаўся атрад пунійцаў. Ганібал спадзяваўся, што голад завершыць знішчэнне казілінскага гарнізона.

На зыходзе зімы Ганібал вярнуўся к Казіліну. Воіны, якія знаходзіліся ва ўмацаваным лагеры, завяралі, што ў Казіліне амаль не засталося дзвюх соцень байцоў. Многія рымляне ад мук голаду кідаліся са сцен. Другія без зброі стаялі на сценах, падстаўляючы грудзі стрэлам і дроцікам. Адзіны перабежчык з горада запэўніваў, што абложаныя даўно ўжо паелі ўсіх пацукоў і мышэй і цяпер харчуюцца размочанымі ў вадзе рамянямі і скурамі ад шчытоў.

Урэшце, аднойчы удалося знайсці ў кустах вярбы на беразе Вольтурна драўляную бочачку з мукой. Хтосьці дапамагаў асаджаным, кідаючы ў раку вышэй горада ўсё, што можа пайсці ў ежу.

Ганібал загадаў паставіць воінаў каля ракі і даць ім лодкі, каб воіны сачылі за тым, каб ракой нічога не прапусціць у горад. Больш бочак з мукой не бачылі, але пасярэдзіне ракі плылі арэхі. Абложаныя вылоўлівалі іх сачкамі і рэшатамі.

Але больш за ўсё здзівіла Ганібала тое, што рымляне кідалі са сцен на ўзрыхленую яго воінамі зямлю насенне рэпы. «Няўжо мне прыйдзецца стаяць пад Казілінам, пакуль не ўзыдзе гэтае насенне?» — сказаў Ганібал і ў той жа момант згадзіўся весці перагаворы з асаджанымі.

Аблога Казіліна адняла ў Ганібала амаль год. А колькі ў Італіі такіх Казілінаў!

● Раскажыце пра мужны рымскі атрад горада Казіліна.

Разбурэнне Карфагена. *(Апавяданне паводле даследаванняў гісторыка А. І. Неміроўскага)*

Семнаццаць дзён гарэў Карфаген. Семнаццаць дзён курчыліся ў агні лімонныя і міндальныя дрэвы, якія калісьці старанна даглядалі садаводы. Абрушваліся аркі і скляпенні храмаў, узведзеных рукамі працавітых фінікійскіх будаўнікоў; гінулі будынкі, якія прастаялі сотні гадоў і вартыя таго, каб прастаяць многія стагоддзі. Згаралі ў агні схаваныя ў тайніках скарбы карфагенскіх купцоў і маёмасць беднякоў. Гарэлі бібліятэкі, якія захоўвалі вопыт і мудрасць народа.

Семнаццаць дзён гарэў Карфаген, а на васемнаццаты пайшоў лівень; здавалася, неба не вытрымала: аблілося слязамі. Дождж ішоў цэлыя суткі. Рымляне хаваліся ў палатках.

Пленнікі, скаваныя па чатыры, ляжалі на зямлі, абыякавыя да ўсяго. І калі раніцай выглянула сонца, чыстае і яркае, іх твары былі па-ранейшаму змрочнымі; ні адзін промень надзеі не асвятліў іх.

Эміліан (Сцыпіён Малодшы) і яго світа падняліся на скалу. Замест цудоўнага, поўнага жыцця горада, да самага заліва распасціралася чорнае, безжыццёвае поле з бясформеннымі руінамі. Удушлівы дым нізка слаўся па зямлі, нават птушкі цяпер не лёталі тут.

● Як вы думаеце, чаму рымляне-пераможцы так жорстка абышліся з горадам Карфагенам і яго жыхарамі?

§ 41. Рабаўладальніцтва ў Рыме

1. Праца рабоў. У выніку войнаў, якія Рым вёў пастаянна, вялікая колькасць палонных ператваралася ў рабоў. Аграбленне правінцый, таксама давала мноства нявольнікаў. Піраты часта захоплівалі людзей і прадавалі іх у рабства. Частка рабоў гадавалася рабаўладальнікамі дома — гэта дзеці рабоў і рабынь. Такія рабы былі паслухмяныя, выхаваныя і каштавалі дорага.

Рабы выконвалі самую разнастайную работу. Але трэба памятаць, што ў адрозненне ад грэкаў, якія не выкарыстоўвалі працу нявольнікаў у земляробстве, рымляне шырока прымянялі іх працу ў земляробстве. Багатыя людзі на сваіх неабсяжных палях трымалі дзесяткі і сотні рабоў. Такія **вілы** поўнасцю трымаліся на працы рабоў. Рабы пасвілі жывёлу, працавалі ў рудніках, майстэрнях, на будаўніцтве дамоў, мастоў, дарог і г. д.

Некаторыя рабы былі адукаваныя, нават вялікія вучоныя. Яны вучылі грамаце дзяцей арыстакратаў. Рабы вялі дамашнюю гаспадарку. Многія з іх служылі ў дзяржаўных органах.

Праца нявольнікаў была вельмі цяжкай. *Рабы — гэта «гаворачыя» прылады працы.* Гэтым яны і адрозніваліся ад *нямых прылад* (кірка, лапата, матыка і г. д.) і *рыкаючых* — валоў, мулаў, быкоў. Ні адна краіна старажытнасці не мела такой колькасці рабоў і такой жорсткай эксплуатацыі, як Рым. Ніхто не можа вызначыць колькасці рымскіх рабоў, як і колькасці прылад працы.

Адносіны да рабоў былі самыя жудасныя. Пастаяннымі былі пабоі, голад, знясіленая праца. Многія нявольнікі ўтрымліваліся скаванымі ў ланцугі, з калодкамі ці ашыйнікамі. Рабы не мелі імя, а называліся мянушкамі. Такое становішча нявольнікаў вымушала іх весці барацьбу з рабаўладальнікамі. *Барацьба вялася ў розных формах: непаслухмянасць гаспадару, псаванне прылад працы, уцёкі, змовы. Найвышэйшай формай барацьбы былі паўстанні.*

2. Барацьба рабоў і беднякоў Італіі пад кіраўніцтвам Спартака.

Буйнейшым у гісторыі было паўстанне рабоў пад кіраўніцтвам **Спартака.** *Колькасць рабоў у рымлян павялічвалася, а становішча іх заставалася па-ранейшаму вельмі цяжкім. Гэта і было асноўнай прычынай паўстання.* У асабліва цяжкім становішчы былі рабы-**гладыятары,** якіх называлі смяротнікамі. Яны павінны былі для пацехі рымлян удзельнічаць у гладыятарскіх баях. Таму ў **74 г. да н. э.** у школе гладыятараў горада Капуі ўзнікла змова. Рабы тайна рыхтаваліся да паўстання, але змова была выкрыта. Некалькі дзесяткаў змоўшчыкаў уцяклі з Капуі і схаваліся на вяршыні патухшага вулкана **Везувій.** Уцёкшыя выбралі сваім кіраўніком **Спартака.** Ён і ўзначаліў паўстанне. Спартак, выхадзец з племені фракійцаў, трапіў у палон да рымлян і быў аддадзены ў школу гладыятараў, таму што быў дужы, смелы, кемлівы і прыгожы.

Рымскі атрад, пасланы да Везувія, блакіраваў гару-вулкан. Але ноччу рабы па сплеценых з лазы дзікага вінаграду лесвіцах

спусціліся ўніз праз жарало быўшага кратэра вулкана і ўшчэнт разбілі рымлян.

Усё новыя і новыя папаўненні прыходзілі ў стан спартакаўцаў. Сярод рабоў было многа беднякоў. Армія паўстаўшых павялічвалася з кожным днём і налічвала толькі пяхоты не менш за *120 тысяч воінаў*. Цвёрдая дысцыпліна ў спартакаўскай арміі, яе арганізацыя па рымскаму ўзору, падтрымка паўстаўшых беднякамі ў забеспячэнні харчам і фуражом, сыравінай рамеснікаў, абозам і г. д., садзейнічалі паспяховай барацьбе з рабаўладальнікамі.

У паўстаўшых была адна мэта — вызваліцца з рабства. Для ажыццяўлення гэтай мэты Спартак павёў усіх паўстанцаў на поўнач Італіі, каб перайсці горы *Альпы* і адпусціць усіх на волю. Рымскі сенат зразумеў, якая грозная сіла Спартак. Таму два консулы былі напраўлены з легіёнамі на барацьбу з паўстаўшымі. Нягледзячы на такую арганізаваную рымскую армію, паўстаўшыя атрымалі перамогу і дайшлі да ракі По. Але незразумела: чаму раптам Спартак павярнуў сваю армію назад, на поўдзень. Гэта пакуль не высветлена ў гісторыі, але ёсць меркаванне наконт таго, што *рабы хацелі адпомсціць рабаўладальнікам, пераправіцца ў Сіцылію і падняць сіцылійскіх рабоў, а таксама рабоў Італіі на барацьбу з Рымам.*

Рым рыхтаваўся да падаўлення паўстання. Вялікая армія на чале з *Красам*, пасланая на паўстаўшых, была разбіта спартакаўцамі. Рым на дапамогу выклікаў легіёны з Іспаніі і Балканскага паўвострава. Легіянеры часта ў паніцы ўцякалі пры наблі-

жэнні паўстанцаў. Для падтрымання дысцыпліны палкаводзец Крас пакараў смерцю кожнага дзесятага воіна з тых атрадаў, з якіх былі ўцёкі. На дапамогу арміі Краса прыбылі новыя легіёны *Пампея.* Апошняя бітва арміі Спартака з рымлянамі адбылася ў **71 г. да н. э.**

Спартак не здаўся ворагу жывым. Цела яго не знайшлі на полі бітвы. Войска паўстаўшых было разбіта. Рабы былі знішчаны, а ўцалелыя шэсць тысяч распяты на крыжах уздоўж дарогі з Капуі да Рыма.

Паўстанне пацярпела паражэнне, таму што яшчэ не настаў час звергнуць вельмі моцны рабаўладальніцкі лад, але ён быў аслаблены паўстаннем. У гэтым гістарычнае значэнне паўстання.

Слоўнік.

Віла — лацінскае слова — маёнтак, памесце, двор; дача.

Гладыятар — лацінскае слова — *меч;* барцы з рабоў, спецыяльна вывучаныя для барацьбы з такімі ж барцамі ці драпежнымі жывёлінамі на арэне цырка, тэатра і т. п.

? **1.** Якім было становішча рымскіх рабоў? **2.** Чаму рабы падняліся на барацьбу з рабаўладальнікамі? **3.** Якая мэта паўстання Спартака? **4.** Чаму ўсе паўстанні рабоў цярпелі паражэнне?

Паўстанне Спартака. (Плутарх. *Крас, 8—11)*

Паўстанне гладыятараў і спусташэнне Італіі называюцца большасцю пісьменнікаў *«Спартакаўскай вайною»*... У Капуі была школа гладыятараў... З іх 200 чалавек згаварыліся бегчы, але аб змове быў зроблены данос,— аб чым яны заўчасна даведа-

ліся... 78 гладыятараў вырваліся на волю, узброеныя ўзятымі на кухні нажамі і ражнамі. Выпадкова сустрэўшы на дарозе некалькі падвод, якія везлі ў другі горад зброю для гладыятараў, яны захапілі яе і ўзброіліся. Заняўшы добрую пазіцыю, гладыятары выбралі сабе трох правадыроў, з якіх першым быў *Спартак*, фракіец, які валодаў не толькі вялікай смеласцю і фізічнай сілай, але розумам і чалавечнасцю...

Перш за ўсё гладыятары кінуліся на прыйшоўшы з Капуі рымскі атрад і, захапіўшы многа зброі, з радасцю замянілі на яе сваю папярэднюю зброю... З Рыма зноў прыслалі трохтысячны атрад, рымляне зрабілі аблогу гары, якая мела толькі адзін круты і вузкі пад'ём, і сталі яго вартаваць. Схілы гары былі адвесныя і гладкія. Наверсе расло многа дзікага вінаграду. Гладыятары зрэзалі лозы і зрабілі з іх трывалыя і доўгія лесвіцы... Спусціўшыся ўніз, гладыятары зайшлі рымлянам у тыл і неспадзявана напалі на іх. Спартакаўцы авалодалі лагерам. Да іх далучылася многа мясцовых пастухоў, ваяўнічых і іншых людзей... Гладыятары спачатку ўступілі ў бой з адным з атрадам у 2000 чалавек і разагналі яго... Спартак заўладаў абозам рымлян і захапіў рымскі лагер...

Спартак быў цяпер вялікі і грозны. Ён склаў сабе даволі разумны план дзеянняў. *Не спадзеючыся зламаць канчаткова магутнасць рымлян, Спартак павёў сваё войска к Альпам, мяркуючы, што трэба пераваліць горы і адправіць рабоў на радзіму...*

Рымскі сенат баяўся Спартака і, усведамляючы небяспечнасць становішча, адправіў супраць яго абодвух консулаў, як быццам бы справа ішла аб адной з самых цяжкіх і вялікіх войнаў... [Але рымскія консулы былі разбіты спартакаўцамі]

...разгневаны сенат выбраў галоўнакамандуючым *Краса*. Многія са знатных адправіліся разам з ім у паход... (Крас, бачачы, што рымскія воіны кідаюць зброю і ратуюцца бегствам ад спартакаўцаў, сурова пакараў уцекачоў)... 500 салдат, якія беглі першымі і такім чынам падалі повад да бегства, ён раздзяліў на 50 дзесяткаў і з кожнага дзесятка пакараў смерцю аднаго па жэрабю... Пераламаўшы такім чынам настрой салдат, *Крас* павёў іх супраць ворага. А *Спартак* патроху набліжаўся да мора. Сустрэўшы ў праліве пірацкія судны, *ён вырашыў адправіцца ў Сіцылію і, перакінуўшы на востраў 2000 чалавек, узнавіць сіцылійскую вайну нявольнікаў, якая толькі нядаўна патухла* і патрабавала нямнога гаручага матэрыялу, каб зноў успыхнуць. Піраты дамовіліся са Спартаком, але, узяўшы падарункі ад яго, адплылі. Тады ён зноў павярнуў ад мора...

Крас, падышоўшы сюды і бачачы, што сама прырода указвае месца, што трэба рабіць, пастараўся ўмацаваць сцяною перашыек... Ён правёў ад мора да мора праз перашыек роў... і над ровам узвёў сцяну вялікай вышыні і трываласці... Спартак ўбачыў сябе акружаным сцяною...

Крас завязаў бой самы вялікі, якія толькі былі ў гэтую вайну, у якім пала 12 300 рабоў... Спартак пасля паражэння пачаў адступаць... Затым ён накіраваўся да самога Краса, але з-за масы людзей, якія змагаліся, і раненых яму не ўдалося дабрацца да яго. Затое ён забіў двух уступіўшых з ім у бой рымлян... акружаны вялікай колькасцю ворагаў і мужна адбіваючы іх удары, у рэшце рэшт Спартак быў пасечаны...

Пампей канчаткова знішчыў папаўшых яму ў рукі рабоў.

Рабы ў руднікаx. *(Паводле апавядання Н. Ф. Астраменцкай. Ветэран Цэзара)*

...У кожным паглыбленні капашыліся абцягнутыя скурай шкілеты: адзін, лежачы на спіне, біў над сабою скалу; другі, заносячы молат у бок, адколваў кускі пароды; жанчыны, стоячы на каленях, дзяўблі сцяну вострымі малаткамі. Рухі іх былі манатонныя. Яны здаваліся зданнямі, асуджанымі на векі вякоў праводзіць адзін і той жа ўзмах.

Ні на адным з іх — ні шматка адзення. Толькі ланцугі на нагах, якія звінелі, калі работнік мяняў становішча. Усе выглядалі аднолькава старымі, нават заморкі-дзеці, якія снавалі туды-сюды, падбіраючы адколатую пароду і складваючы яе ў ручныя каляскі. Сустракаючыся з намі, дзеці баязліва туліліся да сцен і жмурыліся: мабыць, святло факелаў прычыняла ім боль.

Пакаранне раба. *(Паводле апавядання гісторыка Й. Томана. Пасля нас хоць патоп)*

Сонца ўжо паднялося над Цірэнскім морам, калі Луцый пад'язджаў да Рыма. Дарога ішла ўздоўж бацькавага маёнтка. За агароджай рабы ўстанаўлівалі крыж. На крыжы быў распяты аголены раб. Смуглявы твар быў скрыўлены ад болю, стогны распятага разрывалі залацістае паветра. Наглядальнік пазнаў у конніку сына свайго гаспадара і ветліва прывітаў яго.

— Што гэта азначае? — запытаў Луцый, не спыняючыся.

— Ён хацеў збегчы, мілейшы пан.

Луцый раўнадушным поглядам акінуў раба, кіўнуў і паехаў далей.

Адчайны крык распятага ляцеў за ім.

● **1.** Раскажыце аб працы рабоў у руднікаx. **2.** За што і як пакаралі раба?

Раздзел III.
Імператарскі Рым

§ 42. Рым — уладар свету

1. Падзенне Рэспублікі ў Рыме. Са шматлікімі захопніцкімі войнамі, якія вёў Рым, ўзмацнялася ўлада палкаводцаў. Вопытныя камандзіры па даручэнню сената самі набіралі і камплектавалі войска. Яны і воінам плацілі за службу і давалі ім частку захопленай дабычы. Таму воіны прызнавалі толькі свайго военачальніка і гатовы былі змагацца з кім ён загадае. Толькі палкаводзец з добра арганізаванай і дысцыплінаванай арміяй мог падавіць любыя выступленні рабоў і беднякоў. Зыходзячы з гэтага, рабаўладальнікі хацелі ўсталявання такой улады палкаводца як *Пампей*, які жорстка расправіўся з паўстаннем Спартака.

Многія рымскія палкаводцы марылі аб уладзе, але *ў консулы ў 58 г. да н. э. быў выбраны Гай Юлій Цэзар.* Менавіта дзякуючы яму Рым стаў уладаром Галіі (сучаснай Францыі). Галы не змаглі адстаяць сваю незалежнасць у барацьбе з загартаванымі ў баях рымскімі легіёнамі. Вялікія багацці папоўнілі казну Цэзара, і ён павялічыў жалаванне сваім воінам, абяцаў ён і надзелы зямлі ветэранам. Каб задобрыць рымлян, наладжваліся масавыя грамадскія відовішчы, а таксама бясплатныя раздачы хлеба.

Надзейнае войска Цэзара і незлічоныя багацці яго казны абумовілі цягу палкаводца да ўсталявання ў Вечным Горадзе

асабістай улады. З гэтай мэтай ён у 49 г. да н. э. рушыў сваё войска на Рым, каб звергнуць уладу сената. Сваю армію сенат даручыў палкаводцу *Пампею,* але *Цэзар* так хутка дзейнічаў, што *Пампей* не змог арганізаваць абарону Рыма. Беднота Рыма падтрымала Цэзара, на яго бок стала і частка рабаўладальнікаў. Цэзару амаль не было супраціўлення і ён з арміяй заняў амаль усю Італію.

Цэзар — пераможац у грамадзянскай вайне — усталяваў асабістую ўладу. Сенат і консулы выконвалі яго волю. Сябе Цэзар назваў **імператарам.** Яму як цару ставілі статуі побач са статуямі багоў, на манетах чаканілі яго партрэты. За верную службу Цэзар шчодра ўзнагародзіў сваіх воінаў. Многія сенатары былі незадаволеныя такой уладай і хацелі захаваць Рэспубліку, у якой яны былі б ва ўладзе. Узнікла змова сенатараў. На адным з паседжанняў сената змоўшчыкі забілі Гая Юлія Цэзара. *Так няўдала скончылася спроба Цэзара ўстанавіць у Рыме асабістую ўладу. Гэтыя падзеі паказалі, якой нетрывалай была Рэспубліка. Жыццё патрабавала новых форм кіравання такой вялікай дзяржавай.*

2. Праўленне Актавіяна Аўгуста. Забойства Цэзара не сустрэла падтрымкі рымлян. Яны не жадалі абараняць Рэспубліку, таму што ўлада і там належала некалькім дзесяткам багатых фамілій арыстакратаў. Паміж гэтымі сем'ямі пачалася барацьба за ўладу. Узначальвалі гэтую барацьбу *Антоній і Актавіян. У 30 г. да н. э. Актавіян перамог і быў абвешчаны імператарам.*

Хаця дзяржава прадаўжала называцца Рэспубліка, але Актавіян падпарадкаваў сваёй волі сенат, Народны сход, консулаў. Яны выконвалі яго волю. Па яго прапанове сенат прысвоіў яму ганаровае імя **Аўгуст.**

Праўленне імператара Актавіяна Аўгуста — гэта па сутнасці воля і ўлада аднаго чалавека. Імперыя з такой формай праўлення называецца **манархіяй.** Аўгуст ўзмацніў уладу рабаўладальнікаў не толькі ў Рыме, але і ў правінцыях.

Пры пераемніках Аўгуста імперыя прадаўжала расшыраць свае ўладанні: на заваёваных тэрыторыях былі створаны новыя правінцыі. У старажытным свеце не было такой вялікай дзяржавы, як Рымская імперыя, якая размяшчалася на тэрыторыі трох кантынентаў: Еўропы, Азіі, Афрыкі.

Слоўнік.

Імпера́тар — лацінскае слова — павяліцель, палкаводзец; тытул галавы дзяржавы.

Аўгу́ст — лацінскае слова — свяшчэнны, узвышаны, вялікі.

Мана́рхія — грэчаскае слова — адзінаўладдзе, самадзяржаўе.

? **1.** Чаму ў Рыме наспела неабходнасць устанаўлення ўлады палкаводцаў? **2.** Дзякуючы чаму Цэзар прыйшоў да ўлады? **3.** Якая ўлада была ўстаноўлена ў Рыме пасля забойства Цэзара? **4.** Якія адрозненні Рымскай імперыі ад Рэспублікі?

Гай Юлій Цэзар. *(Плутарх. Мараліі. Афарызмы цароў і палкаводцаў, 90, 1—15)*

1. Гай Цэзар падлеткам папаў у рукі піратаў. Ад яго патрабавалі вялікі выкуп; ён рассмяяўся, што

піраты самі не ведаюць, каго схапілі, і сам назначыў удвая большы. А знаходзячыся ў іх пад стражаю ў чаканні грошай, ён патрабаваў ад іх цішыні і маўчання, калі ён спіць; складаў вершы і прамовы, чытаў ім услых, а калі яны недастаткова захапляліся, абзываў іх невукамі і варварамі і са смехам пагражаў іх павесіць. Так ён неўзабаве і зрабіў: калі выкуп быў дастаўлены і яго адпусцілі, ён сабраў у Азіі людзей, напаў на разбойнікаў, захапіў іх і распяў.

4. Ён плакаў, чытаючы аб справах Аляксандра Македонскага, а на пытанні сяброў сказаў: *«У мае гады ён перамог ужо Дарыя, а я нічога яшчэ не зрабіў»*.

5. Ён праязджаў з сябрамі нязначны гарадок у Альпах, і яны пацікавіліся, няўжо і тут ідзе барацьба і саперніцтва аб першынстве; Цэзар спыніўся, задумаўся і сказаў: *«Сапраўды, я сам аддаў бы перавагу быць першым тут, чым другім у Рыме»*.

6. Справы адважныя і вялікія, гаварыў ён, трэба рабіць, а не абдумваць.

7. І ён выступіў з Гальскай правінцыі на Пампея цераз Рубікон са словамі: *«Жэрабя кінута!»*

12. Разбіўшы адным ударам Фарнака Пантыйскага, ён напісаў сябрам: *«Прыйшоў, убачыў, перамог»*.

13. За вячэраю аднойчы зайшла размова, якая смерць лепшая; Цэзар сказаў: *«Раптоўная»*.

● Якім вы ўяўляеце сабе Цэзара па прачытаных афарызмах?

Узвышэнне Цэзара. *(Паводле апавядання гісторыка Д. П. Калістава)*

...Рымская рабаўладальніцкая рэспубліка перажывала глыбокі ўпадак. Цяжкі ўдар нанесла ёй грознае паўстанне рабоў пад кіраўніцтвам Спартака. Стала зразумела, што сенат, выбраныя службовыя асобы, існуючыя суды і турмы не ў сілах утры-

маць у паслухмянасці рабоў і свабодную беднату, гэта значыць усіх тых, чыёй працай ствараўся дабрабыт Рыма. Уплыў сената быў вельмі падарваны. Палітычныя дзеячы перад выбарамі не саромеліся адкрыта падкупляць выбаршчыкаў... Рымская рэспубліка разлагалася. Гэта адчувалі цяпер усе. Многія знакамітыя і багатыя людзі марылі аб моцнай уладзе, аб ваеннай **дыктатуры.** Яны гатовы былі паступіцца сваімі грамадзянскімі правамі і свабодай, абы гэта ўлада засцерагала іх інтарэсы, забяспечыла цвёрды парадак і захавала веру ў заўтрашні дзень...

У гэты цяжкі для Рымскай рэспублікі час на палітычнай сцэне паявіўся *Гай Юлій Цэзар...* Абставіны ў Рыме, аднак, дапамаглі ажыццяўленню яго славалюбівых задумак. Аб магутнасці і славе Цэзар марыў з юнацкіх гадоў. Ён не мог без пачуцця зайздрасці глядзець на статуі Аляксандра Македонскага ці чытаць апісанне яго паходаў. Усё гэта напамінала Цэзару, што ён яшчэ нічым не праславіўся ў тым узросце, калі Македонскі-заваёўнік ужо валодаў паловай свету...

У Цэзара былі падставы спадзявацца на ажыццяўленне сваіх задумак. Ён, *выхадзец са знатнага роду Юліяў,* вёў сваё паходжанне ад багіні *Венеры,* быў сваім чалавекам у коле правячай знаці. Ужо толькі гэта давала яму магчымасць хутка рухацца па службовай лесвіцы. Цэзар не быў моцнага здароўя, але быў вынослівы і поўным энергіі. У яго было мала грошай, але знатнае паходжанне дапамагала атрымаць у доўг усё, што трэба было для яго раскошнага жыцця. Заўсёды прыгожа адзеты, элегантны, смекалісты, пастаянна раскідваючы грошы, узятыя ў доўг, Цэзар быў добра вядомы сярод багатай і знатнай моладзі Рыма...

Цэзар разумеў, што без падтрымкі простага народа яму не ўдасца дабіцца ўлады. Вось чаму гэты

арыстакрат пачынае збліжацца з рымскімі дэмакратамі... Самалюбівы малады чалавек пачаў шукаць прыхільнасць простага народа. Ён наладзіў для грамадзян раскошныя абеды, пышныя відовішчы, дармавыя раздачы хлеба. Цэзар не толькі патраціў на гэта ўсе астаткі свайго багацця, але залез у вялікія даўгі. Ён стараўся завербаваць сабе паплечнікаў у народны сход. Значная частка рымскіх беднякоў ужо даўно не мела пастаяннага заробку і жыла за кошт вось такіх выпадковых падачак ад дзяржавы і багатых рабаўладальнікаў. Гэтых беднякоў з пагардай называлі гарадской чэрню...

Цэзар вельмі добра разумеў, што ў руках вопытнага палітыка такая падкупленая дробнымі падачкамі гарадская бедната можа стаць вялікай сілай...

Уплыў Цэзара ў народным сходзе рос... Раскошныя відовішчы змяняліся адно другім, будаваліся прыгожыя будынкі... Праз некаторы час Цэзар прапанаваў правесці новы закон аб надзяленні зямлёй бяднейшых многасямейных грамадзян... Цяпер перад Цэзарам адкрыліся шырокія магчымасці задаволіць сваё непамернае самалюбства і прагу ўлады.

● **1.** Дзякуючы чаму Цэзар дабіўся ўлады? **2.** Што садзейнічала ўзвышэнню Цэзара?

§ 43. Усе дарогі вядуць у Рым

1. Апошнія заваяванні Рымскай імперыі. Пасля смерці імператара Аўгуста Рымам кіравалі імператары, якія атрымалі ўладу ў спадчыну ці захапілі яе з дапамогай арміі. Слова *«імператар»* набыло новы сэнс — *так называлі ўладароў Рымскай дзяржавы.* Праўленне імператараў значна ўзмацніла панаванне рабаўладальнікаў не толькі ў

Вечным Горадзе, але і на ўсёй тэрыторыі дзяржавы, а гэта значыць і ў правінцыях.

Рымскія законы сурова каралі рабоў за непаслухмянасць, а калі раб забіваў гаспадара, то ўсіх рабоў гэтага рабаўладальніка каралі смерцю. Былі выпадкі, калі каралі смерцю сотні рабоў. Безумоўна, рабаўладальнікі і Рыма, і правінцый падтрымлівалі імператарскую ўладу.

Усё цяжэй было Рыму весці войны за расшырэнне тэрыторыі імперыі, ахоўваць граніцы такой вялікай дзяржавы і падаўляць паўстанні. Таму ў пачатку II ст. н. э. імператар **Траян** здзейсніў апошнія паходы з мэтай расшырэння граніц імперыі. *Ён заваяваў і далучыў да Рыма тэрыторыю дакаў (сучасная Румынія) і здзейсніў паход на Усход,* дайшоўшы аж да Міжрэчча, але вярнуўся з арміяй на падаўленне паўстанняў у правінцыях.

Пасля заваяванняў імператара Траяна рымская імперыя была вымушана перайсці да абароны сваіх неабсяжных уладанняў.

2. Імператарскі Рым. Сталіца імперыі — Рым ужо ў канцы I ст. да н. э. быў самым буйным горадам не толькі Міжземнамор'я, але і ва ўсім старажытным свеце. *Жыхароў горада было больш за мільён.* Цэнтр горада — *Палацінскі ўзгорак* з **форумам.** Усе галоўныя вуліцы, як сонечныя прамяні, сыходзіліся на форуме. Таксама і ўсе дарогі з далёкіх і блізкіх правінцый вялі ў сталіцу. Яшчэ ў тыя далёкія часы была створана прымаўка: *«усе дарогі вядуць ў Рым»*. І сапраўды, сухапутныя і марскія шляхі вялі ў Вечны Горад. Сюды прыязджалі і плылі на караблях купцы, іншаземныя дыпламаты,

шматлікія грузавыя караблі з сыравінай і рабамі; прыбывалі і адпраўляліся палкаводцы з арміяй і т. п.

На *Палаціне* былі пабудаваны палацы імператараў, якія зіхацелі золатам, мармурам і каштоўнымі камянямі. *Ад назвы палацінскіх палацаў паходзяць беларускія словы «палац» і «палата»*. На форуме, у гонар свайго кіравання і каб праславіць сябе, імператары ставілі *розныя помнікі, рабілі збудаванні, статуі,* **аркі,** *фантаны.* Цэнтр горада ўжо ў тыя часы стаў сапраўдным цікавым музеем імперыі пад адкрытым небам. Гонарам рымлян былі збудаванні для грамадскіх відовішчаў: *цыркі, тэатры,* **іпадромы,** *стадыёны.* Усе гэтыя велічныя будынкі стаялі сярод цяністых паркаў, фантанаў, якія асвяжалі паветра, і шматлікіх прыгожых статуй.

3. Аслабленне імперыі і яе заняпад. Рабства было адной з прычын пагоршання становішча імперыі. Рабы не былі зацікаўлены добра працаваць, каб гаспадар атрымаў багаты ўраджай ці шмат вырабаў у майстэрні. Нявольнікаў усё роўна дрэнна кармілі і адносіліся да іх са знявагай. *З цягам часу рабства стала тормазам развіцця сельскай гаспадаркі, а таксама і рамяства. Праца рабоў станавілася нявыгаднай,* таму рабаўладальнікі шукалі новых форм арганізацыі працы — гэта значыць *вядзення гаспадаркі і прамысловасці, заснаваных не на працы рабоў, а на працы свабодных людзей.*

Буйныя землеўладальнікі свае маёнткі дзялілі на дробныя ўчасткі і здавалі ў арэнду свабодным людзям. Такіх арандатараў

называлі **калонамі.** Яны абавязаны былі аддаваць за карыстанне зямлёй частку ўраджаю. Але калон быў зацікаўлены ў атрыманні большага ўраджаю, чым раб, ён жа шанаваў прылады працы.

Некаторыя рабаўладальнікі давалі рабам невялікія ўчасткі зямлі, прылады працы, дазвалялі мець сям'ю. Такія рабы атрымалі назву рабоў з хацінамі **(пекулій).** Так рабаўладальнікі пераводзілі на пекулій не толькі рабоў у сельскай гаспадарцы, але і ў прамысловасці, аддаючы майстэрні з прыладамі працы, лаўкі і г. д.

І ўсё ж такі гэтыя меры не змаглі ўзмацніць імперыі, таму што аслабленне ішло і з другога боку: *пачаліся масавыя паўстанні ў правінцыях* супраць рымскага прыгнечання.

Вандруючыя плямёны, якія акружалі імперыю, асабліва з III ст. н. э., пачалі парушаць яе граніцы. *Націск «варвараў» быў вельмі адчувальны.* Гаспадарка паступова прыходзіла ў заняпад. Былі *парушаны гандлёвыя сувязі,* а к V стагоддзю яны поўнасцю спыніліся.

4. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі. З-за цяжкасці кіравання неабсяжнай імперыяй яна была раздзелена ў **395 годзе** на Усходнюю і Заходнюю. Варвары прадаўжалі наступаць на граніцы, а ў **410 г.** на чале з ваяўнічым правадыром **Алáрыхам** *готы* ўварваліся ў Рым і разбурылі яго. За готамі паследавалі наступленні германскіх плямёнаў *вандалаў,* якія канчаткова разбурылі Рым. У гісторыі захаваўся тэрмін **«вандалізм»,** які азначае грубае і бязлітаснае

знішчэнне помнікаў культуры і твораў мастацтва.

Адзін з правадыроў германскіх плямёнаў у **476 г.** заставіў адказацца ад прастола апошняга імператара **Ромула Аўгу́стула.** *Гэтая падзея лічыцца падзеннем Заходняй Рымскай імперыі.* Усходняя імперыя з цяжкасцямі змагалася з варварамі яшчэ некалькі вякоў.

Слоўнік.

Фо́рум — лацінскае слова — рыначная плошча, цэнтр палітычнага і культурнага жыцця рымскага горада.

А́рка — лацінскае слова — збудаванне ў выглядзе варот, завершанае дугападобным перакрыццём.

Кало́н — лацінскае слова — земляроб Позняй імперыі; залежныя сяляне, замацаваныя за зямлёй.

Пеку́лій — лацінскае слова — уласнасць, маёмасць.

! **1.** Як вы думаеце, чаму рымскія заваяванні былі апошнімі ў II ст. н. э.? **2.** Састаўце вусна апавяданне «Горад Рым — сталіца імперыі». **3.** Якія былі асноўныя прычыны аслаблення і заняпаду імперыі? **4.** Калі адбылося падзенне Заходняй Рымскай імперыі?

Ля карты Рымскай імперыі. *(Паводле апавядання даследчыка Й. Томана. Пасля нас хоць патоп)*

Тарквата прыйшла па поклічу бацькі. Села на стул і нахілілася над вялікай картай. Авіола з замілаваннем глядзеў на дачку. Ён так моцна яе любіў, як і свае сундукі з золатам...

— Паглядзі, любая, што у мяне ёсць! Гэта карта свету па **Страбону.** Гэтыя чырвоныя значкі — вялікія гарады, гэта — рэкі, гэта — горы. Казка, так? Увесь свет, у якім жыве *сто мільёнаў людзей і*

немаведама колькі рабоў, ты можаш абхапіць сваімі рукамі. Яна ўсміхнулася бацьку.

— Хочаш, я раскажу табе, якая частка свету штó прыносіць Рыму? Ён пачаў расказваць.— Глядзі: **Іспанія.** Там у нас многа дабра. *Жалезныя руднікі* належаць мне даўно, а на днях я атрымаў у імператара ў арэнду *медныя*. А медзь разам з жалезам — гэта для аружэйнікаў тое ж самае, што для нас сонца. І *волава* пастаўляе для нас **Іспанія**, і *золата*. Ну і, безумоўна, *рабоў*. Хаця *рабоў* пастаўляе не толькі **Іспанія**, а ўсе правінцыі ад Гвадалквівіра да Еўфрата, ад Дуная да Нубійскай пустыні. А **Галія**, акрамя *рабоў*, дастаўляе нам *статкі вепраў і авечак, лён і эмаль*. **Германія** дае нам салдат. З **Германіі** мы вывозім *соль, медзь* і *янтар*.

Авіола працягваў: — **Германія** яшчэ пастаўляе нам *скуры* для салдацкіх шчытоў, статкі *зубраў* і *мядзведзяў* для цыркавых гульняў. **Брытанія**, вось гэты востраў, дае *шэрсць* для тог і плашчоў. А гэта правінцыя **Норык**. Там *жалеза*, а гэта вельмі важна! А вось **Далмацыя**, тут *волава* і *срэбра*. у **Македоніі** і **Фракіі** — *пшаніца* і *выдатныя гладыятары*, у **Дакіі** — *руды*, у **Эпіры** — *коні*, у **Грэцыі** — *мармур* і *статуі*... Што ж нам дае **Афрыка?** Цудоўныя рэчы: *слановую косць, авечак* і *жоўты мармур, свінец, фінікі* і *бананы; горы пшаніцы, шкло, палатно, папірус*.

● Выпішыце ў сшытак, што пастаўлялі правінцыі ў Рым.

Варвары. *(Паводле апавядання А. М. Штаерман «Паўстанне готаў на Дунаі»)*

З глубінных тэрыторый Азіі, ад самых граніц далёкага Кітая, у прыволжскія і прычарнаморскія стэпы прыйшоў шматлікі народ — **гýны.** На сваім шляху гуны сеялі разруху і жах. Вестка аб іх жорсткасці вельмі хутка распаўсюджвалася ўсюды.

Распавядалі, што гуны вандруюць па стэпах са сваімі стадамі і не ведаюць другога жылля, акрамя кібітак, і другой ежы, як сырое мяса і дзікіх траў; гаварылі, што ўсё сваё жыццё гуны праводзяць на сваіх несамавітых, але вынослівых конях, што яны непераможныя ў бойках і бязлітасныя да пераможаных. Прасоўваючыся ўсё далей на захад, гуны разбурылі гарады Баспорскага царства і падпарадкавалі сабе суседнія з імі плямёны.

У глыбокай старажытнасці *на паўднёвым узбярэжжы Балтыйскага мора жылі* **гóты.** Да пачатку II ст. н. э. частка іх пранікла ў Паўночнае Прычарнамор'е. Тут яны аселі і змяшаліся з больш шматлікімі і культурнымі мясцовымі плямёнамі. *Тых, хто пасяліўся к усходу ад Днястра, сталі называць* **остготамі** (усходнія готы), а тых, *хто к захаду,—* **вестготамі** *(заходнія готы).*

Остготаў пакарылі *гуны,* а супраць *вестготаў* паўсталі падпарадкаваныя імі **славяне.** Яны аб'ядналіся з *гунамі* і разбілі *вестготаў.* Ратуючыся ад знішчэння, разбітыя *вестготы* беглі ў напрамку Дуная. Частка іх шукала сховішча ў непрыступных гарах Трансільваніі. Другая частка звярнулася да імператара Валента з просьбай дазволіць ім сяліцца на пладародных прыдунайскіх палях. За гэта яны абяцалі выстаўляць салдат для абароны граніц імперыі. *Готы* былі вядомы як храбрыя воіны.

Імператар абяцаў *готам* адразу прадаставіць землі і харчаванне. Ён адправіў сваіх прадстаўнікоў наглядаць за іх пераправай і размяшчэннем. Дзень і ноч на караблях, лодках і проста на ствалах ссечаных дрэў перапраўляліся дзесяткі тысяч *готаў* цераз Дунай, спадзеючыся знайсці бяспечнае сховішча на другім беразе і новую радзіму.

Але хутка *готы* ўпэўніліся, што іх надзеі абманутыя. Дадзеныя ім абяцанні не выконваліся. Імператарскія чыноўнікі і не думалі выдаваць новым

прышэльцам харчаванне. Сярод *готаў* пачаўся страшны голад. Выкарыстоўваючы бязвыхаднае становішча *готаў*, чыноўнікі, купцы, ліхвяры скуплялі за бясцэнак іх людзей, жонак і перапраўлялі гандлярам рабамі... Сярод *готаў* нарастала незадавальненне, якое вылілася ў вялікае паўстанне на Дунаі. *Готам* дапамагалі мясцовыя жыхары, якія ўступалі ў іх шарэнгі. Паўстаўшыя вызвалялі рабоў, калонаў і разам з імі ўзорвалі аднятыя ў багацеяў землі. Захопленых вяльмож, рабаўладальнікаў, *готы* ператваралі ў рабства, каб тыя на сабе адчулі ўсё, чаму яны падверглі сваіх безабаронных нявольнікаў. *Готы* атрымлівалі перамогі, і большая частка рымскіх салдат пераходзіла на іх бок. Так працягвалася два гады.

Рымляне, сабраўшы шасцідзесяцітысячную армію на чале з імператарам Валентам, падышлі да горада Адрыянопаля. **9 жніўня 378 г. н. э.** выстаўленыя ў баявым парадку войскі Валента рушылі насустрач *готам*... Пачалося жудаснае пабоішча. Паўстаўшыя біліся з небывалай мужнасцю. Салдаты Валента пачалі адступаць. Хутка адступленне ператварылася ў беспарадачны пабег з поля боя з панікай. *Больш за 40 тысяч салдат і сам імператар Валент палі на полі бітвы.* Рэшткі яго войска з цяжкасцю дабраліся да Адрыянопаля.

Шлях паўстаўшым быў адкрыты да сталіцы Усходняй імперыі — Канстанцінопаля. Жах ахапіў багатых і знатных сенатараў і чыноўнікаў. Рух разрастаўся. *Паўсталі ўсе прыдунайскія вобласці.* На захадзе атрады паўстаўшых прыбліжаліся да граніц Італіі, а на ўсходзе армія готаў была ўжо на падыходзе да Канстанцінопаля... *Імператар Усходняй рымскай імперыі Феадосій заключыў дагавор з готамі, па якому частка зямель у Малой Азіі давалася готам.* Але большасць готаў былі непрымірымымі з рымлянамі. Яны вялі барацьбу і спадзявалі-

ся дабіцца новых поспехаў. Прадбачлівыя людзі гаварылі, што настане дзень, калі гэтыя ж готы з'яднаюцца з рымскімі калонамі і рабамі і тады настане канец тысячагадоваму ўладарніцтву Рыма над прыгнечанымі народамі.

● Чаму готы на Дунаі паднялі паўстанне супраць Рыма?

Раздзел IV. Культура Рыма

§ 44. Мастацтва Старажытнага Рыма

1. Уплыў грэчаскай культуры на рымскую. *Рымская культура развівалася пад пастаянным уплывам культуры грэкаў.* Грэкі шырока каланізавалі ўзбярэжжа Апенінскага паўвострава і Сіцылію, таму рымляне мелі самыя цесныя кантакты з іх бытам і культурай. *Рымляне ўзялі за аснову грэчаскі алфавіт, на базе якога стварылі свой лацінскі.* Гэтым алфавітам карыстаюцца многія народы свету і ў сучасны момант.

Асабліва ўзрос уплыў элінскай культуры на рымскую пасля заваявання рымлянамі Балканскага паўвострава (II ст. да н. э.). Але, хаця рымляне і сталі пераможцамі, грэкі ўсё ж такі засталіся непераможнымі ў культуры. Тым больш яны асляпілі і здзівілі сваім мастацтвам заваёўнікаў. Сапраўды, як пісаў рымскі паэт *Гарацый,* пераможцы былі дзікімі ў параўнанні з элінамі. Мастацтва элінаў было ўнесена ў суровы Лацый (Рым).

Грэчаская архітэктура і скульптура, жывапіс і літаратура, тэатр і аратарскае мастацтва, міфалогія, рэлігія і філасофія аказалі прамое ўздзеянне на развіццё духоўнай культуры рымлян. Але гэта не значыць, што толькі ўсё гатовае перанімалі рымляне. Яны вучыліся ў грэкаў і шмат чаго стваралі новага, непаўторнага. Што ж было непаўторным у рымлян?

2. Рымская рэлігія. Рэлігія грэкаў асабліва паўплывала на развіццё рымскай рэлігіі. Трэба адзначыць, што і ў рымлян, як і ў грэкаў было *мноства багоў* і розных ніжэйшых сіл прыроды і грамадства, якім таксама пакланяліся. Гэта, перш за ўсё, *геніі* — заступнікі і абаронцы людзей. Кожны чалавек меў свайго генія, які абараняў чалавека і назіраў за ім з дня нараджэння і да смерці. Дзень нараджэння чалавека — свята і яго генія. Статуя генія рымскага народа была адліта з золата і знаходзілася ў храме на Капітоліі.

Кожная рымская сям'я мела сваіх багоў — гэта *пенаты,* ахоўнікі дома, добрыя духі (дамавыя ў славян). Ахоўнікі членаў сям'і — *лары,* іх нават бралі з сабой у падарожжы. Рымляне верылі ў добрых і злых духаў — гэта *душы памёршых.* Добрыя якасці чалавека, такія, як *вернасць, мужнасць, пашана, згода, дабро, свабода, мір* і іншыя, таксама абогатвараліся, але гэтыя багі былі бязвобразныя. Багі рознай дзейнасці чалавека былі вобразнымі, з абліччам чалавека. Кожная з'ява прыроды і грамадства мела сваіх багоў (засуха, дождж; вайна, дзяржава і інш.). Галоўным сярод вялікай колькасці багоў быў **Юпітэр,** гэта той

жа бог грэкаў Зеўс, з тымі ж абавязкамі і той жа дзейнасцю.

Багі рымлян	Багі грэкаў	Від дзейнасці
Юпітэр	Зеўс	Бог-цар; зямля, космас
Юнона	Гера	мацярынства
Мінерва	Афіна	воінскае мастацтва, жаночыя рамёствы
Апалон	Апалон	навука, мастацтва
Дыяна	Артэміда	жывёльны свет
Венера	Афрадыта	жаночая прыгажосць, каханне
Марс	Арэс	вайна
Нептун	Пасейдон	воднае царства
Меркурый	Гермес	гандаль, дыпламатыя, пошта
Цэрэра	Дземетра	урадлівасць
Вулкан	Гефест	кавальская справа
Вакх	Дыяніс	вінаградарства, віно
Вікторыя	Ніка	перамога

У залежнасці ад развіцця працоўнай дзейнасці чалавека і яго культуры ствараліся іх пакравіцелі — вобразы багоў і багінь. Паколькі дзейнасць чалавека была мнагагранная, то шматлікімі і мнагаграннымі былі багі і багіні.

3. Літаратура. Рым меў шмат таленавітых паэтаў, але найбольш вядомымі былі **Вергілій, Авідый, Гарацый.** Жыццё і творчасць гэтых і іншых паэтаў прыпадае на канец I ст. да н. э. і I ст. н. э.— час найвышэйшага ўздыму паэтычнага мастацтва. У гісторыі гэты перыяд атрымаў назву *«залатога веку» рымскай паэзіі.* Імператар Аўгуст сумеў

прыцягнуць на свой бок многіх паэтаў. Знакаміты батагы рымлянін, прыяцель і сябра імператара — **Мецэна́т** арганізаваў у сваім доме гурток паэтаў, падтрымліваў і садзейнічаў ім тым, што даваў каштоўныя падарункі. Такім чынам, слова *«мецэнат»* ператварылася ў агульнае імя і стала абазначаць *«багаты апякун мастацтва»* — тое што ў наш час гавораць *фундатар, «спонсар»*.

Удзельнік гэтага гуртка выдатны прыдворны паэт *Вергілій* напісаў цудоўную паэму *«Энеіда»*. Паэма стваралася па заказу самога імператара *Аўгуста*. Перад паэтам была пастаўлена нялёгкая задача — звязаць гістарычнае мінулае Рыма са слаўным гістарычным мінулым грэкаў. Аўтар павінен быў паказаць, што рымляне з'яўляюцца нашчадкамі багатай элінскай культуры і гісторыі. *Вергілій* апавядае, што горад Рым быў заснаваны *нашчадкам Энея* — выхадцам са знакамітай *Троі*, па імені якога і названа паэма *«Энеіда»*. Так *«Энеіда»* прадаўжала гісторыю грэкаў, апетую легендарным *Гамерам* у паэмах *«Іліяда»* і *«Адысея»*. *Вергілій* па-мастацку высветліў гісторыю рымлян ва ўзаемнай сувязі з грэкамі. На гэтым гістарычным фоне і быў узвялічаны імператар *Аўгуст* і яго «залаты век» праўлення Рымам.

4. Архітэктура. *Архітэктура павінна была падкрэсліваць велічнасць, магутнасць і багацце Рыма.* І сапраўды ўсе грамадскія пабудовы: храмы, аркі, калоны, форумы, цыркі, тэатры, амфітэатры, іпадромы былі вартыя таго, каб апраўдаць сваё назначэнне.

Рымляне не толькі выкарысталі прыгожыя элементы і накірункі архітэктуры грэкаў, але ў прыгожым і трывалым будаўніцтве пайшлі значна далей. Яны ўжо ў II ст. да н. э. вынайшлі *бетон* — трывалае і вяжучае рэчыва. Дзякуючы гэтаму вынаходству, а таксама *абпаленай цэгле* і *рознакаляроваму шклу*, якое ўжо шырока выкарыстоўвалася ў будаўніцтве, рымляне стварылі збудаванні, некаторыя з якіх у добрым стане захаваліся да нашага часу.

Своеасаблівым і толькі рымскім у архітэктуры былі прыгожыя *áркі* і *калоны* ў гонар ваенных перамог, юбілеяў імператараў ці іншых знакамітых падзей. Такія збудаванні называліся трыумфальнымі. Форма аркі шырока выкарыстоўвалася пры будаўніцтве мастоў, будынкаў, водаправодаў і інш.

Самым цудоўным збудаваннем, якое добра захавалася да нашых дзён, з'яўляецца *храм усім багам* — **Пантэон.** Каля трох тысяч наведвальнікаў могуць адначасова змясціцца ў ім. Гонар храма — яго купал — дугападобная столь, якая нагадвае небасхіл.

Сучасныя гісторыкі выдзяляюць у архітэктуры рымлян сем цудаў, сем самых цудоўных збудаванняў (аб іх гл. пасля § 44).

5. Скульптура. Збудаванні ўпрыгожваліся скульптурамі. Іх размяшчалі на плошчах, у парках, скверах і г. д. Гаварылі, што Рым быў заселены скульптурамі, іх так многа было ў горадзе, што сенат неаднаразова прымаў пастановы: зняць частку скульптур, таму што яны былі нават ліш-

німі і не ўпісваліся ў пейзаж вуліцы, плошчы, парка.

Характэрная рыса рымскай скульптуры — партрэт. Партрэтныя статуі і бюсты багоў, імператараў, дзяржаўных дзеячаў і знакамітых людзей так дасканала перадавалі рысы твару і характара чалавека, што яны з'яўляюцца найлепшымі першакрыніцамі пры вывучэнні гісторыі і культуры рымлян.

* * *

Рымская культура атрымала шырокае распаўсюджанне не толькі на Апенінскім паўвостраве, а і ва ўсёй неабсяжнай імперыі. Выкарыстаўшы ўсё лепшае другіх пакораных народаў, рымляне ў спалучэнні з уласнымі дасягненнямі стварылі шэдэўры мастацтва, якія ў сучасны момант здзіўляюць нас сваёй прыгажосцю, велічнасцю і трываласцю.

Слоўнік.

Áрка — лацінскае слова — лук, дуга — перакрыццё ў выглядзе дугі.

Пантэ́он — лацінскае слова — (*пан* — усё, *тэо* — бог) — храм для ўсіх багоў.

Рэльéф — лацінскае слова — выпуклае выяўленне на плоскасці.

? **1.** Які ўплыў аказала грэчаская культура на культуру рымлян? **2.** Ці ёсць адрозненні ў рэлігійных вераваннях рымлян і грэкаў? **3.** Параўнайце багоў грэкаў і рымлян і від іх дзейнасці. **4.** Як Вы разумееце выраз «мецэнат»? **5.** Якая мэта паэмы Вергілія «Энеіда»? **6.** Дзякуючы чаму так развіта было будаўніцтва ў Рыме?

Сем цудаў імператарскага Рыма. *(Паводле ападання гісторыка-даследчыка А. І. Неміроўскага)*

Яшчэ задоўга да таго, як Рым стаў уладаром Міжземнамор'я, грэкі ўжо склалі спіс сямі цудаў свету. (Вы іх ведаеце з гісторыі цывілізацый Старажытнага Усходу і Старажытнай Грэцыі.) Для рымскіх цудаў у гэтым пераліку не знайшлося месца.

А ці былі ў рымлян свае цуды будаўнічага мастацтва? Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба дамовіцца, што мы будзем разумець пад «цудам». «Цудам» мы павінны лічыць тое збудаванне, якое выклікала здзіўленне сучаснікаў і здзіўляе нас цяпер.

У імператарскім Рыме іх можна выдзеліць сем, можа іх было і болей.

Калона Траяна

На адной з самых вялікіх плошчаў Рыма ў старажытнасці і зараз узвышаецца велізарная каменная калона. Яна ўзведзена ў 113 годзе ў гонар перамог імператара Траяна над вольналюбівымі *дакамі* і ператварэння Дакійскага царства (сучасная Румынія) у рымскую правінцыю. Вышыня калоны каля 38 м, дыяметр калоны 3,7 м. Ствол пакрыты спіральнай стужкай **рэльефу**, якая ўтварае 23 віткі. Агульная даўжыня рэльефу — 200 м.

Такім чынам, 200 м^2 мармуру поўнасцю пакрыты рэльефнымі выяўленнямі. Велічная ідэя даць зрокавае ўяўленне аб вайне не мае сабе роўных па маштабах і ўвасабленнях. Егіпецкія фараоны таксама стараліся адлюстраваць на камені свае перамогі. Але там адлюстроўваліся асобныя эпізоды вайны, а тут уся вайна ў цэлым, ад пераходу рымскага войска цераз Дунай да самазабойства цара дакаў Дэцэбала.

Віла Адрыяна

Пераемнік Траяна імператар Адрыян правёў большую частку свайго жыцця ў вандраваннях...

У старасці, утаміўшыся ад паездак, Адрыян прыказаў узвесці каля Рыма загарадную вілу і ўзнавіць там у мініяцюры ўсё, што так уразіла яго ў час вандраванняў па Грэцыі і Егіпту. Прагульваючыся па алеях, прастарэлы імператар аддаваўся ўспамінам. Яны былі радасныя і сумныя...

Трэба думаць, што ў калекцыі імператара было нямала арыгіналаў вялікіх твораў. Карціны да нашых дзён не дайшлі. Захаваліся толькі статуі. Цяпер іх можна бачыць у буйнейшых музеях свету, у тым ліку ў Эрмітажы Санкт-Пецярбурга.

Пантэон

У горад Рым з пераможнымі войнамі зыходзіліся чужаземныя багі і багіні. Рымляне прымалі іх з пашанай... І тады некаму прыйшла ў галаву шчаслівая думка: а «чаму не пабудаваць храм усім багам, і мясцовым і прышлым?» Гэта быў выхад з таго цяжкага становішча, у якое паставілі сябе самі рымляне, стварыўшы вялікую дзяржаву. Цяпер ні адзін бог ці багіня (а яны, як вядома, капрызныя і помслівыя) не маглі паскардзіцца на дрэннае абыходжанне. Таму з будаўніцтвам храма *«усім багам» (па-грэчаску — Пантэона)* было вырашана не марудзіць...

Пантэон — пабудова з купальным скляпеннем. Дыяметр купала і яго вышыня характарызуюцца адной лічбай — 43 метры. Да канца XIX стагоддзя купал Пантэона заставаўся самым буйным у свеце. Але справа не толькі ў памерах. Сучасныя будаўнікі дабіваюцца такіх купалаў з дапамогай стальной і бетоннай арматуры. У рымскага інжынера іх замяніў дасканалейшы разлік... У цэнтры купала круглае акно дыяметрам 8,5 метраў. Свят-

ло, якое лілося адтуль, выхватвала з цемры велічныя дэкаратыўныя калоны і ўтвораныя імі нішы, а ў нішах знаходзіліся статуі багоў.

Тэрмы

Адной з найбольш прыгожых пабудоў рымлян з'яўляюцца тэрмы (лазні).

Першым з рымскіх імператараў пабудаваў тэрмы **Нерон...** Па сведчанню саміх рымлян, пышнасцю адрозніваліся *тэрмы* **Каракалы,** пабудаваныя ў 217 годзе...

Самымі грандыёзнымі і добраўпарадкаванымі былі тэрмы **Дыяклетыяна.** Будаўніцтва іх пачалося ў 298 годзе. Сярод будаўнікоў... было 40 тысяч хрысціян, прыгавораных да катаржных работ. *Плошча тэрм — 13 гектараў... Гэта велічэзныя залы, у якіх магло змясціцца тры тысячы адначасова...* да нашых дзён захаваліся толькі руіны...

У лепшым стане захаваліся *тэрмы Каракалы.* Яны цяпер раскапаны. На іх плошчы *(11 гектараў)* мог бы размясціцца невялікі горад. Да паслуг наведвальнікаў тэрм былі не толькі лазневыя памяшканні, ванны, басейны, але і гімнасіі, бібліятэкі, галерэі з творамі жывапісу і скульптуры, залы для філасофскіх і літаратурных дыскусій, стадыён, сады, крамы з таварамі. Пад залай галоўнага будынка пры раскопках знойдзены падсобныя памяшканні, у тым ліку водаправод і атапляльная сістэма...

Тэрмы — гэта найбольш арыгінальныя тварэнні рымлян, якія не знайшлі сабе роўных ні ў Грэцыі, ні на Усходзе.

Водаправоды

Тэрмы не маглі працаваць без водаправода, не меншага цуда антычнага інжынернага мастацтва. *Першы з рымскіх водаправодаў быў пабудаваны ў 312 г. да н. э. Апіем Клаўдзіем.* Ён цягнуўся на *16,5 км* ад гарадскіх варот Рыма да крыніцы ў каменяломнях, амаль па ўсім працягу пад зямлёй.

Наступны па часу водаправод адносіцца да 272 г. да н. э. Ён забяспечваў Рым вадою рэчкі Аніо і меў даўжыню *70 км. Усяго ў Рыме к 226 г. н. э. было 11 водаправодаў. Некаторыя з іх служаць да цяперашняга часу.*

Там, дзе на шляху цякучай вады сустракаліся яры і іншыя няроўнасці рэльефу, узводзіліся каменныя масты, па якіх пракладваліся свінцовыя альбо гліняныя трубы... І ўсё ж перавага аддавалася пракладцы труб пад зямлёю, у тунелях...

Будаўніцтва водаправода з'яўлялася не толькі складанай з тэхнічнага боку, але і дарагой справай... каласальныя сродкі магло даць бязлітаснае аграбленне заваёваных правінцый...

«Залаты дом»

Імператар **Нерон** лічыў Рым трухлявым, брудным і ванючым. Надзелены буйной фантазіяй, ён марыў аб садах Семіраміды і палацах Мемфіса...

Рымскія архітэктары распрацавалі праект пабудовы велічнага палаца, які павінен быў зацямніць сваёй раскошаю рэзідэнцыі ўсходніх уладык і стаць новым цудам свету. Але гэты план не мог быць ажыццёўлены без расчысткі гарадскога цэнтра ад пакінутых папярэднімі стагоддзямі трушчоб... Праект так бы і застаўся праектам, калі б нечакана не ўспыхнуў велічны пажар (64 год)...

Імператарскі палац стаў як бы цэнтрам новага Рыма. *З-за мноства золата і каштоўнасцей ён атрымаў назву «залатога дома».* Найбольшае здзіўленне сучаснікаў выклікала не раскоша — да яе ўжо паспелі прывыкнуць,— а нябачныя раней спалучэнні раскошных пабудоў з адасобленымі лугамі і сажалкамі, быццам перанесенымі з сельскай глушы ў сталіцу свету. Гэта была дачная рэзідэнцыя імператара, якая перавышала ў сем разоў тэрыто-

рыю сучаснай Ватыканскай дзяржавы і раскінулася на схілах трох з сямі рымскіх узгоркаў. Яна была адкрыта ўся святлу. Сцены палаца мелі своеасаблівую будову, з дапамогай спецыяльнага ўстройства яны маглі паварочвацца ўслед за рухам сонца. Велічная трыццаціметровая статуя імператара наследавала знакамітага калоса Радоскага.

Калізей

...у 72 годзе было пачата будаўніцтва велічнага амфітэатра. У сярэднявеччы ён атрымаў назву Калоссеум, адкуль — **Калізей.**

Адкрыццё Калізея ў 80 годзе было адсвяткавана гладыятарскімі гульнямі і цкаваннем звяроў, якія цягнуліся сто дзён. Было знішчана да 50 тысяч дзікіх звяроў і мноства гладыятараў. За гэтым «раскошным» відовішчам магло адначасова назіраць 50 тысяч рымскіх грамадзян. Жанчыны занімалі верхні (драўляны) ярус Калізея. Усяго ў ім было чатыры ярусы.

Цяпер захавалася тры каменныя ярусы. Унутры Калізей пусты. Гісторыя разбурэння амфітэатра дае ўяўленне аб яго грандыёзнасці. Спачатку Калізей разбураўся сам... Потым разбуралі людзі... з яго матэрыялу было пабудавана 23 дамы, а ў XIV—XV стагоддзях — шэсць цэркваў. Калізей ператварыўся ў гіганцкую каменяломню. Дармавы камень ішоў не толькі на будаўніцтва, але і перапальваўся ў вапну.

У XVII стагоддзі на тэрыторыі апусцеўшага Калізея пабудавалі фабрыку селітры...

Цяпер Калізей — гордасць Рыма. Вялікая колькасць машын, турыстаў і ўвогуле вялікі рух аўтамабільнага транспарту прадстаўляе для гэтага цуда не меншую небяспеку, чым тысячагадовае варварства ахвотнікаў за дармавым матэрыялам. Ці вытрымае Калізей гэтае новае выпрабаванне?

Энеіда. *(Урывак з паэмы Вергілія «Энеіда»)*

А пасяродку два флаты відаць; карабельныя грудзі
Кованай меддзю блішчаць...
Вось і Аўгуст вядзе за сабою на бітву
Смелых сыноў італійскіх, сенат і народ...
Вось пераможац Усходу з Чырвонага мора Антоній
Рушыць з багатай здабычай сцягоў і даспехаў.
Тысячы вёслаў па хвалях б'юць дружна; грудзямі
Вострымі судны валы рассякаюць, і пеняцца воды.
Так урачыста героі імчацца на вежах плывучых.
Дроцікі сыпяць і стрэлы; у полымі, іскрах
Пакулле ўсюды ляціць...

Аўгуст, з трыумфам уязджаючы ў Рымскія сцены,
Свой бессмяротны зарок прысвячае багам італійскім,
Тройчы сто алтароў найвялікшых узвёўшы ў горадзе.
Усюды на вуліцах шум ад гульняў і воплескаў.
...доўгай чарадой ідуць пераможаныя,
Розныя па мове, адзенню і зброі.

● Каго праслаўляе рымскі паэт Вергілій ў паэме «Энеіда»?

§ 45. Узнікненне хрысціянства

1. Прычыны ўзнікнення новай рэлігіі. Рым, пакарыўшы мноства народаў, устанавіў такое прыгнечанне над імі, якога людзі да гэтага не ведалі. Але асабліва цяжкае становішча рымляне стварылі яўрэям, якія насялялі рымскую правінцыю Сірыю і Палесціну. Часткай гэтай правінцыі была быўшая дзяржава яўрэяў Іудзея. Усе сродкі барацьбы за вызваленне былі ўжо яўрэямі выпрабаваны і не прынеслі адчувальных вынікаў, але застаўся апошні сродак — надзея на Бога Яхве. Яўрэі верылі, што ён не пакіне іх і вызваліць ад рымскага прыгнечання.

Таму ў асяроддзі яўрэйскага народа распаўсюджваліся чуткі, што ў хуткім часе прыйдзе збавіцель ад усіх няшчасцяў, пасланы Богам. Гэты Бога-чалавек **Хрыстос** (па-яўрэйску *Месія*) меў імя **Ісус** (у перакладзе з яўрэйскай мовы — *выратавальнік).* Разнастайныя варыянты гэтых чутак значна пазней былі ўпарадкаваны і запісаны. Яны атрымалі назву **Евангеллі** (у перакладзе з грэчаскай мовы азначае *«добрыя весткі»).*

Яўрэі лічылі, што **Ісус Хрыстос** пасланы **Богам** менавіта да іх, а не да іншых народаў, таму што яны не ведалі мнагабоства, а прызнавалі толькі аднаго **Бога-Яхве.** Яўрэйская рэлігія, у адрозненне ад грэкаў, рымлян, егіпцян і іншых народаў, не мела створаных багоў. Вось чаму ў яўрэйскім асяроддзі, і першапачаткова ў *Палесціне,* а потым і ва ўсім *Міжземнамор'і* распаўсюджваліся чуткі аб прыходзе **Ісуса Хрыста.** Вера **ў Хрыста,** а пазней і ў яго вучэнне, атрымала назву — **хрысціянства,** а тыя, хто падтрымаў гэту веру, сталі называцца **хрысціянамі.**

Аб тым, што **Ісус Хрыстос** з'яўляецца гістарычнай асобай, сведчыць свяшчэнная кніга хрысціян **«Біблія».** Ён нарадзіўся ў яўрэйскім асяроддзі *Іудзеі* ў горадзе Назарэце. Аб яго жыцці ў **Назарэце** і ўвогуле ў асяроддзі яўрэяў паведамляюць таксама пісьмовыя крыніцы. Гэта перш за ўсё творы антычных аўтараў. Сапраўднасць сведчанняў прызнана сучаснай навукай (гл. матэрыял пасля § 45).

2. Вучэнне Ісуса Хрыста аб выратаванні чалавека і чалавецтва. У сваіх пропаведзях **Ісус** гаварыў, што ён прыйшоў для таго, каб

прынесці гібель несправядліваму міру. Па яго вучэнню *чалавек павінен імкнуцца пазбавіцца духоўным ачышчэннем і пакаяннем ад усіх бед і няшчасцяў.* Чалавек сам вінаваты ва ўсіх няшчасцях, таму што ён імкнецца праўдай і няпраўдай прыдбаць багацце, палепшыць свой дабрабыт, забываючы аб удасканальванні душы.

Такім чынам, хрысціянства абясцэньвала і адмоўна адносілася да багацця, улады, дабрабыту, задавальнення сваіх жаданняў. І наадварот, тое, чаго чалавек стараўся пазбегнуць,— беднасць, голад, залежнасць, пакута — хрысціянства ўзводзіла ў ступень сапраўдных каштоўнасцей, якія садзейнічалі ачышчэнню і выратаванню. Так новая рэлігія адразу вырашала ўсе складаныя надзённыя пытанні жыцця і давала на іх адказы. Пры гэтым *хрысціянства не заклікала да барацьбы, а вырашала ўсе праблемы маральным і духоўным ачышчэннем чалавека.* У жыцці ж любы адкрыты пратэст супраць цяжкіх умоў існавання крывава падаўляўся.

Першымі хрысціянамі, безумоўна, сталі абяздоленыя людзі — бедната, жабракі, рабы.

3. Арганізацыя хрысціянскай царквы. З самага пачатку *хрысціянства ўсталявала роўнасць ўсіх перад Богам* незалежна ад сацыяльнага становішча. *Формай арганізацыі першых хрысціян былі абшчыны,* у якіх усе веруючыя валодалі аднолькавымі правамі і карысталіся аднолькавай маёмасцю. Такіх абшчын на тэрыторыі Рымскай дзяржавы было многа. Дух Хрыста панаваў над усёй абшчынай. З цягам часу

ў гэтых абшчынах галоўную ролю адыгрывалі **епіскапы** (наглядальнікі). *Аб'яднанне ўсіх хрысціян у абшчыны, якімі кіравалі епіскапы, атрымала назву* **царква.** Не трэба блытаць гэты тэрмін з будынкам царквы, які прызначаны да малення.

Хрысціяне прызнавалі толькі аднаго Бога, у сувязі з гэтым адмаўляліся пакланяцца рымскім імператарам. Адмаўляліся яны і ад ахвярапрынашэнняў рымскім язычаскім багам. За гэта хрысціяне падвяргаліся ганенням: іх асуджалі на пакаранне смерцю, кідалі драпежнікам у цырку і да т. п.

4. Хрысціянства — дзяржаўная рэлігія імперыі. Час ішоў. Паступова ідэі хрысціянства аб выратаванні чалавека ад усіх няшчасцяў і вечным жыцці яго душы прыцягвалі ўсё бо́льшую колькасць людзей. Ідэі хрысціянскага цярпення і пакорлівасці, непраціўлення злу ўспрымалі не толькі беднякі, але і людзі з асяроддзя сярэдніх і нават багатых слаёў насельніцтва.

У 325 годзе *пры імператары Канстанціне хрысціянства было прызнана дзяржаўнай рэлігіяй Рымскай імперыі.* Новая рэлігія павінна была садзейнічаць умацаванню імператарскай улады і самой імперыі.

Слоўнік.

Ісу́с — яўрэйскае слова — выратавальнік (спасіцель).

Хрысто́с — яўрэйскае слова — Месія (збаўца, збавіцель).

Ева́нгелле — грэчаскае слова — добрая вестка.

Епі́скап — грэчаскае слова — наглядальнік.

Біблія — грэчаскае слова — кніга; збор свяшчэнных кніг хрысціянскай рэлігіі.

? **1.** Чаму новая рэлігія ўзнікла ў асяроддзі яўрэяў? **2.** Што было галоўным у вучэнні Ісуса Хрыста? **3.** Якія асноўныя правілы ўсіх хрысціян? **4.** Чаму хрысціянства стала дзяржаўнай рэлігіяй Рымскай імперыі?

Ці быў Ісус Хрыстос гістарычнай асобай? *(Сведчанні пісьмовых крыніц)*

Для многіх гэтае пытанне пакажацца дзіўным. Да нядаўняга часу гаварылі і пісалі ад імя навукі аб тым, што Ісус Назаранін — гэта выдуманы вобраз, а яго вучэнне — падман народа. Але ці сапраўды навука адвяргае Ісуса як зямное імя Бога-чалавека. Можна верыць ці не верыць, што Бог адкрыўся свету ў вобразе Хрыста — тут археалогія і пісьмовыя помнікі нічога не вырашаць,— гістарычная рэальнасць Ісуса Хрыста — прадмет цалкам даступны навуковаму вывучэнню.

Гістарычныя пісьмовыя звесткі, якія захаваліся да нашага часу, даказваюць сапраўднасць зямнога жыцця Ісуса Хрыста. Хто ж гэтыя аўтары, сапраўднасць сведчанняў якіх не адвяргае і сучасная навука.

Асаблівую цікавасць прадстаўляюць паведамленні аб Ісусе ў *«Іудзейскіх старажытнасцях» («Археалогія», XVIII, 3)* **Іосіфа Флавія** (37—100 гг.), рымскага гісторыка, родам з Палесціны. Ён піша аб справах намесніка рымскай правінцыі *Понція Пілата* і адзначае, што «жыў Ісус, чалавек мудры, калі яго ўвогуле можна назваць чалавекам. Ён здзейсніў дзівосныя справы і стаў настаўнікам тых людзей, якія ахвотна ўспрымалі ісціну. Ён прыцягваў да сябе многіх іудзеяў і элінаў. Гэта быў Хрыстос. Па патрабаванню нашых уплывовых асоб Пілат прыгаварыў яго да распяцця

на крыжы. Але тыя, хто раней любілі яго, не пераставалі гэтага і цяпер. На трэці дзень ён зноў з'явіўся ім жывы, як аб гэтым і аб многіх іншых яго цудоўных справах прадказвалі Богам натхнёныя прарокі. І да цяперашняга дня існуе секта хрысціян, якія атрымалі ад яго сваё імя».

Хаця *Іосіф Флавій* іудзей па сваіх рэлігійных перакананнях, але верыў у тое, што Месіяй (Хрыстом) быў менавіта Ісус. Іосіф апавядае і аб іншых лідэрах, якія аб'яўлялі сябе месіямі, але верыць у тое, што Хрыстос уваскрэс. Гэта здаецца дзіўным, аднак навука не адвяргае фактаў існавання Ісуса Хрыста, дадзеных яўрэйскім гісторыкам.

Трохі пазней былі напісаны творы **Карнелія Тацыта** (55—120 гг.), буйнейшага рымскага гісторыка, які апавядае аб пажары Рыма летам 64 г. Ён гаворыць, што імператар Нерон зваліў усю віну на «людзей, ненавісных за іх мярзотнасці, якіх чэрнь называла хрысціянамі. Хрыстос, ад якога паходзіць гэтая назва, быў пакараны смерцю пры Тыберыі пракуратарам Понціем Пілатам, але падаўленыя шкодныя забабоны зноў вырваліся наверх і распаўсюдзіліся не толькі па Іудзеі, дзе гэтае зло атрымала пачатак, але і па Рыму...» (Аналы. XV, 44).

Гэта месца ў Тацыта аб Хрысце і яго вучэнні не можа быць пазнейшай устаўкай ужо таму, што з такой пагардай і нянавісцю гаворыцца аб хрысціянах, што ні ў аднаго хрысціяніна не паднялася б рука пісаць так аб сваёй веры.

Сведчанні Тацыта прызнаны сапраўднымі большасцю вучоных, але некаторыя вучоныя адвяргаюць іх сапраўднасць таму, што гэта прамы шлях да гістарычнасці заснавальніка хрысціянства — Хрыста.

Сучаснік Тацыта **Святоній** (70—140 гг.) — рымскі гісторык, у біяграфіі «Нерон», апісваючы карысныя мерапрыемствы імператара, адносіць да іх праслe-

даванне «хрысціян, людзей, якія вераць у новыя і шкодныя забабоны» (Нерон, 16). У біяграфіі Клаўдзія ён таксама паведамляе аб узнікненні сярод рымскіх іудзеяў перапалоху «з-за нейкага Хрэста» (Клаўдзій, 25). Як і Тацыт, ён называе іх «хрэсціяне».

Пліній Малодшы (61—113 гг.) — упраўляючы рымскай правінцыяй Віфініяй. Па сваіх абавязках яму прыходзілася праследаваць хрысціян. У пісьме да імператара Траяна Пліній апісвае жыццё хрысціян і іх малітвы. Ён сведчыць: «маліліся Хрысту як быццам бы Богу». Гэта значыць, што Пліній ведаў аб існаванні Хрыста як чалавека, у адваротным выпадку ён гаварыў бы проста аб «Богу Хрысце» (Пісьмы. X, 96, 6—7).

Атэісты сцвярджаюць, што цытуемае месца з твора Плінія — падробка, але ў працах **Тэртуліяна**, які жыў у III стагоддзі, мы знаходзім пацвярджэнне доказу Плінія.

Акрамя разгледжаных намі звестак-сведчанняў аб Ісусе Хрысце, ёсць важныя паведамленні ў яўрэйскай свяшчэннай кнізе **«Талмуд»**. Іх даследаваў беларускі вучоны М. М. Нікольскі.

Не трэба адхіляць і сведчанняў апостала **Паўла**. Рэальнасць яго як гістарычнай асобы не ставілася пад сумненне нават атэістамі. Між тым Павел быў малодшым сучаснікам Ісуса.

Падвядзём вынікі. *Пісьмовыя крыніцы сведчаць аб тым, што пры імператары Тыберыі і пракуратары Пілаце ў Іудзеі жыў прапаведнік Бога-чалавек Ісус з Назарэта.* Яго вучэнне прыцягнула многа паслядоўнікаў, але ва ўлад ён выклікаў падазрэнні і варожасць. Ахоўнікі закона выдалі яго Понцію Пілату і той пакараў смерцю Ісуса як «Цара Іудзейскага», небяспечнага для Рыма. Пасля смерці Назараніна загадкавыя з'явы пераканалі вучняў, што Хрыстос уваскрэс, што ён сапраўды зба-

віцель, абяцаны прарокамі. Так нараджалася хрысціянства, рэлігія, якая стала хутка распаўсюджвацца па ўсёй Рымскай імперыі.

● Хто са старажытных аўтараў пакінуў сведчанні аб Ісусе Хрысце?

§ 46. Грамадскія відовішчы рымлян

1. Неабходнасць арганізацыі грамадскіх відовішчаў. На працягу ўсіх перыядаў гісторыі рымскае грамадства з задавальненнем успрымала самыя разнастайныя відовішчы: *гладыятарскія і марскія баі, цкаванне драпежнікамі людзей, асуджаных на пакаранне смерцю, паляванні на звяроў у цырку; цырк, тэатр, іпадром.* **Мэта гэтых прадстаўленняў — выхаванне рымлян у духу патрыятызму, жорсткасці, сіле.** Рымлянін павінен мець перавагу і сілу перад пакоранымі народамі. Жорсткасць і абыякавасць да крыві, забойстваў і пакут іншых, цвёрдасць волі і характару — галоўныя рысы рымляніна, а таксама і рымлянкі. Таму для рымскага грамадства такія віды мастацтва былі самымі любімымі.

Заваёўваючы ўсё новыя тэрыторыі, Рыму неабходна была непераможная армія, яе воіны павінны быць непрымірымымі да ўсіх тых, хто не падпарадкоўваўся сіле, а аказваў супраціўленне. З такімі людзьмі яны распраўляліся вельмі жорстка: іх проста знішчалі. Тыя народы, якія без супраціўлення пераходзілі ў рымскае ўладарніцтва, атрымлівалі спачуванне: жыццё захоўвалася. Аб гэтым пісалі нават такія знакамітыя рымскія паэты, як *Вергілій:*

«Ты ж народы павінен вясці, рымлянін, уладай сваёю.
Вось мастацтвы твае — берагчы пакорных і ўтаймоўваць гордых».

Рымскае грамадства таму і патрабавала: **«Хлеба і відовішчаў!»**, але відовішчаў з забойствамі, пакутамі, праліццём крыві. Улада давала народу тое, што ён хацеў. Апетыт, як вядома, прыходзіць у час яды, таму колькасць усякага роду грамадскіх прадстаўленняў пастаянна ўзрастала. Пры Аўгусце гладыятарскія баі і тэатральныя прадстаўленні займалі 66 дзён у год, пры Марку Аўрэлію ўжо 135, а ў IV стагоддзі іх колькасць узрасла да 175 і болей дзён; вясёлыя мерапрыемствы для народа праходзілі, такім чынам, кожныя два дні.

Бедната Рыма, накормленая бясплатнымі раздачамі не толькі хлеба, а і да хлеба, была задаволена яшчэ і велічнымі прадстаўленнямі ў тэатрах, цырках, іпадромах, амфітэатрах. Арганізатары такіх прадстаўленняў былі ўпэўнены ў падтрымцы і правядзенні любога выгаднага для сябе рашэння ў Народным сходзе ці сенаце. Не трэба забываць, што ў адной толькі сталіцы — імператарскім *Рыме было не менш за 300 тысяч беднаты, якая жыла падачкамі і патрабавала «хлеба і відовішчаў!»*. Гэта была грозная і магутная палітычная сіла, якую нельга было не ўлічваць уладам.

2. Гладыятарскія баі і цкаванне драпежнікамі — любімейшы адпачынак рымлян. Гладыятары, вывучаныя ў спецыяльных школах майстэрству фехтавання, валоданню зброяй і фізічна загартаваныя муж-

чыны, заўсёды, выходзячы на арэну, звярталіся да імператара з клічам: *«Будзь здароў, імператар, ідучыя на смерць вітаюць цябе!»* Для імператара і яго сям'і былі спецыяльныя месцы ў час правядзення ўсіх грамадскіх відовішчаў. Галоўная зброя гладыятара — меч, але былі баі з віламі-трызубцамі і сецямі, якія накідваліся на праціўніка. Пераможаны гладыятар, але цяжка паранены, спецыяльным жэстам, падняццем рукі, прасіў памілавання ў гледачоў і імператара. Тыя ж у большасці выпадкаў патрабавалі выкрыкам «дабіць!» з апушчанай правай рукой і адтапыраным вялікім пальцам.

Гладыятарскія баі амаль заўсёды дапаўняліся цкаваннем драпежнымі звярамі асуджаных на пакаранне смерцю, але часцей за ўсё гэта былі хрысціяне. У амфітэатрах і цырках пад арэнай знаходзіліся спецыяльныя памяшканні для драпежнікаў, людзей-смяротнікаў і трупаў людзей і жывёлін. Адсюль у любую хвіліну з дапамогай машын-пад'ёмнікаў дастаўлялі звяроў, паляўнічых і асуджаных. З розных бакоў на арэне з'яўляліся групы звяроў-драпежнікаў, даўно не кормленых і гатовых накінуцца на няшчасных.

Адным з самых крывавых прадстаўленняў было 100-дзённае свята з нагоды адкрыцця Калізея. Пяць тысяч розных дзікіх звяроў было прывезена з заморскіх краін для пацехі рымлян. Многа было праліта крыві, многа было пакут і знявечаных людзей і звяроў, яшчэ больш было трупаў, якіх рабы баграмі скідвалі ў спецыяльныя памяшканні пад арэнай. Але ўсё гэта было

такім захапляючым, цікавым, непаўторным для гледачоў, што яны доўга гаварылі аб незвычайных відовішчах і чакалі новых, яшчэ больш незвычайных.

Толькі Рым сваёй сілай і ўладай сумеў паставіць у асобы від мастацтва мукі, боль, пакуты, забойства. Такое мастацтва было неабходна для заваявання народаў і ўладарніцтва. **Забаронены былі крывавыя відовішчы дзякуючы хрысціянству ў V стагоддзі.**

Гэты від мастацтва з падзеннем Рыма, на шчасце народаў, ніколі больш не быў адноўлены ні адной пазнейшай цывілізацыяй. Але адгалоскі засталіся і па сённяшні дзень у іспанскай **карыдзе.**

3. Марскія баі на пацеху натоўпу. Не меншай папулярнасцю ў грамадстве карысталіся марскія баі, якія вяліся як сапраўдныя. За аснову боя звычайна бралі які-небудзь марскі бой мінулай вайны. У такіх баях удзельнічалі сапраўдныя баявыя караблі, транспартныя судны, баявая тэхніка, маракі і марская пяхота.

Для такіх відовішчаў спецыяльна было выкапана Фуцыянскае возера каля Рыма, дзе ў тысячагадовы юбілей горада былі праведзены самыя раскошныя марскія баі. Амфітэатр Калізей таксама быў месцам правядзення такіх прадстаўленняў. Яго арэна апускалася і вельмі хутка запаўнялася вадой па падземных канавах з ракі Тыбр. На такія відовішчы ў Рым прыязджалі не толькі з блізкіх гарадоў, але нават з правінцый.

4. Тэатр, цырк, іпадром. Меней усяго рымляне любілі тэатр, у якім ужо даўно пера-

сталі ставіць нудныя і сумныя трагедыі і нецікавыя камедыі. Для гледачоў, безумоўна, мала было крыві і пакут на сцэне, жыццё патрабавала больш жорсткасці. Таму тэатр і не карыстаўся поспехам, як у грэкаў.

У рымскім тэатры звычайна на сцэне выступалі танцоры, якія выконвалі **пантаміму** на матывы міфаў грэкаў, як *«Суд Парыса»*. Танцор так па-мастацку выконваў усе ролі, што глядач бачыў і Парыса, і багінь, якія з'явіліся перад ім, каб вырашыць спрэчку, хто з іх самая прыгожая.

Былі жартоўныя прадстаўленні з народнага жыцця, у якіх можна было бачыць і спрытнага рыбака, і дурнога суддзю, і разумнага рамесніка, і праставатага селяніна.

Арэна цырка была прадастаўлена выдрасіраваным жывёлінам, а больш за ўсё паляванню на звяроў, прывезеных з джунгляў Афрыкі і Азіі. Гэтыя відовішчы былі вельмі займальнымі, іх любілі рымляне. Тут на фоне сапраўднай прыроды, якая так па-мастацку была прадстаўлена на арэне, было многа жывёл і людзей, а яшчэ больш пакут і крыві.

Вялікім поспехам карысталіся прадстаўленні на іпадромах — гэта спаборніцтвы на калясніцах. Бег на калясніцах, запрэжаных 2, 4, 6, 8 дарагімі коньмі, з сапраўдным майстэрствам кіравання вазніцы, быў захапляючым і запамінальным для гледачоў. Такія скачкі на іпадромах і ў цырках часта ператвараліся ў кучы паломаных калясніц і горы мяса загінуўшых коней і вазакоў.

Вядомых наезнікаў, атрымаўшых сотні перамог, і іх коней, з якімі некаторыя выйгралі для сваіх гаспадароў сотні прызоў, ушаноўвалі як багоў. Ім ставілі статуі з ганаровымі надпісамі, у якіх пералічвалі іх перамогі. Некаторыя надпісы захаваліся да нашага часу.

Слоўнік.

Іпадро́м — грэчаскае слова — конская дарога, месца спаборніцтва з коньмі.

Цырк — лацінскае слова — круг; месца грамадскіх прадстаўленняў.

Кармавы́ — упраўляючы суднам.

Кары́да — іспанскае слова — бой быкоў.

Катапу́льты, балісты — лаціна-грэчаскія словы — ваенныя кідальныя машыны.

Пантамі́ма — грэчаскае слова — перайманне; у Рыме драматызаваны танец аднаго акцёра на сюжэт міфалогіі.

? **1.** Чаму Рыму неабходны былі крывавыя відовішчы? **2.** Як вы разумееце лозунг «Хлеба і відовішчаў!»? **3.** Чаму гладыятарскія баі і цкаванне драпежнікамі былі любімымі відовішчамі рымлян? **4.** Раскажыце, як праходзілі марскія баі. **5.** Чаму тэатр быў для рымлян менш любімым, чым для грэкаў? **6.** Чаму грамадскія відовішчы рымлян не былі прыняты пазнейшымі цывілізацыямі?

Гладыятары Рыма. *(Паводле апавядання А. М. Штаерман «У амфітэатры»)*

...Якое гэта відовішча, калі гладыятары перад пачаткам боя праходзяць па арэне, бліскаючы дарагой зброяй і вітаючы імператара словамі: *«Будзь здароў, імператар, ідучыя на смерць вітаюць цябе!»*

Колькі прафесійных байцоў гіне, не дачакаўшыся ўдачы! Раненых без жалю дабіваюць. І жыццё гладыятараў вельмі цяжкае: за малейшую правіннасць — розгі, катаванне; яны заўсёды пад стражай; іх гаспадары баяцца, каб не паднялі мяцеж гэтыя моцныя, адчайныя людзі, як калісьці пры Спартаку. І бегчы ім няма ніякай магчымасці. Калі мёртвых байцоў адносяць з арэны, раб выпрабоўвае іх раскаленым жалезам, каб, прыкінуўшыся забітымі, яны не спрабавалі ўцячы.

Паводле даследаванняў нямецкага гісторыка Г. Хёфлінга («Рымляне. Рабы. Гладыятары». М., 1992. С. 53)

У гонар імператара Траяна з нагоды перамогі над дакамі (Румынія) былі арганізаваны грамадскія відовішчы, якія цягнуліся 123 дні, на працягу гэтых чатырох месяцаў ён паслаў змагацца 10 000 гладыятараў, баі якіх перамяжоўваліся з цкаваннем 10 000 дзікіх драпежных звяроў.

Па прыказу Траяна адзін раз выступала 350, а другі — «усяго толькі» 202 байцы, затое трэці раз, сапраўды вар'яцкімі былі прадстаўленні, якія цягнуліся 117 дзён, на арэну была выведзена 4941 пара гладыятараў! Усяго ж з 106 па 114 г. н. э. па меншай меры 23 000 гладыятараў змагаліся адзін з другім не на жыццё, а на смерць, выконваючы волю імператара. Безумоўна, народу падабаліся такія бітвы на арэне, так што і наступныя імператары прадпрымалі ўсё магчымае для таго, каб не ўпасці тварам у гразь.

* *
*

Сапраўды знамянальнай падзеяй было святкаванне тысячагоддзя Рыма ў 248 г. н. э., калі Філіп Араб выставіў тысячы гладыятараў, якія потым тысячамі трупаў пакрылі арэны.

Плутарх. Цэзар. 55

Пасля трыумфаў Цэзар «прыняўся раздаваць салдатам багатыя падарункі, а народу арганізавалі пачастункі і гульні. На 22 000 сталах былі арганізаваны пачастункі для ўсіх грамадзян. Гульні — гладыятарскія баі і марскія пабоішчы — ён даў у гонар сваёй памёршай дачкі Юліі».

Марскія баі. *Паводле даследаванняў нямецкага гісторыка Г. Хёфлінга («Рымляне. Рабы. Гладыятары». М., 1992. С. 91—94)*

Цэзар першы арганізаваў незвычайныя для рымлян марскія баі ў сувязі са сваім чатырохкратным трыумфам. Гэты спектакль праходзіў на возеры, спецыяльна для гэтага выкапаным на Марсавым полі. Тысячы матросаў і дзве тысячы грабцоў на розных сапраўдных караблях адчаянна змагаліся з «ворагам». Адзін флот прадстаўляўся як егіпецкі, другі як фінікійскі. Рымскі пісьменнік Святоній піша: «на ўсе гэтыя відовішчы адусюль сцякалася столькі народу, што многія прыезджыя начавалі ў палатках па вуліцы і завулках, а даўка была такая, што многія былі задушаны насмерць, у тым ліку два сенатары».

Яшчэ больш раскошныя марскія відовішчы арганізаваў імператар Аўгуст. На гэты раз спецыяльна на правым беразе Тыбра было выкапана вялікае возера (557×536 м). Пасярэдзіне возера быў насыпаны востраў, які дазваляў выконваць мастацкія тактычныя манеўры суднаў. У крывавую бойку на пацеху шматтысячнаму натоўпу выступалі ўзброеныя «афіняне», з аднаго боку, з другога — «персы». Дзесяткі двух- і трохпалубных, яшчэ больш невялікіх караблёў удзельнічала ў гэтых баях.

*

* *

Імператар Клаўдзій праз 50 гадоў на Фуцыянскім возеры, як паведамляе рымскі гісторык Тацыт: «...падрыхтаваў ваенныя трохпалубныя і чатырохпалубныя караблі, пасадзіў на іх 19 тысяч чалавек; каля берагоў возера з усіх бакоў былі расстаўлены плыты, каб ваюючым некуды было бегчы, але ўнутры гэтай агароджы заставалася многа прасторы для намаганняў грабцоў, для мастацтва **кармавых**, для нападзення караблёў адзін на аднаго і для ўсяго астатняга, без чаго не абыходзяцца марскія баі. На плытах стаялі падраздзяленні імператарскай гвардыі і падраздзяленні конніцы, на іх жа былі ўзведзены высунутыя ўперад умацаванні з гатовымі да дзеяння **катапультамі і балістамі**, тады як астатнюю частку возера сцераглі маракі на палубных караблях»...

● **1.** Падрыхтуйце вусна апавяданне па аднаму з прыведзеных тэкстаў. **2.** Выкажыце свае адносіны да цкавання драпежнікамі людзей, асуджаных на пакаранне смерцю.

Значэнне рымскай цывілізацыі ў развіцці еўрапейскіх народаў

(Ад сусветнай велічнасці да падзення — шлях рымскай цывілізацыі)

Гісторыя велічнага Рыма вам ужо знаёма. Ад невялікага паселішча-горада, якое заснаваў легендарны *Ромул* у **753 г. да н. э.**, да сусветнай дзяржавы-імперыі на трох кантынентах: *Еўропы, Азіі і Афрыкі* — такі шлях старажытнай рымскай цывілізацыі. Першапачатковы горад-поліс Рым —

правобраз дзяржавы ў даліне р. Тыбра — пераходзіў ад першабытна-радавой абшчыны да больш арганізаванага грамадства — суседскай тэрытарыяльнай абшчыны. У выніку развіцця прылад працы і працоўнай дзейнасці плямёнаў паляпшаліся ўмовы жыцця. Усё гэта вяло да больш арганізаванага грамадства, якое атрымала назву **царскі перыяд** рымскай цывілізацыі *(ад Ромула і да выгнання Тарквінія Гордага). Гэта той час, калі цары разам з сенатам і Народным сходам упраўлялі грамадствам. А ў гаспадарцы ўсталёўвалася прыватная ўласнасць на ворную зямлю.* У сацыяльным асяроддзі прайшлі вялікія змены — гэта *выдзяленне патрыцыяў і плебеяў і паяўленне патрыярхальнага рабства.*

У выніку такіх вялікіх перамен у жыцці Рымскага поліса багатыя людзі — гэта перш за ўсё патрыцыі — хацелі палітычнай улады. Як раз час прывёў іх да выспеўшага жадання кіраваць грамадствам. Выгнаўшы цара **(610 (609) г. да н. э.)**, рымляне выбралі сваіх прадстаўнікоў — консулаў. Так была ўстаноўлена **Рэспубліка** ў Рыме. **Консулы,** *Народны сход і сенат* — гэта багатыя людзі, якія кіравалі грамадствам. Але плебеі ў барацьбе за ўладу, а перш за ўсё за зямлю, таму што толькі зямля рабіла чалавека багатым, *дабіліся права выбіраць сваіх абаронцаў-заступнікаў — народных трыбунаў.* У далейшых сваіх патрабаваннях і ў барацьбе з патрыцыямі плебеі вырашылі і яшчэ шэраг пытанняў: *выбіраць аднаго консула ад плебеяў, уступаць у шлюб з патрыцыямі, выбіраць жрацоў, часткова атрымалі зямлю на дзяржаўным*

полі. Так плебеі ўраўняліся ў палітычных правах з патрыцыямі, але яшчэ доўга вялі барацьбу за зямлю. Валоданне зямлёю давала права і ганаровай службе ў арміі. Дзякуючы арміі і сваёй ваяўнічасці Рым пакарыў спярша ўсе плямёны Апенінскага паўвострава і стаў перад праблемай заваявання іншых краін свету. *На працягу некалькіх стагоддзяў пастаянных войнаў рымляне ўжо ўладары ўсяго Міжземнамор'я.* Велічная дзяржава Рэспубліка нават не адпавядала сваёй назве. У гэтай дзяржаве патрэбна была новая арганізацыя палітычнай улады кіравання сусветнай дзяржавай. Так *складвалася імперыя на чале з манархам,* з новымі органамі ўлады, якія адпавядалі сусветнай дзяржаве.

Вялікі Рым з дастатковай колькасцю сыравіны, шырокім рынкам для гандлю і незлічонай колькасцю рабоў так хутка развіваўся ў гаспадарчым жыцці, што нават многія сучасныя вучоныя называюць імператарскі Рым капіталістычнай дзяржавай. Вялікія змены адбыліся і ў светапоглядах людзей, якія *ад язычаскай рэлігіі перайшлі да хрысціянства.* Новая рэлігія хрысціянства ад праследуемай стала дзяржаўнай рэлігіяй імператарскага Рыма.

Але, сапраўды, нічога ў свеце не вечна. З цягам часу тыя ж умовы, якія прывялі Рым да такой магутнасці і велічнасці, яны ж і аслабілі яго і загубілі. *Барацьба рабоў з рабаўладальнікамі, нявыгаднасць рабскай працы, замена рабскай працы новымі формамі (рабы з хацінамі, вольнаадпушчанікі, пекулій, калоны і г. д.), масавыя паўстанні ў правінцыях — усё гэта пад-*

рывала ўстоі магутнай дзяржавы. Цяжкасці імперыі яшчэ дапаўняліся знешнімі фактарамі — *варвары, вандруючыя народы,* не толькі парушалі граніцы, але і сяліліся на землях рымскіх правінцый. Яны робяць паходы на Вечны Горад і разбураюць яго. **У 476 годзе пала Заходняя Рымская імперыя,** але гэта не падзенне дасягненняў здабыткаў старажытнай рымскай цывілізацыі. Яны жывуць і ў наш час: *пісьменства (алфавіт, якім карыстаюцца многія народы свету); бетон, які так шырока прымяняецца ў будаўніцтве ва ўсім свеце; хрысціянская рэлігія, якая стала сусветнай яшчэ ў імперыі; літаратура і аратарскае мастацтва, якія пераняты ўсёй Еўропай.* Не трэба забываць і таго, што рымляне навучылі будаваць дарогі, масты, тэрмы (лазні), пракладваць водаправоды.

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ ГІСТОРЫЮ
СТАРАЖЫТНАЙ РЫМСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ?

Асноўныя перыяды гісторыі Рыма	Тэрыторыя Рымскай дзяржавы	Змены ў гаспадарцы	Дасягненні ў культуры	Парадак кіравання дзяржавай	Важнейшыя падзеі і іх даты

Запоўніце гэту табліцу.

Па гісторыі старажытнай Рымскай цывілізацыі вы можаце прачытаць кнігі, указаныя ў канцы вучэбнага дапаможніка.

ХРАНАЛАГІЧНАЯ ТАБЛІЦА ПА ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАЙ РЫМСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Асноўныя перыяды	Стагоддзі	Галоўныя падзеі і даты
I Царскі перыяд Старажытнай Рымскай цывілізацыі	VIII да н. э. VII да н. э.	◄ 753 г. да н. э. Заснаванне Рыма згодна з легендай і археалогіяй
II Рымская рабаўладальніцкая Рэспубліка	VI да н. э. V да н. э. IV да н. э. III да н. э. II да н. э. I да н. э.	◄ 509 г. да н. э. Устанаўленне Рэспублікі ў Рыме ◄ 264 г. да н. э.—146 г. да н. э. Войны Рыма з Карфагенам (Пунічныя войны) ◄ 74—71 гг. да н. э. Паўстанне рабоў на чале Спартака ◄ 30 г. да н. э. Прыход да ўлады імператара Аўгуста
III Рымская імперыя	I II III IV V	◄ Нараджэнне Ісуса Хрыста, распаўсюджанне хрысціянства ◄ Пачатак стагоддзя — апошнія заваёвы Рыма пры імператару Траяну ◄ 325 г. Хрысціянства — дзяржаўная рэлігія імперыі ◄ 395 г. Падзел імперыі на Заходнюю і Усходнюю ◄ 410 г. Узяцце і разбурэнне Рыма готамі ◄ 476 г. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі

Літаратура

I. Для настаўніка

Всеобщая история. Обработанная «Сатириконом».— Л., 1990.

Древняя Греция. Книга для чтения / Под ред. Д. П. Каллистова, С. Л. Утченко. Изд. 3-е, доп.— М.: Учпедгиз, 1963.

Древняя Греция. Книга для чтения / Под ред. С. Л. Утченко. Изд. 4-е, доп.— М.: Просвещение, 1974.

Древняя Греция. Книга для чтения / Под ред. С. Л. Утченко, Д. П. Каллистова.— М.: Учпедгиз, 1954.

История Древней Греции / Под ред. В. И. Кузищина.— М.: Высшая школа, 1986.

История древнего мира / Под ред. И. М. Дьяконова, В. Д. Нероновой, И. С. Свенцицкой.— М., 1982. Т. I—III.

История древнего мира в художественно-исторических образах. Хрестоматия. Пособие для учителей. Изд-во 2-е, доп.— М.: Просвещение, 1978.

История Древнего Рима / Изд. 2-е. Под ред. В. И. Кузищина.— М.: Высшая школа, 1982.

Колобова К. М., Глускина Л. М. Очерки истории Древней Греции. Пособие для учителяй.— Л.: Учпедгиз, 1958.

Куманецкий К. История культуры Древней Греции и Рима / Пер. с польск.— М.: Высшая школа, 1990.

Кун Н. А. Легенды и мифы Древней Греции.— Мн.: Народная асвета, 1985.

Мифологический словарь / Гл. ред. Е. М. Мелетинский.— М.: Сов. Энциклопедия, 1990.

Нечай Ф. М. Образование Римского государства.— Мн.: Изд-во БГУ, 1972.

Парандовский Я. Олимпийский диск / Пер. с польск.— М., 1979.

Хрестоматия по истории Древней Греции / Под ред. Д. П. Каллистова.— М., 1964.

Хрестоматия по истории древнего мира. Пособие для учителей / Сост. Ю. С. Крушкол, Н. Ф. Мурыгина, Е. А. Черкасова.— М.: Просвещение, 1975.

Хрестоматия по истории Древнего Рима / Под ред. В. И. Кузишина.— М.: Высшая школа, 1987.

II. Для вучня

Александрийская поэзия.— М., 1972.

Арский Ф. Н. Перикл.— М., 1971.

Булвер-Литтон Э. Последние дни Помпеи.— М., 1965.

Воронкова Л. В глуби веков.— М. 1973.

Воронкова Л. Герой Саламина.— М., 1975.

Воронкова Л. След огненной жизни. Мессенские войны.— М., 1969.

Воронкова Л. Сын Зевса.— М., 1971.

Героі Элады. З міфаў Старажытнай Грэцыі.— Мн.: Юнацтва, 1985.

Говоров А. А. Алкмен — театральный мальчик.— М., 1974.

Езерский М. В. Марий и Сулла.— М., 1987.

Езерский М. В. Сила земли.— М., 1959.

Знаменитые греки. Жизнеописания Плутарха.— Л., 1961.

Книга для чтения по истории древнего мира. Пособие для уч-ся / Под ред. А. И. Немировского.— М.: Просвещение, 1981.

Лурье С. Я., Ботвинник М. Н. Путешествие Демокрита.— М., 1964.

Мора Ф. Золотой саркофаг.— М., 1964.

Нейхардт А. А., Шишова И. А. Семь чудес света.— М., 1963.

Немировский А. И. Белая лань.— Воронеж, 1964.

Немировский А. И. Белые, голубые и собака Никс.— М., 1966.

Немировский А. И. За столбами Мелькарта.— М., 1959.

Немировский А. И. Слоны Ганнибала.— М., 1963.

Немировский А. И. Тиберий Гракх.— Пенза, 1955.

Немировский А. И. Три войны.— Л., 1961.

Озерецкая Е. Л. Олимпийские игры.— Л., 1972.

Осинский И. Рыцари истины. Книга для учащихся.— Мн.: Народная асвета, 1989.

Остроменцкая Н. Ф. Ветеран Цезаря.— М., 1969.

Парандовский Я. Мифология. Верования и легенды греков и римлян.— М., 1971.

Рубинштейн Р. За что Ксеркс высек море. Рассказы из истории греко-персидских войн.— М., 1967.

Сергеенко М. Жизнь Древнего Рима.— М., Л. 1964.

Слава далеких веков. Из Плутарха.— М., 1964.

Смирнова В. Герои Эллады. Из мифов Древней Греции.— М., 1955.

Томан Й. После нас хоть потоп.— М., 1973.

Троянская война и ее герои. Приключения Одиссея.— Л., 1967.

Усова А. П. Маленький гончар из Афин.— М., 1963.

Успенские В. и Л. Золотое руно. Мифы Древней Греции.— М., Л., 1941.

ЗМЕСТ

Што такое гісторыя 3
Як працаваць з падручнікам 8
Частка першая. **Жыццё першабытных людзей** 9

Раздзел I. **Першабытныя збіральнікі і паляўнічыя** . . . . . —
§ 1. Жыццё найстаражытнейшых людзей . . —
§ 2. Старажытнейшыя людзі і іх заняткі . . 13
§ 3. Узнікненне радавога грамадства . . . 17

Раздзел II. **Фарміраванне ўмоў для ўзнікнення першых цывілізацый** 22
§ 4. Першыя земляробы і жывёлаводы . . —
§ 5. Канец радавога ладу 27
§ 6. Уяўленні першабытных людзей аб навакольным свеце 31
Лічэнне гадоў у гісторыі 37
Частка другая. **Цывілізацыі Старажытнага Усходу** 39

Аддзел I. **Старажытны Егіпет** . . . . —

§ 7. Прырода і насельніцтва Старажытнага Егіпта . . . . . —
§ 8. Асноўныя заняткі старажытных егіпцян 43
§ 9. Утварэнне дзяржавы ў Старажытным Егіпце 47
§ 10. Росквіт старажытнаегіпецкай цывілізацыі 51
§ 11. Асноўныя рысы старажытнаегіпецкай рэлігіі 56
§ 12. Навука і адукацыя ў Старажытным Егіпце 60
§ 13. Літаратура, архітэктура і мастацтва ў Старажытным Егіпце 66

Аддзел II. **Цывілізацыя старажытнай Пярэдняй Азіі** 71

§ 14. Адкрыццё цывілізацыі старажытнага Міжрэчча 71
§ 15. Міжрэчча на зары цывілізацыі . . . 77
§ 16. Старажытнейшыя дзяржавы Міжрэчча 82
§ 17. Пярэдняя Азія ў першай палове I тысячагоддзя да н. э. 85
§ 18. Культура Пярэдняй Азіі ў I тысячагоддзі да н. э. 91

Аддзел III. **Старажытная Індыя** . . . 98

§ 19. Індская цывілізацыя . . . . . —
§ 20. Прыход арыяў і каставы лад у Старажытнай Індыі 104
§ 21. «Веды» — вялікі пачатак 108

Аддзел IV. **Гісторыя старажытнакітайскай цывілізацыі** 114

§ 22. Узнікненне старажытнакітайскай цывілізацыі . . . . . —
§ 23. Утварэнне адзінай кітайскай дзяржавы 119
§ 24. Старажытнакітайскае грамадства. Народныя паўстанні 123
§ 25. Культура Старажытнага Кітая . . . 128

Частка трэцяя. **Гісторыя антычнай цывілізацыі** 134

Аддзел I. Старажытная Грэцыя . . . —

Раздзел I. **Ранняя Грэцыя** . . . . . —

§ 26. Крыта-мікенскае грамадства і яго культура . . . . . —

Раздзел II. **Росквіт грэчаскага грамадства** . 143
§ 27. Ад першабытнай абшчыны да дзяржавы —
§ 28. Асаблівасці полісаў Спарты і Афін . . 150
§ 29. Войны грэкаў з персамі 164
§ 30. Развіццё рабаўладальніцкай дэмакратыі ў Афінах і Перыкл 172

Раздзел III. **Заняпад грэчаскіх полісаў і падпарадкаванне іх Македоніі** 178

§ 31. Пелапанеская вайна . . . . . —
§ 32. Рабства. Разарэнне сялян і рамеснікаў 187
§ 33. Узвышэнне Македоніі і ўстанаўленне яе ўлады над грэкамі 192

Раздзел IV. **Культура грэкаў** 203
§ 34. Школа, тэатр і навуковыя веды . . —
§ 35. Філасофія, Алімпійскія гульні, рэлігійныя святы і вальнадумства 211
§ 36. Архітэктура і скульптура 221
Роля старажытных грэкаў у развіцці сусветнай гісторыі і культуры 229

Аддзел II. **Старажытны Рым** 236

Раздзел I. **Ранні Рым** . . . . . —
§ 37. Прыродныя ўмовы і насельніцтва Апенінскага паўвострава ў старажытнасці . . —
§ 38. Царскі перыяд у гісторыі Рыма . . 241

Раздзел II. **Рымская Рэспубліка** 247
§ 39. Быць грамадзянінам Рэспублікі . . . —
§ 40. Рым — уладар Міжземнамор'я . . . 253
§ 41. Рабаўладальніцтва ў Рыме 262

Раздзел III. **Імператарскі Рым** 269
§ 42. Рым — уладар свету . . . . . —
§ 43. Усе дарогі вядуць у Рым 274

Раздзел IV. **Культура Рыма** 282
§ 44. Мастацтва Старажытнага Рыма . . —
§ 45. Узнікненне хрысціянства 293
§ 46. Грамадскія відовішчы рымлян . . . 300
Значэнне Рымскай цывілізацыі ў развіцці еўрапейскіх народаў 308

Літаратура 313

Вучэбнае выданне

ДАЎГЯЛА Генадзь Іосіфавіч,
КОРЗУН Міхаіл Сямёнавіч,
РЭВЯКА Казімір Адамавіч

Гісторыя цывілізацый старажытнага свету

Вучэбны дапаможнік для 5 класа

Адказны за выпуск *Л. В. Цікунова*. Вокладка мастака *Р. С. Фралова*. Мастацкі рэдактар *Л. А. Дашкевіч*. Тэхнічны рэдактар *Л. П. Сопат*. Карэктары *С. Т. Асташэвіч, Г. М. Булат*.

Здадзена ў набор 15.04.93. Падпісана ў друк 10.06.93. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 16,8. Умоўн. фарба-адбіт. 17,22. Ул.-выд. арк. 12,03. Тыраж 113 000 экз. Заказ 390. Цана 145 руб.

Выдавецтва «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 4. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220041, праспект Ф. Скарыны, 79.

Даўгяла Г. І. і інш.

Д 21 Гісторыя цывілізацый старажытнага свету: Вучэб. дапам. для 5-га кл. сярэд. шк. / Г. І. Даўгяла, М. С. Корзун, К. А. Рэвяка.— Мн.: Нар. асвета, 1993.— 318 с.

ISBN 5-341-01146-5

Д $\frac{4306020600-086}{М\ 303(03)-93}$ 40—93 **ББК 63.3(0)3я721**

145 p.